# Ад Каляд

# ***да Пакроваў***

П.А.Гуд

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мінск**
**"Красіка-Прынт”**
**2000**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 339.17 (476)
ББК 65.9 (4 Бел) 421
Г 93

Серыя "Беларусь святочная" заснавана ў 2000 годзе.
Рэдактар-складальнік Л.І. Жук

Г 93 Гуд. П.А.
Ад Каляд да Пакроваў. / Пад рэд. Л.І. Жук. — Мн.: Выд. **ТАА** "Красіка-Прынт", 2000. — 224 с. — (Беларусь святочная).

**ISBN** 985-405-052-1.

У кнізе прадстаўлены шэраг творчых распрацовак гульнёвых праграм да святаў усіх каляндарных цыклаў.

Выданне адрасавана работнікам культуры пазашкольных і школьных установ, а таксама масаваму чытачу.

УДК 339.17 (476)
ББК 65.9 (4 Бел) 421

**ISBN** 985-405-052-1

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *Уступ*

На сучасным этапе імклівымі тэмпамі развіваецца працэс стварэння новай святочнай культуры беларусаў, пабудаванай перш за ўсе на старадаўніх мастацкіх традыцыях нашага народа. Адраджэнню нацыянальнай культуры ў значнай ступені садзейнічала пастанова Вярхоўнага Савета рэспублікі, якая ўключыла ў сучасны святочны каляндар беларусаў такія святы, як Каляды і Вялікдзень.

Але выкарыстанню народных традыцый у беларускіх святах каляндарнага цыкла перашкаджае нездавальняючы стан метадычнага кіраўніцтва працэсам адраджэння народных традыцый і адсутнасць у культработнікаў сістэмных фальклорна-этнаграфічых ведаў. Пераадоленню гэтага прабелу садзейнічае навуковая, метадычная і творчая дзейнасць Беларускага утвсрсітэта культуры, Беларускага інстытута праблем культуры, Саюза фалькларыстаў Беларусі, абласных навукова-метадычных цэнтраў.

У сучасным духоўным жыцці Беларусі атрымалі распаcюджанне народныя святы ўсіх каляндарных цыклаў. Этнаграфічнай асаблівасцю сучасных каляндарных урачыстасцяў з'яўляецца гістарычная пераемнасць. Сямейна-бытавы аспект у іх некалькі спрошчаны, яны набылі грамадскі характар. Структура святаў насычана элементамі тэатралізацыі.

Аднак у працэсе адраджэння выявілася і негатыўная тэндэнцыя. Нярэдка святы праводзяць пераважна ў форме прадстаўленняў, дзе існуе дакладны падзел на артыстаў і гледачоў, актыўных удзельнікаў і пасіўных сузіральнікаў дзеі. Сцэнічнае ўвасабленне абрадаў перашкаджае развіццю масава-імправізацыйнай творчасці людзей, выхоўвае не ствральніка, а спажыўца культуры. Такое ўвасабленне і трактоўка не адпавядаюць народнай традыцыі, згодна з якой усе прысутныя на свяце былі актыўнымі творцамі.

У многіх святах і зараз пасляабрадавае гульневае дзеянне альбо адсутнічае ўвогуле, альбо ўвасабляецца вельмі прыблізна. Падбор гульнёвых дзеянняў часта выпадковы. Многія з іх не адпавядаюць тэматычнай накіраванасці святаў, мясцовым традыцыям, у выніку чаго страчваецца нацыянальны характар, мясцовы каларыт, характэрныя рэгіянальныя і тэрытарыяльныя адметнасці святаў.
З гэтай прычыны зараз перад дзсячамі мастацтва, работнікамі

культуры пазашкольных і школьных устаноў паўстала надзённая задача — стварэнне спецыфічнага гульнёвага комплексу кожнага канкрэтнага свята каляндарнага цыкла. Гэта адзін з галоўных накірункаў у адраджэнні народных святаў. Пры гэтым распрацоўка пазаабрадавай гульнёвай часткі свята павінна улічваць як вясковыя,
так і гарадскія мясцовыя гульнёвыя традыцыі.

За апошнія гады, як паказвае аналіз, працэс развіцця масава-гульнёвай часткі свята адбываецца ў двух накірунках:

1. Захаванне традыцыйных гульнёвых формаў беларускіх народных святаў каляндарнага цыкла.
2. Распрацоўка новых гульнёвых формаўтварэнняў, пабудаваных на аснове мастацка-гістарычнай спадчыны.

Разглядаючы гэты працэс, трэба адзначыць, што ён пачаўся не на голым месцы. Яшчэ ў 60—70 гады культасветработнікі рабілі першыя спробы адраджэння масава-гульнёвай часткі святаў, але гэтыя першыя намаганні насілі эпізадычны характар і ўвасабляліся час ад часу. Але і на сучасным этапе пераход ад эпізадычнасці да масавага ўкаранення народных гульнёвых формаў у святах так і не завяршыўся, прычым з'явіўся шэраг праблем як драматургічных, так і рэжысёрскіх, праблем, якія неабходна вырашыць у бліжэйшы час.

*Першая праблема* — адраджэнне рэгіянальнага гульнёвага фальклору. У многіх раёнах спажывецкія адносіны культработнікаў да творчага працэсу прывялі да таго, што сцэнарыі, прапанаваныя рэспубліканскім і абласнымі метадычнымі цэнтрамі, без уліку мясцовых традыцый пераносяць у свае святы. Такі падыход параджае аднастайнасць, прыводзіць да уніфікацыі, творчага штампа. Аналіз сцэнарных распрацовак народных святаў паказвае, што па кожнаму са святаў каляндарнага цыкла толькі адзін-два варыянты гульняў выкарыстоўваюцца ў рэспубліцы. Таму нядзіўна, што ў многіх раёнах пазаабрадавыя гульнёвыя часткі святаў падобныя адна на адну як дзве кроплі вады, і гэта становішча трэба неадкладна выпраўляць шляхам росшуку, асэнсавання і ўкаранення мясцовых.гульняў і забаў, што прыдасць кожнаму святу ў кожнай мясцовасці спецыфічныя адметнасці, мясцовыя асаблівасці, значна узбагаціць як народную гульнятэку, так і сучасную святочную культуру.

*Другая праблема* — павышэнне пазнавальнага накірунку ў гульнёва-забаўляльных праграмах народнага свята.
Справа ў тым, што сённяшнія народныя забавы і гульні — гэта былыя абрады і рытуалы, якія страцілі магічны змест і набылі яскрава выражаны гульнёвы характар. І вельмі важна ў сучасных гульнёва-забаўляльных праграмах тлумачыць удзельнікам семантыку, г. зн. значэнне дадзеных дзей, каб удзельнікі маглі зразумець іх сэнс. Асаблівую ўвагу на падобны аспект трэба звярнуць пры апрацоўцы сцэнарыя з тым, каб культработнікі ў далейшым маглі ўвасобіць гэта на свяце. Шматлікія назіранні святаў даюць падставу для сцвярджэння, што пазнавальны накірунак праграм распрацаваны вельмі слаба і прыблізна. Поўнае ж тлумачэнне семантыкі гульнёвай дзеі дасць магчымасць шматлікім удзельнікам зрабіць калектыўную рэакцыю, калектыўнае тлумачэнне гульні, якая адбываецца, што параджае механізм народнай комікі, стварае атмасферу весялосці.

*Трэцяя праблема* сцэнарнай распрацоўкі і рэжысерскага ўвасаблення гульнёва-забаўляльных праграм — гэта выкарыстанне якасці носьбітаў сцэнарна-рэжысёрскага ходу праграм персанажаў адпаведных беларускіх абрадаў.

Здаецца, усім вядома, што вядучымі гульнёвых праграм на Каляды могуць быць Дзед-Пачынальнік, Шчодра і Калядоўшчык; на Гуканне Вясны — вяснянкі і Вясна; на Вялікдзень — валачобнікі і г.д.

У той жа час, як паказвае практыка, у многіх раенах культработнікі робяць неапраўданыя новаўвядзенні. Так, у Салігорску і іншых раёнах калядныя гульнёвыя праграмы праводзяць Несцерка і Баба-Яга, якія не маюць ніякага дачынення да каляднага фальклору. У асобных раёнах галоўная дзеючая асоба Масленіцы — гэта герой рускага фальклору Ямеля, які арганізоўвае гульневыя дзеі. А ў Століне — адным з цэнтраў фальклору — культработнікі дадумаліся да таго, што ўвялі ў лік персанажаў Купалля Нептуна, Акулу,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Селядца і Локшыну!!!

Падобныя "навацыі" наносяць вялкую шкоду развіццю гульнятэкі, ушчэнт разбураюць стылявую і жанравую характарыстыкі святаў, іх пазнавальны накірунак, рэзка зніжаюць эфектыўнасць эмацыянальнага і педагагічнага ўздзеяння святаў. Таму неабходна прыняць закон аб ахове фальклору і забараніць арганізатарам рабіць некампетэнтныя наваўводзіны.

Такім чынам тры праблемы паўсталі перад сучаснай культурай: адраджэнне рэгіянальнага гульнёвага фальклору, павышэнне пазнавальнага накірунку гульнёва-забаўляльных праграм і выкарыстанне мастацка-вобразных гульнёвых традыцый. Толькі пры іх вырашэнні мы зможам паставіць на якасна новы ўзровень правядзенне сучасных гульнёвых дзей народнага свята, стварыць яго спецыфічны пазаабрадавы гульнёвы комплекс.

У гэтай кнізе вы знойдзеце шэраг творчых распрацовак гульневых праграм да святаў усіх каляндарных цыклаў, у якіх прымалі ўдзел студэнты кафедры рэжысуры святаў Беларускага універспэта культуры К. Пятровіч, В. Каваленка, У. Крачэўскі, Т. Новік, А. Хвалько, Л. Ліннік, В. Моўчан і інш. Разам з аўтарам кнігі студэнты вывучалі этнаграфічныя, фальклорныя, гістарычныя і літаратурныя матэрыялы, рабілі фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі ў розныя раёны Беларусі з мэтай збору і сістэматызацыі гульневых форм беларускага фольклору, праводзілі апытанні насельніцтва і назіранні правядзення сучасных святаў. Пад навуковым і мастацкім кіраўніцтвам аўтара студэнты ў кожнай праграме вызначалі вобразнае адлюстраванне ў мастацка-дэкаратыўным, пластычным і музычным вырашэннях, знаходзілі сцэнарна-рэжысерскі ход, здзяйснялі літаратурную апрацоўку сцэнарыяў, уключалі ў тэксты тлумачэнне семантыкі гульнёвых дзей.

Гульнёвыя праграмы, надрукаваныя у гэтай кнізе, пабудаваны на матэрыялах розных рэгёнаў Беларуси, але пераважна на аснове фалькорна-этнаграфічнай спадчыны Міншчыны. Сярод іх ёсць распрацоўкі, створаныя на аўтэнтычнай аснове, а таксама творча пераасэнсаваныя і прыстасаваныя да сучаснага свята. Вялікую цікавасць прадстаўляюць кірмашовыя забавы беларусаў, аналагі якім у другіх народаў пакуль што не знойдзены.

"Ад Каляд да Пакроваў" — першая ў Беларусі спроба стварэння спецыфічнага гульнёвага комплексу святаў, першы крок на шляху адраджэння нацыянальнай гульнёвай спадчыны. Таму вельмі важна, каб работнікі культуры не механічна пераносілі прапанаваныя праграмы ў структуру сваіх святаў, а дапаўнялі іх перш за ўсё мясцовымі гульнямі і забавамі, стваралі на іх аснове новыя гульнёвыя дзеі. Гэта будзе спрыяць захаванню і развіццю беларускай народнай гульнятэкі ў кожнай мясцовасці, дапаможа зрабіць нашы святы па-сапраўднаму масавым народным дзеяннем.

***П.А. ГУД,***
***загадчык кафедры рэжысуры святаў Беларускага універсітэта культуры, кандыдат гістарычных навук***

## *Калядныя варожбы*

Памяшканне святочна ўбрана пад беларускую хату. Стаіць стол, засланы абрусам, на ім свечка, рэчы для варожбы.

Гучыць беларуская народная песня “Паехала каляда”. Пад лірычную мелодыю выходзіць дзяўчына. Папраўляе рэчы на стале, запальвае свечку і звяртаецца да гледачоў.

***Вядучая.***

Калядныя варожбы. Яшчэ адзін паэтычны штрых да духоўнага жыцця нашых дзядоў і прадзедаў. Яны былі ўцехаю і забаваю, бо заўседы неслі чалавеку надзею. Згадзіцеся, каму з маладых не хацелася б пранікнуць у будучыню, даведацца пра суджанага-раджанага, сямейны лес? Ці не так?

*(Гледачы адказваюць).*

***Вядучая.***

Вось і мы зараз з вамі паварожым. Паспрабуем акунуцца ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтыя таямнічыя скарбы мінулага! Пачынаем.

*(Запальвае яшчэ адну свечку).*

Вось гэту свечку вы перадавайце хуценька адзін аднаму. І ў каго яна па заканчэнні музыкі

***Вядучая.***

Вось наша першая удзельніца варожбы — самая шчасная дзяўчына на нашым свяце. Давайце зараз выберам самую прыгожую і самую вясёлую дзяўчыну. І зробім мы гэта пры дапамозе чароўнай свечачкі.

*(Гледачы зноў перадаюць свечку адзін аднаму. Дзяўчаты выходзяць да Вядучай).*

***Вядучая.***

Вось нашая самая шчасная, самая прыгожая і самая вяселая дзяўчына. Выберыце сабе, калі ласка, яшчэ па адной сяброўцы, і мы пачнем варажыць.

*(Дзяўчаты яшчэ запрашаюць з гледачоу трох удзельніц, усе падыходзяць да Вядучай).*

***Вядучая.***

Вось нашы першыя ўдзельнщы. На калядкі ўсе дзяўчаткі вось як варажылі: выходзілі на двор, набіралі трэсак у фартух і беглі ў хату. А ў хаце лічылі трэскі: цотны іх лік — хутка быць у пары, а калі няцотны – у гэтым годзе яшчэ не стрэнецца з суджаным.

*(Ідзе варожба з трэскамі).*

Ну, вось мы і спазналі, хто ў гэтым годзе будзе ў пары. Але згадзіцеся, кожнай дзяўчыне цікава ведаць, ці раней яна за сваіх сябровак замуж пойдзе. І вось што для гэтага рабілі: скінуўшы чаравік, мералі ім дарогу ад покуці да парога. Чый першы ля парога апынецца, тая напярод замуж пойдзе.

Зараз і мы паспрабуем так паваражыць.

*(Дзяўчаты здымаюць па чаравіку і ад покуці да парога адна за адной мераюць ім дарогу).*

***Вядучая.***

Мы даведаліся, каму ў гэтым годзе ў пары быць, і хто раней замуж пойдзе. Але ж яшчэ цікава ведаць, якога нораву будзе ваш суджаны.

А дастанешся хлопцу браваму,  
Хлопцу браваму, кучараваму,  
Хлопцу зграбнаму і высокаму,  
застанецца — той самы шчасны сённяшнім свяце.

*(Гледачы перадаюць свечку. У каго яна засталася па заканчэнні музыкі, той падыходзіць да Вядучай).*

Хлопцу смеламу і разумнаму.

Вось у мяне, дзяўчаткі, — на стале стаяць шэсць талерачак, на кожнай ляжыць нейкая рэч, накрытая сурвэткай. Зараз кожная дзяўчына па чарзе возьме сабе якую-небудзь талерку, і па рэчы мы даведаемся, якога нораву будзе ваш суджаны!

***На талерках ляжаць:***

чарка *(муж будзе трошачкі вытіваць);*  
люстэрка *(прыгажун);*  
зерне *(працавіты і стаpанны);*  
кніга *(разумны);*  
шчотка *(злосны, з характарам);*  
ключы *(гаспадарлівы)*

***Вядучая.***

Ці спадабаліся вам варожбы, дзяўчаткі?

*(Гледачы адказваюць).*

Дзякуй вам, сядайце, калі ласка.

*(Вядучая падыходзіць да стала і бярэ талерку з зернем, у якой ляжаць пярсцёнкі).*

***Вядучая.***

Ай, дай жа, Божа, малайца-таргаўца,  
Каб у будны дзень у золаце хадзіла,  
А ў нядзельку ў аксаміце.

Вось у мяне, госцікі даражэнькія, талерка з зернем. Але ж яна не простая. У гэтай талерцы ляжаць пярсцёнкі розныя. Зараз кожная дзяўчына, да якой я падыду, возьме па жмені зерня. І па тым, які пярсцёнак ей дастанецца, мы даведаемся аб дастатку вашага кавалера.

*(Вядучая падыходзіць да дзяўчат, яны бяруць па жмені зерня, сярод якога трапляюцца пярсцёнкі).*

Калі дастаўся залаты пярсцёнак — значыць, сустрэнецца хлопец багаты-багаты; срэбны — прыйдзе хлопец у сваты з сярэднім дастаткам; просты пярсцёнак — сустрэнецца вельмі шчодры хлопец, не вельмі багаты. Але ж вы будзеце моцна кахаць адзін аднаго. Пярсценак з камянём — сустрэнецца дзяўчыне не проста хлопец, а нават паніч. І быць гэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяўчыне паненкай хутка. Калі ўзяла адно зерне - у гэтым годзе ніякі хлопец не сустрэнецца. Але ж хто ведае — можа, яно і да лепшага? Ёсць час падумаць, удалы выбар зрабіць.

***Вядучая.***

Вось, дзяўчата, вы даведаліся, якіх хлопцаў чакаць вам у сваты. Але ж цікава, адкуль яны з'явяцца? Таму выходзьце да мяне, хто зараз варажыў і каму дастаўся пярсцёнак. Зараз мы даведаемся, з якога боку сватоў чакаць!

*(Да вядучай выходзяць чатыры дзяўчыны.)*

***Вядучая.***

А раней вось як гэта рабілі.

*(Вядучая бярэ доўгую палку).*

Бралі кол і ставілі яго перад сабой, а затым выпускалі з рук. У які бок кол упадзе, адтуль і сватоў чакаць.

Ну, паспрабуем? *(Па чарзе адпускаюць кол, растлумачвае):*

Чакай, дзяўчына, прыезжых сватоў здалёк, мо з-за мяжы нават. Падобна, нейю госць адтуль да цябе завітае.

Ну а ты, дзяўчына, не вельмі далека пойдзеш ад роднай хаткі. Добры сусед к табе завтае.

***Вядучая.***

Ці спадабаліся вам варожбы? Ну, тады далей варажыць будзем! Станавіцеся, дзяўчаткі, у паўдужжа.

Пагуляйце, дзеванькі, пагуляйце.
Пойдзеце у чужыя людзі —
Мінецца гулянне,

**Дзявочае красаванне.**

Зараз, дзяўчаткі, мы даведаемся, якой жа спецыяльнасці будзе ваш суджаны. І дапаможа нам у гэтым пеўнік. Але спачатку мы разлічымся па чарзе, каб ведаць, якая дзяўчына пад якім нумарам. Уважліва сачыце за пеўнікам, што ён будзе рабіць.

*(Гучыць вясёлая музыка. Да дзяўчат выходзіць пеўнік - пераапрануты хлапец. Спачатку ён ходзіць, аглядаючы кожную дзяўчыну.)*

***Вядучая.***

Бачыце, дзяўчаткі, наш пеўнік ходзіць ды паглядае. Гэта значыць, што першай дзяўчыне дастанецца муж-аграном.

*(Певень махае крыламі.)*

***Вядучая.***

А вось другой дзяўчыне дастанецца муж-лётчык.

*(Певень кукарэкае.)*

***Вядучая.***

Глядзіце, наш пеўнік спявае. У трэцяй дзяўчыны будзе муж-артыст.

*(Яшчэ певень можа біцца— муж будзе міліцыянер; бегчы— спартсмен; кляваць— дырэктар рэстарана;грабсці лапай— трактарыст).*

***Вядучая.***

Дзякуй, дарагі пеўнік, табе за дапамогу! Дзяўчаткі, давайце падзякуем пеўніку, створым вакол яго карагод, хай ён станчыць.

*(Дзяўчаты водзяць вакол пеўніка каргод, і ён танчыць).*

***Вядучая.***

Дзякуй табе, пеўнік, дзякуй вам, дзяўчаткі! Сядайце, калі ласка!

Вось і ўсё, што мы паспелі.
Варажылі, як умелі,
Жаніхоў павыбіралі,
Ды развітацца нам час!
Шчасця зычу і кахання,
Хай спаўняюцца жаданні.
Зараз жа на развітанне
Шчыра дзякую я вам.

Госцікі даражэнькія, да сустрэчы у наступным годзе на Калядных варожбах!

*(Развтваецца з гледачамі).*

***

*(З песняй "Пайшла Каляда калядуючы " з'яўляцца калядны гурт.)*

***Шчодра.***

А ў нас сёння сход Каляд, сабірайцеся ўсе ў рад.
Адну зіму песні пеяць, будзем іх у рэшаты складаць,
У рэшаты складаць, ды вас, паночкі ды паненачкі, частаваць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Куццю варыці ды на ей варажыці.
Танчыць, у гульні гуляць, ды з калядамі

... ***Усе.***

Паздраўляц!

***Шчодра.***

Пайшла Каляда, Каляда,
Вінаградная, красная, зялёная.
Выхадзіл1, гулялі калядоўшчыкі,
Прыхадзілі, прыгулялі к гаспадараву двару.

***Усе.***

А дзе ж самі гаспадары?

*(Калядны гурт разыходзіцца, пад музыку выходзяць гаспадары: Лявон, Лявоніха і іх дачушка Зосечка.)*

***Усе.***

А вось і гаспадары: Лявон, Лявоніха і іх дачка Зосеча.

***Шчодра.***

Ой, добры вечар, хазяін, засцілай сталы, кладзі пірагі, да будз к табе да трое гасцей: а першая госць — жарка сонейка, а другая госць — ясен месячык, а трэцяя госць — дробен дожджычак. Чым пахваліцца - жарка сонейка?

***Сонейка.***

Як узыду я рана на зарэ — узрадуюцца неба і зямля, неба і замля, і ў лузе трава.

***Шчодра.***

Чым пахваліцца ясен месячык?

***Месячык.***

Як узыду я позна з вечара — узрадуецца купец у дарозе, купец у дарозе, а звер у дуброве.

***Шчодра.***

Чым пахваліцца дробен дожджычак?

***Дожджычак.***

Як узыду я рана і з вясны — узрадуецца жыта-пшаніца і ўсякая пашніца.

*(Калядны гурт спявае "На нова лета".)*

***Шчодра.***

Шчадрыцеся, гаспадары, жывіце год да ста так,
Хай едуць у вашыя двары прыбытак і дастатак!
А каб добра было жыць, трэба нам паваражыць!
Нясі, Лявоніха, калядную куццю, зараз паглядзім, ці чакае цябе дабрабыт у наступным годзе.

*(Лявоніха выносіць куццю, якая стаіць на падносе з саломінкамі, пакрытымі ручнікам. Зосечка адчыняе накрыўку, усе глядзяць у гаршчочак.)*

***Шчодра.***

Ой, добрая куцця атрымалася — разварыстая, а пах які - проста цуд! Чакае цябе, Лявоніха, дабрабыт на ўвесь год! *(Звяртаецца да гаспадара)* А ты, гаспадар, чаго стаіш, з нагі на ногу перамінаешся? Хадзі сюды, зараз твая чарга — цягні саломінку з-пад ручніка, даведайся, які ўраджай будзе.

*(Лявон цягне саломінку і дастае доўгую, поўную зярнят.)*

***Шчодра.***

Гляньце, якая доўгая ды поўная зярнят саломінка! Радуйся, гаспадар, весяліся, ды добраму ўраджаю дзівіся! *(Звяртаецца да гледачоў.)* А вы, даражэнькія гаспадарочкі, паспытайце свій лес, паваражыце на ураджай і дабрабыт.

*(Лявоніха падыходзіць да гледачоў і прапануе цягнуць саломінку.)*

Цягні, калі ласка, гаспадар, саломінку!

*(Гаспадар цягне поўную зярнятак саломінку.)*

Ой, добрая саломінка, адразу бачна — сапраўдны гаспадар, дык і ўраджай у цябе будзе багаты, а адсюль — і шчасце ў тваім даму.

*(Лявоніха падыходзіць да другога гаспадара.)*

Цягні і ты, гаспадарочак, сваю саломінку.

*(Гаспадар цягне доўгую, але пустую саломінку.)*

***Шчодра.***

А вам, шаноўны, трэба добра працаваць, каб вялікі ўраджай сабраць.

*(Лявоніха ідзе да трэцяга.)*

А зараз ваша чарга, цягніце саломінку!

*(Гаспадар выцягвае маленькую, пустую саломінку.)*

***Шчодра.***

Ой, не пашанцавала! Але не хвалюйцеся, не народзіцца хлеб, дык народзіцца бульба. Дзякуй, даражэнькія, што паспыталі свой лес, і не сумуйце, калі крыху не пашанцавала, памятайце, хто старанна працуе, той мір мацуе!

А мы ведаем, што ў пана гаспадара дачушка ёсць, а прыгажунечка, нібы каліна красная. Выйдзі, Зосечка, павярніся, нам, калядоўшчыкам, пакланіся.

*(Выходзіць Зосечка, калядны гурт спявае "У лузе каліна ".)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Шчодра.***

Табе, Зосечка-прыгажунечка, песня спета, песня спета, ды насупраць лета, каб вялікая расла, ды замуж пайшла, бацьку-матку вяселлем страсла... А давайце паглядзім, які ў яе муж будзе.

*(Калядоўшчыкі становяцца ў два колы, ідуць у карагодзе і спяваюць, чатыры дзяўчыны выносяць талеркі з вадою, зернем, люстэркам, кнігай*

"Пеця, Пеця, Петушок, залаты грабушок,
Маслена галовушка, шоўкава бародушка.
Што ж ты рана ўстаеш, дзеўкам спаць не даеш,
Пеця, Пеця, Петушок, залаты грабушок".)

***Шчодра.***

Ну, Пеця, пакажы, які муж будзе ў гэтай прыгажунечкі.

*(Певень падыходзіць да талеркі з зернем, клюе і кукарэкае.)*

***Шчодра.***

Ой, добры мужык будзе, працавіты, а кашалёк дык поўны даляраў.

***Дзяўчына.***

Мабыць, бізнесмен ці рэкецір!

***Шчодра.***

Я бачу, што яшчэ шматдзяўчат хочуць паваражыць. Пеця, запрасі вось гэтую прыгажунечку.

*(Певень выводзіць дзяўчыну ў цэнтр карагода, калядоўшчыкі спяваюць "Пеця Петушок", пасля песні певень падыходзіць да талеркі з люстэркам і кукарэкае.)*

***Шчодра.***

Гляньце, певень люстэрка дзяўбе, а гэта азначае, што будзе прыгожым. Трымай гэтае люстэрка, хай твой хлопец прыхарошваецца, ды на другіх дзяўчат не заглядваецца.

*(Певень запрашае наступную дзяўчыну.)*

***Шчодра.***

А ты, ластаўка, чаму такая сумная? Хадзі і табе паварожым!

*(Певень падыходзіць да талеркі з вадой і кукарэкае.)* ***Шчодра.***

Гляньце, певень ваду п'е, мабыць, піць мужык будзе... Але ж не хвалюйся, піць-гуляць, не гора гараваць, хай то будзе не з нягоды, а з шчаслівага жыцця. Трымай гэтую талерачку, хай твой мужык апахмяляецца ды розуму набіраецца.

*(Певень запрашае наступную дзяўчыну.)*

***Шчодра.***

І ты, красачка, даведайся, што за муж табе дастанецца!

*(Певень падыходзіць да кнігі і кукарэкае.)*

***Шчодра.***

Гляньце, певень кнігу дзяўбе. Гэта азначае, што муж твой будз вельмі разумны. Трымай гэтую кніжку, хай твой “прафесар” чытае, ды пра цябе не забывае!

Вось мы і даведаліся, які будзе суджаны, а адкуль ён з’явіцца, хочаце даведацца?.. Лявоніха, нясі сюды калядныя бліны, але класці мы іх будзем не ў рот, а на галаву.

Хлопцы, нясіце качаргу, сядуць дзеўкі на яе вярхом і пракаціцца ладком, павернуцца вакол сябе тры разы і скажуць мапчныя словы...

***Усе.***

Што рабілася — разрубісь, што круцілася — раскруцісь,
Што шылася —расшыйся, адкуль будзе мілы, дай знаць!

***Шчодра.***

З якога боку забрэшуць сабакі — адтуль і мілага чакаць.

*(Запрашае дзяўчыну з каляднага гурта.)*

***Шчодра.***

Бачу, Ірыначка вельмі хоча даведацца, з якога боку чакаць! Сядай на качаргу, трымай блінец, пачынаем!

*(Дзяўчына паварочваецца вакол сябе тры разы, гурт кажа магічныя словы, брэша сабака, брэх грубы і здалёк.)*

***Шчодра.***

Нешта зусім не чуваць гэтага сабакі, мабыць няскора з’явіцца, але ты не сумуй, чую, што голас сапраўднага мужчыны. Падрасці крыху, пасаг збяры, а там гдядзі і сватоў сустрэнеш.

Дзяўчатачкі, запрасіце, калі ласка, вунь тую прыгажунечку, хай таксама паварожыць.

*(Дзяўчаты з каляднага гурта запрашаюць гледачоў.)*

Сядай на качаргу, трымай блінец, пачынаем!

*(Чуецца брэх шчаня.)*

Людцы добрыя, хто гэта там цукае і здаецца зусім блізка, мабыць, сёння і знойдзе цябе. А будзе ён з Мінскай вобласці з в. Пухавічы. А зараз я запрашаю ўсіх дзяўчат, якія яшчэ не паваражылі.

*(Дзяўчаты з гурта выводзяць на пляцоўку некалькі*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*дзяўчат.)*

Сядайце хутчэй на качаргу, уладкаваліся? Пачынаем!

*(З розных бакоў чуецца брэх сабак.)*

Ну што, кожная пачула свайго сабаку? Ну вось і добра, чакайце сваіх суджаных, і яны абавязкова да вас прыйдуць!

Весела музыка йграе,
Усіх на польку запрашае!

*(Усе танчаць польку.)*

## *Шчодры вечар — добры вечар*

Пляцоўка святочна ўпрыгожана ручнікамі. На задніку — выява казы і васьмікутнай зоркі. На мізансцэне — стол з пачастункамі і прызамі.

Гучыць вясёлая калядная мелодыя. На пляцоцку выходзяць, прытанцоўваючы, Шчодра і Каза.

***Каза.***

Прыйшла Каляда, калядуючы,
А за ею дзецкі, шчадруючы.
Пайшла Каляда ў адну хату,
А ў гэтай хаце куццю таўкуць.
Пайшла Каляда ў другую хату,
А там серабро звініць.
А ў трэцяй хаце золата блішчыць.
А ў чацвёртай — сала шыпіць.
А ў пятай хаце каўбасу пякуць.
А наша хата поўна гасцей.
Усе яны пець, гуляць хочуць.

***Шчодра.***

Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!
А людзей тут цераз край,
Хоць ты лыжкай мяшай.
А ці рады вы нам?
Калі вы нам рады,
Мы вам да парады.
І, як кажуць нашы людзі,
Хай вам даспадобы будуць жарты, песні,
Бо без песні жыць няёмка, хоць ты трэсні.
А без скрыпкі і дуды ходзяць ногі не туды,
А яшчэ ў прывітанне пажадаць мы вам хацелі,
Каб ад нашага спаткання крышку вы памаладзелі,
Каб не ведалі вы злосці, каб жылі ў весялосці.
Вушы каб у вас не вялі, каб вы добра ўсе гулялі.
Разам. Усім ад краю і да краю шчасця і дабра жадаем.

***Шчодра.***

А ты, Каза, не ляніся!
Туды-сюды павярніся,
Ножкамі пастукачы,
Рожкамі паляскачы.
Паскачы для народа,
Каб урадзіла жыта
У новым годзе многа.
А вы, людцы добрыя, не сядзіце.
Казу-весялуху ў карагод вазьміце.
Хто з Казою патанцуе,
Таму ў новым годзе пашанцуе.

*(Каза і Шчодра ідуць у натоўп, заводзяць карагод. Гучыць музыка з песні "Го-го-го, каза...". Каза заводзіць карагод на пляцоўку, апошняй ідзе Шчодра. Усім удзельнікам карагода прапануецца стаць кругам. Шчодра і Каза становяцца ў цэнтр.)*

***Шчодра.***

Малайчына, Каза, поўна народу вакол сябе сабрала. А якія ўсе маладыя, вясёлыя, спрытныя.

***Каза.***

Пачакай, Шчодра, зараз паглядзім, якія яны спрытныя да гульняў. Я прапаную пагуляць у цікавую гульню, якая называецца "Яшчар". Адзін з хлопцаў, якога я зараз выберу, будзе “Яшчарам”. Ен павінен сядзець у цэнтры круга, а дзяўчаты і хлопцы будуць вадзіць карагод і спяваць:

Сядзіць, сядзіць Яшчар,
Гэй нам, гэй
У залатым крэсле,
Улясковым кусце
Бяры сабе жонку,
Каторую хочаш
Ці то ў чаравічках,
Ці то ў панчошках.

Усе дзяўчаты зараз атрымаюць вяночкі. І ў час карагода яны павінны набліжацца да Яшчара. Ён па чарзе будзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здымаць у дзяўчат вяночкі да той пары, пакуль не збярэ ўсіх вяночкаў. Пасля дзяўчаты па адной будуць выпрошваць у яго свае вяночкі. Яшчар павінен смяшыць дзяўчат. Хто засмяецца, той не атрымае свой вяночак. Калі дзяўчына звяртаецца да Яшчара, то гаворыць:

Яшчар, панок, адцай вянок,
Я ручкі, ножкі мазаліла,
Свайго вяночка не знасгла.

А вы, хлопцы, дапамагайце дзяўчатам карагод вадзіць. Усё зразумела? Тады хай музыкі нам падыграюць, а мы пачынаем гульню.

*(Ідзе гульня "Яшчар ".)*

***Шчодра.***

*(Пасля гульні.)А* цяпер запрашаю ўсіх стаць паўкругам. Козанька хоча пачаставаць удзельшкаў смачнымі аладкамі.

*(Каза частуе ўдзелынкаў. А Шчодра тым часам звяртаецца да гледачоў).*

***Шчодра.***

Аладкі ў нашай Казы атрымаліся смачныя. Хто яшчэ пакаштаваць хоча? Калі ласка. А патрэбна для гэтага ўсяго толькі адгадаць загадку.

1. Дзве дачкі, дзве Маці і бабуля. Колью усіх? *(Трое: бабка, маці і дачка)*
2. Без кораня, а расце. *(Камень)*
3. Ляцелі сізыя галубкі, селі на ваду
   Вады не скаламуцлі і самі не паляцелі. *(Снег)*
4. Лысы конь цераз вароты глядзіць. *(Месяц)*
5. На полі Ярох рассыпаў гарох,
   А стала світаць — няма чаго збіраць.
   *(Неба, зоркі)*

***Каза.***

Малайцы. Хто правільна адгадаў — хуценька да нас па аладкі.

*(Пераможцы конкурсу ідуць на пляцоўку, атрымліваюць пачастунккі,* ім *прапануецца далучыцца да ўдзельнікаў, якія знаходзяцца на пляцоўцы.)*

***Шчодоа.***

Козанька, мо пара іншым госцейкам паскакаць?

***Каза.***

Паскакаць, дык паскакаць!

Прыехала Каляда з вечара
Ды прывезла дудак рэшата,
Ды паставіла на ступе,
Сама села на куце.
А вы, дудачкі, іграйце,
А вы, хлопчыкі, свісціце,
А вы, дзеванькі, пляшыце.

*(Гучыць танец "Падыспань". Танцуюць І ўдзельнікі, І гледачы. Шчодра застаецца на пляцоўцы, а Каза ідзе танцаваць да гледачоў.)*

***Шчодра (пасля танца).***

Я вось за ўсімі назірала ды лепшую пару прыкмеціла. І зараз хачу гэту пару адзначыць прызам (на пляцоўку запрашаецца лепшая з гледачоў і ўзнагароджваецца смачнымі перапечкамі).

***Шчодра.***

Калі вы так добра танцавалі, то мусіць і спяваеце добра... давайце паглядзім, хто з вас больш прыпевак ведае. Музыкі, калі ласка, да нас.

*(Гучаць прыпеўкі. Хто больш праспяваў, атрымлівае прыз.)*

***Шчодра.***

Дзякуй, дзякуй, павесялілі вы нас усіх.

*(Удзельнікі конкурсу ідуць да гледачоў.)*

***Каза.***

А зараз ізноў гуляць будзем. Гэта гульня называецца “Шкута”. Вось бачыце ў мяне ў далоні пятак, ды не медны, а залаты. Зараз я пайду паўз паўдужжа. Ты, Шчодра, ідзі за мною ды добра глядзі, каму я гэты залаты аддам. Калі упільнуеш, то зоймеш мае месца. Хто атрымае пятак — будзе замест Шчодры. І гэтак далей.

*(Удзе Каза, гаворачы.)*

***Каза.***

Шкута ідзе, золата нясе,
А хто адгадае,
Той вялікае шчасце мае.

*(Пад музыку ідзе гульня "Шкута ".)*

***Каза (пасля гульні).***

Ну, малайцы, так разгуляліся, што нават і не суняць вас. Калі так спадабаліся вам гульні, то я прапаную яшчэ адну. Назва ей - "Ката пячы". У нашых продкаў яна была адна з самых любімых у калядныя вечары. А ну, Шчодра, давай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сюды нашага Ката.

*(Шчодра выносіць вялікі шост, на якім у самым версе прычэплены снечаная фігурка Ката. Вушы і ногі— з сала, а хвост з каўбасы.)*

***Каза.***

Ну дык вось, паглядзім, каму дастанецца галоўны прыз нашага свята. Па чарзе вы павінны пад'ехаць на вілах да Ката са словамі: "Еду з кута на Ката". І паспрабаваць адкусіць кавалачак. Усе астатнія павінны смяшыць удзельніка. І калі ён засмяецца, то выбывае з гульні. А ў старадаўні час такому ўдзельніку нават вымазвалі твар сажай. Ну, а хто ўсе ж такі адкусіць кавалачак, то атрымае галоўны прыз. Гэй, музыкі, зайграйце самую вясёлую музыку, якую можаце. А мы пачынаем гульню.

*(Ідзе гульня.)*

Пасля заканчэння пераможца атрымлівае прыз — пірог з макам, а фігурку Ката дзеліць на ўсіх удзельшкаў.

Усе ідуць з пляцоўкі.

***Шчодра.***

Шчодра, Шчодра, шчадраўніца,
Прыляцела ластавіца.
Стала сабе шчабятаці,
Усіх людзей у танцы запрашаці.

*(Гучыць полька-весялуха, усе танцуюць.)*

***Каза (пасля танца).***

З песняй шчыраю калядуем мы
У святую ноч пад шатром зімы.

***Шчодра.***

Мы прыйшлі да вас пажадаць дабра,
Ад усёй душы, як сваім сябрам

***Каза.***

Каб прынёс год новы вам
Дабрабыт і плен,
Многа радасці, веру светлых дзён.

***Шчодра.***

Няхай збудзецца, што жадаецца,
Што задумана — прыдбаецца.

***Каза.***

Дзякуй вам за добры прыём,
Цераз лета і восень ізноў к вам прыйдзём

***Разам.***

Усяго вам добрага,
Да пабачэння!
*(Гучыць вясёлая мелодыя, усе разыходзяцца.)*

## Калядкі Дзеда Мароза

Гучыць вясёлая музыка. Выбягаюць скамарохі, вітаюцца з дзцьмі за руку, раскідваюць канфеці, паветраныя шары, падымаюцца на эстраду.

***Скамарох 1.***

Зіхаціць на небе сонца,
Ранак разгараецца,
А ў дзятвы нашай вясёлай
Свята пачынасцца!

***Скамарох 2.***

Сышліся на свята
І нам тут не цесна,
Бо ўсе з аднаго мы,
З вясёлага цеста.

***Скамарох 3.***

Што такое Новы год?
Гэта — дружны карагод,
Гэта — смех сяброў вясёлых,
Гэта — свята каля ёлак!

***Скамарох 1.***

Хай да нас у карагод
Стануць дзеці ўсіх шырот!
(Вядзе карагод.)

***Скамарох 2.***

Колькі шуму, колькі смеху:
Дзеда вылепілі з снегу!

***Скамарох 3.***

Замест рук — уткнулі палкі,
Вочы — вугалю кавалкі,
Нос — чарэпак з гладыша,
Барада — шматок кудзелі,
А на лысіну надзелі
Кош замест капелюша!

***Скамарох 1.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ну і дзед! Відаць яму
Цешыць нас усю зіму.
*(Музыка. З'яўляецца Снегавік. Спявае.)*

***Снегавік.***

Я спяваю ў карагодзе,
Каб увесь пачуў народ.
Ды шкада, што навагоддзе
Толькі раз на год!
Сёння, ідучы да вас,
Сто загадак я прыпас!
Той розум мае,
Хто іх адгадае!
Белы, лёгкі і пушысты,
Ён укрыў зямлю ўсю чыста.
Я прынёс яго ў дом —
Ён разліўся ручаём. *(Снег.)*
Сее, вее, падсявае,
След зімою замятае. *(Завіруха.)*
Ён нарадзіўся на страсе,
Вялікім вырас пакрысе,
На сонцы грэцца ледзь пачаў,
Заплакаў моўчкі і прапаў. *(Лядаш.)*
Раку за ноч замураваў
І вокны усе размаляваў,
Вавёрку ўшчыкнуў за нос.
Завуць яго, сябры, *(мароз)*.
Што за беленькая мушка
Апусцілася на вушка,
Ледзь чутно паказытала,
Штосьці вушку пашаптала
І праз міг яе не стала.
Паглядзеў і я туды, —
А там кропелька вады.
*(Сняжынка.)*

***Снегавік.***

І да нас сняжынкі заляцеі!. Цэлы рой сняжынак, прывяла іх старэйшая сястрычка —

***Снягурка.***

Давайце разам пазавем іх:
Сняжынкі-пушынкі, ляціце да нас!
Сняжынкі-пушынкі, з'явіцца вам час!
*(Дзеці завуць сняжынак. Снягурка вядзе сняжынак у залу, і тыя водзяць вакол ёлкі свой зімовы карагод.)*

***Снягурка.***

Вось сняжынкі разам селі,
Вось сняжынкі паляцелі,
Спыніліся ля варот, —
Усіх клічуць у карагод!
*(Раздаецца шум: гэта скрозь натоўп прабіраецца Ляшачка.)*

***Ляшачка.***

Ну, чаго? Чаго штурхаешся? *(Далей — на эстрадзе.)* Усе мае харошанькае адзенне пакамечылі.Мяне — душачку, добрую дзевачку, патаўклі! Гэта ўсё дзяўчынкі завідушчыя не хацелі мяне пусціць, бо я надта прыгожая! Праўда, дзеці?.. Ай, вой, паглядзіце: гэта ж ялінка! І чаго толькі няма на яе галінках! Няма цукерак! Так? Няма талерак! Так? Няма блюкучых шарыкаў!? *(Ёсць!)* Шкляных ліхтарыкаў!? *(Ёсць!)* Вой, дзіва якое: зайцы на ёлцы і ў карагодзе пад елкай, ліскі ды мядзведзі, Снягуркі ды сняжынкі. І ў зале, і на ялінцы! А... а... гэта што за цуд такі заморскі?!
*(Паказвае на Кузю.)*

***Кузя.***

Дзівіся, Снягурка, дзівіцеся, школьнікі, якія ў мяне цудоўныя штонікі!
Я на Ігрышча хадзіў,
Па модзе штонікі ўкараціў.
Я сярод вас наймаднецкі!
А разумны! Што сам Жванецкі!

***Снягурка.***

Не хваліся, Кузя! Хай цябе дзеці пахваляць!

***Кузя.***

Можа і дзеці гэтыя таксама ўсе разумнікі?.. Тады адкадкажыце мне, калі ласка, хто
На ўсе рукі майстар здатны,
Ён дарожнік, ён і шкляр,
І мастак з яго выдатны,
І цудоўнейшы цясляр,
Раку за ноч замураваў
І вокны ўсе размаляваў.
Вось працаўнік ён, вось мастак!
Завуць яго... Хто скажа як?.. *(Мароз!Дзед Мароз.)*

***Ляшачка.***

Чаго крычыце так моцна? Зараз Дзед Мароз пачуе, прыйдзе сюды і ўсіх памарозіць!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Снягурка.***

Ты што, Ляшачка! Дзеці сюды прыйшлі, каб з добрым, Марозам сустрэцца, а ты іх палохаеш! Ды вось нешта не едзе да нас дзядуля. Дзядзька Снегавік, ці не ведаеш, чаму Дзядулі Мароза няма?

***Снегавік.***

Не хвалюйся, пляменніца! Зараз мы з дзятвой паклічам твайго дзеда! Як я падыму ўгору рукі *(паказвае)*, дык дзеці гучна скажуць: Дзе ты, добры Дзед Мароз? А ну-тка, дзеці, парэпеціруем! Добра атрымоўваецца! Увага! Гукаем!

***Дзеці.***

Дзе ты, добры Дзед Мароз?

***Снегавік.***

Можа ў лесе ты замерз?
Што да нас ты не прыходзіш?

***Снягурка.***

Ці валёнак не знаходзіш?
Ці вавёрка спрытнай лапкай
У цябе схапіла шапку?

***Дзеці.***

Дзе ты, добры Дзед Мароз?
*(Звіняць званочкі.)* ***Снягурка.***

Коні імчацца! Што за крос!
Гэта едзе

***Дзеці.***

Дзед Мароз!

***Скамарох 2.***

І на ранішнік да нас прыйдзе Дзед Мароз як раз!

*(Музыка. У суправаджэнні Снягуркі, сняжынак Дзед Мароз абыходзіць залу, вітаецца з гасцямі, з'яўляецца на эстрадзе. З прывітаннямі яго сустракаюць усе персанажы прадстаўлення.)*

***Дзед Мароз.***

Год за годам — карагодам,
І ўжо сёння з Новым годам
Я сардэчна, аддушы
Вас віншую, малышы!
А чаго ж я вам жадаю?
Зараз, зараз прыгадаю...
Каб бадзерымі былі вы,
Каб разумнымі раслі вы,
Каб прынёс вам Новы год
Многа радасных прыгод
І здароўя ў вашы хаты,
Каб былі здаровы самі,
Каб былі здаровы мамы,
Каб былі здаровы таты,
Каб не ведалі напасці,
Каб шчаслівым кожны рос!
З Новым годам! З новым шчасцем
Вас віншуе Дзед Мароз!
*(Музыка. Дзд Мароз кланяецца.)*

***Скамарох 1.***

Новы год! Новы год!

***Скамарох 2.***

Каля елкі карагод!

***Скамарох 3.***

Дзед Мароз яго вядзе.
Снег блішчыць у барадзе!
*(Карагод.)*

***Кузя.***

Водзіць з намі карагод
Сам Мароз-дзядуля.
Многа казак у яго
І вясёлых гульняў!

*( Дзед Мароз, Снегавік і Снягурка праводзяць гульню "Два Марозы".)*

***Ляшачка.***

Вой, які гармідар падняўся! Кузечка, будзь сябрам, згуляй з гэтымі крыкунамі ў маўчанку!

***Кузя.***

Добра! Згуляем! Увага, мае дзетачккі!
Я ішоў з Дземяшоў.
Гэта было ўночы.
Сядзіць жаба на калку,
Вылупіўшы вочы.
Хто першы крыкне,
Той жабу лыкне!
*(Вядзе гульню. Скамарохі дапамагаюць.)*

***Ляшачка (раптам крычыць).***

А вось ен крыкнуў, жабу лыкнуў! Дзед Мароз! У зале было ціха, а вось ты, маленькая, крыкнула, а значыцца і жабу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лыкнула! Ну-ну, не крыўдуй: гэта ж гульня!

*(Ляшачка і Кузя вядуць зацею "Танчым" і карагод "Усе разам мы прысядзем".)*

***Снегавік.***

Ну вось: гулялі з дзецьмі, спявалі, танчылі, а пазнаеміцца забыліся.

***Кузя.***

Мяне завуць Кузя. А вас? Грамчэй!.. Яшчэ грамчэй!..

***Ляшачка.***

Не, нічога не зразумела. Давайце зробім пераклічку. Наташы есць?.. Сашы есць?.. Дзімы?.. Максімы?.. Светы?.. Катлеты?.. Алёшы?.. Галешы?.. Цукеркі?.. О-го! І катлеты ёсць, і галёшы, і цукеркі! Я надта цукеркі люблю!

***Дзед Мароз.***

Я люблю дзецям задаваць цікавыя пытанні. Адкажыце-тка мне:

—У якой казцы сустракаюцца разам усе 12 месяцаў? Хто напісаў гэту казку?*(" 12месяцаў". С.Маршак.)*

—Хто напісаў для нас з вамі казку "Пані Мяцеліца"? *(Браты Грым.)*

—А "Снежную каралеву"? *(Г.Х. Андэрсен.)*

—У якім мультфільме галоўныя героі спяваюць песеньку "Расскажи, Снегурочка, где была..." *("Ну, пачакай".)*

—Гераіня якой цудоўнай казкі Аляксандра Мікалаевіча Астроўскага прысутнічае сёння на нашым святе? *(Снягурка.)*

***Скамарох 1.***

Калі б не было вады,
Не было б і кружкі,
Калі б не было Снягуркі,
Хто б нам спеў частушкі.

***Снягурачка.***

Галасочкам не хвалюся,
Так пяю, як можацца,
Зараз песню заспяваю,
А вы мне паможыце.

Хто гэта мне падпявае? *(Прыслухоўваецца.)* Сябры мае, ці вы чуеце званочкі? Гэта ж едзе Каляда на сівенькім канёчку, на маляваным вазочку!

***Дзед.***

Дзень добры ў хату! Іду ад пана нашага. Ідучы, пытаю, што сказаці маю свайму пану Году, што носіць бароду шыроку, як лапата, сіву ды касмату. Ці шырокі сцены, каб нам патанцаваці? Ці добрыя гаспадары, каб пачаставаці?

Ну-ка, каза, стань, расхадзіся,
Пану хазяіну пакланіся,
Пані хазяйцы пакланіся,
Каб ласкавая была,
Каб шчодрая была,
Каб унеслі каўбасу
Ды кусок сала,
Каб каза вясялей стала!

***Маладзіца.***

Дзе каза ходзіць,
там жыта родзіць,
Дзе каза рогам,
там жыта стогам!

*(Маладзіца вядзе карагод "Пакажы, вясёлы козлік... ". Каза з дзецьмі танчыць.)*

***Дзед.***

Адпачні, казанька! А вы, музыканцікі, пагуляйце-тка нам. Хай маладзічанька карагод завядзе!

*(Грае шумавы аркестр. Усе вядуць карагод "Дзе хадзіў карагод".)*

***Цыган.***

Кланяюся вам нізка, і Мішка таксама кланяецца. А цяпер, Мішачка, пакажы, як Ляшачка ходзіць. А як Снягурка танцуе? Малайчына! А цяпер запрасі ўсіх танцаваць!

А вы, дудачкі, іграйце, іграйце
А вы, дзевачкі, гуляйце, гуляйце,
А вы, хлопчыкі, свісціце, свісціце,
А вы, дзетачкі, пляшыце, пляшыце!

*(Усе персанажы прадстаўлення пабралі дзяцей за рукі, утварылі маленькія кольцы ды танцуюць польку "Танцавала рыба з ракам".*

*Мішачка ды Козанька абыходзяць гасцей, падаючы мех для пачастункаў. Кланяюцца, адыходзяць убок.)*

***Дзед.***

Ішла Каляда па вуліцах да дзетак на свята навагодняе! Ды Каляду трэба частаваць. Казе ды Мішачку грошы ды цукеркі ў торбачку кідаць, а яшчэ кідаць цукерачкі, ды каўбаску на талерачцы, пернікі, сушкі, пірагі, ватрушкі!

А вы ўсе здаровы бывайце

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Ды праз год нас чакайце!

*(Каляднікі з песняй "Калядачкі, бліны-ладачкі"адыходзяць.)*

***Снегавік.***

Сег мільгае карагодам,
А сцюдзёны вецер сціх… .

***Усе.***

З Новым годам! З Новым годам
Мы віншуем вас усіх!

***Снягурка.***

Хай дарогі ўсе на свеце
Вам адкрыюцца ў жыцці,
Мы жадаем шчыра, дзеці,

***Дзед Мароз.***

Як хутчэй вам падрасці.
Развітацца час мне з вамі,
Адысці ў мінулы год,
Бо зусім не за гарамі

***Усе.***

Году Новага прыход!

*(Гучыць марш. З'яўляецца Новы год.)*

***Новы год.***

Ад Камчаткі, Сахаліна
Я да вас ішоў няспынна!
Праз тайгу, даліны, горы,
Неабсяжныя прасторы!
Зазірнуў у кожны кут.
І, нарэшце, у вас я тут!
О, Год Стары! У хвіліну гэту
У цябе прыму я эстафету!

***Дзед Мароз.***

Вось табе мой посах, каб было лягчэй вандраваць па Зямлі. А вось і мех мой для падарункаў: ён табе спатрэбіцца праз год, калі ты станеш Старым годам.

*(Кланяецца Новому году, кладзе паклоны на тры старонкі адыходзіць.)*

***Кузя.***

Пасінеў на рэках лёд,
Неба ў ясных зорках.
Зноў прыйшоў к нам Новы год
З песнямі і ёлкай!

***Новы год.***

Дарагія сябры! Віншую вас з навагоднім святам! Жадаю здароўя, шчасця! Няхай добры настрой і вясёлыя агеньчыкі ў вашых вачах ніколі не гаснуць!

Прашу не забывацца, што вы ў сваей хаце, і весяліцца ад душы!

***Скамарох 1.***

Не сумуеце, дарагія хлопчыкі?

***Скамарох 2.***

А вы, мілыя дзяўчынкі?

***Скамарох 3.***

Як ваш настрой, папы і мамы?

***Разам.***

Запрашаем на навагоднюю праграму!

***Скамарох 1.***

Для дзяцей і дарослых,

***Скамарох 2.***

Невысокіх і рослых,

***Скамарох 3.***

Для старэнькіх і маладзенькіх,

***Разам.***

Тоўсценькіх і худзенькіх!

*(Канцэрт.)*

***Скамарох 1.***

А цяпер вам наша развітальнае слова.

***Скамарох 2.***

Бывайце, сябры, вы тройчы здаровы!

***Скамарох 3.***

Жыць вам, любыя, і не хварэць!

***Разам.***

Дабрэць, не старэць, разумнець!

*(Музыка. Персанажы, развітваючыся, адыходзяць. Свята скончана.)*

## *Добры вечар таму, хто у гэтым даму*

Пляцоўка ўпрыгожана ручнікамкі. На задніку знаходзіцца васьмівугольная зорка. На пляцоўцы стаіць стол з пачастункамі. Гучыць тэма беларускай народнай песні "Пайшла Каляда". На пляцоўку, прытанцоўваючы, выходзіць Шчодра. Музыка сціхае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Шчодра.***

Добры вечар! Шчодры вечар!

Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!

А людзей тут цераз край.

Хоць ты лыжкай мяшай!

А ці рады вы мне?

Калі вы мне рады,

Я вам да парады!

Са снятам вас, даражэнькія, с Калядамі. Пасля Піліпаўскага посту пачыналіся святочныя дні і вечары. Сімвалічнай стравай гэтых вечароў была куцця. Куццю абавязкова гатуюць, яна самая галоўная страва. Есць посная куцця і багатая куцця.

А якія стравы гатаваліся на посную куццю? Хто ведае? За кожны правільны адказ даюцца баранкі.

А на багатую куццю, у адрозненне ад поснай, гатаваліся мясныя стравы. Хто ведае, якія стравы гатавалі на багатую куццю?

Тым, хто правшьна адказаў, даюцца цукеркі.

***Шчодра,***

На багатую куццю, калі ўжо ўсе стравы, у тым ліку і куцця, стаялі на стале, гаспадар адчыняў вакно і запрашаў да вячэры мароз: “ Мароз, мароз! Хадзі куццю есці! Каб ты не марозіў ячменю, проса і ўсяго, што мне трэба пасеяць". Гаспадыня таксама запрашала мароз куццю есці: "Мароз, мароз! Хадзі куццю есці! Каб ты не марозіў гуркоў, цыбулі і ўсяго, што мне трэба пасадзіць".

Вось так, мае даражэнькія!

***Шчодра.***

А зараз, хто атрымаў баранкі і цукеркі, хуценька падыходзьце да мяне.

*(Гледачы падыходзяць.)* ***Шчодра.***

А пасля вячэры, калі гаспадары і гаспадынькі кладліся спаць, то моладзь збіралася ў хаце і ладзіла ігрышчы. Пачыналіся ігрышчы з танцаў. Давайце і з вамі патанцуем.

Хлопцы, паглядзіце, якія прыгожыя дзяўчаткі стаяць! Бярыце прыгажунь і ну ў пляс!

Музыка, зайграй нам вясёлую мелодыю!

*(Гучыць музыка, усе танцуюць.)* ***Шчодра (пасля танца).***

Малайцы, добра так танцавалі, што нават не супакоіць вас. А зараз я прапаную пагуляць. Хочаце пагуляць ці не?

*Гучаць адказы.*

Калі хочаце, дык давайце пагуляем. З дапамогай гэтай гульні мы зможам выявіць самага хуткага. А гульня гэта называецца "Рэмень". Слухайце, калі ласка, уважліва ўмову гульні.

Станавіцеся ўсе ў кола, трымайцеся за рукі. Аднаму з вас я дам скураны рэмень. Той чалавек, у якога рэмень ходзіць паза колам. Хто яму спадабаецца, ціхенечка б'е таго па нагах рэменем, а сам уцякае. Той, каму ўдарылі па нагах, павінен даганяць першага. Калі дагоніць, то цалуюцца, а калі не — рэмень аддаюць іншым. Зразумелі? Тады пачнем гуляць. Музыка, зайграй нам вяселую мелодыю!

*(Гучыць вясёлая музыка. Пад музыку ідзе гульня "Рэмень".)*

***Шчодра (пасля гульні).***

Ай, што за спрытныя хлопцы, а дзяўчаты, нібы маладыя козанькі. Адным словам, малайцы! Частуйцеся, калі ласка, шаноўныя, і сядайце на свае месцы.

***Шчодра.***

Калі трошачкі стаміліся, то, мо, самы раз загадкі паадгадваць? Зараз я загадаю вам загадкі. А хто ведае, калі ласка, падымайце руку і адказвайце.

*Вось слухайце ўважліва:*

1. Без рук, без алоўка, а маляваць умее. *(Мароз)*
2. Ляцяць птушкі без крыл, а садзяцца без ног. *(Снег)*
3. Зімой расце коранем уверх, а вясной памірае. Хто адгадае? *(Лядзяш)*
4. На вадзе родзіцца, а вады баіцца. *(Лёд)*

За кожны правільны алказ даюцца цукерачкі.

***Шчодра (пасля загадак).***

Ведаеце, шаноўныя, раней каза лічылася сімвалам урадлівасці. “ Дзе каза хвастом — там жыта кустом. Дзе каза рогам — там жыта стогам”. Вось так, шаноўныя. І хто з казой патанцуе, той увесь год шчаслівы будзе. А зараз, хто атрымаў цукеркі, выходзьце да мяне.

*(Гледачы выходзяць.)*

***Шчодра (пасля выхаду гледачоў).***

А якія хлопцы прыгожыя! А дзяўчаты, нібы макаў цвет!

А ці хочаце вы пагуляць? Калі хочаце, то я зараз прапаную

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вельмі вяселую музычную гульню. А называецца яна "Як хадзіў наш казёл". Спачатку давайце вывучым словы з песні:

Як хадзіў наш казёл ды па
ельнічку.
Хлопаў, дзевак сабіраў
На вяселлечка.
Выбіраю и цябе-бе-е-е.

Усе вывучылі? Слухайце далей. Адзін з вас будзе "галавой", усе астатнія стновяцца адзін за другім. Станавіцеся, мае даражэнькія. Паўторым словы. На апошняе слова "галава" павінна выбраць з гледачоў таго, хто яму спадабаўся. Той чалавек становіцца. А я зараз з гледачамі будзем лічыць: "Раз, два, тры", на лік тры "галава" становіцца хвастом. І так далей працягваецца гульня. Толькі заўвага! Тыя, хто з'яўляюцца "хвастом", павінны выконваць толькі тыя рухі, якія выконвае "галава". Зразумелі?

***Шчодра.***

Музыка, зайграй вясёлую мелодыю.

*( Гучыць музыка. Удзельнікі спяваюць словы з песні "Як хадзіў наш казел. Ідзе нпд музыку гульня.)*

***Шчодра (пасля гульш).***

Вось якмя малайцы. Спадабалася гульня?

*Гучаць адказы.*

Не стаміліся? Калі не, то давайце паглядзім, як вы спяваеце прыпеўкі.

А вы, шаноўныя *(звяртаецца да гледачоў)*, выберыце, калі ласка, лепшага з іх спевака.

Пад музыку ўдзельнікі спяваюць прыпеўкі:

**1.** Не глядзіце на мяне,
Што я худавата.
Мама сала не дае.
Я не вінавата.
**2.**Ой, дзеўкі, бяда.
Куды мне дзявацца?
Па калена — барада,
Лезе цалавацца.
**3.** Вецер вее, павявае,
Шыбачкі хютаюцца.
Прыйдзе мілы пацалуе —
Губачкі зліпаюцца.
**4.**Па балоце бусел ходзіць —
Чырвоная дзюбачка.
Прыйдзе мілы пацалуе,
Скажа: "Мая любачка".
**5.**Села баба на курыцу,
Выехала на вуліцу.
А мужчыны не пазналі —
Усе шапкі паздымалі.
**6.** Знасіў боты за два злоты,
Да дзяўчыны ходзячы.
Знасіў шапку на дзесятку,
У парозе стоячы.
**7.** Цераз рэчку пераедзем,
Беражком пайдзём пяшком.
Чужых дзевак абгаворым,
Сваіх замуж аддадзём.

***Шчодра (пасля прыпевак).***

Ну, малайцы, так спявалі, што ногі самі ў пляс ідуць. А вы, даражэнькія *(звяртаецца да гасцей)*, выберыце, калі ласка, самага здатнага спевака.

*(Ідзе выбар. Лепшы частуецца баранкамі. )*

***Шчодра***.

А ці ведаеце вы, што напярэдадні Новага года існуе звычай красці. Таму кожнага, хто прыходзіў у хату вечарам, прымалі за злодзея! Хавалі рэчы. Крадуць нават скаціну. Але на другі дзень прыносяць і прыводзяць да гаспадара ўкрадзенае, і той павінен іх частаваць. Вось так, мае даражэнькія. Не стаміліся? Хочаце яшчэ пагуляць? Калі хочаце. Давайце пагуляем. Гульня называецца "Шкута". Станавіцеся, калі ласка, у паўкола. Вось бачыце, у мяне ў руках пятак, ды не медны, а залаты. Зараз я пайду паўз паўкола, ды гэты залаты каму-небудзь з вас аддам. Трэба выбраць таго, хто знойдзе гэты залаты.

*(Ідзе выбар. Выбралі.)*

Слухайце далей. Той, каго выбралі, павінен знайсці залаты, калі знойдзе, то становіцца на мае месца, а той, у каго ён быў, пільнуе. Трэба таксама казаць словы:

Шкута ідзе, золата нясе.
А хто адгадае,
Той вялікае шчасце мае.

*(Пад музыку ідзе гульня "Шкута".)*

***Шчодра (пасля гульш).***

Малайцы, частуйцеся, калі ласка, баранкамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У нашых продкаў была яшчэ адна самая любімая гульня. Яна называлася "Ката пячы". Ведаеце такую гульню? А, можа хочаце пагулять? Калі хочаце, давайце пагуляем. Вось наш кот, ён знаходзіцца на высокім шасце. Вушы і ногі з сала, а хвост з каўбасы. Зараз паглядзім каму дастанецца галоўны прыз —пірог з макам. Станавіцеся ў дыяганаль. Адзін за другім разганяйцеся і скачыце. Паспрабуйце ротам дастаць хвост. Трэба таксама казаць словы "Еду з кута на ката". Калі ласка, мае даражэнькія, паспрабуйце дастаць і адкусіць хвост ката, і атрымаеце галоўны прыз. Гэй, Музыка, зайграй самую вяселую мелодыю. А мы пачынаем гульню.

*(Пасля гульні пераможца частуецца пірагом.)*

***Шчодра.***

Шаноўныя, а ці ведаеце вы што ўсе ігрышчы па традыцыі заканчваліся вясёлымі скокамі і танцамі. Так давайце і мы,людцы даражэнькія, будзем захоўваць традыцыі нашых продкаў і скончым нашае ігрышча танцамі. Калі ласка. Музыка, заиграй нам “Полечку”.

*(Гучыць "Полечка", усе удзельнікі танцуюць.)*

***Шчодра(пасля танца).***

А я вось выбрала лепшую пару. Хай у вас будзе шчасце, здароўе, каб гаспадарка вялася і грошы былі.

Каб прыпёс Год Новы вам
Дабрабыт і плен.
Многа радасці, веру светлых дзён.
Няхай збудзецца,
Што жадаецца.
Што задумана — прыдбаецца.
Усяго вам добрага!

*(Пад музыку Шчодра выходзіць.)*

## ***А ў нас сёння Коляда...***

Для стварэння святочнай атмасферы гучыць беларуская музыка. Адчыняецца генеральная заслона. На задніку — выява Каляднай зоркі. Гучаць пазыўныя свята. На сцэне з трох бакоў з'яўляюцца Каляднікі. Музыка мікшыруецца.

***1 каляднік.***

Паехала Каляда з канца ў канец!

***2 каляднік.***

На Каляды калядуйце! Піць і есці не шкадуйце!

***3 каляднік.***

Хай адрозніць Каляда, дзе гарэлка, дзе вада!

***1 каляднік.***

Шчадруйцеся, шаноўныя! Жывіце год да ста так!

***2 каляднік.***

Хай едзе ў вашыя двары прыбытак і дастатак!

***3 каляднік.***

І доля, і гарэлка хай будзе не горкай!
Хай свеціць вам шчасцем!

***Разам.***

Калядная зорка!

*(Гучыць музыка. Зазывалы пакідаюць сцэну. Іх змяняюць дзяўчаты каляднымі карагодамі. З карагода выдзяляюцца дзве дзяўчыны— вядучыя. Усе астатнія сыходзяць са сцэны.)*

***1 Вядучая.***

Добры вечар, шчодры вечар!
Добрым людзям на здароўе!

***2 Вядучая.***

У Калядны шчодры вечар
Усім вам шчасця і здароўя!

***1 Вядучая.***

Вітаем вас, шаноўныя, на нашым свяце!

***2 Вядучая.***

Шчыра запрашаем вас
З намі калядаваці!

***1 Вядучая.***

А каб калядаваць, трэба ж нешта пра Каляды ведаць!

***2 Вядучая.***

Усім вядома, што Каляды святкуюць з 25 снежня па 7 студзеня. А адкажыце, даражэнькія, якая магічная страва гатуецца на Каляды! *(Адказ: "Куцця").*

***1 Вядучая.***

Так, правільна, куцця. А можа адкажаце, якія тры куцці святкуюць на Беларусі?

*(Адказ: вялікую, шчодрую або богатую і голодную)*

***2 Вядучая.***

Правільна — вялікую, шчодрую і галодную. Пра Каляды вы амаль што ўсё ведаеце. Тады выходзьце да нас усе тыя, хто правільна адказаў. Будзем разам калядаваць. Й

*(Удзельнікі выходзяць на пляцоўку. У гэты момант гучыць вяселая беларуская музыка.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***2 Вядучая.***

Станавіцеся, калі ласка паўколам.

***1 Вядучая.***

Як вядома, у час Каляд жанчыны звівалі клубкі нітак як мага лепей і больш, бо гэта спрыяла росту качаноў капусты. Абыякавая ж звіўка клубкоў знішчала ў валоў сілу ў нагах. Таму, даражэнькія мае, я прапаную вам па прыкладу нашых бабуль звіць клубок. А для дапамогі вы можаце выклікаць сабе па сябру. Каб не толькі капуста расла вялікая, але і каб гаспадарка была добрая.

*( Дзяўчаты запрашаюць хлопцаў. Вядучыя выдаюць удзельнікам пражу з нитак.)*

***1 Вядучая.***

Хлопцы, трымайце пражу, а дзяўчаты па маёй камандзе пачынайце віць клубкі. Раз, два, тры — пачалі!

*( Ідзе конкурс-гульня. Па сканчэнні гульні вядучыя падводзяць вынікі.)*

***1 Вядучая.***

Я бачу, вось гэтая пара звила раней за ўсіх.

***2 Вядучая.***

Але ж вось у гэтай пары атрымалася лепей, значыць, капуста будзе вялкая. Хто ведае, можа, яны там каго-небудзь знойдуць?

***1 Вядучая.***

А ў каго не атрымалася, не хвалюйцеся! Мы запрашаем да нас у госці Козку шэрую. Бо якія ж Каляды без Казы? Яна заўседы была сімвалам урадлівасці.

(Гу*чыць музыка. На пляцоўку выбягае Каза.)*

***2 Вядучая.***

Кажуць, хто з Казою патанцуе, таму ў гэтым годзе пашанцуе. Станавіцеся вакол Казы ў карагод — каб дзетак у вас нарадзілася за год.

*(Гуцыць музыка. Усе ўдзельнікі становяцца ў карагод.)*

***1 Вядучая.***

Каза будзе вам рухі паказваць, а вы за ей паўтарайце, пры гэтым ідучы па кругу. Калі Каза каго-небудзь заказытае, той становіцца замест яе ў круг і паказвае ўжо свае рухі.

*(Ідзь гульня-танец.)*

***1 Вядучая.***

Малайчына, Козачка! Добра паскакала і людзей павесяліла, а зараз ідзі па іншых хатах калядаваць.

***2 Вядучая.***

А госцікі якія малайцы, так добра танчылі, нібы ўсё жыцце ў балетнай школе правучыліся. Але ж мне цікава, ці спрытныя вы да гульняў?

*( Удзельнікі адказваюць.)*

***1 Вядучая.***

Калі так, я прапаную гульню. Вось дзяўчына – вы нібы вішанька, такая ж прыгожая, спраўная. Станавіцеся, калі ласка, на зэдлік. Я даю "вішаньцы" саломінку, якую яна ўвесь час трымае ў вуснах паварочваючы галаву то ў адзін, то ў другі бок. Вось такім чынам (паказвае). А ўсе астатнія будуць вадзіць вакол яе карагод. Як толькі музыка сціхне, хлопцы, якія бліжэй за астатніх стаяць каля "вішанькі" з абодвух бакоў, павінны будуць падскочыць так, каб ухапіць саломінку сваімі вуснамі. Хто першы схопіць, той у якасці падарунка атрымае пацалунак прыгажуні.

*(Ідзе гульня "Вішанька ".)*

***1Вядучая.***

Вось якія хлопцы спрытныя, атрымлівайце ўзнагароду ад дзяўчыны.

***2Вядучая.***

Аднак не хвалюйцеся, хто застаўся без пацалунку. На Калядках усе дзяўчаты і хлопцы павінны быць абцалаваныя. Таму хуценька станавіцеся ў круг, ды так, каб хлопец стаяў паміж дзяўчат — сусед каля суседкі. Я буду стаяць у сярэдзіне круга і кружыцца вакол сябе супраць сонца. А вы - па ходу сонца, узяўшыся за рукі і кажучы наступныя словы:

Ты кружысь, ваўчком кружыся,

І каля мяне спыніся.

На каго я на апошніх словах пакажу рукою, у таго і спытаю:

- Сусед, ці любіш суседку?

*(Вы можаце адказаць: "Не люблю ".)*

А каго ты любіш?

Вы адказваеце, напрыклад, Алену. Тады Алена і суседка павінны памяняцца месцамі, але ў гэты час я сама магу заняць месца Алены. Тады суседцы прыйдзецца весці далей гульню. Калі ж хлопец сімпатызуе сваей суседцы, то адказвае: "Люблю" і цалуе яе *(дзяўчына будзе стояць з ім пакуль яе не выкліча хто іншы).*

*(Ідзе гульня.)*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

***1 Вядучая.***

Добра, добра! Сусед кахае суседку. Так і павінна быць у жыцці. Але ж цікава даведацца, каго на самай справе кахаюць нашыя ўдзельнікі. Хто ў нас менш за усіх цалаваўся? Хадзі сюды. Зараз я завязваю табе вочы і пытаю, ці любіш ты яе, і на каго-небудзь паказваю. А ты адказваеш "так" ці "не" да той пары, пакуль не знойдзеш сабе каханую.

*(Ідзе гульня. Пасля таго, як знайшлі каханую, вядучая пытаецца)*

***1 Вядучая.***

А куды ж ты хочаш яе пацалаваць: сюды *(і паказвае на руку, ці на нос і інш., пакуль не адкажа “так”).*

*(Пасля чаго з вачэй здымаюць хустку, вядуць да той ці таго, каго выбраў, і цалуе.)*

***1 Вядучая.***

Вось твая абраная, цалуй яе, калі ласка, туды, куды хацеў.

*(Называе частку цела. Гульня паўтараецца некалькі разоў.)*

***2Вядучая.***

Дзякуй вам вялікі, шаноўныя, за ўдзел у нашых гульнях.

***1 Вядучая.***

Мы спадзяемся, што сёння ў Калядны вечар вы знайшлі сваю каханую ці каханага.

***2 Вядучая.***

А каб замацаваць ваш саюз назаусёды і каб добры настрой не пакідаў вас ніколі...

***1 Вядучая.***

Мы запрашаем вас на польку-весялуху!

*(Гучыць полька. Усе танцуюць. Пасля танца)*

***2 Вядучая.***

Дзякуй даражэнькія! А зараз, хлопцы, вядзіце дзяўчат на іх месца і сядайце побач з імі.

*(Гучыць беларуская лірычная музыка.)*

***1 Вядучая.***

А цяпер пара развітвацца. Мы ўсім вам жадаем жыць-пажываць і дабра нажываць.

***2 Вядучая.***

Хай шчасце вашу хату не мінае!
Каханне хай яе не пакідае!

***1 Вядучая.***

Дай вам жыць у раскошы!
І мець торбу грошай!

***2 Вядучая.***

Каб багатыя былі!
Каб дзеткі здаровыя раслі!

***1 Вядучая.***

Гора чорнага не знайце,
Свайго не цурайцеся,
Праўды трымайцеся!

***2 Вядучая.***

Жыцце любіце, кахайце!

***Разам.***

І на гэтым — бывайце!

*(Паступова даецца музыка. Зачыняецца генеральная заслона.)*

## *Ішла Каляда*

Свята адбываецца на калярыначнай пляцоўцы Камароўскага рынку. У цэнтры плошчы стаіць вялікая ўпрыгожаная ёлка. Каля Дома мэблі, на галоўнай пляцоўцы свята, устанаўліваецца гукавая аппаратура. Сцэна ўпрыгожана вялікай ілюмінацыйнай зоркай. Гучыць фанаграма калядных песень. Удзельнікі фальклорнага фестывалю збіраюцца каля падземнага пераходу на вуліцы В. Харужай, 4.

Гучаць пазыўныя свята. Пачынаецца шэсце калядных гуртоў школ Савецкага раёна. Шэсце ўзначальвае Дзед-Пачынальнік. Далей ідзе Зорканоша, музыкі, пераапранутыя калядоўшчыкі. З песнямі і танцамі ўдзельнікі шэсця пачынаюць рухацца ад падземнага пераходу па вуліцы Харужай і накіроўваюцца да галоўнай пляцоўкі свята. Удзельнікі шэсця па камандзе Дзеда-Пачынальніка робяць прыпынак каля ёлкі і ствараюць вялікі карагод у гонар свята Каляды.

***Дзед-Пачынальнік.***

Станавіцеся, людцы, у карагод,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэта свята мы чакалі цэлы год.

Трэба шчыра Каляду павітаці,

У яе гонар песню праспяваці!

Удзельнікі шэсця ствараюць карагод вакол ёлкі пад песню "Ай калядачкі".

Ай, калядачкі, бліны-ладачкі.
Ай, рана-рана, бліны-ладачмкі.
Ай, калядачкі пабліжыцеся,
Ай, рана-рана, пабліжыцеся.
Ай, каубасачкі паніжыцеся,
Ай, калядачкі пабліжыцеся.

***Дзед-Пачынальнік.***

А каляда паехала далей! Ніводны двор не мінае. Са святам усіх вітае!

Удзельнікі шэсця накіроўваюцца да цэнтральнай пляцоўкі, дзе іх ужо сустракае Шчодра. Гучыць песня "Шчодры вячор".

***Шчодра.***

Ой, вясёлая тая вуліца, куды калядкі ідуць! Добры дзень, паважаныя сябры! Вельмі прыемна, што вы сёння прыйшлі на гэтую плошчу, каб сустрэць разам адно з самых чароўных свят — Каляды! А з'явілася гэта свята многа год таму назад, і нашыя бабулі і дзядулі называлі Калялы — святам Сонца. Іменна ў гэты час Сонца , якое так патрэбна для людзей, зямлі і жывел, паварочвае на лета. Нашы продкі з нецярплівасцю чакалі гэтага свята, хадзілі з песнямі па хатах, ладзілі гульні, віншавалі ўсіх з Калядамі!

Бачыце! Да нас прыехала Каляда вясёлая здалёку-зглыбоку, з сівых давен. А колькі сонцаў узышло! Гэта мы калянымі зоркамі вітаем Сонцазварот. *(Звяртаецца да гледачоў.)* Давайце сустрэнем гэтае свята прыгожа ды спеўна, як дзяды, бабулі страчалі. Давайце будзем вяселымі, дружнымі, добрымі. Бо сёння ўсе мы каляднікі – вяселыя ды гаманкія, на дабро не скупыя!

*(З песняй "Пайшла Каляда" на сцэну падымаецца калядны гурт Беларускага універсітэта культуры.)*

Пайшла Каляда калядуючы,
Гэй, Каляда, Каляда.
Пайшла Каляда ў адну хату.
Гэй, Каляда, Каляда.
А ў гэтай хаце куццю таўкуць.
Пайшла Каляда ў другую хату,
А ў гэтай хаце серабро звініць.
Пайшла Каляда ў трэцюю хату,
А ў гэтай хаце сала шыпіць.
Пайшла Каляда ў чацвёртую хату,
А ў гэтай хаце золата блішчыць.
Пайшла Каляда ў пятую хату,
А ў пятай хаце каўбасу пякуць.
Гэй, Каляда, Каляда!

***Шчодра.***

А ў нас сёння сход Каляд, сабірайцеся ўсе ў рад.

Адну зіму песні пяяць, будзем іх у рэшаты складаць,

У рэшаты складаць, ды вас, паночкі ды паненкі, частаваць.

Куццю варыці ды на ей варажыці.

***Шчодра.***

Танчыць, у гульні гуляць, ды з калядам...

***Усе.***

Паздраўляць!

***Шчодра.***

Пайшла Каляда, Каляда,
Вінаградная, красная, зялёная.
Выхадзілі, гулялі калядоўшчыкі,
Прыхадзілі, прыгулялі к гаспадараву дварцу.

***Усе.***

А дзе ж самі гаспадары?

(*Калядны гурт разыходзіцца, пад музыку выходзяць гаспадары: Лявон, Лявоніха і іх дачка Зосечка.)*

***Усе.***

А вось і гаспадары: Лявон, Лявоніха і іх дачка Зосечка!

***Шчодра.***

Ой, добры вечар, хазяін. Засцілай сталы, кладзі пірагі. Да будзе к табе да трое гасцей: а першая госць — жарка сонейка, а другая госць — ясен месячык, а трэцяя госць — дробен дожджычак. Чым пахваліцца жарка сонейка? ***Сонейка.***

Як узыйду я рана на зарэ — узрадуюцца неба і зямля, неба і зямля і ў лузе трава.

***Шчодра.***

Чым пахваліцца ясен месячык?

***Месячык.***

Як узыду я позна з вечара — узрадуецца купец у дарозе, а



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звер у дуброве.
***Шчодра.***
Чым пахваліцца дробен дожджычак?
***Дожджычак.***
Як узыду я рана і з вясны — узрадуецца жыта, пшаніца, усяка пашніца.
*(Гурт спявае "На нова лета ".)*
На нова лета хай родзіцца жыта
Шчодры вечар, багаты вечар.
Жыта, пшаніца, усякая пашніца.
Жадаем табе, слаўны гаспадару.
Піва варыці, сынкоў жаніці.
Пасаг збіраці, дочак выдаваці.
Залезь на баляску, дастань каўбаску.
Стань на драбінку, дастань саланінку.
Кошычак маку да таго прысмаку.
Шчодры вечар, багаты вечар!
***Шчодра.***
Шчадрыцеся, гаспадары, жывіце год да ста так,
Хай едуць у вашыя двары прыбытак і дастатак!
А каб добра было жыць, трэба нам паваражыць!
Нясі, Лявоніха, калядную куццю, зараз паглядзім, ці чакае цябе дабрабыт у наступным годзе.
*(Лявонха выносіць куццю, якая стаіць на падносе з саломінкамі, покрытымі ручніком. Зосечка адчыняе накрыйку, усе глядзяць у гаршчочак.)*
***Шчодра.***
Ой, добрая куцця атрымалася — разварыстая, а пах які — проста цуд. Чакае цябе, Лявоніха, дабрабыт на увесь год! *(Звяртаецца да гаспадара)* А ты, гаспадар, чаго стаіш, з нагі на ногу перамінаешся? Хадзі сюды, зараз твая чарга — цягні саломінку з-пад ручніка, і даведешся, які ўраджай будзе.
*(Лявон цягне саломінку і дастае доўгую, поўную зярнят.)*
***Шчодра.***
Гляньце, якая доўгая ды поўная зярнят саломінка! Радуйся, гаспадар, весяліся, ды добраму ўраджаю дзівіся! *(Звяртаецца да гледачоў.)* А вы, даражэнькія гаспадарочкі, паспытайце свій лес, паваражыце на ўраджай і дабрабыт.
(*Лявоніха падыходзіць да гледачоў і прапануе цягнуць саломінку.)*
***Лявоніха.***
Цягні, калі ласка, гаспадар, саломінку.
*(Гаспадар цягне поўную зярнятак саломінку.)*
***Лявоніха.***
Ой, добрая саломінка, адразу бачна — сапраўдны гаспадар, дык і ўраджай у цябе будзе багаты, а адсюль і шчасце ў тваім доме.
*(Лявоніха падыходзіць да другого гаспадара.)* ***Лявоніха.***
Цягні і ты, гаспадарок, саломінку.
(*Гаспадар цягне доўгую, але пустую саломінку.)*
***Шчодра.***
А вам, шаноўны, трэба добра працаваць, каб вялікі ўраджай сабраць.
( *Лявоніха ідзе да трэцяга.)*
***Лявоніха.***
А зараз ваша чарга, цягніце саломінку.
*(Гаспадар цягне маленькую пустую саломінку.)*
***Шчодра.***
Ой, не пашанцавала! Але не хвалюйцеся: не народзіцца хлеб, дык народзіцца бульба. Дзякуй, даражэнькія, што паспыталі свій лес, і не сумуйце, калі крышачку не пашанцавала. Памятайце, хто старанна працуе, той мір мацуе! А мы ведаем, што ў пана гаспадара дачушка есць, а прыгажунечка, нібы каліна красная. Выйдзі, Зосечка, павярніся нам, калядоўшчыкам, пакланіся.
*(Выходзіць Зосечка. Калядны гурт спявае "У лузе каліна".)*
А ў лузе, каліна красна. Шчодры вечар, каліна красна.
Ой, ясней красней, Зосечка, у таты.
На двор хадзіла — увесь двор скрасіла.
У сені ўвайшла — сені заззялі.
У хату ўвайшла — паны стаялі.
Паны стаялі, шапкі здымалі.
Ўапкі здымалі, у яе пыталі.
Ці ты князеўна, ці каралеўна.
Я не князёўна, не каралеўна.
Таткава дачка красна паначка.
Мамчына дачка, як ягадачка.
Мы ж цябе красну не зневажаем.
І з калядою мы паздраўляем!
***Шчодра.***
Табе, Зосечка-прыгажунечка, песня спета. Песня спета,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ды насупраць лета, каб вялікая расла, ды замуж пайшла, бацьку з маткай вяселлем страсла... А давайце паглядзім, які ў яе муж будзе.

*(Калядоўшчыкі становяцца ў два колы, ідуць у карагодзе і спяваюць.)*

"Пеця, Пеця, Петушок, залаты грабушок,
Маслена галовушка, шоўкава бародушка.
Што ж ты рана ўстаеш, дзеўкам спаць не даеш,
Пеця, Пеця, Петушок, залаты грабушок".

*(Чатыры дзяўчыны выносяць талеркі з вадою, зернем, люстэркам, кнігай.)*

***Шчодра.***

Ну, Пеця, пакажы, які муж будзе ў гэтай прыгажунечкі.

*(Певень падыходзіць да талеркі з зернем, клюе і кукарэкае.)*

***Шчодра.***

Ой, добры мужык будзе, працавіты, а кашалёк дык поўны даляраў. Мабыць, бізнесмен ці рэкецір! Я бачу, што яшчэ шматдзяўчат хочуць паваражыць. Пеця, запрасі вось гэтую прыгажунечку.

*(Певень выводзіць дзяўчыну ў цэнтр карагода, калядоўшчыкі спяваюць "Пеця Петушок", пасля песні' певень падыходзіць да талеркі з люстэркам і кукарэкае.)*

***Шчодра.***

Гляньце, певень люстэрка дзяўбе, а гэта азначае, што будзе прыгожым. Трымай гэтае люстэрка, хай твой хлопец прыхарошваецца, ды на другіх дзяўчат не заглядваецца.

*(Певень запрашае наступную дзяўчыну.)*

***Шчодра.***

А ты, ластаўка, чаму такая сумная? Хадзі і табе паварожым!

*(Певень падыходзіць да талеркі з вадой.)*

***Шчодра.***

Гляньце, певень ваду п'е, мабыць, піць мужык будзе... Але ж не хвалюйся, піць-гуляць, не гора гараваць, хай то будзе не з нягоды, а з шчаслівага жыцця. Трымай гэтую талерачку, хай твой мужык апахмяляецца ды розуму набіраецца.

*(Певень запрашае наступную дзяўчыну.)*

***Шчодра.***

А ты, красачка, даведайся, што за муж табе дастанецца!

*(Певень падыходзіць да кнгі і кукарэкае.)*

***Шчодра.***

Гляньце, певень кнігу дзяўбе. Гэта азначае, што муж твой будз вельмі разумны. Трымай гэтую кніжку, хай твой “прафесар” чытае, ды пра цябе не забывае!

Вось мы і даведаліся, які будзе суджаны, а адкуль ён з’явіцца, хочаце даведацца?.. Лявоніха, нясі сюды калядныя бліны, але класці мы іх будзем не ў рот, а на галаву. Хлопцы, нясіце качаргу, сядуць дзеўкі на яе вярхом і пракацяцца ладком, павернуцца вакол сябе тры разы і скажуць мапчныя словы...

***Усе.***

Што рабілася — разрубісь, што круцілася — раскруцісь,
Што шылася —расшыйся, адкуль будзе мілы, дай знаць!

***Шчодра.***

З якога боку забрэшуць сабакі — адтуль і мілага чакаць.

*(Запрашае дзяўчыну з каляднага гурта.)*

***Шчодра.***

Бачу, Ірыначка вельмі хоча даведацца, з якога боку чакаць! Сядай на качаргу, трымай блінец, пачынаем!

*(Дзяўчына паварочваецца вакол сябе тры разы, гурт кажа магічныя словы, брэша сабака, брэх грубы і здалёк.)*

***Шчодра.***

Нешта зусім не чуваць гэтага сабакі, мабыць няскора з’явіцца, але ты не сумуй, чую, што голас сапраўднага мужчыны. Падрасці крыху, пасаг збяры, а там гдядзі і сватоў сустрэнеш.

Дзяўчатачкі, запрасіце, калі ласка, вунь тую прыгажунечку, хай таксама паварожыць.

*(Дзяўчаты з каляднага гурта запрашаюць гледачоў.)*

Сядай на качаргу, трымай блінец, пачынаем!

*(Чуецца брэх шчаня.)*

Людцы добрыя, хто гэта там цукае і здаецца зусім блізка, мабыць, сёння і знойдзе цябе. А будзе ён з Мінскай вобласці з в. Пухавічы. А зараз я запрашаю ўсіх дзяўчат, якія яшчэ не паваражылі.

*(Дзяўчаты з гурта выводзяць на пляцоўку некалькі дзяўчат.)*

Сядайце хутчэй на качаргу, уладкаваліся? Пачынаем!

*(З розных бакоў чуецца брэх сабак.)*

Ну што, кожная пачула свайго сабаку? Ну вось і добра,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чакайце сваіх суджаных, і яны абавязкова да вас прыйдуць!

Весела музыка йграе,
Усіх на польку запрашае!
*(Усе танчаць польку.)*

***Шчодра.***

Давайце апладысментамі падзякуем студэнтам 114 групы універсітэта культуры, кафедры рэжысуры святаў.

*( Гледачы апладзіруюць.)*

***Шчодра.***

А Каляда паехала далей!
Ні водны двор не мінае,
Са святам усіх вітае!

*(З песняй "Паехала Каляда" калядны гурт Універсітэта культуры накіроўваецца на сезонны рынак, дзе праводзяць гульнёвую праграму "Калядныя варожбы.)*

***Шчодра.***

Дай не адну нядзельку я не даспала, пакуль Каляд дачакалася! Шаноўныя сябры! Павіншаваць вас са святам прыехалі вельмі цудоўныя хлопцы і дзяўчаты — навучэнцы школ Савецкага раёна. Паглядзіце! Тут і гаспадары, і цыганы, і мядзведзь, і конь, і каза, і жораў, і музыкі, адным словам — калядоўшчыкі. Ну, а які гурт сёння на свяце будзе найбольш цікавейшы — вызначыць напрыканцы свята наша журы, з членамі якога я вас і пазнаёмлю:

*Жызнеўская Людміла,* студэнтка кафедры рэжысуры святаў;

*Каваленка Валянціна Пятроўна,* кіраўнік фальклорнага гурта "Валошкі";

*Шэвялёў Уладзімір Мікалаевіч,* галоўны спецыяліст па культуры Савецкага райвыканкама.

***Шчодра.***

Я бачу, нашы дзевачкі спяваць хочуць, нашы хлопчыкі пагуляць хочуць. Запрашаю на сцэну калектыў 130-га ліцэя, кіраўнік Глушаніна Аляксандра Вітальеўна.

*(На сцэне стаіць стол, накрыты ручніком, лава. Гаспадыня папраўляе на стале стравы. Здалёк гучыць мелодыя песні "Паехала Каляда".)*

***Гаспадыня*** *(звяртаецца да гледачоў).*

Шаноўныя сябры! Дзіва-дзіўнае адвечнае адбылося тры дні назад — павярнулася сонца ад зімы на вясну. А пакуль яшчэ стаяць маразы, кружаць мацеліца і завіруха, людзі чакаюць вясну і святкуюць! *(Прыслухоўваецца. Музыка ўзмацняецца.)* Няўжо калядоўшчыкі да мяне завіталі?

*(Гучыць песня "Паехала Каляда", перад сцэнай з'яўляюцца калядоўшчыкі.)*

Паехала каляда з канца ў канец.
Каляда, каляда, калядзіца мая.
Прыехала каляда к Янку на двор.
Калі, Янка, не дасі бочку пшаніцы,
Калі, Янка, нам не дасі младу Ганульку.
Калі гэта не дасі, то трасцу што з'ясі.
Не шкадуй нічога нам, аддавай усе калядам.
Каляда, каляда, калядзіца мая!

***Звяздар.***

Добры вечар у хату.
Нашы ягамосці
Прыбылі да вас сення мы ў госці!

***Механоша.***

Гэй, Гаспадыня, не тамі гасцей!

***Хлопец.***

Бо мы знаем, што сядзіш дома на ўслонцы і лічыш чырвонцы!

***Дзяўчына.***

Не дай нам, Гаспадынечка, доўга стаяці, на тваім двару сняжок таптаці.

***Павадыр.***

Просім выйсці на ганачак, просім вынесці нам падаруначак.

***Гаспадыня.***

Хоць я не багата, а гасцям заўсёды рада.

***Звяздар.***

Чым будзеш частаваць?

***Гаспадыня.***

Было б за што дзенькаваць!

*(Гучыць песня "Добры вечар, гаспадынечка ".)*

Добры вечар, гаспадынечка,
А што ў цябе за навіначка.
Шчодры вячор, добры вячор.
Сорак кароў ацялілася,
А яшчэ сорак назначылася.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гаспадынечка, перапёлачка,
У цябе сырчыкаў поўна полачка,
А ты ж сёння нас частаваць будзеш,
А мы цябе віншаваць будзем!
Каб на лета дачакала,
Калядоўшчыкаў сустракала
Падарачкамі надзяляла!

***Гаспадыня.***

Дзякуй вам, паважаныя, за цудоўную песню. Заходзьце, заходзьце хутчэй, каляда чакае гасцей. Чым маю, тым і прымаю!

*(Калядоўшчыкі падымаюцца на сцэну.)*

***Звяздар.***

Мы не самі прыйшлі, мы казу прывялі. А ну, козанька, пакажы на што ты здольная.

*(На сярэдзіну сцэны выходзіць Павадыр з Казой. Гучыць песня “Го-го-го, каза”. Каза танцуе пад песню.)*

Го-го-го, каза, го-го-го, шэра,
Дзе рожкі дзела, на соль праела.
Лезь, каза, на печ, пакажы чапец.
Лезь, каза, на кут, пакажы хамут.
Дзе каза рогам, там жыта стогам.
Дзе каза хвастом, там жыта кустом.
Дзе каза нагой, там жыта капой.
Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць!

*(Каза валіцца на подлогу і прыкідваецца мёртвай.)*

***Хлопец.***

Устань, козанька, расхадзіся, нашай Гаспадынечцы нізка пакланіся. Да саменькіх ножак, хай дасць піражок!

*(Каза крыху прыпадымаецца і пaглядае.)*

***Дзяўчына.***

Гаспадыня ў рэшаце бліны нам валачэ. Ключыкамі звякае, каморачку адапрэ.

*(Гаспадыня частуе калядоўшчыкаў.)*

***Механоша.***

А за гэты піражок — каб на другі год каласок, а з таго каласка поўна бочка жыта нарасла.

*(Каза падымаецца.)*

***Павадыр.***

Пакланіся ўсім: і старым, і малым.
Закладай свае рогі, падбірай свае ногі.
З гэтай хаты выхадзі, бяду гора вынасі.
Уцякаюць хутчэй з гаспадаравых вачэй!

*(Каза кланяецца.)*

***Звяздар.***

Дай божа табе, Гаспадынечка, і ў каморы, і ў аборы.

***Хлопец.***

А на стайні — вараныя коні!

***Дзяўчына.***

Конікі касаты — цялушачкі рагаты!

***Механоша.***

Авечачкі лахматы, а свіначкі віхраты.

***Гаспадыня.***

Дзякуй вам, калядоўшчыкі, што маю хату не мінулі. Чакаю вас на наступны год!

*(Гучыць песня "Паехала Каляда", калядоўшчыкі пакідаюць сцэну.)*

Выходзіць Шчодра.

***Шчодра.***

Ці падабаецца вам свята, паважаныя гледачы? *(Гледачы адказваюць.)*

Ну кали вы нам рады і мы вам да парады,
То, як кажуць нашы людзі, хай вам даспадобы
Будуць жарты, песні, бо без песні
Жыць няёмка хоць ты трэсні!
А якія ж каляды без песень!

Сустракайце гурт 122-й школы, кіраўнік Жураўлёў Андрэй Валер'евіч.

(*Гучыць песня "Ой калядныя бліны ладныя ". Калядны гурт.Гурт выконвае харэаграфічную кампазіцыю.)*

Ой калядныя бліны ладныя,
Ой лялю рана бліны ладныя.
Ой пшанічныя, дзеўкі пышныя,
Ой лялю рана, дзеўкі пышныя.
Ой аржаныя, хлопцы дурныя.
Ой лялю рана, хлопцы дурныя.
Ой павыбілі дзеўкі сцежачкі
Ой лялю рана, дзеўкі сцежачкі.
Яны ходзячы ў начлежачкі,
Ды муку крупу яны носячы
Ой лялю рана, яны носячы
Музыканціка яны просячы,
Ой лялю рана, яны просячы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хлопец. Прыехала каляда ўвечары,
Прывезла дудак рэшата.
А вы, музыкі, грайце,
А вы, людцы, гуляйце!

***Дзяўчына.***

Я прапаную пагуляць у цікавую гульню, якая называецца "Яшчар". Адзін з хлопцаў, якога я зараз выберу, будзе яшчарам. Ен павінен сядзець у цэнтры кола. А дзяўчаты і хлопцы будуць вадзіць карагод і спяваць:

Сядзіць, сядзіць яшчар гэй нам, гэй.
У залатым крэсле гэй нам, гэй.
Уляскавым кусце.
Бяры сабе жонку,
Каторую хочаш,
Ці то ў чаравічках,
Ці то ў панчошках.

***Дзяўчына.***

Усе дзяўчаты зараз атрымаюць вяночкі. І ў час карагода яны павінны будуць набліжацца да Яшчара. Ён па чарзе будзе здымаць у дзяўчат вяночкі. Так да той пары, пакуль не збярэ ўсіх вяночкаў. Пасля дзяўчаты па адной будуць выпрошваць у яго свае вяночкі. Яшчар павінен рассмяшыць дзяўчат, хто засмяецца, той не атрымае свій вяночак. Калі дзяўчына звяртаецца да Яшчара, то гаворыць словы: Яшчар, панок, аддай вянок. Я ручкі, ножкі мазаліла, свайго вяночка не знасіла.

***Дзяўчына.***

А вы, хлопцы, дапамагайце дзяўчатам карагод вадзіць. Усе зразумела? Тады хай музыкі падыгрываюць, а мы пачынаем гульню.

*(Ідзе гульня "Яшчар ".)*

***Хлопец.***

А ну, музыканцікі! Зайграйце Лявоніху весялей.
Нашых ножак не жалей.
Нашы ножкі не баляць,
Яны хочуць танцаваць!
*(Танец "Лявоніха ".)*

***Дзяўчына.***

А зараз ізноў гуляць будзем. Гэта гульня называецца "Шкута". Вось бачыце ў мяне ў далоні пятак, ды не медны, а залаты. Зараз я пайду пауз паўкола, а ты, Шчодра, глядзі, каму я тэты залаты аддам. Калі ўпільнуеш, то займеш мае месца, хто атрымае пятак, будзе замест Шчодры. І гэтак далей.

*(Ідзе Каза і гаворыць словы з песні.)*

***Каза.***

Шкут ідзе, золата нясе,
А хто адгадае, той вялікае шчасце мае.
*(Пад музыку ідзе гульня "Шкута".)*

***Механоша.***

Ці падабаюцца вам нашыя гульні, паважаныя гледачы? Тады, людцы добрыя, не сядзіце, Казу весялуху ў карагод вазьміце. Хто з Казою патанцуе, таму ў новым годзе пашанцуе!

*(Каза, Механоша, Дзяўчына, Хлопец ідуць у натоуп, заводзяць карагод. Гучыць музыка з песні "Го-го-го, Каза".)*

***Каза.***

Мы прыйшлі да вас пажадаць дабра,
Ад усёй душы, як сваім сябрам.

***Механоша.***

Каб прынёс год новы вам дабрабыт і плен,
Многа радасці, веру светлых дзён.
*(На сцэну падымаецца Шчодра і старшыня журы Шэвялёў У.М.)*

***Шчодра.***

Ну, а зараз старшыня журы аб'явіць пераможцу конкурсу калядных гуртоу.

***Шэвялёў.***

Я у вялікім захапленні ад сённяшняга свята. Я пазнаёміўся з вельмі таленавітымі хлопцамі і дзяўчатамі. Вы паказалі цудоўныя веды народных традыцый. Вельмі цяжка сёння адзначыць, хто быў лепшы, але ўсё ж такі журы адзначыла гурт школы № 122. *(Апладысменты.)* Калі ласка, гурт і кіраўнік, падыміцеся на сцэну.

*(Усе гурты адзначаюцца грамотамі і салодкімі прызамі.)*

***Шчодра.***

Паважаныя госці! Па старадаўняй традыцыі на Каляды ў многіх гарадах Беларусі палілі святочныя феерверкі. І таму мы сёння вырашылі не парушаць традыцый і запрашаем усіх на святочны феерверк.

*(Гучыць фанаграма песні "Шчодры вячор". Удзельнікі свята запальваюць калядны феерверк.)*

***Шчодра.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Запалілі мы агні свята,
Каб асветлілась наша хата.
Хай палаюць іскрынкі ў ночы,
Хай засвецяцца радасцю вочы.
Мы калядны фэст завяршаем,
Вам здароўя і шчасця жадаем!
*(Гучыць развітальная песня "Будзь ваша здароў".)*
Будзь ваша здароў, як рыжык бароў,
Гэй каляда, калядзіца.
Май торбу грошай, жыві ў раскошы.
Май усяго даволі, а бяды ніколі.
Стары год канчаем, новы зачынаем.
З ранняю вясною, з буйнаю травою.
З збожжам каласістым, з ядром ядраністым,
Ды з прыемным летам, ды з громам пры гэтым.
Ды з восенню яснай, ды з долечкай шчаснай,
Бывай жа здароў ды з усёй сям'ёй.
Ды з усёй сям'ёй, ды і з дзеткамі.
Гэй каляда, калядзіца, гэй!

***Шчодра***.

Да наступнай сустрэчы на будучыя Каляды!

***Хлопец.***

Дзякуй вам!
Цераз лета зноў к вам прыйдзем!
*(З песняй "Ой, калядныя бліны ладныя " гурт пакідае сцэну.)*

***Шчодра.***

Давайце апладысментамі падзякуем гурту школы 122 і яе кіраўніку. *(Гледачы апладзіруюць.)*

Сёння тут калядны сход,
Збірайся каля нас, народ.
Будзем танчыць, гуляць і спяваць,
Усіх з калядамі віншаваць!

Сустракайце гурт сярэдняй школы 171, якім кіруюць Блужнеўская Станіслава Феліксаўна і Галеева Ніна Іванаўна.

*(Пад бубен на сцэну выходзіць гурт калядоўшчыкаў.Іх сустракае Гаспадар.)*

***Хлопец.***

Ішла каляда па ляду, па ляду,
Рассыпала каляда каляду, каляду.

***Дзяўчына.***

Вы, рабяткі, не зявайце,
Калядзіцу сабірайце!

***Увесь гурт.***

Каляда, калядзіца, прыхадзі павесяліцца! ***Зоркаоша.***

Вароты скрыпяць, марозы чуваць.

***Гурт.***

Каляда, калядзіца, прыхадзі павесяліцца. ***Механоша.***

Дзень добры таму, хто ў гэтым даму.

***Гурт.***

Каляда, калядзіца, прыхадзі павесяліцца.

***Хлопец.***

Добры вечар вам, а ці рады вы нам?

***Гаспадар.***

Мы то рады, але хто вы такія?

***Зоркаоша.***

Мы люд не просты, з далекага краю, людцы ўсе сталыя, з-пад самага раю.

***Гаспадар.***

Адкуль ідзяце?

***Механоша.***

Ідзём ад пана Года, што носіць бараду шыроку, як лапата, сіву і калмату. Мы к лету ідзём, радасць нясём. Ці шырокі сцены, каб нам патанцаваць, ці добры Гаспадар, каб нас пачаставаць?

***Гаспадар.***

Дык за што ж вас частаваць, спачатку трэба паспяваць!

***Хлопец.***

А ну, музыканцік, рэзні польку.
*(Гучыць полька.)*

***Зоркаоша.***

Ішлі калядоўшчыкі, калядуючы,
Добры люд віншуючы.
Ад іх белы конь адбіўся, стаміўся,
Спатыкнуўся ды тут апынуўся!
*(На сярэдзіну хаты выходзіць Цыган і Конь.)*

***Цыган.***

Купі, чалавек, каня, у гаспадарцы патрэбная жывёліна. *(Конь матае галавой.)*

***Гаспадар.***

Ды што грыва, ты на зубы ягопаглядзі!

***Цыган.***

Дык я ж амаль задарма прадаю, можна сказаць дару. А



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даронаму каню ў зубы не глядзяць.

***Гаспадар.***

Вядома, кожны Цыган сваю кабылу хваліць.

***Цыган.***

А ну, конь мой, паскачы, пакажы на што ты годзен! *(Пад беларускую польку конь скача і падае на подлогу.)*

***Гаспадар.***

Я ж казаў, што конь стары! Добрага каня прадаваць не вядуць.

***Цыган (звяртаецца да каня).***

Уставай, мой даражэнькі.

*(Конь матае галавой.)*

***Цыган.***

А ты, пэўна, аўса хочаш?

*(Гаспадар выносіць аўса, конь пачынае скакаць.)*

***Конь.***

Вас павіншую, аўса сабе пакалядую.
Зычу для добрых людзей добрых надзей і спадзей.
Каб мне скакалася, а вам плённа працавалася.
Мне падковак новых, а вам дзетак здаровых.
Мне новае сядзельца, а вам сала тры пудзельцы.
Каб шчасліва жылі, заўжды вясёлыя былі.
Кожны год калядавалі, добрых людзей віншавалі.

*(З песняй "Ай, калядачкі, бліны-ладачкі" калядоўшчыкі пакідаюць сцэну.)*

***Шчодра.***

Ну, а зараз паважаныя сябры, надышоў час параіцца, аб'явіць нашага сённяшняга пераможцу калядных гуртоў. А пакуль журы раіцца, запрашаем усіх на Калядныя ігрышчы!

*(На пляцоўку пад мелодыю песні "У карагодзе мы былі"выходзяць Бахур і Рэшатуха.)*

***Бахур (да Рэшатухі).***

Ой, мае даражэнькія, я зараз смачны піроґ еў, мо, і ты мне такі спячэш?

***Рэшатуха.***

Калі ахвота будзе, дык, можа, і спяку.

***Бахур.***

Зараз Каляды, таму на стале павінна быць усяго досыць! А якія яшчэ стравы рыхтавалі да Каляды?

***Рэшатуха.***

А вось аб гэтым мы зараз даведаемся ў нашых гледачоў.

*(Да гледачоў.)*

Даражэнькія, адкажыце, калі ласка, а якія стравы рыхтавалі на Каляды?

*(Гледачы адказваюць, да тых, хто назваў стравы, падыходзяць дзяўчаты і выводзяць гледачоў на пляцоўку.)*

Рэшатуха выстройвае ўдзельшкаў у паўкола. ***Бахур.***

А ці ведаеце вы, што на каляды існаваў такі звычай "Казла вадзіць"? *(Гледачы адказваюць.)* Станавіцеся ўсе за мной у дыяганаль адзін за адным. Бярыцеся рукамі за бакі суседа і пад словы:

***Грамада.***

Як хадзіў наш казёл ды па ельнічку,
Хлопцу дзевак сабраў на бяседачку.
Выбіраю я цябе.

***Бахур.***

Паўтарайце ўсе рухі за мной. На каго я пакажу, той становіцца перада мною і на лік раз, два, тры — пераварочваемся — "хвост" становіцца "галавой", а "галава" — "хвастом". Зразумела? Тады пачынаем.

*(Пры дапамозе гульні на пляцоўку выводзяцца яшчэ 6 чалавек.)*

***Бахур.***

Ну вось, "Казла" павадзілі.

***Рэшатуха.***

А ці ведаеце вы, што казёл — істота вельмі рухавая? *(Гледачы адказваюць.)*

??? мы гэта зробім?

***Рэшатуха (да гледачоў).***

А вось як! Устаньце, мае даражэнкія, у дыяганаль. Зараз ??? будзе "галавой", а вунь тая дзяўчына — "хвастом" *(паказвае на апошняга чалавека ў дыяганалі.)* "Хвост" павінен уцякаць ад "галавы". Калі "галава" дагоніць яго, тады "хвост" становіцца "галавою". Пачынаем. Спачатку. Зразумела? Пачынаем!

*(Гучыць полька.)*

***Бахур.***

Ну, вось, казла утаймавалі.

***Рэшатуха.***

А гэта гаворыць аб тым, што гэты год будзе шчаслівы. А якое ж шчасце без пацалункаў. Зараз пабачым, для каго гэты год будзе асабліва шчаслівым. Гэтая гульня, хлопцы, асабіста



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для вас.

***Бахур.***

Станавіцеся, хлопцы, у дыяганаль. *(Да дзяўчат.)* А вы, прыгажунечкі, глядзіце ды падтрымлівайце хлопцаў.

*(На пляцоўку у гэты час выходзяць хлопец і дзяўчына. Яна трымае ў руцэ саломінку. Хлопец садзіць дзяўчыну к сабе на плечы.)*

***Бахур (да хлопцаў).***

Слухайце ўважліва. Зараз кожны з вас па чарзе павінен будзе падбегчы і паспрабаваць ротам дастаць гэтую саломінку. Хто дастане - атрымае прыз не малы, ды вельмі салодкі. Зразумела? Пачынаем. (Гучыць *полька.)*

***Рэшатуха.***

А падарунак — салодкі пацалунак ад нашай прыгажуні!

*(Дзяўчына і хлопец цалуюцца тры разы.)*

***Бахур.***

Ну вось і пацалаваліся.

***Рэшатуха.***

Але гэта яшчэ не ўсё, зараз я прапаную усім астатнім такую цудоўную гульню "Падушачка". Хто не атрымаў пацалункаў, неўзабаве хутка атрымае. Станьце, калі ласка, у кола. Зараз мы з вамі пойдзем па ходу сонца, а Бахурка — супраць яго з падушачкай. Як толькі скончацца словы песні:

Падушачка, падушачка, мая пухавая.
Малодачка, малодачка, мая маладая.

***Рэшатуха.***

Каго люблю, каго люблю, таго пацалую.
Падушачку, падушачку маю падарую.

Насупраць каго спыніцца Бахур, той з ім павінен будзе пацалавацца ў коле, стоячы на падушачцы на каленях. Пасля той, з кім пацалуецца Бахур, такім жа чынам павінен выбраць сабе пару, і гэтак далей. Зразумела? Пачынаем! *(Выконваецца песня "Падушачка".)*

***Рэшатуха.***

Ну вось, пацалункі атрымалі. Стравы назвалалі...

Б***ахур.***

Але такую страву як "пячоны кот" ніхто не назваў. Можа вы не ведаеце такой стравы? *(Гледачы адказваюць.)*

***Бахур.***

Калі не ведаеце, дык зараз даведаецеся. Станавіцеся у дыяганаль усе.

*(У гэты час хлопец выносіць на шасце пячонага ката, у якога замест хваста— кавалачак каўбасы.)* ***Бахур.***

Зараз пад словы: Еду з кута па ката — Цап-лап за ката! Вы павінны да яго падбегчы і паспрабаваць адкусіць кавалачак хваста. Той, у каго гэта атрымаецца, атрымае ў падарунак увесь каўбасны хвосцік. Зразумела? Пачалі!

*(Гучыць музыка.)*

***Рэшатуха.***

Малайцы! Ну дык няхай так, няхай сяк – няхай будзе "Кракавяк"! А каб добра было скакаць, трэба ўсе рухі за мной паўтараць.

*(Гучыць "Кракавяк ".)*

***Бахур.***

Добра вы сёння гулялі ды танцавалі. А за гэта трэба вас падарункамі адарыць!

*(Дзве дзяўчыны выходзяць* і *адорваюць гледачоў блінамі. Гучыць святочная музыка.)*

***Рэшатуха.***

А зараз для ўсіх вас гучыць полечка.

*(Усе танцуюць. Затым дзяўчаты і хлопцы праводзяць удзельнікаў на свае месцы.)*

## *Зіма з вясною сустракаюцца*

**Састаўныя элементы свята**

—Марш кавалькады зазывалаў па вуліцах горада.
—Адкрыццё святочнага кірмашу і дзіцячага гарадка.
—Прыбыццё зімы, рапарт зімовых месяцаў.
—Зімовыя забавы.
—Прыбыццё Вясны, танец вяснянак.
—Штурм снежнай крэпасці, ад'езд зімы.
—Запальванне кастра Вясны, масавыя карагоды.
—Прыбыццё герояў беларускага фальклору.
—Веснавыя гульні.
—Заключны маналог Вясны.
—Феерверк.

"Хто ўмее весяліцца, той гора не баіцца!"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Вас чакаюць гулні, жарты —
Быць пахмурным тут не варта!"
"Годзе, сняжыначкі, сыпацца з неба!
Цёплага сонца чакае ўжо глеба".

Дзіцячая пляцоўка свята афармлена скульптурамі лясных звяроў. Тут жа размешчаны снежны цір, ледзяная карусель *(апісанне ў дадатку да сцэнарыя)*, пункт пракату троек коней і дзіцячы санны поезд. На тэрыторыі дзіцячага гарадка знаходзіцца невялікая эстрада для выступленняў лялечнага тэатра і культаргашзатара, а побач — аўтобус для паказу мультфільмаў. Вакол дзіцячага гарадка падрыхтаваны гурбы снегу, з якіх дзеці пазней будуць ляпіць снежныя скульптуры на конкурс.

Зона дзеяння зімы размешчана ля снежнай гары, на якой зроблены дзве ледзяныя дарожкі для скараснога спуску, акантаваныя борцікамі. Справа ад гары знаходзіцца ледзяная эстрада ў выглядзе паўкруглай сферы з калонамі з ледзяных пліт. *(Вечарам на ледзяной эстрадзе дэманструецца слайд-фільм "Поры года".)* Ля падножжа снежнай гары паўкругам месцяцца беларускія зімовыя атракцыены: "кплаўрот", палескі і гродзенскі прызавыя слупы, пляцоўка для перацягвання каната (з перагародкай са снегу пасярэдзіне), а таксама; ледзяны конус, гарызантальны ледзяны слуп для спаборніцтваў, гарадошная пляцоўка на лёдзе і ледзяная дарожка *(апісанне ў дадатку да сцэнарыя).*

Снежная крэпасць, размешчаная паміж зонамі Зімы і Вясны, упрыгожана ледзянымі вежамі і зубцамі, сцены яе абліты вадою, падфарбаванай блакітнай фарбай. Вароты крэпасці зроблены з дрэва і прыладжаны да ледзяных слупоў.

На валах крэпасці — піраміды снежак для будучых баёў. Усярэдзіне - пляцоўкі для дзеянняў казачных персанажаў і спецмашына з пад'ёмнай стралой, прыкрытая шчытамі з фанеры. Справа ад крэпасці — невялікая эстрада вышынёй паўтара метра.

Зона дзеяння Вясны размяшчаецца вакол кастровай плошчы. Справа ад вогнішча вясновая эстрада, упрыгожаная гірляндамі з лісця і кветак. На эстрадзе — канструкцыя дзвюх рук чалавека, якія трымаюць хлебнае поле ў кароне лясоў. У зоне дзеяння Вясны размешчаны веснавыя беларускія забавы: арэлі, дзіцячыя і палеская рыбная латарэі, атракцыён "Перахват", пляцоўка для хадзьбы на хадулях і падняцця цяжкасцей, атракцыён "Падчапі гаршчок" і фруктовая латарэя.

У зонах гуляння размешчаны даведнікі ў форме каменяў - са снегу на зімовай плошчы, з фанеры — на веснавой.

Пра дзеі свята гасцям паведамляюць "радыёдаведкі". Яны замаскіраваны ў фігурах Снегавіка, Дзеда Мароза, Мядзведзя, птушак.

Уздоўж алей парку размешчана гандлёвая зона.

"Апетытныя рады" зімовага кірмашу афармлены у беларускім стылі. Прадаўцы, апранутыя ў кажушкі з элементамі нацыянальнага арнаменту, гандлююць беларускімі масленічнымі стравамі і прамысловымі таварамі, якія атрымалі распаўсюджанне на святах у Беларусі.

Над гандлёвымі радамі вісяць плакаты:
"Чалавек галодны ні на што не годны".
"Без бульбы і без сала куса
Няма яды для беларуса".
"Грэчка — авечка, а бульба — бык".
"Блінок маслены – каток,
Сам каціся ў раток!"
"З самавара валіць пара —
Прыкмячай, дзе вараць чай".
"Самы лепшы ў свеце квас!
Паспытайце яго ў нас".
"Губы столькі ўжо з'елі —
Ані-ні больш не хацелі,
Але цягнецца рука
Да мажнога шашлыка".
"Галушкі ў смятане
І клёцкі ў малацэ —
Чарга як бачыш стане
Падобная рацэ".
"Марожанае, піражнае,
Пернікі, цукеркі...
Ласуйцеся і ў рэшаты
Адкладвайце паперкі!".
"Нашы лепшыя запасы —
Сыр, вяндліца і каўбасы".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па гандлёвай пляцоўцы расхаджваюць карабейнікі, якія прапануюць свой тавар.

Цэнтрам зімовага кірмашу з'яўляецца карчма "Зіма з Вясною сустракаюцца", размешчаная пад адкрытым небам. Тэрыторыя карчмы абнесена снежным валам. Ля ўваходу — круглы стол з самаварам, вылепленым са снегу, у які дабаўлены янілінавы *(цёмны)* фарбавальнік. Карчма падзелена папалам вялізным доўгім сталом. Злева ад стала прадаюцца бліны, варэнікі з сырам, дранікі, сыры і тварожныя вырабы, чай. Справа гарыць касцёр, на якім на ражне смажыцца цэлы баран, разносяцца араматныя пахі шашлыкоў, прадаюцца мясныя, каўбасныя і кандытарскія вырабы, гарачае малако. Асобна стаіць латок, дзе прадаюць сувенірнае пячэнне, выпечанае ў выглядзе жаваранкаў, буслоў і іншых птушак, а таксама булачкі ў форме сельскагаспадарчых прылад і прадуктаў.

За сталом па цэнтру ад уваходу знаходзіцца невялікае ўзвышэнне, дзе будуць выступаць фальклорныя ансамблі. На эстраднай пляцоўцы — фігура скамароха, у роце якога ўманціраваны радыётранслятар, з яго перадаюцца беларускія народныя і сучасныя песні зімовай і веснавой тэматыкі.

Светлавое афармленне карчмы "Зіма з Вясною сустракаюцца": ля ўваходу гарыць падсвечаны знутры самавар са снегу, злева ад уваходу — тры усмешлівыя бліны, справа — падсвечаныя знутры ледзяныя выявы гародніны, фруктаў, кветак.

У 11 гадзін раніцы ў аўтамабілях, на тройках, у санным поездзе з музыкай і песнямі скамарохі праязджаюць па горадзе. Яны прыпыняюцца ля людных месцаў, робяць аб'явы:

—Зіма са снегам,
Вясна са смехам
Сышлі з дарожкі —
Бяруцца ў рожкі.
—Усім людзям
Паглядзіннічка,
Усім людзям
Пагулянnічка!
—Добрыя людзі,
Спяшайце за намі!
У парку прыбудзе
Чарга за блінамі!
—Да дванаццаці гадзін
Спячом комам першы блін.
Да дванаццаці гадзін
Сабірайся як адзін!
—Масленка, маслёнка!
Бывай, зіма красненька!
Пачастуй блінком,
Напаі чайком.
Як белы сняжочак,
Дай сыру кусочак,
Масленка, маслёнка!
—Аб'ядзенняў густа
Налюбыя густы.
Кожнаму роту
Знойдзем работу —
Каму масла,
Каму сыр,
Хто заплаціць —
Таму пір!
—Дранікі-галадранцы
Плаваюць у смятанцы.
—Галушкі, як цялушкі, —
Не справішся без дружкі!
—На шашлык!
Трыццаць тры быкі
Аддалі бакі,
І стала свінак —
Для каўбас і вяндлінак!
—Па гэтай паглдзе –
Катанні на лёдзе,
А транспарт у шырокім выбары —
На конях,
На лыжах,
На санях
І ў цэбары!
— Ёсць шанцы змяняць карбаванцы:
Латарэя-спортлата —
Хутка выйграеш хоць што!
— Да дванаццаці гадзін

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спячом комам першы блін!
Да дванаццаці гадзін
Сабірайся як адзін!
Зіма з Вясной стрэнуцца
Людзям на пацеху!

**12.00 гадзін.**

Скамарохі-зазывалы, якія прыбылі да цэнтральнага ўваходу парку, паўтараюць сваю рэкламную праграму і запрашаюць людзей на свята.

Пачынае работу святочны кірмаш. Уздоўж гандлёвых радоў ходзяць карабейнікі, якія прапануюць удзельнікам свята ласункі, марожанае, арэхі, фрукты, цукеркі. У цэнтры гандлёвай плошчы пачынаецца конкурс блінапекаў, на які кожнае прадпрыемства грамадскага харчавання выстаўляе свайго ўдзельніка. Умова конкурсу: на працягу гадзіны спячы як мага больш смачных і прывабных бліноў рознай рэцэптуры.

У дзіцячым гарадку — конкурс снежнай скульптуры, на які калектывы некалькіх прадпрыемстваў і школ раёна выстаўляюць сваіх прадстаўнікоў. Бацькі дапамагаюць дзецям ляпіць конкурсныя скульптуры.

На снежнай горцы адкрываюцца катанні. Каманды саннікаў, якія прадстаўляюць прадпрыемствы, установы, школы, праводзяць трэніроўку перад будучымі спаборніцтвамі. На другой ледзяной дарожцы катаюцца ўсе жадаючыя, спецыяльна для іх загадзя падрыхтаваны "сані" з падмарожаных рэшатаў, цэбраў і да т. п.

**13.00 гадзін.**

Да зімовай эстрады на тройцы пад'язджаюць месяцы Снежань, Студзень і Люты. Гучаць пазыўныя фанфар, ганцы Зімы абвяшчаюць яе з'яўленне:

*(Разам)*
Боты ў полі звоняць меддзю,
Вецер свішча наўздагон.
Развітацца Зіма едзе
У ........раён!

***Снежань.***
Сіні лёд дрыжыць,
Белы конь бяжыць,
На санях Зіма
У кажусе ляжыць.

***Студзень.***
Яна едзе даль
На апошні баль,
І за гэта ей —
Ледзяны медаль.

***Люты.***
Ля новых варот
Робіць паварот,
Гэй, дарогу дай,
Расступіся, народ!

Гучаць бомы, іх гукі пераходзяць у бадзёрую мелодь "Мяцеліца". На верхняй пляцоўцы снежнай гары з'яўляецца тройка, запрэжаная ў сані. З саней выходзяць сняжынкі-дзяўчынкі ў белых футрах. Яны выстройваюцца "калідорам" на схіле гары, трымаючы ў руках запаленыя бенгальскія агні. Скрозь дарогу агнёў і праходзіць Зіма — жанчына ў святочным белым футры і бліскучай кароне.

Узышоўшы на эстраду, Зіма падымае жазло. Гучаць урачыстыя фанфары, і ўгору ўздымаюцца агні салюта.

***Зіма.***
Шанаванне добрым людзям,
Хай вам радасці прыбудзе.
Хлопцы, дзеўкі, мамы, таты,
Запрашаю вас на свята!
Пра мяне ў вас, па праўдзе,
Часта йшла гаворка:
Што снег белы вочы крадзе,
Вабяць ноччу зоркі,
Ранак ясны і прыгожы,
Дымы з печы — свечы...
Эх, зіма пацешыць можа
Сэрца чалавеча.
У яе так многа ў штаце
Мастакоў і ткалляў,
Што зімою — як на свяце,
Крочыш снежнай даллю.
Свята гэтага часцінка
Сёння паміж намі.
Дазваляю прычасціцца
Чаем і блінамі!

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Гучыць вясёлая мелодыя. Сняжынкі частуюць гледачоў блінамі і чаем. Частуючы, яны прыгаворваюць:

—У нашага бліна дармавая цана!
—Чай чабаровы — будзеш здаровы!
—Колькі прымуць вашы шчочкі —
Самавары на дзве бочкі!

Зіма прадстаўляе гледачам зімовыя месяцы:

У маёй арцелі
Служаць тры брацельнікі:
Снежань-замятун,
Студзень-калатун
І Люты-лятун.
Не сядзяць на дачы,
Не ляжаць у пасцелі —
Дайце справаздачу,
Што зрабшць паспелі!

***Снежань.***

Як мне і належыць,
Я быў вельмі снежным.
Болей снегу — болей хлеба,
Разгружаў вагоны з неба,
І з усіх нябесных баз
Я свой вычарпаў запас.

***Студзень.***

Я ж сцюдзёнаю парою
Выпускаў сняжынкі роем.
Я ахутаў кожны кусцік,
Лёд каваў у звонкай кузні,
Каб па стужцы цвёрдых рэк
Мог катацца чалавек.

***Люты.***

Як я з братцам ні стараўся,
У адной справе промах даў:
Усе рэчкі замарозіў,
А адной не ўтаймаваў —
Малочная рэчка цякла і цячэ
І, кажуць вясною прыбудзе яшчэ.

***Зіма.***

Прашу паказацца, хто сярод вас
За белую рэчку трымае адказ.
Бо сёння ўшанована будзс рука,
Што ў дом ваш прыносіць стакан малака.

**12 гадзін 30 хвілін.**

***Зіма.***

Слухайце маю аб'яву:
Абяцаю усім забаву,
Зараз будуць песні,скокі —
Выступаюць скамарохі!

Гучаць вясёлыя найгрышы дуды. З ледзяной гары на падмарожаных рэшатах, у цэбрах, на санях з'язджаюць скамарохі. Вясёлым гуртам яны ўзбягаюць на ледзяную эстраду.

***Скамарохі.***

—А мы масленку дажыдалі,
Гару сырам набівалі,
—Зверху маслам палівалі.
—Хто з гары пракоціцца,
Той яшчэ вароціцца.
—Масленка ж катліва —
Пакатацца міла.
—Не зважайце на мундзіры,
Выступайце ў турніры!
—Зараз будзем строіць смешкі —
Запрашаем на пацешкі!
—Пасмяяцца ўсе запрошаны —
Пачынаем скамарошыны!

З вясёлымі воклічамі скамарохі рассыпаюцца па гульневаму полю, накіроўваюцца да атракцыёнаў. Пачынаюцца народныя забавы - турніры Зімы. Каля правай ледзяной горкі аргаізаваны пункт пракату саней і дзіцячых санак, падмарожаных рэшатаў, лядзянак і інш. На левай дарожцы скамарохі праводзяць беларускае спартыўна-гульнёвае дзевяцібор'е 'Гара — не гора, а радасці мора". На гэты турнір кожная школа, прадпрыемства і установа выстаўляюць сваю каманду з трох чалавек.

Каля ледзяной эстрады распачынаюць работу палескі і гродзенскі прызавыя слупы, у папярэдне выбраных месцах — атракцыены "Калаўрот", ледзяная карусель, ледзяны конус, гарызантальны ледзяны слуп.

У зоне Зімы праводзяцца спартыўныя праграмы "Лыжны фестываль", "Вакол хакея", "Камбінаваная эстафета", а

таксама гульневая прграма “Снежныя забавы народаў СССР”.

На дзіцячай пляцоўцы адкрываецца пункт пракату, дзе арганізуецца катанне на тройках і санным поездзе. Пачынае работу снежны цір.

На ледзяной эстрадзе — фестываль мастацтваў. Яго заключным нумарам з'яўляецца харэаграфічная сюіта "Завіруха".

**14 гадзін 30 хвілін.**

Раздаецца піратэхнічны выбух, і ў паветра ўзлятаюць сотні бліскучых сняжынак, зробленых са срабрыстай фальгі.

***Зіма.***

Годзе, сняжыначкі,
Сыпацца з неба!
Цёплага сонца
Чакае ўжо глеба.
Мы нагуляліся
з вамі ўволю,
Баб наляпілі
Са снегу даволі.
Хутка растопяць вас
Сонца праменні:
Рэк, ручаёў
Мы пачуем бурленне.
Удосталь нап'ецца
Матуля-зямліца
Свежай, сцюдзёнай
Вясенняй вадзіцы.
***(Я. Журба. Зімой)***

***Снежань.***

Мы жылі ў добрай згодзе
Увесь сезон суровы.
Час сказаць у гэтым годзе
Развітання словы.

***Студзень.***

Хай у пару будуць засеўкі,
Акрыяюць лозы,
Хай трашчаць вашы засекі,
Як зімой марозы!

***Люты.***

Рукі хай кажух бухматы
Вырастае ў стагі.
Хай багаты будуць хаты
Так, як зімы на снягі!

***Зіма.***

Галаву вядзе да сну,
Моц акоў маіх слабее,
Але з вамі йшчэ паспею
Адамкнуць Вясну-красну!

Фальклорны ансамбль выконвае беларускую веснавую песню "Жаваронaчкі, прыляціце!". Затым усе ўдзельнікі фальклорных груп, рухаючыся да вяршыні гары, чытаюць:

Вылеці, вястун вясны,
Вынесі залатыя ключы,
Замкні халодную зіманьку,
Адамкні цёплае лецечка!

Гучыць урачыстая мелодыя. На верхняй пляцоўцы ледзяной гары на белым кані з'яўляецца Вястун Вясны, апрануты ў беларускі нацыянальны касцюм, элементам якога з'яўляецца зялёная світка з чырвоным арнаментам. Ён падносіць да губ дуду-сурму, і тройчы разносіцца прызыўны сігнал *(магчыма фанаграма)*.

***Вястун Вясны.***

Гэй, народ!
Вясна ля варот,
Я — вястун яе
І абвяшчаю
Юнай Вясны прыход!

Гучыць мелодыя "Вясновай казкі" Я. Глебава. На пляцоўцы ледзяной гары з'яўляюцца тры юнакі — месяцы Сакавік, Красавік і Май, апранутыя адпаведна ў блакітны, зялёны і чырвоны касцюмы з элементамі беларускага арнаменту. У руках веснавых месяцаў — запаленыя каляровыя дымавыя шашкі, якія ствараюць яркі фон. Праз вароты, утвораныя веснавымі месяцамі, праходзяць дзяўчаты-вяснянкі з доўгімі каляровымі стужкамі. У гэты час гучаць вершы:

Ідзе вясна ў шумлівых водах,
У звонкім срэбры ручаёў
І разлівае мяккі подых,
Як песню нейкую без слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звініць паветра і гамоніць
А даль так свежа, так ясна.
Дзень добры вам, лясы і гоні,
Дзень добры, юная вясна!

***(Я. Колас. Ідзе вясна)***

На верхняй пляцоўцы ледзяной гары з'яўляецца Вясна, апранутая ў блакітнае адзенне, упрыгожанае зялёным лісцем і яркімі кветкамі. У руках Вясна трымае канцы каляровых стужак вяснянак. Вяснянкі, вітаючы прыход Вясны, робяць шырокія вертыкальныя ўзмахі стужкамі, ледзяная гара пераліваецца рознакаляровым морам. На фоне гэтага дзеяння і ціхай музыкі гучаць вершы:

Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы,
Болей не мерзне душа ні адна,
Сонейкам цёплым, зеленню вабнаю
Абдаравала зямельку вясна.
Грай жа, жалеечка! Грай, грай, вясёлая!
Выўграй з вясною і долечку мне.
З пушчаю, з птушкамі, з вольнымі ветрамі
Грай мне аб шчасці, грай аб вясне!

***(Я. Купала. Вясна)***

Гучыць вясёлая народная мелодыя. Вясна і вяснянкі апускаюць стужкі, якія вясёлкаю пакрываюць гару.

***Скамарохі.***

Гэй, вясна-красна-а-а!
Што ты нам прынясла-а-а!

***Вясна.***

Я вам прынясла
Тры карысці ў радасці:
Шаўковую траву на вясну,
Буйное жыта на лета,
Ядрыцу-грэчку на восень.

Пад вясёлую мелодыю Вясна з вяснянкамі сыходзіць на ледзяную эстраду, якая ажывае лесам зялёных галінак. Пачынаецца танец вяснянак, які спыняецца стоп-кадрам, у цэнтры яго — Вясна. У неба узлятаюць дзесяткі галубоў.

***Зіма.***

Вясну з прыходам я вітаю
І перад тым, як трон аддаць,
Хачу я адрапартаваць:
Тры месяцы маёй работы
Мы працавалі без ляноты
І, каб зямліца урадзіла,
Снягамі я палі ўкрыла
І тэхніку рамантавала.
Каб ты сяўбу хутчэй пачала,
Надзейна зерне зберагла,
Што Восень мне перадала.
Бачыш крэпасць ледзяную —
Мой апошні бастыён.
Дзед Мароз яе пільнуе,
Зерне сцеражэ там ен.
Моц сваю кабдаказаць,
Ты павінна крэпасць узяць!

***Вясна.***

Вястун! Слухай мой загад!

*(Да эстрады пад 'язджаюць Вястун Вясны і веснавыя месяцы.)*

Асілкаў смелых, моцных, дужых
Заві пад сцяг вясновы мой,
Каб даць Зіме апошні бой,
Прагнаць мяцеліцы і сцюжы,
Прыход Вясны ўшанаваць
І зерня людзям перадаць!

Вястун трубіць у дуду. ***Вястун Вясны.***

Тых, хто адвагай ганарыцца,
Заву ўсіх я за сабой
На штурм! На крэпасць! Грамадой!

Гучыць заліхвацкая мелодыя. Вястун, веснавыя месяцы, Вясна, Зіма, скамарохі і гледачы спяшаюцца на штурм крэпасці.

**15 гадзін 30 хвілін.**

...З-за ледзяных бастыёнаў снежнай крэпасці выглядваюць адмоўныя казачныя персанажы. Вястун трубіць у дуду, і пад гукі полькі-весялухі грамада скамарохаў і гледачоў ідзе на штурм крэпасці. Паміж удзельнікамі тэатралізаванага бою пачынаецца перастрэлка снежкамі.

На полі бою з'яўляюцца Вястун Вясны і веснавыя месяцы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з запаленымі факеламі ў руках. Праскакаўшы вакол крэпасці, яны кідаюць факелы ў сярэдзіну.

У крэпасці запальваюцца каляровыя дымавыя шашкі. Вароты крэпасці адчыняюцца, і на поле з паднятымі рукамі выходзяць казачныя персанажы, якія разбягаюцца ў розныя бакі. Уверх падымаецца страла спецмашыны, у люльцы якой стаіць Вястун Вясны і трубіць перамогу.

З крэцасці выходзіць Дзед Мароз. У яго руках — чаша з адборным зернем. Ён падымаецца на ўзвышэнне каля крэпасці і аддае чашу Зіме.

***Зіма (звяртаючыся да Вясны).***

Ты моц маю перамагла,
Зімовыя знікаюць чары.
Бяры зярно і засявай
Палёў шырокія абшары.
Перадае чашу з зернем Вясне:
Я ж ад'язджаю на пакой
У паўночны край любімы мой.
Хай цёплы дзень смялей ступае —
Табе пасад я ўступаю.
Хай новы дзень здабыткам будзе —
Нясе вам шчасце, радасць, людзі!
Зіма са світай ад'язджае.

***Вясна.***

Не спяшайце адыходзіць —
Зараз будзем карагодзіць
На маёй, на веснавой паляне.
Будзем гушкаць дзяўчат,
Весяліць мам і тат —
Запрашаю ка мне на гулянне!

Гучыць музыка. Вясна, несучы чашу з зернем, пачынае шэсце па сваей зоне. За ей ідуць веснавыя месяцы, вяснянкі, скамарохі і гледачы. У час шэсця вяснянкі водзяць карагод "Пляцень". Падышоўшы да веснавой эстрады, вяснянкі выстройваюцца на прыступках.

Гучыць веснавая мелодыя ў выкананні цымбалаў. Вясна перадае чашу з зернем вяснянкам, і кожная з іх прымацоўвае да яе сваю каляровую стужку. Павольна і ўрачыста чаша плыве па руках дзяўчат і ўстанаўліваецца на падстаўку ў форме чалавечых далоней, якія трымаюць хлебнае поле ў кароне лясоў. Гучаць вершы:

Зямля Беларусі! Ты у граях-вяснянках,
Ты ў звоне вясёлак, ты ў гуслях вятроў,
Ты песня сама ад крыніц да заранкі,
Ад зорак паўночных да сіняга ранку,
Ты — наша паэма з бурштынавых слоў!
***(П. Броўка. Беларусь)***

***Вясна.***

О, зямля!
Ты ўся ў абновах!
Ты ў мільён званочкаў звоніш.
Ты на ста пявучых мовах
Песняй радасцю гамоніш.
Ты смяешся так шчасліва,
Што адразу стала ясна,
Як ты даўна, як цярпліва
Свята гэтага чакала!
***(Н. Гілевіч. Свята вясны)***

***Вясна.***

Ты ўздыхаеш на поўны грудзі —
У полі будуць скібы ўзняты.
Засявайце ж нівы, людзі,
Прынімай, зямля, зярняты!

**16 гадзін.**

Гучыць лірычная мелодыя.

***Сакавік.***

Вясна спрадвеку
Прыносіла дзве святыя надзеі:
на ўраджай і на каханне.
На тое,
што будзе на жытачка род
і на статачак плод.
І на тое,
што акрые дужыя плечы
сарочка-вышыванка
з дзявочых рук:
"Насі, міленькі, штонядзелькі,
успамінай мяне штогадзінкі!".

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

***Красавік.***

Вясна спрадвеку прыносіла надзею
на тое,
што ў шчодрую восень
на таку будзе ўмалотна,
у арудзе прысыпна,
а на стале краіста,
а ў цечы пячыста,
а ў дзяжы падыходна,

***Май.***

Вясна спрадвеку прыносіла надзею
на тое,
што заручаць вас шлюбам,
як голуба з галубай.
Таму такая дарагая
і асабліва чаканая
гэта пара —
пара Вясны,
калі ў прыроды і чалавека
адно імкненне —
да працягу жыцця
зернем,
лісточкам,
дзіцём.

***Вясна.***

У славянскай старане
Ёсць мне звычай любы:
Аддаюць тут па вясне
Шанаванні шлюбу.
Песняй дораць маладзіц,
Ходзяць у адведкі —
Кажуць, шчасце ў дом глядзіць
Калі ў люльках дзеткі.
Каб зноў чулася "люлю",
З веснавым стараннем,
Прыбіраю я зямлю,
Тку ўзор кахання.
І на сватаў ручнікоў
Выткала даволі —
Каб было і жаніхоў,
І нявестаў болей.

Сёння выдам я ўказ —
Раю не пярэчыць:
Хай усе вядуць у ЗАГС
Сцежкі ды сустрэчы.

***Вястун Вясны.***

Маладыя едуць!
Зараз будуць тут!

***Вясна.***

Пару маладую — на пачэсны кут!

У выкананні ансамбля "Песняры" гучыць песня "Дзяўчына-сардэнька". Пад'язджае вясельны санны поезд. У гэты час гучыць тэкст *(музыка мікшыруецца):*

***Вястун Вясны.***

Едуць! Едуць!

Маладыя пад'язджаюць да веснавой эстрады, выходзяць з саней. На пляцоўку Вясны яны праходзяць скрозь алею вяснянак, якія асыпаюць іх першымі веснавымі кветкамі — пралескамі, залацістым зернем. *(Працяг песні).*

***Вясна (да молодых).***

Вітаю. Віншую. І веру:
Для вас
Шчаслівую эру
Пачне гэты час.
Вясною, зімою і летам —
Заўжды
Каханнем сагрэтыя
Будуць гады.

Раптам з натоўпу да мікрафона выскаквае скамарох.

***Скамарох.***

Маладых спяшыў глядзець —
Паваліўся з горкі.
Узяў чаю ў раток —
Чай без цукру горкі!
Горка, го-орка!

Гледачы скандуюць "горка!". Маладыя цалуюцца.

***Вясна (выносячы шкатулку з беларускім арнаментам).***

На вяселлі так вядзецца:
Маладым пасаг даецца.
Хай дабро ў хаце месціцца,
Хай адзначыць вас народ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У шкатулцы ж будзе месца
Для працоўных узнагарод.

*Вясна перадае маладым беларускую шкатулку.*

***Вясна.***

Хай надзеі стануць явай,
Збудуцца ўсе вашы сны.
Маладым даецца права
Запаліць касцёр Вясны!

*Гучаць фанфары. Вяснянкі перадаюць маладым факелы і яны запальваюць вогнішча.*

***Вясна.***

Мае свята азорана,
Ды агонь не ярчэй
Заручальнага золата
І шчаслівых вачэй...
Маладым раю
Спяшыць да караваю,
А мы на іх вяселлі
Тут пагуляем.

***Вяснянкі (некалькі разоў, як рэха).***

Шчасшвай дарогі-і!
Добрай долі-1!

*Пад мелодыю "Дзяўчына-сардэнька" ўсе праводзяць маладых.*

***Вясна.***

Танцы й карагоды
Не выходзяць з моды.
Хай лунаюць песні
У небе напрадвесні.
Гэй, народ!
Станавіся ў карагод!

Гучыць музыка. Удзельнікі фальклорных ансамбляў, вяснянкі, скамарохі і гледачы водзяць карагоды.

**16 гадзін 40 хвілін.**

Разносяцца вясёлыя найгрышы скрыта і дуды, заліхвацкія пераборы гармоніка, рытмічныя ўдары бубна. Пачынаецца шэсце фальклорных герояў.

На чале грамады — Несцерка з кіем у руцэ і торбай за плячыма. Верхам на кані едуць волат, цмок, Баба-Яга, воўк, лісіца, авечка, журавель. За імі — дэкаратыўна аформленая павозка цыркавых артыстаў, якія па ходу кідаюць рэплікі гледачам, жангліруюць, паказваюць нескладаныя фокусы. За павозкай ідуць артысты на хадулях, важак з мядзведзем — "студэнтам смаргонскай акадэміі". *(пераапрануты),* павозка з шырмай і тэатрам-батлейкай, за якой скамарохі робяць пантамімныя рухі, а таксама "жывыя батлеі" — артысты, апранутыя ў касцюмы лялек. Шэсце заканчвае група "цыганоў", якая выконвае пад гітару танец, і фальклорная група, што спявае вясёлыя беларускія прыпеўкі.

***Вясна.***

Не Пярун грамы абрынуў
З бурай-навальніцай —
Гэта Несцерка з сябрынай
Едзе весяліцца.
З беларускага фальклору
У паход к нам рушыў —
Самы час у гэту пору
Разгавецца душам.

*Артысты маляўніча размяшчаюцца на эстрадзе і вакол яе. Несцерка падыходзіць да мікрафона.*

***Несцерка.***

Добры вечар, людзі-дабрадзеі!
Ехалі ж мы да вас
хто на вазе, хто на казе,
хто на кожнай назе па чарзе.
Прывезлі ж мы вам
смеху мяшочак,
чароўны гаршчочак,
на рыбу кручочак.
Вашыя вочы да дзіваў ахвочы:
глядзіце батлейку,
чорну цыганейку,
мішку-разумейку.
Вучан мішка не па кніжках,
але мае прэміі —
ён студэнт даўно вядомай
смаргонскай акадэміі.
Мы смяшылі вашых дзедаў,
намі жылі кірмашы.
А хто нас да сюль не ведаў –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазнаеміцца спяшы!

**17 гадзін.**

Гучыць радыёканцэрт з жартоўных беларускіх песень *("Чаму ж мне не пець", "Бацька добры, бацька добры...", "Як мне, траве, зелянеці ", "Як паедзем мы ў госці ", "Салавей спявае звечара ў даліне", "Матылі " і інш.)*. Пачынаецца забаўная праграма Вясны, якую праводзяць фальклорныя героі. Яны запрашаюць пакатацца на арэлях, удзельнічаць у спаборніцтвах хадзьбы на хадулях, конкурсе асілкаў, рыбнай латарэі, атракцыёнах "Перахват", "Падчапі гаршчок" і інш. На танцавальнай пляцоўцы праводзіцца конкурс культарганізатараў раёна, на які кожная культасветустанова выстаўляе свайго ўдзельніка.

На ледзяной эстрадзе паказваецца слайд-фільм "Поры года", а ў дзіцячым гарадку — мультфільмы веснавой тэматыкі.

На эстрадных пляцоўках парку адкрываецца фестываль беларускага фальклору, у якім прымаюць удзел вакальныя і фальклорныя групы, тэатр-батлейка і "жывыя батлеі", цыркавыя артысты, важак з мядзведзем.

На адной з палян каля раскладзенага вогнішча побач з кібіткай-эстрадай пачынаюцца жартоўнае гаданне пераапранутых цыганоў, конкурс народнага танца, а на цэнтральнай эстрадзе — частушачнікаў, на які кожная культасветустанова выстаўляе свайго ўдзельніка.

**18 гадзін.**

Каля веснавога вогнішча пачынаецца танцавальная дыска-праграма "Беларускі сувенір", у якой разам з фальклорнымі творамі ў апрацоўцы для вакальна-інструментальных ансамбляў гучыць музыка ў выкананні аркестраў і ансамбляў беларускай народнай песні. Тры невялікія танцавальныя аддзяленні праводзяць Сакавік, Красавік і Май. Пасля першага вальса плошча запаўняецца шумам завірухі, завываннем ветру і звонам капяжу. З'яўляецца Сакавік з блакітным шалікам у руках. У яго аддзяленні — хуткія танцы, загадкі, віктарыны.

Плошчу залівае птушыны спеў. З'яўляецца Красавік, у руках якога — зялёны шалік. Праходзіць танцавальнае аддзяленне гэтага месяца ў праграме якога калейдаскоп народных і сучасных бальных танцаў, аўкцыён сельскагаспадарчых раслін, конкурс на выкананне полькі-весялухі.

Над плошчай чуецца пошчак салаўёў. На эстрадзе з'яўляецца Май - юнак з чырвоным шалікам. У яго аддзяленне ўваходзяць карагоды, фінал конкурсу выканаўцаў частушак. У гэтым конкурсе ўдзельнічаюць і два выканаўцы, задача якіх — пераспяваць адзін другога.

**19 гадзін.**

Гучаць пазыўныя фанфар. Вясна падводзіць вынікі свята. Несцерка вымае з торбы і ўручае пераможцам конкурсаў прызы.

***Вясна.***

Павярнулі з сястрою
Мы сёння на лета —
І вясновыя гімны
Заказалі паэтам.
Кожны птах і лісточак
Ім падорыць па слову —
Каб Вясну-гаспадыню
Апісаць адмыслова.
Я ключы цяпер маю —
Замыкаю марозы,
Адмыкаю паводкі,
Першы сок у бярозы.
І штодня я ступаю
У нагу з хлебасеем,
Каб удача ў працы
Акрыяла надзеяй.
Гэта свята пачало
Шлях мой з вамі сумесны —
Ды к да заўтра. А заутра
Сустрэнемся з песняй.

Гучыць урачыстая мелодыя. Сакавік, Красавік і Май уручаюць Вясне свае каляровыя шалікі. Вясна ўзмахвае імі — і ў паветры рассыпаюцца гронкі святочнага феерверку. Гучыць беларуская народная песня "Бывайце здаровы".

А далей — гульні.

Ледзяная карусель уяўляе сабой пакрытую лёдам пляцоўку круглай формы з высокім слупам у цэнтры. На рухомым коле, якое знаходзіцца на вяршыне слупа, прымацаваны вяроўкі, што звісаюць да зямлі. Жадаючыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдзельнічаць у гульні бяруць у рукі вяроўку і пачынаюць слізгацца па ледзяной дарожцы вакол слупа.

## *Масленка*

*( Заднік сцэны ўпрыгожаны эмблемай з усміхаючымся блінам. На мізансцэне знаходзяцца два кубы. На пляцоўку з песняй " А сення ў нас Масленка, Масленка "выходзяць вядучыя:хлопец і дзяўчына.)*

***Хлопец.***

Ой, добры дзень вам,
Дарагім сябрам.
Сёння ў свята Масленкі
Будзем пяяць песенькі,
Будзем гульні граці,
Зіму праважаці,
Зіму праважаці,
Вясну сустракаці.

***Дзяўчына.***

Хто на Масленку сумуе,
Таму ў годзс не шанцуе.

***Хлопец.***

Значыць, будзем забаўляцца,
І блінцамі сілкавацца.
За вялікі блін, як Сонца,
Трэба працаваць бясконца,
А каб каштаваць аладкі,
Адгадаем мы загадкі.
Я загадваю для дзяўчынак,
Беларускіх малайчынак.

***Дзяўчына.***

А я буду для хлапцоў,
Беларускіх малайцоў.

***Хлопец.***

На полі Ярох рассыпаў гарох — стала світаці, няма чаго збіраці. *(Неба і зоры)*

*(Хто адказвае, частуе аладкай.)*

***Хлопец.***

Трымай аладку,
Каб была, як аладка, гладка.

***Дзяўчына.***

А вы, хлопцы, не сядзіце,
А таксама адкажыце!

Б'юць мяне палкамі, пнуць мяне камнямі, затое мяне глумяць, затое мяне любяць. *(Хлеб)*

*(Хто адказвае, частуе блінам.)*

Трымай блінец,
Каб быў маладзец!

***Хлопец.***

Ну,дзяўчаты, не чакайце
А загадку зноў гадайце!

Жалезны ток, свінячы пераскок, мучная пасцель. *(Скаварада, падмазка і блін)*

*(Хто адказвае, частуе аладкай.)*

За такую цяжкую загадку атрымай, прыгажуня, аладку!

***Дзяўчына.***

Ляцеў птах, на ваду — бах. Вады не скалыхнуў, на дно патануў. *(Снег)*

*(Адказаўшага частуе блінам.)*

Трымай блінок,
Кладзі ў раток!

***Хлопец.***

Стаіць дуб, на дубе 12 гнёзд, у кожным гняздзе па 4 сініцы, у кожный сініцы па 14 яек: сем чорных і сем белых. *(Год)*

*(Адказаўшага частуе аладкай.)*

Хто адгадвае загадкі —
Мае смачныя аладкі.

***Дзяўчына.***

Спераду шыльцы, ззаду вільцы, наверсе чорнае сукно, пад сподам белае палатно. *(Ластаўка)*

*(Частуе блінам.)*

Адгадаў, ну, малайчына!
Паглядзіце: во, хлапчына!

***Хлопец.***

Дзяўчаты, а без чаго хлеба не спячэш? *(Без скарынкі)*

*(Частуе аладкай.)*

Хто з намі не гуляе,
Хай на сябе наракае.

***Дзяўчына.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чорная карова ўвесь свет пабарола, белая ўстала — увесь свет падняла. *(Ноч і дзень)*

*(Частуе блінам.)*

Атрымайце пачастунак —
Масленічны падарунак.

***Хлопец.***

Мы загадкі адгадалі?
*(Адказваюць.)*
Пераможцаў частавалі?
*(Адказваюць.)*
А цяпер, хто еў блінцы,
Дзяўчыначкі і хлапцы,
Падыходзьце к нам хутчэй
Будзем мы гуляць далей!

*(Гледачы выходзяць на пляцоўку.)*

***Дзяўчына.***

Вось яны, нашы знатакі. Паглядзіце, якія яны ўсе прыгожыя.

***Хлопец.***

А ці так яны танцуюць, як красавацца умеюць? Музыканцік, рэзні нам полечку! Ды такую, каб ад танцаў дыміліся падэшвы!

*(Гучыць полька. Удзельннікі разбіваюцца па парах і танцуюць.)*

***Дзяўчына.***

Слухай, *(імя хлопца)*, аднак жа і добра ў іх атрымоўваецца. Адкуль толькі такія танцоры бяруцца?..

***Хлопец.***

І сапраўды, танцаваць яны таксама ўмеюць. Але заўважыў я, што хлопцы у нас нежанатыя. Дзяўчаты, пагуляем? Пакараем хлопцаў за тое, што не ажаніліся ў мінулы мясаед?

*(Адказваюць.)*

Тады станьце, хлопцы, калі ласка, бліжэй да мяне, а дзяўчаты— бліжэй да нашай *(імя дзяўчыны)*. *(Да дзяўчат)* Трымайце вось гэтыя калодкі. Вам іх трэба пачапіць свайму хлопцу на шыю. Калі ласка. *(Чапляюць.)*

***Дзяўчына.***

А вы, хлопчыкі, будзеце адкупацца, бо калі не адкупіцеся, то цягаць вам гэтыя калодкі да тае пары, пакуль не знойдзеце сабе нявесту. Зразумела? А адкупацца мы з вамі будзем прыпеўкамі. Трымайце. *(Раздае прыпеўкі.)*

***Хлопец.***

А вы, дзяўчаты, уважліва назірайце за тым, як хлопцы будуць старацца не застацца з калодкамі. Пачынаем!

*(Хлопцы спяваюць прыпеўкі.)*

Я па беражку бягу —
Бераг асыпаецца.
Я бяззубую люблю —
Яна не кусаецца.

А ў Толевай гармоні
Планкі пазалочаны.
Не любіце, дзеўкі, Толю!
Толя разваллочаны.

Туды-сюды вокам кіну
Няма таго, за кім гіну.
А пры боку сядзіць згрэбла,
Што нікому не патрэбна.

Не хадзіце, дзеўкі, у лазню,
Не хадзіце парыцца.
Ад гарачае прыпаркі
Макіяж адваліцца.

***Дзяўчына.***

Паглядзіце, дзяўчаты, як нашы хлопцы спяваць умеюць, як яны стараліся!.. Ну што, вызвалім нашых малайцоў? Не хадзіць жа ім з калодкамі ўсе жыццё.

*(Адказваюць.)*

***Хлопец.***

Тады здымайце з іх калодкі, і зараз мы пагуляем у вельмі цікавую гульню, якая называецца "Вяроўка". У ей мы паглядзім, які хлопец больш цягнецца да сваей дзяўчыны.

*(Дзяўчаты здымаюць колоды. Памочніцы вядучых іх збіраюць, потым выпосяць вяроўку, звязаную ў кола.)*

***Дзяўчына.***

Хлопцы, зрабіце, калі ласка, невялікае кола ў цэнтры пляцоўкі і трымайцеся за вяроўку, а дзяўчаты стануць вакол хлопцаў у вялікае кола. Будзем вадзіць карагод у розныя бакі. Як толькі спыніцца музыка, кожны хлопец павінен будзе пацягнуцца да сваей дзяўчыны і пацалаваць яе, не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпускаючы вяроўку. Усе зразумела? Тады пачынаем!

*(Пад музыку песні "А я бачыў, бачыў... " праводзіцца гульня "Вяроўка " 3 разы.)*

***Дзяўчына.***

Вось якія ў нас хлапцы-малайцы. Здаецца, нейкая сіла незвычайная цягне іх да сваіх дзяўчат. ***Хлопец.***

Ну што, даражэнькія, будзем далей гуляць. Разбіцеся, калі ласка, на дзве каманды. У кожнай павінна быць 2 хлопцы і 2 дзяўчыны. Разбіліся? Вось і добра. *(Да гледачоў.)* Ёсць у нас 2 вёскі: Заполле і Залессе. Палова залы, па левы бок ад мяне, будзе веска Заполле, і будзе падтрымліваць сваю каманду. *(Паказвае ўбок каманды злева.)* А другая палова, па правы, будзе вёскай Залессе, і падтрымліваць будзе сваю каманду. *(Паказвае ўбок каманды справа.)*

***Дзяўчына.***

Пляскаць у далоні умееце? *(Адказваюць.)* А нагамі тупаць? *(Адказваюць.)* А ну-ка зараз паспрабуем. Залессе! *(Апладзіруюць.)* Заполле. *(Апладзіруюць.)* А цяпер усе разам! *(Апладзіруюць).* Нешта слаба. Хіба кашы не елі? А ну-ка, яшчэ разок разам! (*Апладзіруюць.)*

***Хлопец.***

Ну ўсё, *(імя вядучай)*, хопіць, а то не застанецца ў іх сілаў на гульні. *(Да ўдзельнікаў).* Заполле ды Залессе, зараз правядзем паміж вамі спаборніцтвы. Якая веска больш вясёлая, спрытная да працы, дружная і таленавітая. Станьце, калі ласка, па парах у 2 калоны. Першай пары мы дадзім вось такія стужачкі. Імі вы павінны завязацца адзін да аднаго нагамі. *(Памочніцы завязваюць ногі ўдзельнікаў.) (Да другіх пар).* А вам мы дадзім вось гэтыя абручы *(памочніцы выносяць абручы).* Вы будзеце бегаць па двое ў адным. Далей усё проста: дабягаеце да свайго кошыка, аббягаеце яго і хуценька назад. А вы *(да гледачоў)*, гледачы, падтрымлівайце сваіх. Пачалі!

*(Праводзіцца эстафета ў суправаджэнні полькі.)*

***Дзяўчына.***

Вось якія малайцы! Такіх спрытных я яшчэ не бачыла.

***Хлопец.***

Так-та яно так. *(Да гледачоў.)* Але ўсё ж такі перамагла ў нас веска ... *(Адказваюць.)* Не чую, якая? *(Адказваюць.)* Так, Заполле *(Залессе).* Тым самым яны заслужылі свой першы блін. Калі ласка, апладысменты! *(Памочніца кладзе ў кошык атрыманы блін.)*

***Дзяўчына.***

А давайце зараз паглядзім, якая з нашых вёсак больш дружная. Вы ж ведаеце, якія ў нас завеі бываюць. А вось калі замяце ўсе навокал, ды так, што свету белага не ўбачыш, як вы праз лес прабіраццa будзеце, каб дайсці дадому, надзець шапкі, каб не змерзнуць і вярнуцца да нас на свята? А гэта зараз убачым. Каб не згубіць адзін аднаго, вам трэба трымацца за вяроўку. Вось, трымайце. *(памочніцы раздаюць вяроўкі.)* Вазьміцеся за іх адзін за адным. Вам трэба, аббягаючы кеглі-дрэўцы, дабегчы да сваей "хаты" *(паказвае на куб, дзе ляжаць шапкі),* надзець шапкі і вярнуцца на месца. Хто гэта хутчэй зробіць, той і атрымае чарговы блін. Умовы зразумелыя? Падрыхтаваліся? Пачалі!

*(Гульня праводзіцца пад мелодыю полькі)*

***Хлопец.***

Якія добрыя ў нашых вёсках першапраходцы маюцца. Але ўсе ж такі першай камандай была веска Залессе *(Заполле).* За што ім чарговы блінец.

*(Памочніца кладзе блін у кошык, які стаіць на кубе.)*

***Дзяўчына.***

А паглядзіце, якія ў нашых вёсках хлопцы-красаўцы. А ці маюць яны моц у плячах? *(Да хлопцаў.)* Маеце? *(Адказваюць.)* А зараз мы гэта і выявім! Падыходзьце сюды (паказвае на цэнтр пляцоўкі) па аднаму з вескі. Зараз гуляем у гульню "Накрыж". Станьце адзін да аднаго спінаю і шчапіцеся рукамі! На лік "раз", "два", "тры", хто каго падыме, той і будзе пераможцам. Зразумела? Раз, два, тры!

*(Ідзе гульня "Накрыж ".)*

Чарговы блін за перамогу атрымлівае веска Залессе *(Заполле).*

***Хлопец.***

А якія ж у нашых вёсках гаспадыні? Ці змогуць яны раніцою, калі яшчэ сонца не ўстала і ў хаце цемень "хоць вока выкалі", суп для мужыка свайго зварыць? А каб суп зварыць, трэба гаршчок падчапіць. Што мы з вамі зараз і паспрабуем зрабіць, але з завязанымі вачыма. *(На месца кошыкўу*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*памочніцы ставяць па аднаму гаршку і раздаюць камандам вілкі.)*

***Дзяўчына.***

А вы, хлопцы, станьце каля гаршкоў, толькі так, каб не перашкаджалі глядзець гледачам, і будзеце падказваць сваім дзяўчатам куды ісці. Хто хутчэй падчэпіць гаршчок за пэўны адрэзак часу, пакуль гучыць музыка, той і атрымае блін для сваей вёскі. Зразумела? Падрыхтаваліся? Пачалі!

*(Ідзе гульня "Падчапі гаршчок" у суправаджэнні полькі.)*

***Дзяўчына.***

Вось якія ў нас гаспадынькі добрыя. Мужыкі іх, напэўна, ніколі не застануцца без ежы, але хутчэй справілася з задачай веска Залессе *(Заполле)*. За гэта вам чарговы блін.

***Хлопец.***

Так, ежу мы наварыць зможам, папрацавалі добра, а хто працуе, той і гуляе. Дык давайце зараз пагуляем у "Сняжкі". Трымайце сняжкі, кожнай камандзе па 8 штук. *(Памочніцы раздаюць удзельшкам сняжкі, кожнаму па два. Затым выносяць шэст, на якім зачэплены паветраны шарык.)* Пытанні да мяне ёсць? Няма. Тады лічу да трох і пачынаем. Якая з каманд больш разоў патрапіць у гэты шарык, не заходзячы за чырвоную стужку *(памочніца рассцілае стужку на падлозе)*, тая і будзе пераможцай у гэтай гульні. Пачнём з каманды Залессе. А вы, Заполле, калі ласка, станьце ўпаўкола і будзеце дапамагаць нам сачыць за правільнасцю правядзення гульні і лічыць пападанні. *(Да каманды Залессе.)* Каманда, гатова? *(Адказваюць.)* Тады, калі ласка, першы стрэл!

*(Праводзіцца гульня "Сняжкі". Па яе заканчэнні хлопец падводзіць вынікі, і памочніца кладзе блін у кошык каманды-пераможцы.)*

***Дзяўчына.***

А я такую цікавую гульню ведаю, "Пінгвіны" называецца.

***Хлопец.***

Дык давай пагуляем.

***Дзяўчына.***

Хлопчыкі, станце, калі ласка, тут *(паказвае ў глыбіню пляцоўкі)*, а вы, дзяўчаткі, вось тут і тут. *(Паказвае на два бакі пярэдняга плана пляцоўкі)*. Вось вам, хлопцы, па снегавому камяку. *(Памочніцы выносяць два баскетбольныя мячы, абклееныя паперай, што надае ім выгляд снегавых камякоў і раздае па адным на пару хлопцаў. Потым чырвонай стужкай абазначае стартавую лінію.)*

***Дзяўчына (да хлопцаў).***

Ваша задача — трымаючы гэтыя камякі паміж ног, дабегчы да дзяўчат і пацалаваць сваю, апасля чаго вярнуцца і перадаць камяк наступнаму ўдзельніку са сваей каманды. Але, увага! Перадаваць яго можна толью пасля перасячэння чырвонай стужкі. Зразумела? Тады пачалі!

*(Праводзіцца гульня "Пінгвіны ".)*

***Дзяўчына.***

Вось дык багатыры! Здаецца, за пацалунак каханайне толькі камяк снегавы, але і такі ж камень з месца зрушаць. З такой хуткасцю ў іх усё атрымалася, што нават не ведаю, хто быў першы.

***Хлопец.***

А, можа, вы нам дапаможаце выявіць пераможцу?.. Вёска Заполле! *(Апладзіруюць)*. Веска Залессе! *(Апладзіруюць.)*

***Дзяўчына.***

Здаецца мне, гледачы кажуць, што перамагла вёска Залессе *(Заполле)*.

***Хлопец.***

Хай будзе так. Вось ваш блін.

*(Памочніца кладзе блін у кошык каманды, якая перамагла.)*

***Хлопец.***

Ну вось, у гульні пагулялі, а зараз трэба падлічыць колькасць атрыманых бліноў і вызначыць, якая ж веска перамагла ў нашых маслешчных спаборніцтвах. *(Вядучыя падлічваюць колькасць атрыманых командамі бліноў.)* Аб'яўляю пераможцам вёску Залессе *(Заполле)!* Трымайце вашы блінцы. *(Памочніцы раздаюць бліны з кошыкаў.)* І, канечне, смачныя масленічныя падарункі для нашых пераможцаў.

*(Памочніцы частуюць пераможцаў варэнікамі з сырам.)*

***Дзяўчына.***

Ну, усё, даражэнькія. Бывайце,<br>
Варэнікі, блінцы спажывайце,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Ды Масленку ўспамінайце.

***Хлопец.***

Мы на свяце пабывалі,
Масленку сустракалі,
Наша Масленка гадавая,
Яна госцейка дарагая.

***Дзяўчына.***

Трэба нам далей ісці.
Трэба ўсю Зямлю прайсці.
Людзям песенькі пяяць,
Людзей з Масленкай вітаць.

***Хлопец.***

А вы здаровы бывайце,
Ды праз год нас...

***Разам....*** чакайце!

*(Пад інструментальную кампазіцыю "А сёння ў нас Масленка, Масленка... "вядучыя пакідаюць сцэну.)*

## Маслетчныя забавы

*(Алеся разгадвае крыжаванку, Дзед побач з ей чытае газету.)*

***Алеся.***

Па гарызанталі "Вясёлае народнае свята". Першая літара "М", што за свята? Дзядуля, ты не ведаеш?

***Дзед.***

А ці падыходзіць "Масленка"?

***Алеся.***

Зараз... Вельмі добра! Адгадала! А што гэта за свята з такою смачнай назвай?

***Дзед.***

Гэта не толькі смачнае свята, але і вясёлае! Эх, калі быў я маладым, як мы добра яго святкавалі ў вёсцы. Гэта цудоўнае свята напярэдадні вясны. У нас гаварылі:

"Зіма з вясною сустракаецца,
Пра здаровейка пытаецца". ***Алеся.***

А чаму назва такая?

***Дзед.***

А таму, што вельмі смачныя бліны былі і з маслам, і з мёдам, і са смятанаю. Нават саму Масленіцу запрашалі такімі словамі:

Мы на горцы пабывалі, пабывалі
Ай, люлі, пабывалі.
Масленіцу сустракалі, сустракалі
Ай, люлі, сустракалі.
Сырам гору набівалі, набівалі.
Маслам гору палівалі, палівалі.

*(Гучыць музыка, з'яўляецца Масленіца з кошыкам у руках.)*

***Масленіца.***

Ого-го-го! Хто тут мяне кліча? ***Дзед.***

А вось і Масленіца дарагая, госцейка залатая. Павтаем яе, сябры.

***Масленіца.***

Даўненька ніхто не клікаў мяне.

***Алеся.***

Вось дзіва, дык дзіва. Дык твае словы, Дзеда, чароўныя, гукальныя.

***Дзед.***

Так... Не думаў, не гадаў, нечакана трапіў. ***Масленіца.***

Ну, маленькая гаспадынька, дзе ж масленічныя бліны? Пачастуй мяне.

*(Дзед з Алесяй пераглядаюцца.)*

***Дзед.***

Забаў нашу госцю, а я хуценька збегаю да суседак — у іх кожны дзень бываюць бліны.

*(Выходзіць Дзед.)*

***Масленіца.***

А мяне не трэба забаўляць. Я сама каго хочаш забаўлю.
У нас сёння — Масленіца.
Прыляцела ластавіца.
Села, пала на жэрдачку,
Шчабятала вестачку.

*(Паказвае кошык.)*

Гэта не проста кошык. Гэта скарбонка вясёлых загадак. Іх тут хопіць да самага рання. А той, хто адгадае мае загадкі, атрымае сімвал сённяшняга свята — вось такую маленькую масленіцу.

*(Аастэнты готовы раздаваць "масленіцы ".)*

**Загадкі:**

**1)** Якую краіну носяць на галаве? *(Панама)*
2) Без рук, без ног, а ўгару лезе? *(Цеста)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) На якое пытанне нельга даць сцвярджальны адказ? *(Ты спіш?)*

4) Хто вылазіць са скуры? *(Змяя)*

5) Хто гаворыць на ўсіх мовах? *(Рэха)*

6) У якой рэчцы прысутнічаюць тры ноты? *(Місісіпі)*

7) У жываце лазня, у носе рэшата, адна рука, ды і тая на плячах? *(Чайнік)*

8) Які востраў скардзіцца на сваю велічыню? *(Ямал)*

9) Якая птушка носіць назву танца? *(Чачотка)*

10) Нашу іх шмат гадоў, а колькасць ім не ведаю? *(Валасы)*

11) Адной рукой усіх сустракае, другой – прапскае? *(Дзверы)*

12) Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках? *(Рэшата)*

13) Пад якім дрэвам заяц стаіць у час дажджу? *(Пад мокрым)*

14) У якіх грыбоў шапачкі рознага колеру, але ўсе яны носяць адно імя? *(Сыраежкі)*

15) Хто два разы нараджаецца, адзі раз — гладкі, а другі раз — мяккі? *(Яечка, а потым качаня)*

16) Якая рака ў нас у роце? *(Дзясна)*

17) Што ідзе, не рухаючыся, з месца? *(Час)*

18) Па мору ідзе, ідзе, а да берага дойдзе, тут і прападзе? *(Хваля)*

19) Белы, як снег, у гонары ва ўсіх? *(Цукар)*

20) Калі хлопчыка называюць жаночым імем? *(Соня)*

21) Мяне б'юць, калоцяць, варочаюць, рэжуць — я усё цярплю, усім дабром плачу...*(Зямля)*

22) Наведзена шкляное вока, пстрыкне раз і помніць вас. *(Фотаапарат)*

23) У залаты клубочак схаваўся дубочак? *(Жолуд)*

24) Не мора, а хвалюецца? *(Ніва)*

25) З віду — клін, развернеш — блін? *(Парасон)*

*(Вяртаецца Дзед з 3-мя суседкамі. Яны трымаюць у руках талеркі з блінамі, на кожнай талерцы па 5 бліноў.)*

***Масленіца.***

Ну, зараз можна і пачынаць. І тых, хто атрымаў "масленіцу-дзяўчынку", я ў першую чаргу пачастую блінамі. Калі ласка. Падыходзьце на сцэну.

***Алеся.***

А як жа святкавалі Масленіцу?

*(У час дыялогу 3-х суседак фарі1руюцца каманды.)*

*(Суседкі перабіваюцъ адна адну.)*

***Суседка 1.***

У нас песні розныя спявалі.

***Суседка 2.***

І на арэлях гушкаліся.

***Суседка 3.***

І смачнаю ежаю частаваліся.

***Суседка 1.***

А як на конях ды санках каталіся.

***Суседка 2.***

Ды ў снежкі гулялі.

***Суседка 3.***

Спаборнічалі паміж сабою ў сіле і ў спрытнасці.

***Суседка 1.***

Ды ўсе т не пералічыш.

***Масленіца.***

Мяркую, што зараз таксама цікавыя спаборніцтвы атрымаюцца. Але пакуль частавацца блінамі, няхай каманды пакажуць свій спрыт. Але і бліны ў нас незвычайныя, яны прыгатаваны рукамі лепшых майстроў, навучэнцаў І курса завочнага аддзялення. Вось гэтамі прыгожымі дзяўчатамі і хлопцамі. ***Суседка 2.***

А зараз кожная з нас стане з блшамі насупраць каманд, кожны з вас па чарзе павінен дабегчы да бліноў, узяць адзін з іх, аббегчы вакол нас і стаць у канцы каманды. Як толькі каманда справіцца з гэтым заданнем, вам патрэбна як мага хутчэй з'есці блін. Якая каманда хутчэй пачастуецца, зараз мы гэта пабачым.

*(Гучыць музыка, ідзе конкурс.)*

*(Пасля заканчэння конкурсу тая каманда, якая прайграла, атрымлівае сувенір.)*

***Масленіца.***

Я думаю, вы не толькі Масленіцу сустрэлі, блінамі начаставаліся, але і сувеніры ад нас атрымаеце.

*(Уручаюцца сувеніры.)*

*(Пасля ўзнагароджання прайграўшая каманда спускаецца ў залу.)*

***Суседка 3***.

Ой, Зося, у мяне збан малака ёсць, я пра яго зусім забылася.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Суседка 1.***

Ага, забылася. Нясі, боўдзіла.

*(Выходзіць суседка з 2-ма збанкамі малака.)*

***Суседка 3.***

Малачко ў мяне, што мядок. Так і льецца ў раток. Праўда, суседачка, масленічныя бліны добра і малачком запіць. Згодны?

***Суседка 2.***

Каманда-пераможца атрымае нечаканую ўзнагароду. Вось вам саломінкі, праз якія вы павінны напераганкі выпіць малако. Гатовы да гульні?

*(Гучыць музыка, ідзе конкурс.)*

***Суседка 3.***

А цяпер таму, хто перамог у гэтай гульні, уручаюцца медалі "Лепшы малакасос".

*(Камандзе вешаюцца на шыю вялікія соскі, уручаецца медаль.)*

Павіншуем пераможцаў! А вам дзякуй за ўдзел у конкурсе. Прыміце на памяць падарункі і праходзьце ў залу.

***Суседка 1.***

Паважаныя малакасосы, а зараз вы будзеце гуляць кожны сам за сябе і змагацца за галоўны прыз і тытул.

***Масленіца.***

А хто з вас ведае, якія птушкі да нас вясну-красну прыносяць? *(Называюць.)* Дык вось, кожны з вас павінен адправіць сваю птушку як мага далей. Чыя птушка даляціць далей, той і пераможа.

*(Гучыць музыка, удзельнікі па чарзе пускаюць размаляваныя самалёцікі. Асістэнты ў зале адзначаюць пераможцаў, праіграўшы атрымлівае прыз і ідзе ў залу.)*

*(У гэты час рыхтуецца рэквізіт— тры кеглі.)*

***Алеся.***

Як толькі сціхне музыка, вы павінны схапіць кеглі, хто застанецца без кеглі, той і прайграе.

*(Гучыць музыка, ідзе гульня.)*

*(Прайграўшаму ўручаецца прыз, і ён праходзіць у залу.)*

***Суседка 2.***

Параска, што табе нагадвае гэты абруч? ***Суседка 3.***

Ой, абруч, ён круглы, як сонейка. А на Масленіцу вялікая пашана была тым рэчам і дзеянням, якія нагадваюць сонца. І бліны круглыя, ды жоўтыя, і колы, якія часта запальвалі, таксама круглыя.

***Суседка 1.***

Нават на конях ездзілі вакол вёскі, каб адзначыць кола.

***Алеся.***

А мы зараз усё гэта забылі. Але гуляць з абручамі таксама любім.

***Масленіца.***

О, гэта вельмі масленічная гульня, давайце і мы з вамі згуляем. Хто даўжэй пракруціць абруч.

*(Гучыць музыка, круцяць абруч. У каго першага зваліўся, яму ўручаецца прыз і адпускаюць у залу.)* ***Алеся.***

Слухай, Дзядуля, я паглядзела сёння на цябе, які ты добры і цікавы чалавек. Я іншым часам крыўдзіла цябе, даруй мне, Дзядуля.

*Дзед.*

Добра, унучка, што ты ўспомніла пра гэта ў сённяшні дзень. Раней у апошні дзень Масленіцы людзі заўжды прaслі прабачэння адзін у аднаго за нанесеныя крыўды.

***Суседка 2.***

А ў маёй вёсцы пасля Масленіцы будзілі мядзведзя. Безумоўна, не па-сапраўднаму, лічылася, што як толькі мядзведзь прачнецца, дык і вясна пачнецца.

***Алеся.***

Гэта цудоўна, давайце і мы разбудзім мядзведзя, ён у нас яшчэ моцна спіць у бярлозе пад снегам.

*(Пасярэдзіне сцэны ляжыць мядзведзь, схаваны пад газетамі, як пад снегам )*

*(Удзельнікі па чарзе павінны дабегчы да мядзведзя, зняць з яго па 1 газеце і прынесці на сваё месца. Пераможа той, хто зніме больш газет.)* ***Мядзведзь.***

Ой, вясёлае сёння свята,
І гасцей тут вельмі багата.
Каб праз год зноў Масленіцу спаткаці,
Дазвольце вам пажадаці:
Мець торбу грошай.
Бяды не знаць ніколі
І смерці нідаволі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каб багатыя былі,
І сто год жылі.

***Масленица.***

Ну калі і мядзведзь прачнуўся, час мне развітвацца з вамі да паступнага года.

*Алеся.*

Пачакай, Масленіца, зараз мы яшчэ пераможцу ўзнагародзім, а потым і цябе праводзім.

***Масленіца.***

А вы як мяне праводзіць будзеце? Раней мяне спальвалі на вогнішчы, сплаўлялі па рэчцы, наладжвалі пахаванні. ***Алеся.***

Не бойся, Масленіца, не спалім цябе і не патопім.

*(Узнагароджваецца пераможца. Даецца тытул "Міс Масленаца " ці "Містэр Масленіца ".)*

*(Гучыць музыка.)*

***Дзед.***

Ідзі, зіма, да Кракава,
Зноў ты прыйдзеш аднакава,
Ідзі, зіма, да Кіева,
Ты там лета пакінула,
Ідзі, зіма, да крынічкі,
Ды забірай рукавічкі.
*(Масленіца выходзіць, а за ей і ўсе.)*

## *А мы Масленку чакалі*

Рэжысёрскі аналіз гульнёвай праграмы "Масленіца". Абгрунтаванне выбару: Масленіца прыцягнула маю ўвагу таму , што гэта, на мой погляд, адно з самых вяселых і цікавых святаў Беларусі, крыху забытае, і таму мне хацелася ўзнавіць яго самабытнасць хараство.

**Тэма:** "Масленіца".

**Ідэя:**

**№ 1.** Адраджэнне і ўзнаўленне старадаўніх звычаяў святкавання Масленіцы на Беларусі.

**№ 2.** Далучыць найбольшую частку насельніцтва да святкавання гэтага свята.

**Сцэнарна-рэжысёрскі ход:** апавяданне пра свята, аб звычаях святкавання гэтага свята.

**Носьбіты сцэнарна-рэжысёрскага ходу:** вядучая.

**У дэкаратыўным вырашэнні:** эмблема "Масленіца", стол, накрыты абрусам з масленічнымі стравамі, жэтоны "Сонейка".

У музычным: мелодыя-лейтматыў "А я бачу, бачу", беларуская народная песня "А ў нас сёння Масленіца", беларуская полька.

**У пластычным:** гульні, танцы.

**Кампазіцыйная пабудова:**

1. *Экспазіцыя:* мелодыя-лейтматыў, выхад вядучай.
2. *Завязка:* знаёмства са святам, прыказкі.
3. *Развіццё падзей:* спаборнніцтва ў гульнях, конкурсах.
4. *Кульмінацыя:* полька усіх удзелышкау.
5. *Развязка:* "прабачэнне" вядучай, раздача пачастункаў.
6. *Фінал:* пажаданне вядучай, развітанне з гледачамі.

**Развіццё падзей:**

- музычны ўступ
- прывітанне вядучай
- прыказкі
- гульня "Запляці касу"
- аўкцыён
- загадкі
- гульня "Звяжы венік"
- вешанне калодкі
- загадкі
- гульня "Спячы блін"
- гульня "Збяры сямейку"
- прабачэнне ўдзельшкау гульні і вядучай
- пажаданні і развтанне вядучай.

**Рэквізіт:**

- два венікі
- дзве скавароды
- дзве хусткі
- два стула
- вянок

**Пызы:** бліны.

**Каштарыс:** мука — 140 т., яйкі — 50 т., малако —40 т., венікі - 170т. р.

Сцэна па-святочнаму ўпрыгожана: на сцэне стаіць стол,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

засцелены абрусам. На стале абрадавыя стравы "Масленіцы" *(бліны, сыр, масла, тварог, варэнікі)*. Заднік сцэны ўпрыгожаны эмблемай "Масленіцы". Гучыць матыў беларускай народнай песні "А я бачу, бачу". На сцэну, прытанцоўваючы, выходзіць вядучая.

***Вядучая.***

А у нас сёння Масленіца!
Прыляцела ластавіца!
Села-пала на калу,
Кідала масла па каму.
А мы Масленку чакалі —
Усю нядзельку выглядалі.
А мы думалі Масленка сем нядзеляк,
Ажно Масленка сем дзянёчкаў!

Вось і дачакаліся мы з вамі вясёлай Масленкі, з блінамі, маслам, варэнікамі. Адзначалі Масленку звычайна сем дзянёчкаў. Першы дзень Масленкі называлі "Сустрэчай", ці "Стрэчанне". У гэты дзень Масленку сустракам і велічалі. Давайце і мы з вамі павітаем нашу Масленіцу. А павітаем мы яе вясёлымі прыказкамі і прымаўкамі. Ці згодны вы?

*(Глядач адказвае.)*

***Вядучая.***

Так, я буду называць першую частку прыказкі, а вы — другую:

1. Масленіца -палізуха: сыр і масла палрізала. (за *адказ уручаецца жэтон "Сонейка ".)*
2. Масленка з блінамі, а пост з грыбамі.
3. Будзе Масленка, будзе ля пупа краснеnька.
4. Масленка-палізуха працягніся хоць да духу.
5. Масленка-белавутка казала вясна буду ды не хутка.
6. А мы Масленку чакалі — усе аладкі выпякалі.

Вось і павіталі мы з вамм вясёлую нашу Масленіцу. А цяпер, хто атрымаў ад мяне "Сонейка", я запрашаю падысці да мяне *(гучыць мелодыя песні "А я бачый, бачый", удзельнікі падыходзяць да вядучай.)*

***Вядучая.***

Я папрашу вас утварыць дзве каманды па тры чалавекі ў кожнай. Адна каманда, станьце ад мяне з правага боку, другая — з левага *(удзельнікі ўтвараюць дзве каманды).*

***Вядучая.***

Другі дзень Масленіцы называўся "Зайгрышы", ці "Загвіны". У гэты дзень з гор каталіся, каб доўгі лен рос.

Вось і мы вызначым, у якіх гаспадароў лен вырасце лепшы ў гэтым годзе. Кожная каманда павінна будзе заплесці касу з ільну. Тая каманда, якая хутчэй і прыгажэй запляце касу, і будзе пераможцай. Бярыце кожны па адной частцы і па маёй камандзе на лік "тры" пачынаем плесці касу. Я думаю, што вы, даражэнькія мае гледачы, дапаможаце мне палічыць. Так, усе разам: "Раз, два, тры". *(Гучыць мелодыя песні "А я бачыў, бачыў ", ідзе гульня.)*

***Вядучая.***

Давайце ж паглядзім, якая каманда ў нас перамагла, хто прыгажэйшую касу заплёў. А вызначым пераможцаў па вашых апладысментах. Апладысменты гэтай касе *(гучаць аплодысменты).* Цяпер гэтай *(апладысменты гледачоў).*

***Вядучая.***

Нешта я нічога не зразумела. Зараз я гэтыя косы да сябе і прычаплю, адразу будзе бачна, якая каса лепшая *(вядучая прычэплівае косы, бярэ адну касу).*

***Вядучая.***

Так, апладысменты гэтай касе *(гучаць апладысменты),* цяпер гэтай *(апладысменты).*

***Вядучая.***

Па вашых апладысментах зразумела, што пераможцам стала вось гэта каманда. Яны заплялі лепшую касу. Значыць, у гэтым годзе ў вас вырасце доўгі, прыгожы лён і ўвогуле вы дачакаецеся добрага ўраджаю. *(Звяртаецца вядучая да другой каманды.)* А вы не бядуйце, мае даражэнькія, а частуйцеся маімі масленічнымі блінамі. *(Гучыць музыка, удзельнікаў частуюць блінамі, і яны займаюць сваё месца ў зале.)*

***Вядучая.***

Бліны — галоўны пачастунак на Масленіцу, таму што яны вельмі падобныя да сонца, якому людзі вельмі рады пасля доўгай зімы. У сераду на Масленіцу цешчы пяклі бліны і чакалі да сябе ў госці зяцёў, каб пачаставаць іх сваімі смачнымі блінамі *(выносяць горку бліноў).* Той, хто адкажа, колькі бліноў у мяне ў гэтай горцы, будзе лічыцца самай лепшай цешчай, ці самым лепшым зяцем *(бліноў 7, так як 7 дзён у Масленіцы;)* калі пераможцай стала жанчына, жадаю табе заўсёды свайго зяца такой горкай бліноў сустракаці, калі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мужчына - а табе жадаю цешчу кахаць і часцей у яе ў гасцях бываць. *(Пад музыку пераможцу ўручаюцца бліны.)*

***Вядучая.***

Вось і надышоў чацвёрты дзень Масленіцы. Гэты дзень называйся "Дзень святого Уласа". Лічылася, што ў гэты дзень павінен праспяваць першы раз жаваранак. У гэты дзень ушаноўвалі маладых, якія пажаніліся ў гэтым годзе. А яшчэ ў гэты дзень хадзілі ў лазню. А паколы ў лазню больш любяць мужчыны хадзіць, то мае загадкі менавіта для мужчын.

1) Повен падпечак чырвоных яечак. *(Жар, вуголле)*
2) Зелена зялёнка, звязана галоўка. *(Венік)*

***Вядучая.***

Як я ўжо казала, у чацвер на Масленіцу хадзлі ў лазню. А якая ж лазня без веніка! Ці так? Вось і зараз вы павінны будзеце венік звязаць. Хто хутчэй звяжа венік, той і будзе лічыцца пераможцам. *(Гучыць мелодыя песні "А я бачыў, бачыў ". Ідзе гульня.)*

***Вядучая.***

Пераможца ў нас вось гэты ўдзельнік, вось табе за гэта пачастунак (уручаецца пачастунак, ён садзіцца ў зал.)

***Вядучая.***

А ты пакуль што, хлопец, застанься. На Масленіцу быў такі звычай "Калодкі вешаць". Вешалі звычайна калодкі тым хлопцам, якія яшчэ не ажаніліся. А мы табе калодку вешаем за тое, што ў нашай гульні прайграў.

*(На ўдзельніка вешаюць калодку.)*

***Вядучая.***

А калі ты ад яе пазбавіцца хочаш, то адкупляйся ці грашыма, ці пачастункамі, а калі няма, тады няхай нашы гледачы скажуць што табе рабіць, якое задание выканаць *(удзельнік выконвае прапанаванае жаданне гледачоў).*

***Вядучая.***

Ну, малайчына. Цяпер, я думаю, з цябе можна калодку зняць *(пад апладысменты гледачоў удзельніку здымаюць калодку і уручаюць пачастунак).*

***Вядучая.***

А цяпер я хачу зноў загадкі загадаць і зноў толькі хлопцам. Слухайце і адгадвайце:

1. Матка таўстуха, бацька краснуха, а сын Фядос пайшоў да нябес. *(Печ).*
2. Мой брат Кандрат як устане, дык да неба дастане. *(Дым)*

***Вядучая.***

Прыйшоў пяты дзень Масленіцы, які называўся "Цешчыны вячэркі". У гэты дзень зяці сваіх любімых цешчаў у госці запрашалі. Ну а калі цешчу запрасілі, трэба ж яе нечым частаваці. А чым частаваць на Масленіцу, як не блінамі? Вось і вы зараз будзеце тут для сваіх цешчаў бліны пячы *(хлопцам уручаюцца патэльні).* Вы павінны будзеце паставіць патэльню на пліту, але спачатку мы вам вочкі завяжам. *(У залу.)* А вы, паважаныя мае, не проста глядзіце, а падказвайце хлопцам, куды ісці, улева ці ўправа *(хлопцам завязваюць вочы, раскручваюць, гучыць музыка, ідзе гульня).*

***Вядучая.***

Малайцы, хлопцы, але вось у чым справа, не любіць цешча бліноў, што на пліце пякліся, ей падавай бліны з печы, з пылу, жару. І вам патрэбна бліны ў печы напячы. Гэта значыць паставіц патэльню пад стул, у печ *(удзельнікам зноў завязваюць вочы, раскручваюць, гучыць музыка, ідзе гульня).*

***Вядучая.***

Вось наш пераможца, добры зяць у цешчы будзе, вось табе пачастунак, частуйся, калі ласка, нашымі блінамі і сядай на месца *(удзельнік гульні пад музыку праходзіць у залу).*

***Вядучая.***

А ты, хлопец, пачакай, табе трэба сярод дзяўчат нашых прыгожых, што знаходзяцца ў нашай зале, выбраць сабе нявесту *(гучыць музыка, хлопец выбірае сабе дзяўчыну з залы).*

***Вядучая.***

Вось якая ў нас прыгожая пара атрымалася! Давайце гэту пару пажэнім (дзяўчыне адзяваюць на галаву вянок). Вось у нас нявеста, а вось і жаніх, і мы папросім вас, каб вы крышку для нас патанцавалі *(гучыць полечка, хлопец з дзяўчынай танцуюць).*

***Вядучая.***

Дзякуй вам за полечку, так мы з вамі добра весяліліся, што дачакаліся шостага дня Масленіцы. У гэты дзень нявестка збірала да сябе ў госці ўсю мужаву радню. Вось і мы будзем збіраць усю радню да сябе. Ты, хлопец, выберы сабе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маці, а ты, дзяўчына, свёкра з зала і запрашайце іх сюда да нас на сцэну. *(Гучыць музыка, удзельнікі падыходзяць да вядучай).*

***Вядучая.***

Зноў танцуем полечку. *(Гучыць полечка, усе танцуюць.)*

***Вядучая.***

А цяпер збірайце да сябе ўсю радню, дзядзечак, цётак, братоў, сватоў, запрашайце ўсіх на вясёлую полечку.

***Вядучая.***

Дзякуй вам, даражэнькія, за полечку. Так добра мы з вамі весяліліся, гулялі, што і да апошняга сёмага дня Масленіцы дабраліся, які называўся "Прабачальная бяседа". У гэты вечар усе родныя прасілі прабачэння адзін у аднаго. Звычайна казалі: "Прабач, калі саграшыў перад табой справай ці языком". А цяпер, паколькі ў нас тут сабралася ўся сямейка, і сваты, і браты, і кумы, прыйшла пара прасіць прабачэння адзін у аднаго. Прасіце прабачэння адзін у аднаго і цалуйцеся. *(Гучыць музыка, ідзе гульня).*

***Вядучая.***

Цяпер прыйшла пара і мне прасіць прабачэння: "Прабачце, мае даражэнькія, калі чым саграшыла перад вамі, справай ці языком. Можа, каго засудзіла, ці выбачаеце вы мяне? *(Адказы ўдзельнікаў.)* Дык тады і мяне цалуйце.

***Вядучая.***

Дзякуй вам, даражэнькія, за спрыт, за вясёласць вашу. У народзе кажуць: "Хто людзей весяліць, за таго ўвесь свет стаіць". Вось і мы з вамі сёння добра павесяліліся. *(Усіх удзельнікаў частуюць бліна, яны праходзяць у глядзельную залу.)*

***Вядучая.***

А цяпер бывайце, праз год Масленку чакайце.
З Масленкай вас, ды з вясёлаю.
З вясной яснай.
З долечкай шчаснай!
*(Вядучая кланяецца і выходзіць.)*

# *Гуканне вясны*

У дзень свята з раніцы ўпрыгожваецца месца правядзення мерапрыемства згодна з эскізамі мастака. Апошняя падрыхтоўка да свята ідзе на вачах удзельнікаў і гледачоў для таго, каб больш людзей прыцягнуць да ўдзелу ў святе і стварыць святочную атмасферу. На галоўным мізансцэнічным пункце — цэнтральнай пляцоўцы - устанаўліваецца вялікая канструкцыя з эмблемай свята, на якой уверсе знаходзіцца зробленая рукамі дзяцей драўляная круцелка, упрыгожаная чатырма рознакаляровымі птушкамі. Пляцоўка абнесена чырвонай стужкай, якая прымацавана да шастоў, размешчаных на адлегласці 2—3 метры. Папяровыя птушачкі аздабляюць гэтыя шасты. З правага боку размяшчаецца пляцоўка для вогнішча і месца для правядзення гульнёвых праграм. Канструкцыя вогнішча мае форму трохкутніка і нагадвае птушыны клін у небе. Злева ад галоўнай пляцоўкі знаходзіцца зона для выстаўкі шпакоўняў пад назвай "Птушкаград". Насупраць "Птушкаграда" размяшчаецца выстава жывых птушак "Карлуша". Уваход на свята афармлены эмблемай і канструкцыяй, якая аздоблена дзіцячымі падзелкамі — на белай тканіне зроблены рознакаляровыя аплікацыі на веснавую тэму. На алеі паміж дрэвамі размясціліся выставы папяровых птушак і фантастычных птушыных будынкаў. Збоку, каля ўваходу на свята, працуюць гандлёвыя рады з веснавой прадукцыяй: пернікамі, печывам, булачкамі ў выглядзе птушак, лапак буслікаў, гаспадарчых прылад — сахі і бараны.

Да пачатку свята ўдзельнікі і гледачы, фальклорныя гурты збіраюцца каля галоўнай пляцоўкі, а потым накіроўваюцца у розныя бакі: частка гледачоў і некалькі гуртоў — на ўзбярэжжа воднага канала, а астатнія — у супрацьлеглы бок, на пагорак. *Гучыць музыка М.Коншына "Беларускі танец", і на яе фоне ідзе дыктарскі тэкст:*

Гэй, народ!
Збірайся ў карагод!
К нам вясна ідзе,
Сонейка нясе!
Спяшайцеся, людзі добрыя!
Спяшайцеся, людзі званыя!
Міласці просім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Завітаць да нас у госці!
З намі разам пойдзем
І вяселле знойдзем,
Будзем песні спяваць
Весяліцца, гуляць
Ды вясну гукаць!

*Гучыць народная песня "Прыйдзі, вясна"(муз. М. Сіраты), і праз некалькі хвілін па радыё дыктар запрашае:*

Хутчэй спяшайцеся, хутчэй!
Чакаем мы ўсіх гасцей.
Прыходзьце ўсе з адкрытаю душою,
Каб сустрэцца нам з вясною.
Будзем карагодзіць, усміхацца
Ды ў гульні забаўляцца!

*Гучыць музыка Н.Купрыяненкі "Беларускія найгрышы ", потым на фоне музыкі дыктарскі тэкст:*

Дазвольце, людзі добрыя,
Вясну-красну заклікаці!
Благаславіце, людзі добрыя,
Вясну-красну загукаці!
Гэй, народ!
Збірайся ў карагод!
Гэй, народ!
Вясна ля варот!
Дзяўчаты-маладзіцы,
Прыгажуні-чараўніцы,
Прачынайцеся, падымайцеся,
У святочныя адзенні апранайцеся!
Будзем усе разам спяваці,
Вясну-красну гукаці!
Прыйдзі, вясна!
Прыйдзі, красна! Гу-у!

У запісу гучаць вяснянкі-заклічкі ў выкананні розных гуртоў. У гэты момант з узвышша (пагорка) і з узбярэжжа канала адначасова ў 11.00 пачынаецца шэсце ўдзельнікаў свята, якія ідуць і спяваюць вяснянкі. Дзеці ў руках трымаюць зяленыя галінкі, да якіх прымацаваны маленькія папяровыя птушачкі. Шэсце набліжаецца да галоўнай пляцоўкі і становіцца паўкругам ля яе. *Гучаць пазыўныя свята —беларуская народная песня "Жавароначкі, прыляціце ".*

*Вядучы-Жаваронак набліжаецца да мікрафона:*

Добры дзень вам, даражэнькія!
Дзякуем, што на свята прыйшлі ў госці!

*Гучыць музыка М. Сіраты "Сустрэча вясны ", на яе фоне вядучы - Жаваронак працягвае:*

Вясна... Якое пяшчотнае і духмянае слова. Яно звініць вясеннім капяжом, дыхае свежасцю першых пралесак. Ушануем вясну,ушануем вялікае сонца, траву росную, неба чыстае, песню шчырую! Няхай свята пяе, няхай галасы звіняць, няхай птушкі ў неба ляцяць!

Гучыць урачыстая веснавая песня, і над пляцоўкай з двух бакоў узлятаюць галубы, якія робяць у небе кругаабароты. Адначасова дзеці падымаюць галінкі ўгору і пагойдваюць імі. *Пад канец песні Жаваронак кажа:*

Гаманкі ручаёк,
Ты — вясны пачатак.
Карагод, карагод —
Спадарожнік свята.
Гаспадыняй Вясна
Стане ў нашым краі,
У дарозе яна, хутка завітае.
Станем мы ў карагод
З добрай весялосцю
І сустрэнем прыход
Маладзенькай госці.

Фальклорныя гурты і харэаграфічны гурт заводзяць карагод, у які запрашаюцца гледачы, госці свята. Ідзе вялікі карагод, у канцы якога гучыць музычны фон — шум ветру, нібы ляціць Халодная Завея. У сярэдзіну галоўнай пляцоўкі выбягае дзяўчына, якая выконвае сольны танец Завеі. *На фоне танца ідзе дыктарскі тэкст:*

Гэта я — Халодная Завея,
Што, не чакалі?
Вясну сустракалі!
Ха-ха-ха!
Не дам вам свята гуляць.
І не будзеце песні спяваць.
Напушчу непагадзь, холад ды вецер,
Каб зіма была ва ўсім свеце!

Пасля гэтых слоў дзяўчаты з харэаграфічнага гурта бяруць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Халодную Завею ў маленькае кола, каб агарадзіць ўсіх людзей ад Завеі. *На фоне шуму ветру Завея з пагрозамі звяртаецца да дзяўчат:*

А вас у лядзяшкіператвару
І ні за што вясну на парог не пушчу!

*Дакранаецца да іх, і яны прысядаюць на кукішкі, як бы "замярзаюць", а Завея кажа:*

Вось будзе пацеха!
Вось дзе я разыйдуся!

*Вядучы-Жаваронак звяртаецца да людзей (у мікрафон):*

Людзі добрый, дапамажыце!
Завіруху праганце!
Каб сонца паднялося вышэй
І засвяціла ярчэй.
Тады яно прыгрэе землю
І прагоніць Халодную Завею,
Абудзіцца зямля.
Прыйдзі, прыйдзі хутчэй да нас, Вясна!

Гучыць у запісу беларуская народная песня "Прыйдзі, прыйдзі, вясна", і дзяўчаты, якія застылі ў маленькім коле вакол Халоднай Завеі, на фоне гэтай песні пачынаюць падымацца, адначасова падымаючы ўгору сашчэпленыя рукі, "адчыняючы акенцы" для прыходу Вясны і вяснянак. У гэты момант Халодная Завея пачынае "таяць" *(прысядае на кукошкі і адыходзіць назад з кола).* Яе месца займае Вясна з вяснянкамі. *Зноў гучыць музыка М.Сіраты "Сустрэча вясны",* І *на яе фоне ідзе дыктарскі тэкст:*

Ідзе вясна ў шумлівых водах,
У звонкім срэбры ручаёў
І разлівае мяккі подых,
Як песню нейкую без слоў.
Звініць паветра і гамоніць,
А даль так свежа, так ясна.
Дзень добры вам, лясы і гоні!
Дзень добры, юная Вясна!

Дзяучаты з маленькага кола адыходзяць назад, на свае месца, а вяснянкі з Вясной, знаходзячыся ў цэнтры кола, выконваюць маленькую харэаграфічную кампазіцыю. *На фоне той жа музыкі і пераліваў птушак гучыць дыктарскі тэкст:*

Ляціце, птушкі веснавыя,
Нясіце ключы залатыя,
Адмыкаць зямліцу,
Выпускаць расіцу,
І густую, і частую,
І пёплую, і мокрую,
На ўвесь свет
І на кожны цвет.

Ляцщь Шэрая Галачка, аблятае ўсю прастору пляцоўкі і накіроўваецца да Вясны. *Пад гукі і пералівы званочкаў Шэрая Галачка перадае веснавыя ключы Вясне і кажа:*

Вясна, вясна, вясняначка,
Прымі залатыя ключы
Ад роднай нашай зямлі!

***Вясна адказвае:***

Гэты дар прымаю,
Усім людзям міру жадаю.
Каб усім вам сонейка свяціла,
І здароўе ўсім вам была.

Вясна прымае ключы і разам з вяснянкамі і Шэрай Галачкай накіроўваецца да вядучага – Жаваронка. *Адначасова з гэтымі дзеяннямі ідзе дыктарскі тэкст:*

Усё Вясна старанна падлічыла
І сонцам абагрэла кожны кут.
Ідзі хутчэй, мы шчыра запрашаем,
Бушуй, квітней ты з намі тут!

*Вядучы-Жаваронак сустракае Вясну, вяснянак, Шэрую Галачку, трымаючы ў руках ручнік са збаночкам зерня.*

Бяры зярно і засявай
Палёў шырокія абшары,
Хай новы дзень здабыткам будзе,
Нясе ён радасць, шчасце людзям.

*На фоне той жа музыкі Вясна прымае ад вядучага-Жаваронка збаночак з зернем і ў адказ гаворыць:*

О, зямля!
Ты ўся ў абновах!
Ты ў мильён званочкаў звоніш.
Ты на ста пявучых мовах
Песняй-радасцю гамоніш.
Ты ўздыхнеш на поўны грудзі —

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У полі будуць скібы ўзняты,
Засявайце ж нівы, людзі,
Прымай, зямля, зярняты!

*Вясна з паклонам ставіць збаночак з зернем на падстаўку. У канцы музыкі да мікрафона набліжаецца Шэрая Галачка і кажа:*

Вясна-вясняначка,
Мы так цябе чакалі,
Вясна-галубушка,
Мы так цябе гукалі!

***Адзін з фальклорных гуртоў падхоплівае:***

Ой, вясна-маці,
Хадзі да нас гуляці!

***2-гі гурт:***

Хадзі гуляці
У карагодзе скакаці!

***3-ці гурт:***

У карагодзе скакаці,
Песні спяваці!

***4-ты гурт:***

Песні спяваці,
Усіх частаваці!

***Усе гурты разам пачынаюць спяваць:***

Ой, вясна, ой, вясна,
Ды што ты нам вынесла, вынесла,
І з кораба вытрасла, вытрасла.

***Вясна (спявае):***

Ды ўсе жыта, пшаніцу, пшаніцу,
Ды цёплую вадзіцу, вадзіцу,
Ды з лукошак гарошак, гарошак.

Гэты дыялог пераходзіць у веснавую карагодную песню, якую заводзіць Вясна з вяснянкамі, вядучы-Жаваронак і Шэрая Галачка. *Гучыць песня "Вясна-красна наставала":*

Вясна-красна наставала,
Ой, наставала,
Снягі з поля саганяла,
Ой, саганяла.
Вясна-красна вясёлая,
Ой, вясёлая,
Кругом трава зялёная,
Ой, зялёная.
Весяліла зямлю, воду
І мяне, мяне маладу.
Ой, зямлю, воду
І мяне, мяне маладу.
А дзе горы-далінаčкі,
Там дзевачкі, парабочкі,
Ой, гуляючы, ой, спяваючы,
Ой, вясну-красну праслаўляючы! Ой!

*У канцы карагода Вясна і вядучы-Жаваронак ідуць на месца галоўнай пляцоўкі (да мікрафона) і Вясна гаворыць:*

Хай веселле звініць у наваколлі,
Шануючы спадчыну матчыну.
Са святам вас, людзі, вітаю
І ўсіх на гульні запрашаю.

Ідзе гульнёвая праграма "Птушыныя гульні", пасля якой гучаць пазыўныя свята. Да мікрафона набліжаецца Вясна, трымаючы палаючую паходню, і гаворыць:

— Спрадвеку вясной палыхаў агонь, які паслаў нам бог Ярыла. І хай сёння мы запалім агонь, які дае нам надзею на цяпло, радасць і веру ў светлыя дні. Запрашаем вас да вогнішча.

У запісе гучыць беларуская народная полька, і пачынаецца шэсце да вогнішча. Вясна ідзе ўперадзе, за ей вяснянкі, птушкі, фальклорныя гурты, удзельнікі свята. Усе размяшчаюцца вакол вогнішча. На фоне беларускага народнага танца ідзе дыктарскі тэкст:

Гары, агонь, ты ясна,
Каб сонца не пагасла,
Каб трава зелянела,
І хутка жыта спела!

Вясна ўрачыста абходзіць вакол вогнішча, а потым падпальвае яго. Усе ўдзельнікі і госці свята назіраюць за палаючым полымем, а дыктарскі тэкст працягваецца:

Хай адыходзяць халады
У маўклівыя гады!
Хай будзе з вамі заўсёды вясна,
Каб былі здаровымі, моцнымі
І дужымі; як наша зямля!

Праз некалькі хвілін, калі вогнішча разгарэлася, Вясна ўсіх запрашае на гульнёва-танцавальную праграму "Падарожжа



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па веснавых святах":

Настала зараз часіна
Весяліцца, танцаваць,
Веснавыя святы ўспомніць
І ў гульні пагуляць.

Праводзяцца гульнёвыя праграмы "Вялікдзень" і "Юр'я ", адначасова на галоўнай пляцоўцы ідзе канцэрт фальклорных гуртоў, а таксама конкурсы-выставы на лепшыя папяровыя птушкі, шпакоўні, фантастычныя птушыныя будынкі, выбіраецца ганаровае журы з прадстаўнікоў раённага аддзела адукацыі. Пасля канцэрта фальклорных гуртоў, конкурсаў-выстаў народнай творчасці на сцэне з'яўляецца вядучая, якая запрашае на галоўную пляцоўку падняцца журы і падвесці вынікі ўсіх конкурсаў *(ідзе ўзнагароджанне пераможцаў).*

*Гучаць пазыўныя свята, на фоне святочной музыкі Вясна і вядучы- Жаваронак кажуць:*

Хай вам, людзі, будзе даспадобы
Веснавы і цёплы гэты дзень,
Каб заўсёды былі ў згодзе
Кожны час і кожны дзень,
Каб заўсёды дзеці ўсміхаліся,
І свяціла сонца над зямлёй,
Каб жылі ў згодзе, працавалі
Моцнаю і дужаю сям'ёй.
Яснага блакітнага вам неба,
Светлых зорак усім вам уначы,
Каб на стале заўсёды была краюха хлеба
І каб святло вы неслі ў сваей душы.

Вось і закончылася наша веснавое свята. Вялікі дзякуй усім, хто прыйшоў, хто браў удзел у танцах, карагодах, гульнях.

***Вясна:***

Няхай звіняць радасным напевам, весела гамоняць і спяваюць нашы крылатыя меншыя сябры, якія нясуць на сваіх крылах вясну, мір і шчасце.

На апошнія словы вядучай пад фінальную песню В. Купрыяненкі "Разгуляйся, народ" дзеці запускаюць у неба вялікую птушку з рознакаляровых паветраных шароў.

# *Юр'я*

Афармленне: на задніку гульнёвай пляцоўкі вісяць маскі свойскіх жывёл, пастуховы ражок, дзве пугі. Гучыць пастуховы найгрыш. *(На пляцоўку з двух бакоў выходзяць два пастухі.)*

***Трахім.***

Здароў, братка Рыгор!

***Рыгор.***

Здароў, Трахімка! Са святам цябе, з Юр'ем!

***Трахім.***

*І* цябе таксама!

***Рыгор.***

У вашай вёсцы ўжо пачалі да свята рыхтавацца?

***Трахім.***

А як жа ж! *(Паказвае на залу.)*

***Рыгор.***

І сапраўды, а я і не заўважыў. Дзень добры вам, даражэнькія. А калі вы тут сабраліся, то, мо, адкажаце, што гэта за свята — "Юр'я "? *(Адказ— свята пастухоў.)*

***Трахім.***

Так, а мо, хто ведае, у я кую пару года яно адзначаецца? *(Адказ.)*

***Трахім.***

Вось бачыш, Рыгорка, ведаюць людзі пра наша свята. А што ў вашай вёсцы кажуць пра "Юр'я"?

***Рыгор.***

У нашай вёсцы кажуць: "Як на Юр'я пагода, то на грэчку няўрода".

***Трахім.***

А ў нас вось кажуць: "Калі на Юр'я мароз, дык сей на балоце авёс".

***Рыгор.***

Хм! Тэта што! А вось у нас лічаць: "Як дождж на Юр'я, то будзе хлеб і ў дурня".

***Трахім.***

Дождж дажджом, а вось калі Юрый сказаў: "Жыта ўраджу ", дык Мікола адказаў: "Пачакай — пагляджу".

***Рыгор.***

Ды нічога ў вас не ведаюць! ***Трахім.***

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Гэта ў каго — у нас? Ды ў нас у вёсцы самыя разумныя людзі.

***Рыгор.***

А вось мы зараз паглядзім.

***Трахім.***

Добра, тады, Рыгорка, давай дамовімся. Вось гэта палова *(паказвае направа)* — мая веска Залесная, а вось гэта *(налева)* - твая Падлесная. Дамовіліся?

***Рыгор.***

Дамовіліся. Зараз паглядзім, у чыёй вёсцы самыя разумныя.

*(Па чарзе загадваюць загадкі, за кожную адгадку частуюць пачастункамі.)*

***Рыгор.***

"Яе нагамі топчуць, а яна ўсіх корміць". *(Зямля).*

***ТрахіМ.***

Цяпер мая чарга. "Коціцца па небе кадушка — не звер, не птушка, не агонь, не вада". Ну, што гэта? *(Сонца).*

***Рыгор.***

Добра. А вось такая: "Вясной весяліць, летам халадзіць, увосень пітае, зімой саграваe". *(Дрэва).*

***Трахім.***

Малайцы! А вось такая загадка: "Малыя дзеці вісяць на павеці, а як падрастаюць, на зямлю злятаюць". Што гэта? *(Арэхі).*

***Рыгор.***

А вось гэту не адгадаеце: "Семсот свішча, чатыры танцуе, дзве свечкі гараць, два вартавыя стаяць". *(Конь).*

***Трахім.***

А як вам гэта: "Чатыры цыганачкі ільюць у адну баначку". *(Карова).*

***Рыгор.***

Ну, вось над гэтай галовы паламаеце: "Чорная курыца на
чырвоных яйках кубліцца". *(Скаварада на вуголлі).*

***Трахім.***

А вось гэту паспрабуйце: "Я на канапцы быў і на хлопанцы быў, і на базары быў. Варылі ва мне, хвалілі мяне, а як лопнуў жывот — дык і выкінулі за плот".*(Гаршчок).*

Ты глянь, разумныя людзі ў Залеснай, але згадзіцеся, што і нашы не горш.

***Рыгор.***

Згодзен. А вось ці могуць у вашай вёсцы шпарка размаўляць?

***Трахім.***

О, ды адна наша бабка Ганууся перагаворыць усю вуліцу.

***Рыгор.***

Ваша бабка? А наш дзед Антось перагаворыць і вашу бабку, і вуліу, на якой яна жыве, і ўсю вашу вёску.

***Трахім.***

Зараз паглядзім. Вось скажыце хутка: "Пад вываратнямі вавёрка ўе вяроўкі вёртка".

*(Памочнікі выносяць плакат з напісанай скарагаворкай. Адна палова пляцоўкі — жыхары Падлеснай разам яе чытаюць уголас.)*

***Рыгор.***

Ну, як, умеем? А вось вы, хто з Залеснай скажыце: "Спрытна кроп палоў Пракоп, лёг пад кропам і захроп". *(Ідзе гульня.)*

***Рыгор.***

Вось якія здатныя! Але, як кажуць у народзе, "Гаварыць — не мяхі варочаць".

***Трахім.***

І сапраўды. Зусім мы ледзь не забылі Рыгорка, дзеля чаго прыйшлі сюды. А вось адкажы мне: без чаго пастух ніколі не выходзіць на пашу?

***Рыгор.***

Вядома, без пугі.

***Трахім.***

Так. А ці ўмеюць у вас пастухі валодаць пугай? Бо для нас жа пуга, як для музыкі гармонік.

***Рыгор.***

А што ей валодаць? Ляскай, ды ўсё.

***Трахім.***

"Ляскай"? Хіба ж у гэтым усё майстэрства сапраўднага пастуха? Не, Рыгорка. А вось хто з вас, даражэнькія, грамчэй стрэльне? Ці ёсць такія? Бо на гэта патрэбны і моц, і спрыт. Я гляджу, у вас наўрат ці такія знойдуцца...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Рыгор.***

Гэта ў нас? Не хвалюйцеся, яшчэ як знойдуцца! Хлопцы, хто хоча паказаць сваю моц? Хто грамчэй стрэльне пугай, той атрымае з маёй торбы пачастунак. *(Ідзе гульня "Стрэльба пугай", удзельнікаў узнагароджваюць.)*

***ТрахіМ.***

Ну, а зараз, Рыгорка, паглядзім, на што здатныя вашы пастухі. Ці ўмеюць яны валодаць пугай? Ляскаць — гэта яшчэ не майстэрства.

***Рыгор.***

А што ж ты лічыш майстэрствам?

***Трахім.***

Ну, вось, напрыклад, ці змогуць яны збіць пугай бутэльку? ***Рыгор.***

Няма чаго і спрабаваць. Хлопцы, да мяне! Хіба ж у Падлеснай спраўнейшыя за нас?

*(Ідзе гульня. Пераможцы атрымліваюць пачастункі.)*

***Трахім.***

Дзякуй, хлопцы, якія вы спрытныя. А цяпер, калі ласка, станьце паўкругам і скажыце, ці змажа хто з вас шапку з долу дастаць?

***Рыгор.***

Ох, і насмяшыў ты людзей, Трахімка. Шапку з долу - вось "цяжкая" задача!

***Трахім.***

Я яшчэ не ўсё сказаў. Слухайце, хлопцы *(паварочваецца да ўдзельнікаў гульні, якія стаяць паабапал вядучых),* запрасіце кожны да сябе сябрука на дапамогу, бо без іх вам у наступнай гульні не абыйсціся. А ты, Рыгорка, і ўсе ўдзельнікі, слухайце ўважліва. Хай адзін з удзельжкаў сядзе на плечы свайму вернаму памочніку і, нахіліўшыся, рукой дастане шапку з долу. Ну што, спалохаліся?

***Рыгор.***

А чаго нам палохацца? Пакажам, хлопцы, Трахімку, на што мы здатныя.

*(Ідзе гульня, пераможцам даюць пачастункі.)*

***Трахім.***

Дзякуй, малайцы, кожны з вас можа стаць пастухом. Зноў станьце, калі ласка, кругам.

***Рыгор.***

Ты ведаеш, Трахімка, у нашай вёсцы ёсць такі звычай. Перад тым, як вывесці статак на пашу, яго трэба правесці цераз кажух, у якім загорнута яйка. І калі яйка застанецца ў кажуху цэлым, то ўся скаціна ў статку на працягу года будзе здаровай, круглай і гладкай, як яйка. Сёння ж свята! Трэбы і нам свой статак правесці праз кажух. Так што — увага!

***Рыгор.***

Вам, сябры *(звяртаецца да ўдзельнікаў, якія стаяць на пляцоўцы),* неабходна як мага хутчэй сабраць сабе па "статку". Вось гэтыя хлопцы *(паказвае па адну палову ўдзельнікаў)* збяруць свой статак у вёсцы Падлесная, а гэтыя *(паварочваецца да астатніх)* — у вёсцы Залесная. І прывядуць гэты статак да нас. Зразумелі? Сігналам для пачатку гульні будзе музыка.

*(Гучыць песня "Вол бушуе ". Ідзе гульня.)*

***Трахім.***

А зараз, паважаныя сябры, статкі патрэбна правесці праз кажухі, якія ляжаць на пляцоўцы. Вы павінны ланцужком прайсці праз кажух, імітуючы звычкі і галасы свойскіх жывёл. Хто хутчэй гэта зробіць, той і стане пераможцам.

*(Ідзе гульня. Пераможцаў частуюць.)*

***Рыгор.***

Дзякуй усім удзельнікам. Хлопцам я прапаную крыху адпачыць. А вы, дзяўчаткі, застаньцеся з намі.

***Трахім.***

Ці ведаеце вы, мілыя дзяўчынкі, што быў на Юр'я такі звычай "Юрыца" — значыць, сяброўку сабе шукаць. Калі хто гэтага не зробіць, то на ўвесь год застанецца без сяброўкі. Запрашайце, дзяўчаткі, на гульню ў "Ручаёк" знаёмых дзяўчат. ***Рыгор.***

Станьце, калі ласка, парамі ў "Ручаёк". Вось гэтая крышку сумная дзяўчынка нам дапаможа. Вам неабходна прайсці праз "Ручаёк", выбраць сабе сяброўку, вывесці яе з "Ручайка" і пацалавацца. Зразумелі? Тады пад музыку, дзяўчаты, "юрыцеся"!

*(Ідзе гульня.)*

***Рыгор (той дзяўчыне, што застанецца адна).***

Не сумуй дзяўчына, я буду тваім сябрам.

***Трахім.***

Ну вось, дзяўчаткі, вы і знайшлі сабе сяброўак. Але ж вы, мабыць, памятаеце, што свята сёння хлапечае — свята

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пастухоў. Дык парадуйце хлапцоў, запрасіце іх на скокі!

*(Рыгорка грае на дудцы.)*

***Трахім.***

Ну, дык грай жа, дудка,
Каб аж было чутна,
Каб аж вушы драла.
Каб ты так іграла,
Каб зямля скакала!

*(Усе танцуюць польку.)*

***Рыгор.***

Ну вось і скончылася наша свята. Пара ўжо нам дахаты. Зачакаліся нас. Вясной работы багата, вясной у цяжкай працы пачынаецца восеньскі хлебны каравай.

***Трахім.***

Таму мы вам жадаем:
Каб Юр'я светлы ключык
Адамкнуў зямлю...

***Рыгор.***

Пусціў расу
На ўсю зямлю —
І густую, і частую...

***Трахім.***

І цёплую, і мокрую

***Рыгор.***

І на ўвесь свет!

***Разам.***

І на кожны цвет!
Да пабачэння, сябры!

## *"Юр'я на парог вясну прывалок"*

На пляцоўку выходзяць Хлопец і Дзяўчына.

Хлопец раскладае вогнішча, ставіць ваду на гарбату.

Дзяўчына запявае песню "Ой, валы мае палявыя..."

Да вогнішча падыходзіць фальклорны гурт і падцягвае песню.

***Дзяўчына:***

Што, дзеванькі, ці не пайсці нам, вясну гукаючы,
Людзей да вогнішча сазываючы.

Фальклорны гурт ідзе карагодам па вёсцы з веснавымі песнямі і запрашае ўсіх на вечарыну. Праз некаторы час натоўп падыходзіць да вогнішча.

***Хлопец:***

Добры вечар! Хутка гарбатка паспее, будзем частаваць.

***Дзяўчына:***

Траўную сілу спажываць. *(Кідае ў ваду збор з сухіх траў)*

Падыходзьце бліжэй, калі ласка, паспрабуйце нашай гарбаты. Можа спадабаецца. Трымайце кубачкі.

Да кола падыходзіць Стары Пастух.

***Стары Пастух:***

Добры вечар, добрым людзям! Ці дазволіце каля вашага агню пагрэць старыя косці?

***Дзяўчына:***

Добры вечар!

***Хлопец:***

Вядома, сядай, Дзед Юрый, што дарма пытаеш, мы табе заўсёды рады.

***Дзяўчына:***

Вось гарбаты вазьміце.

***Стары Пастух:***

Дзякуй, дзетачкі. Але ж многа вас тут сабралася, шмат каго я й не ведаю... Мо нічога, з часам даведаюся. Ці дазволіце, спадарства, вам што-небудзь зайграю?

***Дзяўчына:***

Вельмі просім.

***Хлопец:***

Калі ласка, дзеда!

***Стары Пастух:***

То добра.

*(Вымае з сумы дуду, грае мелодыю "Вол бушуе... ")*

Да вогнішча падыходзіць Знахарка з кошыкам у руках.

***Знахарка:***

Вечар добры, шаноўныя бяседы! І табе, Юрый! ***Стары Пастух:***

Добры, добры, Люля. Даўно цябе не бачыў, як завітала?

***Знахарка:***

Йшла вуліцаю, чую хтосьці так ладна грае, як было не ўвязацца за гукамі. Так і завітала... Бачу недарма... Вялікае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кола ты вакол сябе назбіраў. Скуль, людцы, будзеце?

***Хлопец:***

А хто скуль.

***Стары Пастух:***

То ўжо даўно час знаёміцца. Вось трымай, сынок, дуду.

*(Падае дуду хлопцу злева)*

Толькі беражліва, ласкава трымай. Пажадай ей добры год й вясёлых юр'еўскіх святаў. Тады імя свае скажы ды яшчэ што-небудзь пра сябе. Тады дунь — яна адгукнецца. І свае табе скажа. Пасля наступнаму перадай. Так усе праз дуду і пасябруем.

Калі дуда зноў апыняецца ў руках Старога Пастуха, Знахарка кажа:

Во цікавасць, колькі людзей каля вогнішча, амаль столькі ж імен у дуды. А якія прыгожыя ўсе гукі. Відаць, і людзі вы ўсе прыгожыя, добрыя. Частуйцеся, калі ласка, вясновым печывам, каб добра вам пелася ў гэты год, ды шчасліва жылося! Можа і зараз што-небудзь заспяваеце, прыгожае да веснавое.

*(Частуе ўсіх "жаваронкамі")*

Фальклорны гурт спявае "Вол бушуе вясну чуе..."

***Стары Пастух:***

Да, Юр'я на парог весну прывалок.

***Хлопец:***

Ты, Дзед, прывалок?

***Стары Пастух:***

Не, не валок. Сама навязалася. Пайду, кажа, за табою, і ўсё тут. Што хоча рабі!

***Дзяўчына:***

Прайду кажаце, дзеда?

***Стары Пастух:***

Вядома ж, не. То пра Святога Юр'я кажуць. Прыгожага маладога хлопца ў белай вопратцы ды на белым кані. Якраз па табе.

***Знахарка:***

Ён надзелены паўнамоцтвамі адамкнуць зямліцу пасля зімняе спячкі, выпусціць расу, якая вельмі карысна для ўрадлівасці глебы і для здароўя. Нездарма жанкі нашы спяваюць: "Святы Юрэй па полі ходзіць..." *(Запявае, гурт ей дапамагае.)*

***Стары Пастух:***

Эх, файнае на Юр'ю свята!

***Дзяўчына:***

А што рабіць у гэты дзень?

***Знахарка:***

Раней так было: зранку дзяўчаты пойдуць на першую расу. Рассцілаюць на жытнёвыя руні посцілку, калі яна намакае, збіраюць і нясуць дадому. Дома выкручваюць і расою апырскваюць жывёлу, прамываюць вочы і цела. Добра яшчэ пакачацца па гэтай расе.

Тым часам гаспадыня ўсцілала стол настольнікам, клала хлеб з соллю, адразала краюху, пасыпала соллю, закручвала ў ручнік і выходзіла ў двор. Там з гаспадаром і пастухом тройчы абыходзіла жывёлу, запальвала ў гаршчочку зёлкі і выганяла з двору праз дым,

шэпчучы замову:

Выганяю я сваю кароўку
На шырокую вуліцу,
На шоўкавую травіцу,
На глыбокую крыніцу
Па светлую вадзіцу,
Шоўкавай травіцай наядайся,
У глыбокай крыніцы напівайся,
Карысці набірайся,
У роўнай не пужайся,
Ведзьме не паддавайся.

***Хлопец:***

А што ў вас і ведзьмы вадзіліся?

***Знахарка:***

Маці мая распавядала, што калісьці жыла ў нашых мясцінах адна маскоўка. Яе гаспадара як забрылі, дык-з тых часоў неведамо, куды ён дзеўся. Маскоўка перш наймалася на работу падзенна, а потым пачала та шаптаць, та даваць зелля, да з таго і жыла. Але вось пашла па сялу пачутка, што тая маскоўка стала ведзьмаю. Та той, та сёй пачалі расказваць, што бачылі, як маскоўка на Вешняга Юр'я прасцілала па расе ручнік да збірала росу ў дайніцу, каб цягнуць к сабе малако з тых кароў, якія пройдуць па тым месцы. Другія казалі, што маскоўка скажацца жабаю ці еляком, да і ссе кароў, казалі, што самі бачылі, як яна круцілася каля кароў і што з тых часоў у кароў не было малака, ці яно было змешана з кроўю. Многа чаго гаварылі людзі пра тую маскоўку і пачалі яе лічыць ведзьмаю.

***Дзяўчына:***

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

А як выгануць кароў з двароў, што адбывалася?

***Стары Пастух:***

А тады ўсёй вёскай статак да поля прыводзяць, пастухоў адораць. Хлеба, яек, сала дадуць, а то й пляшку гарэлкі. Пасля ідуць па хатах. А пастухі тым часам раскладаюць агонь, рыхтуюць яечню, з якой тры разы абыходзяць увесь статак. Вось тут ужо ўсе жыхары на поле выходзяць з караваем, варажыць на ўраджай.

***Знахарка:***

Пасля частуюцца яечняй. Спяваюць, у гульні розныя гуляюць, карагоды водзяць.

***Стары Пастух:***

Можа і нам трэба ўжо патанчыць. Нешта засядзеліся, здаецца.

***Знахарка:***

Згода.

Знахарка заводзщь карагод "Мядуніца".

***Дзяўчына:***

О, як хораша!

***Знахарка:***

То можна яшчэ адзін.

Дзяучына заводзщь карагод "А па возеры...".

***Стары Пастух:***

Паколькі галоўным ворагам нашых каровак пасля ведзьмаў, лічыцца люты звер, то я прапаную згуляць у "Ваўка". Каб у жыцці з ім ніколі не сустрэцца. Ставайце ўсе ў рад. Першым разам я буду вашым пастухом, а Знахарка — "воўкам", яна будзе вас лавіць, а я абараняць, глядзіце, не паддавайцеся, бо "воўк" вас зварыць.

—Воўк, воўк, што ты робіш?

—Ямачку капаю.

—На што табе ямка?

—Агонь паліць.

—На што табе агонь?

—Мяса варыць.

—На што табе мяса?

—Дзяцей карміць.

—А дзе мяса возьмеш?

—У цябе.

—А я не дам.

—А я вазьму!

Гуляюць некалькі разоў. "Воўк" становіцца "пастухом" ці адна з каровак. І наадварот.

***Дзяўчына:***

А я таксама адну гульню ведаю. "Малако" завецца. Пагуляем?

***Стары Пастух:***

Я не супраць.

***Дзяўчына:***

Тады сядайце ўсе ў кола, каб вольна было ўсім і ахоплівайце калені рукамі, прыцюкайце іх да грудзей. Гэта — "гладышыкі з малаком". Зараз трэба абраць "ката" і "гаспадыню".

***Хлопец:***

Я буду катом.

***Дзяўчына:***

Добра, тады я — "гаспадыня". "Гаспадыня" кліча "ката".

—Мяў, мяў, — адгукаецца "кот".

—Ты дзе гуляў?

—На двары.

—А мышку злавіў?

—Не.

—Чаму?

—Малака хачу!

—Выбірай "гладышак".

"Кот" абыходзіць "гладышыкі", дакранаецца да кожнага і аблізваецца. "Гаспадыня" пытаецца:

—Ну што, выбраў?

—Так.

—Калі здолееш, бяры! — і адварочваецца.

"Кот" зноў абыходзіць гульцоў, бярэ кожнага за плечы і, легка штурхаючы ўлева, гаворыць:

— Не хачу.

Дайшоўшы да выбранага, "кот" кажа: "Хачу!" — і нечакана штурхае гладышак управа. Калі ён паваліцца, то выбывае з гульні, а "кот" зноў пачынае перамовы з "гаспадыняй". Калі ж не, то "кот" мяняецца з ім ролямі і гульня працягваецца.

Гуляюць некалькі разоў.

***Знахарка:***

А ў мяне таксама есць для вас гульня — "Чарадзей". Уставайце ўсе падалей адзін ад аднаго. Няхай Міколка будзе першым разам "чарадзеем". Падыміце ўсе правую ногу і не апускайце ні ў якім выпадку. Калі да вас падыходзіць "чарадзей" і будзе рабіць якія-небудзь рухі, то вы павінны ўсе за ім паўтарыць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але стоячы на адной назе. Калі саступіце — будзеце "чарадзеем". То пачынаем.

Гульня паўтараецца некалькі разоў. ***Стары Пастух:***

Вось я вам зараз прапаную гульню сапраўдную, Юр'еўскую. "Цяцерку". Хлопцы, ставайце ў адзін рад, а дзяўчаты ў другі тварам да мяне. Хлопец, што наперадзе, бяры дзяўчыну насупраць за руку і скачыце па розныя бакі радоў. Як вернецеся на месца...

***Знахарка:***

То дзяўчына цікай хутчэй вакол бяседы. Паспееш стаць на месца — будзеш бегчы з наступным хлопцам, не — пойдзеш у канец рада.

***Стары Пастух:***

А вы, хлопцы, спяшайцеся. Схопіце — зацалуеце, не — месца вам на задворках.

***Знахарка:***

А мы тым часам спяваць будзем. Дзе наш музыка? Дапамажы.

Я цяцерку пасу,
Ды ух я!
На зялё'ным лугу,
Ды ух я!
А цяцерка пад мост,
Ды ух я!
Я цяцерку за хвост,
Ды ух я!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мела маці 3 сыны,
Ды ух я!
Ды ўсё яны Васілі,
Ды ух я!
Адзін коней пасе,
Ды ух я!
Другі лапці пляце,
Ды ух я!
Трэці сядзе на камене,
Ды ух я!
Дзержыць дуду на рамені,
Ды ух я!
Ой, ты дудка мая,
Ды ух я!
Весялушка мая.
Ды ух я!
Весяліла ты мяне,
Ды ух я!
Да на чужой старане,
Ды ух я!

Гуляюць некалькі разоў.

***Знахарка:***

Во разышліся! А калі зараз у "Маўчанку"?
Разам кажам:
Пярвенчыкі, чарвенчыкі,
Зазвінелі бубенчыкі,
Па свежае расе,
Па чужой паласе,
Там кубкі, арэшкі,
Цукеркі, мядок, маічок!

Усе павінны замаўчаць. Калі хто-небудзь не вытрымае: засмяецца шчі вымавіць хоць слова, то плаціць штраф: спявае, баіць казку ці танчыць. Маўчым?

Гуляюць некалькі разоў. Тых, хто "выплаціў" штраф, Знахарка частуе вафлямі.

***Знахарка:***

Добра з вамі, але ж час мне ўжо ісці. Заўтра зноў да вас завітаю. Па песне пазнаю. Заспявайце мне, дзяўчаты, якую Юр'еўскую песню. Хоць "Выйду я на двор..."

Фальклорны гурт спявае.

То дабранычы, дзякуй вам за цудоўны вечар!

***Стары Пастух:***

І я за табою. Салодка вам спаць ды легка ўставаць!

Знахарка і Стары Пастух уходзяць.

Фальклорныя гурты працягваюць вечарыну спевамі.

## ***Прыйшла Юр'ева раса***

На пляцоўцы, дзе раскладзена вогнішча, з'яўляецца Стары Пастух.

***Стары пастух:***

Добры вечар, добрым людзям!
Не сядзіце склаўшы рукі.
Трэба карагоды ля вогнішча павадзіць,
Таначкі станцаваць,
У гульнейкі пагуляць!
Што сядзіце моўчкі, песню якую-небудзь завядзіце.

Усе вітаюцца з Дзедам Юрыям. Фальклорны гурт спявае "Выйду я на двор...". Хто ведае песню, падхоплівае. Стары Пастух ім акампануе на дудачцы. Здалёк чуваць голас Знахаркі.

Знахарка падыходзіць да вонішча, трымаючы ў руках кошык з яйкамі.

***Знахарка:***

Вечар добры!

Як гэтыя яйкі цэленькія, кругленькія, так і ваша скацінка каб была поўная, цэлая і сытная. Вечар добры!

*(Бярэ з кошыка яйкі і раздае ўсім прысутным)*

***Стары Пастух:***

Дзякуй табе, Люля.

***Знахарка:***

Я чула ў цябе, дзед Юрэй, ужо некалькі год коннага прыбытку не было.

***Стары Пастух:***

Ёсць такая напасць.

***Знахарка:***

Прыйшла параіць табе, каб у ноч на Юр'я ты на яйку паспрабаваў заваражыць.

***Стары Пастух:***

Хм. То можа й твая праўда.

***Хлопец:***

А што гэта азначае: заваражыць на яйке?



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Стары Пастух:***

У нас гэта так робяць: напярэдадні першага выгану коней нанач у поле, гаспадар бярэ яйкі па колькасці коней і накіроўваецца да стайні, у якой знаходзяцца яго коні. Абыходзіць яе кругам тры разы, а затым кладзе яйкі пад парог. Тры разы перахрысціўшыся, адчыняе ўваходныя дзверы і ўваходзячы кажа:

Прыйшла Юр'ева раса,
Не дам вам аўса!

Падходзіць па чарзе да кожнага каня, гладзіць па ўсей спіне, надзявае вяровачную аброць, выводзіць з канюшні, стараючыся правай нагой ступіць на парог стайні, дзе раней ім былі пакладзены яйкі, У гэтым месцы і знаходзіцца "нячыстая сіла", якая шкодзіць росту, здароўю і прыбытку коней, але на гэта ей дадзена права толькі ў ноч на Юр'я. Калі гаспадар ступіць на парог пры вывадзе коней правай нагой, то д'ябальская сіла абясшкоджана на працягу ўсяго года.

***Знахарка:***

Але ж яшчэ трэба абавязкова адарыць чым-небудзь пастуха, які будзе ў гэту ноч пасвіць коней. Калбас даць, сала, яек. Вось вы, дзяўчаты, зараз адарыце нас песняй.

Стары Пастух наігрывае.

Фальклорны гурт спявае "Як пушчу стралу...".

***Знахарка:***

Настаў чарод нам на яйках паваражыць. Стукайцеся адзін з адным носкам яйка, і ў каго ён застанецца цэлым, у таго і год будзе найлепшым дзеля ўсякіх спраў. А ў каго паб'ецца — не сумуйце, таму хутчэй пашанцуе ў каханні.

***Стары Пастух:***

А мы зараз дапаможам. Ставайце-ка ўсе ў кола. Хачу, Люля, "Падушачку" завесці.

***Знахарка:***

Добрая справа. То я распачну.

*(Здымае хустку, складае яе на руцэўу выглядзе падушачкі і ўстае ў сярэдзіне кола.)*

***Стары Пастух:***

Мы зараз пойдзем з вамі ў адзін бок, а Люля — у другі, спяваючы:

Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Падружачка, падружачка,
Мая дарагая.
Каго люблю, каго люблю,
Таго пацалую.

Тут усе спыняюцца, і той хлопец, які апыняецца насупраць Люлі, ідзе з ею ў кола. Таму сваю падушачку — і тыя, што ў цэнтры, прыцюкаюцца адзін да аднаго то леваю, то праваю шчочкамі.

Навек падарую — мы пляскаем у ладоні, Люля перадае падушачку хлопцу, а сама стае ў круг, а хлопец працягвае дзеянне.

***Знахарка:***

Ці зразумела? Калі што не ўяўляеце, то зараз пабачыце. Пачалі.

Гульня працягваецца на наступныя куплеты:

... А на той падушачцы
Добра ляжыцца,
Прыйдзе міленькі
Ды будзе сварыцца.
Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Малодачка, малодачка,
Мая маладая.
Ці ж я табе не казала,
На парозе стаўшы:
— Не едзь, не едзь у дарожку,
Няхай едзе старшы.
Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Малодачка, малодачка,
Мая маладая.
Татка стары, татка стары,
На свеце нажыўся,
А ты ж, мае лубянятка,
Нядаўна жаніўся.
Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Малодачка, малодачка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мая маладая.
Як паехаў мой міленькі,
Як паехаў позна,
Параскідваў падушачкі,

Параскідваў розны.
Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Малодачка, малодачка,
Мая маладая.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як прыехаў мой міленькі,
Як прыехаў з месца,
Параскладваў падушачкі,
Параскладваў у месца.
Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Малодачка, малодачка,
Мая маладая.

Гульня працягваецца, пакуль амаль усе не пабудуць у коле.

***Хлопец:***

А можа ў "Вуціцу"? Ставайце карагодам, бярыцеся за рукі, бяжыце і спявайце:

Ой, ідзі, вутачка,
Ой, ідзі шэрая,
Па крутой...
У цябе сямёра дзяцей,
Восьмы селязень,
Дзевятая вутачка — цяцера...

У любы момант кожны з вас можа разарваць карагод, увесці за сабой і завярнуць клубком. Перамагае самы вялікі клубок.

Гуляюць некалькі разоў.

***Знахарка:***

То йдзіце ўжо гарбату піць, можа, стаміліся!

Усе сядаюць каля вогнішча і бяруць кубачкі з гарбатай!

***Дзяўчына:***

Можа, спяём?

Фальклорны гурт спявас "А ў лесе ды на верасе..."

***Знахарка:***

У мяне тут у кошыку яшчэ некалькі печываў ды цукерак засталося. Але на ўсіх не хопіць. Як гэта падзяліць? Можа, хто ведае, якія выразы, прыкметы, звязаныя з Юр'ем, — тых пачастую.

***Стары Пастух:***

Трэба, каб да Юр'я было сена і дурня.

***Хлопцы і дзяўчаты:***

—Юр'е — наесца вол травіцы.

—Юр'я з ярмом, Мікола з цярлом.

—Юр'я без снега і дажджу — будзе неўрадлівы год.

—Юр'я густы дождж — урадзіцца жыта.

—На Юр'я дождж — скаціне лёгкі год, а на грэчку нярод.

—Калі ж на Юр'я мароз, то добрыя проса і авёс. Знахарка частуе пераможца.

***Знахарка:***

А якія, жанкі, вы песні пра Юр'ю ведаеце? Заспявайце, я вас таксама пачастую.

*Фальклорны гурт спявае:*

"Выйду я на двор..."
"Святы Юрэй..."
"О, ты сонца..."

***Дзяўчына:***

Давайце ў "Проса". Дзед Юрый, будзь "гаспадаром". ***Стары Пастух:***

"Гаспадаром" я заўсёды рады.

***Дзяўчына:***

Тады ўставайце ўсе ў шарэнгу і бярыцеся за рукі.

*"Гаспадар " праходзіць уздоўж шарэнгі і спыняецца каля Дзяўчыны:*

—Прыходзь да мяне проса палоць.

—Не хачу.

—А калі есці?

—Хоць зараз!

—Ах ты гультайка!

Пасля гэтых слоў "Гаспадар" бяжыць у любы канец шарэнгі. Адначасова з ім і "гультай" бяжыць, але за спінамі гуляючых, Хто першы схошць за руку апошняга у шарэнзе, той становщца з іМ побач, а друп займае месца "Гаспадара".

Так гуляюць некалькі разоў. ***Знахарка:***

Прапаную карагодам пахадзіць. Вось апошняя "гаспадыня" і "гайдак" — хадзіце ў кола. Так. Пакуль мы будзем хадзіць, вы павінны пасля адпаведных слоў песні рабіць тое, пра што пяецца: разыходзіцца, кланяцца, танцаваць. Але на словы: "Каго любіш, пацалуй!" цалавацца не адзін з адным, а выбіраць сабе хлапца і дзяўчыну з кола, і тады тыя ідуць у сярэдзіну.

Музыка, паграй нам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Стары Пастух грае мелодыю, а астатнія спяваюць карагод:*

У карагодзе мы былі — 2 разы,
Ой, люлі мы былі — 2 разы.
Каго мы там відзелі?
Ой, люлі мы былі — 2 разы.
Відзелі там парачку,
Ой, люлі мы былі — 2 разы.
Ты, парачка, разыдзіся,
Ой, люлі мы былі — 2 разы,
Усім нізенька пакланіся,
Ой, люлі мы былі — 2 разы,
Панямножку патанцуй,
Ой, люлі мы былі — 2 разы,
Каго любіш, пацалуй!
Ой, люлі мы былі — 2 разы.

Так гуляюць пакуль усе амаль не пабудуць у сярэдзіне кола.

***Стары Пастух:***

Ай, як прыгожа, ажно сэрца скача, гледзячы на вас... Ну, парачкі, хадзіце сюды. Ёсць у мяне для вас незвычайны пачастунак.

Усе сядаюць каля вогнішча. Стары Пастух вымае з торбы з дзесятак рыб краснапёрак.

***Стары Пастух:***

Трымайце, шукайце сабе ражны ды як засмажым на вуголлях! Смачная рыба. Дарэчы, вы ведаеце чаму яна краснапёрая?

***Хлопец:***

Я нешта чуў пра Чырвонае возера, у якім яна водзіцца...

***Стары Пастух:***

Так, так. Вось пакуль будзеце частавацца, я вам гэтую байку і распавяду. Яно двойчы мяняла свае найменне. З Жыцкага на Князь-возера, з Князь-возера на Чырвонае. Спытайцеся ў тамтэйшага люду, якой рыбай адорвае іх спакон веку возера? Адкажуць: краснапёрай. А пачырванела пер'е рыбінае нібыта ад вялікай крыві, што неяк праліліся ў ваду ды насыціла зямлю вакол возера. А была ж тут калісьці жорсткая бітва, бой неміласэрны ўсё зтымі ж татарамі-душагубцамі...

Пры княжацкім двары ў дружыне храбрай служыў мужны вой, сівавусы Пуцята. А ў таго Пуцяты раслі-выхоўваліся два сыны-волаты. Светлавокія, віхрастыя, смяшлівыя. Радасна было бацьку, калі ў час пацешных боек з сынамі ўпэўніваўся ён, што з цяжкасцю ўжо даюцца яму перамогі над юнакамі, што ў хуткім часе мацнейшыя, дужэйшыя за яго будуць хлопцы. За гонар меціць такіх сыноў. І ганарыўся будучымі ратнікамі Пуцята, і дзякаваў Богу за шчасце, даравана яму.

Сыны ж Пуцятавы, шаснаццацігадовыя дзецюкі, не думалі пакуль аб ратнай славе. З равеснікамі палявалі, спаборнічалі ў трапнасці, прывязваючы да пояса за хвасты збітых страдой вавёрак альбо балотных качак, з дзеўкамі карагоды вадзілі ў вяночках з дзьмухаўцоў, ды абодва, таемна адзін ад аднаго, спрабавалі падабацца румянай дзяўчыне з пяшчотным імем Каліна.

Але аднойчы сівавусы Пуцята рашуча загадаў маладым волатам:

— Хопіць юнацкіх забаў! Час вам стаць сапраўднымі мужчынамі. Да князя пойдзеце разам са мною. Не адмовіцца, думаю, слаўны ўладар ад такіх вояў. А там, як паход прыспее, пакажаце сябе так, каб бацьку не было сорамна. Можа, і узвысіць вас за добрую службу князь.

Светлай раніцай перад вочы княжацкія прывёў святочна апранутых сыноў сваіх Пуцята. Але, мабыць, не ў час прыйшло сямейства волатаў у грыдніцу, бо толькі трывожны шэпт чаляднікаў, спалоханыя твары слуг ды сумны пагляд князя, якім ён аккіуў гасцей сваіх, сустрэлі іх.

—Мо бяда нечаканая надышла? Чума, мор чорны абрынуўся за грахі нашы на нас? — спытаўся сівавусы воін.

—Не мор, але не меншае зло, верны мой Пуцята, — адказаў князь. — Злое семя ўзрасло цяпер замест хлеба на нашай няшчаснай зямлі. Дайшлі, урэшце, і да нас лютыя татары. Выпрабаванне дасылае нам Гасподзь. Учора бачылі за возерам Жыцкім паганых батыраў. І няма ім ліку, ад капытоў іхніх коней уся трава на шляху татарскага воінства вытаптана, ад смуроду нячыстых целаў лістота на дрэвах згортваецца, вяне, па пятах жа за касавокімі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ліхадзеямі ляцяць крумкачы, бягуць ненажэрныя ваўкі. Адчуваюць пах смерці, каркаюць, па нашых душах выюць...

Заклапочаны стаў Пуцятаў твар: будзе бойка крывавая!

—Ці сам павядзеш, княжа, дружыну на ворагаў? — спытаўся.

—Нягожа перакладаць мне свой крыж на плечы іншага, — з уздыхам адказаў князь. — Але ж табе, мой верны слуга, таксама будзе шмат клопату. Збярэш апалчэнне па навакольных вёсках. Бяры кожнага юнака, што дасягнуў шаснаццаці гадоў, кожнага старога, што трымаецца ў сядле. Іншага вырaтавання я не бачу.

—Няхай будзе так, — цвёрда адказаў Пуцята. — Калі цяжка будзе нашай дружыне, прыкрые яе апалчэнне. Тых жа, хто мацнейшы будзе, і пастаўлю з левага боку ад асноўнага войска. Сам павяду іх на ворага, і калі іншага наказу ад цябе, княжа, не будзе. Мяне ж у дружыне няхай заменяць мае сыны. Не адмаўляйся ад іх, мой гаспадар.

Шэрай раніцай на беразе возера сабраліся княжацкія воіны. І доўга стаялі яны ў цішы і ўглядаліся праз туман у той бок, адкуль павінны былі з'явіцца іх супраціўнікі. Але праз туман даносіліся толькі няясныя шолахі ды далёкае іржанне коней. Вось паступова пачаў разыходзіцца, таяць туман. І ўбачылі тады ратнікі варожае войска, якое на супраціўным баку возера таксама, як і яны, чакала, калі развіднее.

І тады раздаўся воінскі кліч з аднаго боку ды дзікі віск — з іншага. Па беразе возера насустрач адзін аднаму кінуліся воіны — нашы ды татарскія. І сышліся, і зазвінелі клінкі, і засвісталі стрэлы. Гарачай стала зямля для конскіх капытоў, і пачырванеў небасхіл не ад узыходзячага сонца, але ад чалавечай крыві.

Гэта быў час, калі знікае ў чалавеку ўсё людское. І, як дзікі драпежнік, толькі крыві прагне ён, ап'янёны бойкай.

Пуцята не бачыў у злой сечы сваіх сыноў, ён нават не думаў пра іх, адбіваючы ўдары, што сыпаліся на яго з усіх бакоў. Неўзабаве яго конь стаў спатыкацца ў месіве чалавечых целаў. Тады Пуцята кінуў пагляд далека над галовамі ратнікаў, што біліся побач з ім. І з жахам убачыў, як сцягваюць з каня бясільнага, параненага князя татары. Застагнаў Пуцята, упэўніўшыся, што нічым не можа дапамагчы яму, акружаны з усіх бакоў ворагамі.

Але нехта спяшаўся, прабіваючы сабе шлях мячом, да князя, і гэта быў адзін з Пуцятавых сыноў. І паляцелі варожыя галовы з плеч пад ударамі волатавай рукі.

Але што гэта? Ззаду да асілка пад'язджае багата апрануты татарскі мурза, падае-валіцца юнак, як падсечаны малады дубок.

А вакол стаяць немагчымы шум, ляск, крык, стогн. Бязлітасна б'е Пуцята ворагаў. І больш ужо не глядзіць у той бок, дзе запнуў яго сын, бо баіцца ўбачыць другога, які таксама павінен быць побач. Але ўжо ляціць у сусвет шчырае бацькоўскае маленне: няхай хаця б аднаго з дваіх пакіне яму Гасподзь у гэтай сечы!

Гарачымі сталі нават дзяржанні для мячоў у руках воінаў. Не вытрымалі татары жорсткага націску княжацкай дружыны, пачалі адступаць, а потым кінуліся бегчы. І гналі іх ратнікі некалькі вёрст па лясах і балотах. Не было нікому з ворагаў вырaтавання.

Толькі пасля таго, як быў забіты апошні татарын, даведаўся Пуцята пра смерць і другога свайго сына. Яму ўдалося вынесці князя з поля бою, але сам юнак быў моцна паранены, ад ран гэтых і сканаў.

Глыбокія маршчыны праляглі на лбе ў сівога Пуцяты, калі даведаўся ён пра гэта. У вялікім горы пакінуў стары воін сваіх баявых паплечнікаў. Пайшоў да глыбокага возера сваю тугу хвалям азёрным давяраць. І застыў раптам у непаразуменні на высокім беразе. Чырвонай ад хрысціянскай крыві стала вада ў возеры. І было такое ўражанне, што возера змагалася таксама, і зараз, параненае, сыходзіць крывёю...

***Знахарка:***

Напужай, Стары, дзяцей. Яшчэ спаць не будуць...

***Стары Пастух:***

Яны-та будуць. Дабранач вам, а мы ўжо пойдзем. Так, Люля?



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Знахарка:***

Бывайце здаровы і да сустрэчы.

Стары Пастух і Знахарка сыходзяць.

## *Юр'ева матка ў свет пайшла...*

На пляцоўку, дзе раскладзена вогнішча, прыходзщь Знахарка з вяночкам у руцэ.

***Дзяўчына:***

Добры вечар, цёця Леля. Мы якраз думалі песню заспяваць. То вы нам дапамажыце.

***Знахарка:***

Бог у помач. Усім добрага вечара.

Запявае "А ў лесе, ды на верасе..."

Фальклорны гурт ей дапамагае.

Здалёк чуваць гук дуды, якая працягвае мелодыю песні.

***Знахарка:***

Здаецца, Дзед Юрэй ідзе.

***Стары Пастух:***

Якая ціхая сёння ноч. Нібы зачараваная. Вітаю ўсіх.

***Знахарка:***

Здаровы будзь, Юрэй. А ноч дзіўная выдалася, бо напярэдадні свята — заўтра Лялю шанаваць будзем.

***Стары Пастух:***

Ага. А хто ж у гэтых вот Лялею назавецца?

***Знахарка:***

То ж ведаеш, найпрывабнейшая мусіць быць.

***Стары Пастух:***

Так. Але як дазнаешся, каторая з прыгожых найлепшая.

***Знахарка:***

Будзем вечар карагодамі хадзіць, песні пець, гулнейкі ладзщь. Якая з дзяўчат дробненька ступае ды ладненька пяе — тую адразу бачна. Ей і чэсць.

***Стары Пастух:***

То збірай дзяўчат.

***Знахарка:***

Ды амаль што ўсе тут.

Дзевачкі дачушкі мае,

Падыходзьце да мяне,

Час ужо таночкі шукаць,

Час ужо песенкі пеяць.

***Хлопец:***

А хто такая Ляля?

***Знахарка:***

Ляля — багіня вясны, маці Ярылы — Юр'я.

***Хлопец:***

А што будзеце з ею рабіць, калі абярэце?

***Стары Пастух:***

За мяне замуж аддаваць.

***Знахарка (смяецца):***

Ай, жартаўнік. Шанаваць будзем, благаслаўлення прасіць.

***Дзяўчына:***

А як тое просяць?

***Знахарка***:

Апранаюць дзяўчыну ў доўгі белы саван, перавязваюць шыю, рукі і стан рознай зелянню, а на галаву кладуць вянок з розных веснавых кветак. У такім уборы саджаюць дзяўчынку Лялю на дзярновую лаўку, на якой з аднаго боку пастаўлены гладышакі з малаком, сыр, масла, яйцы, смятана, а з другога — хлеб; каля ног кладуць вяночкі, адпаведна ліку дзяўчат з карагода. Затым скачуць вакол яе, пасля снедаюць каля яе ног. Ляля пачастуя усіх прыгатаванай ежай. Тады зноў танчаць, а Ляля кідае пад гэты час ім на голаву вянкі. Праз гэта Ляля надзяляе іх прыгажосцю, здароўем і добрай доляй. А каму я сёння надзену вяночак, тая ў нас гэтым годам Лялею называецца. То уставайце ў карагод, усе дзяўчаты напярод.

Усе ўстаюць карагодам, Стары Пастух грае, фальклорны гурт спявас.

***Стары пастух:***

Вялікі карагод! Трэба паменшыць. Хадзіце, дзяўчаты, па левы бок ад мяне, а хлопцы — па правы. Патанчым "Проса". Кладзіце рукі адзін аднаму на плечы. Спачатку дзяўчаты набліжайцеся да хлопцаў:

—А мы проса сеялі, сеялі,

Возьмем, Лада, сеялі, сеялі —

Зараз хлопцы, набліжаючыся:

—А мы проса вытапчам, вытапчам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Возьмем, Лада, вытапчам,
вытапчам — адыходзячы.
І гэтак далей, музыка нам дапаможа.
—А мы коней выпусцім,
выпусцім. Возьмем, Лада,
вытапчам, вытапчам.
—А мы коней застанем,
застанем. Возьмем, Лада,
застанем, застанем.
—А мы коней выкупім,
выкупім. Возьмем, Лада,
выкупім, выкупім.
—А чым жа вам выкупіць,
выкупіць? Возьмем, Лада,
выкупім, выкупім.
—А мы дадзім сто рублёў, сто
рублёў. Возьмем, Лада, сто
рублёў, сто рублёў.
—Нам не надо тысячы,
тысячы. Возьмем, Лада,
тысячы, тысячы.
—А нам надо дзевачка,
дзевачка. Возьмем, Лада,
тысячы, тысячы.
—А нам надо дзевачка Волечка,
Волечка...
То хадзі, Воля, зараз да хлопцаў.
Пайшлі зноў.

Так гуляюць, пакуль усе дзяўчаты не пярэйдуць у шарэнгу хлопцаў.

***Знахарка:***

О, як раз усе дзяўчаты стаяць зараз паміж хлопцаў. Зайграй нам, Музыка, якую карагодную. А вы, мае каханыя, павінны перадаваць адзін аднаму з зубоў у зубы гэтую галінку. Хто выпусціць — будзе штонебудзь спяваць, танчыць ці цалаваць суседа. Трымайце галінку.

Гуляюць некалькі разоў. Адна з дзяўчын, калі да яе прыходзщь галінка, кладзе яе сабе ў кішэню і запявае, заводзячы за сабою карагод!

***Хлопец:***

У карагодзе мы былі ці можна?

***Стары Пастух:***

Чаму б не.

Музыка наігрывае мелодыю. Дзяўчына заводзіць карагод.

Гульня паўтараецца некалькі разоў.

***Знахарка:***

А зараз, апошняя парачка, хадзіце да мяне. Я прапаную вам яшчэ адну гульню — "Змейка". Ставайце ўсе прысутныя ў рад і трымайце адзін аднаго за пояс. Ты, хлопчык, станавіся наперад — будзеш галавою, а ты, дзяўчынка, станавіся назад — будзеш хвастом. Галаве трэба паймаць хвост, паймаеш — быць хвасту галавою. Раз, два, тры пачалі.

Гульня паўтараецца некалькі разоў.

***Стары Пастух:***

Зараз яшчэ крыху пабегаем. Ставайце парамі, адзін за адным па колу. Каму не дасталося пары — будзе калачом. Вось ты, Знахарка, у нас сёння адная. Будзеш калачом.

***Знахарка:***

Ну добра.

***Стары Пастух:***

Калі яна падыдзе да пары і пастучыць каму-небудзь па спіне, то вы пытайце:

- Хто там?

—Сем ком і калач, — кажа яна. А вы:

—Цябе, Божа, на дарозе раскарач. — І бяжыце ад калача па колу, да свайго месца, калі стоміцеся, то можаце змяніцца з кім-небудзь у пары. Але калі "калач" вас зловіць — вам і вадзіць.

Гульня паўтараецца некалькі разоў па жаданню ўдзельнікаў.

***Знахарка:***

Гарбата ўжо паспела, падыходзьце.

Усе збіраюцца ля вогнішча.

А покуль вы будзеце адпачываць, я папрашу нашых старэйшых жанчын паказаць некалькі старадаўніх танцаў. Хто захоча пераняць — далучайцеся. Памятайце, дзяўчаты, я за вамі сёння пільна назіраю.

*Гучаць танцы:*

"На рэчаньку"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Курапят"
"Месяц"
"Цёмная ночка"
"Кракавяк"
"Падыспань"

Кожны паўтараецца 2 разы. Першым разам жанкі танчаць самі, а другі — з моладдзю.

***Стары Пастух:***

А ну рэзні, музыка, польку!

***Знахарка:***

Але гэта будзе не звычайная полька, па чарзе я буду падыходзіць да кожнай з пар і надзяваць дзяўчатам на галаву вяночак, кожная павінна станьчыць для мяне асабіста, а я вас за гэта пачастую. Хто падабаецца больш за ўсіх — будзе нам Ляляю.

Гучыць полька.

***Знахарка:***

Ходзіць паміж парамі і частуе выканаўцаў цукеркамі. Апошняй надзявае вяночак Кацярыне.

***Знахарка:***

Быць табе, Кацярынка, гэтым годам Ляляю.
Квітней, мае сонейка,
Хай будзе з табою вясна заўсёды!

***Кацярынка (кланяючыся ўсім):***

Дзякуй вам.

***Стары Пастух:***

Віншую цябе, Кацярынка. Гэта добры знак на добрую справу. А зараз, хлопцы, хадзем прынясем яшчэ вады для гарбаты.

Хлопцы ідуць усе да калодзежа. Дзяўчаты заводзяць каля Кацярынкі карагод "А па возеру...".

Хлопцы вяртаюцца з вадою. ***Знахарка:***

Хто хоча гарачанькай гарбаты — сядайце бліжэй.

*(Налівае ўсім гарбату.)*

Фальклорны гурт, а разам з ім і ўсе прысутныя спяваюць пакуль не стомяцца і не разыдуцца.

Стары Пастух і Знахарка адыходзяць ад вогнішча, не развітваючыся.

**Абрад "Лялькік"**

Пасля абеду ўсе ўдзельнікі і госці свята збіраюцца ля вогнішча спяваюць юр'еўскія песні. На пляцоўцы з'яўляецца Знахарка з кошыкам і вядзе за руку Алёну:

—Дзевачкі, прыгажуні мае, час ужо вам вяночкі звіваць, Лялю прыбіраць.

***Знахарка:***

Ідзіце, дачушкі мае,
Вяночкі павіце,
Лялю прыбярыце,
На пасад пасадзіце,
Карагоды вакол яе павадзіце.
А ты, Лялечка, на дзяўчат не крыўдуй,
Усіх пачастуй.

*(Збірае дзяўчатам кошык, дзе ляжаць хлеб, сыр, яйкі, гладышак з малаком.)*

Дзяўчаты разам з Ляляю ідуць па вёсцы, несучы з сабою маленькую драўляную лаўку і кошык, пяюць карагодную: "Завівалася пчолка над варотамі...".

Зазываючы ўсіх вясковых дзяўчат пайсці з імі:

—Пойдзем, дзевачкі, карагоды вадзіць,
У Лялі-вясны прыгажосці прасіць.

Калі натоўпы прыходзяць на луг, усе дзяўчаты пачынаюць віць сабе вяночкі:

***Дзяўчына 1:***

Зараз, дзевачкі,
Вяночкі віце,
Прыгажэйшыя кветкі
Ў іх кладзіце.

***Дзяўчына 2:***

Як сонейка зямельку прыбірае,
Так і мы нашу Лялю
Прыбярэм, убярэм,
На зайздрасць усім.

Дзяўчаты з фальклорнага гурта спяваюць карагодныя песні і апранаюць Лялю ў белы саван, упрыгожваюць рознай зелянінай, надзяваюць самы прыгожы вянок. Кветкамі прыбіраюць таксама і драўляную лаўку.

***Дзяўчына 1:***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

***Дзяўчына 2:***
Дай нам жытцу
Ды пшаніцы.

***Дзяўчына 3:***
Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

***Дзяўчына 1:***
У агародзе — сенажаці.

***Дзяўчына 2:***
Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

***Дзяўчына 3:***
Поўны гряды,
Роўны з ряда!

***Дзяўчыны разам:***
Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

***Дзяўчына 1:***
Розачкі на шчочкі

***Дзяўчына 2:***
Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

***Дзяўчына 3:***
Васілечкі ў вочкі.

***Дзяўчына 1:***
Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

***Дзяўчына 2:***
Вясны на доўгія гады!

***Дзяучына 3:***
Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

Саджаюць Лялю на лодку, кладуць побач хлеб, сыр, яйкі ставяць гладышак малака. Каля ног яе ўсе дзяўчаты з словамі:

Ляля, Ляля,
Наша Ляля!

Складаюць свае вяночкі

Дзяўчыны з фальклорнага гурта заводзяць усіх дзяўчат у карагод вакол Лялі і спяваюць.

Наспяваўшыся, сядаюць ля ног Лялі.

***Дзяўчына 1:***
Наша Ляля, Ляля нас накорміць гусам: ***Усе разам:***
Ляля, Ляля,
Ой, наша Ляля!

Ляля частуе дзяўчат усім, што ляжыць на лаўцы з рознымі пажаданнямі.

—Частую вас хлебам з солю на шчасце з доллю.

— Як у вячэры ў пароўні малако прыбывае, няхай у вас прыгажосці прыбывае!

Няхай адыдуць ад вас злыя напасці, халады й маўклівыя гады!

— Весялосці вам ды маладосці!

***Дзяўчына 1:***
Хопіць, дзевачкі, частавацца,
Час ужо нам у вяночкі прыбрацца.

Дзяўчаты стаюць у дзве шарэнгі насупраць і танчаць "Проса”, толькі замест слоў:
"Возьмешь, Лада..."
кажуць:
"Наша Ляля..."

Кожнай дзяўчыне, якая пераходзіць з адной шарэнгі ў другую Ляля надзявае на галаву вяночак.

Гуляюць 2 разы. Пасля танчаць карагод.

***Ляля:***
Ставайце, дзевачкі, юрыцца.

Дзяўчаты стаюць "ручаём". Спяваюць веснавы карагод. Ляля праходзіць праз "ручаёк" і забірае сабе адну з дзяўчынак, выходзіць з ей наперад і цалуюцца. Тая дзяўчына, што засталася адна, робіць тое ж самае. Гэтак пакуль усе дзяўчыны не "паюрацца".

***Дзяўчына 2:***
Добра, дзевачкі, так гулятца,
Толькі трэба дамоў вяртацца.

*Дзяўчына 1 і 3 бяруць Лялю пад рукі і ўсе праважаюць яе праз вёску да хаты:*
Дзякуй табе, Лялечка,
Ясная прыгажуня нашая,
Не крыудуй калі што,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бывай
І яшчэ раз да нас завітай.
Усе дзяўчаты кланяюцца Ляле.

## *Юр'еўскія забавы*

Пляцоўка дзеяння святочна прыбрана. На задніку намалявана сонца з праменнямі, на сонцы — пастуховая пуга і дудачка, вакол сонца прымацаваны галінкі вярбы.

*(Пад гукі пастуховай дудачкі на пляцоўцы з'яуляецца ???, які наігрывае мелодыю "Юр'я, устань рана... " Затым пад ляскат пугі на пляцоўку выходзяць вядучыя Міхал і Васіліна, яны трымаюць у адной руцэ вербу, а ў другой посуд са святой вадой і акрапляюць ей поле на чатыры бакі.)*

***Міхал:***
Юрай, уставай рана,
Адмыкай зямлю.

***Васіліна:***
Выпушчай расу
На цёплае
лета,

***Міхал:***
На буйнае жыта,
На ядрыстае,

***Васіліна:***
На каласістае,
Людзям на здароўе...

*(Пад гэтыя словы яны акрапляюць зямлю. Дудар, граючы тую ж мелодыю, адыходзіць на задні план, у сярэдзіну выходзяць вядучыя.)*

***Міхал:***
Святога Юр'я вітаем, песні яму спяваем, а зараз пара спрыт і розум паказаць, каб святы Юр'я пабачыў, што мы добрыя гаспадары і гаспадыні, пастухі і пастушкі. Васіліна, што гэта там у цябе ў белай хустцы звязана?

***Васіліна:***
Я табе полудзень несла, хлеб духмяны, шматок сала, яйкі велікодныя ды малака збанок! Калі ласка, шаноўныя госці, паглядзіце на вашыя крэслы, да некаторых з іх прымацаваны яйкі. У каго такія ёсць, калі ласка, запрашаем да нас на пляцоўку пагуляць разам з намі ў Юр'еўскія гульні.

***Міхал:***
Сябры, вы ведаеце, што сёння, на Юр'я, апошні дзень, калі можна біцца велікоднымі яйкамі?

***Васіліна:***
У мяне прыгожых яйкаў шмат. Хто хоча апошні раз велікоднымі яйкамі пабіцца, трэба яго выйграць.

***Міхал:***
На Юр'я перш чым выганялі кароўку ў поле, клалі пад брамку яйка, каб карова, пераступіўшы яго, была гладкая, поўная і вымя каб у яе было поўнае і круглае, бо яйка — сімвал жыцця.

***Васіліна:***
А я вось і фартушкі прынесла для гульні. Калі ласка, даражэнькія ўдзельнікі, палова ставайце за Міхалам, а другая палова — за мной. Трэба хуценька яйка данесці да брамкі, адзін раз абыходзячы кароўку, пакласці пад брамку яйка, вярнуцца тым жа шляхам, перадаць фартушок другому. Тая каманда, якая першай пакладзе апошняе яйка пад брамку, і будзе пераможцам.

***Міхал:***
Ітак, шаноўныя, на лік раз, два, тры — гуляць пачалі.
Раз, два, тры!

*(Гучыць мелодыя "Ай, вясна, ай, красна..." Пачынаецца гульня.)*

***Васіліна;***
Ну што, шаноўныя, якая каманда апошняя паклала яечка пад брамку? Малайцы, усе вы спрытныя, але ж перамагла тая каманда, што за Міхалкам стаіць. Вось вам, даражэнькія, яйкі велікодныя, частуйцеся, калі ласка!

*(Васіліна частуе пераможцаў яйкамі.)*

***Міхал:***
А зараз нам трэба даведацца, якія ж прыкметы існавалі, звязаныя з гэтым днём.

***Васіліна:***
А ў беларусаў існавала шмат і прыказак, і прымавак, і прыкмет пра Юр'я, якія адлюстроўвалі яго асаблівасці.

***Міхал:***
"Як дождж на Юр'я, то будзе хлеб і ў дурня".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Васіліна:***
"Юр'ева раса — не трэба коням аўса".
***Міхал:***
"Як на Юр'ю пагода, то на грэчку няўрода".
***Васіліна:***
"Калі на Юр'я ідзе дождж густы і вялікі, то будзе расці жыта."

Вось вы і даведаліся, даражэнькія, пра Юр'еўскія прыкметы і прыказкі, а зараз, Міхалка, давай даведаемся, ці змогуць нашыя госцікі сваю жывёлу ад дрэнных сіл зберагчы ды агонь грамнічнай свечкі не патушыць.
***Міхал:***
Зараз мы з вамі і правядзём гэты старажытны абрад, які з цягам часу ператварыўся ў гульню. Першы ўдзельнік каманды трымае ў руках свечку, падбягае да сваей жывелы, кладзе свечку ля яе на дол, бяжыць назад. Другі ўдзельнік падбягае, кладзе запалкі, трэці запальвае свечку, аббягае вакол сваей жывелы адзін раз і хутка вяртаецца назад. Пераможа тая каманда, якая першая данясе свечку і не патушыць яе. Калі свечка пагасне, то тая каманда адразу прайграе. Пераможца атрымае салодкі пачастунак. (Пячэнне ў форме свойскіх жывёл.)
***Васіліна:***
Як толькі загучыць музыка, адразу пачынаем. Ну што,
падрыхтаваліся?
А ну, музыканцік, рэзні полечку!
*(Гучыць полька. Праводзіцца гульня "Грамнічныя свечкі".)*
***Міхал:***
Ай да малайцы! Васілінaчка, пачастуй нашых пераможцаў
пячэннем.
*(Васіліна частуе пераможцаў пячэннем.)*
***Васіліна:***
Ногі, рукі ў вас спрытныя, а ці добра думаюць вашы галовы? Калі ласка, тая каманда збанок малака атрымае, якая больш загадак адгадае! Пачынаем!
***Міхал: 1.***
"Месяц убачыў — не забраў,
сонца ўстала — падабрала". Што гэта? *(Раса)*
***Васіліна: 2.***
"Пасярод двара — стаіць гара,
Спераду вілы, ззаду — мятла". Хто гэта? *(Карова)*
***Міхал: 3.***
"Возіць усіх на сабе і за сабою.
Сам жа заўсёды ідзе пехатою". Хто гэта? *(Конь)*
***Васіліна: 4.***
"Балабан бяжыць,
На ім лес дрыжыць". Хто гэта? *(Баран)*
***Міхал: 5.***
"Хто не хворы, а ўсё стогне?" Хто гэта? *(Свіння)*
***Васіліна: 6.***
"З барадою, а не стары,
З рагамі, не бык,
Дояць, а не карова
Лыкі дзярэ, а лапці не вяжа". Хто гэта? *(Каза)*
***Міхал:***
Вось гэтая каманда больш загадак адгадала, Васіліна, прынясі ей збаночак свежага малачка, як мы і абяцалі.
***Васіліна:***
Частуйцеся, даражэнькія. (Васіліна прыносіць збанок малака.)
***Міхал:***
Скажыце, які галоўны інструмент у пастуха? (Адказ: пуга)
***Васіліна:***
А які ж пастух без пугі, у іх жа пугі няма.
***Міхал:***
От, знайшла бяду — зараз спляцем пугу. Хлопцы з маёй каманды, хадзіце да мяне, даражэнькія.
***Васіліна:***
А што, давай паспрабуем. Хлопчыкі з маёй каманды, хадзіце да мяне.
***Міхал:***
Паслухайце, калі ласка, умовы гульні. Мы з Васілінай будзем трымаць будучыя пугі за кіек. А вам трэба будзе ўзяць канцы вяровак у рукі і па камандзе "пачынаем" плясці касічку-пугу, не выпускаючы вяроўку з рук. Калі пуга сплецена, перавязаць яе стужкай на канцы і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зразумела, пераможа тая каманда, якая першай спляце пугу. А вы дзяўчаты, проста так не стойце, а сваіх хлопчыкаў падтрымалівайце апладысментамі.
***Васіліна:***
Умовы зразумелыя? Пачынаем!
*(Гучыць мелодыя "Ай, вясна, ай, красна... "Хлопцы плятуць пугі.)*
***Міхал:***
Малайцы, добрыя пугі сплялі. Васіліначка, пачастуй, калі ласка, нашых пераможцаў тварожным хатнім сырам. Вось ад гэтай пугі кароўкі добра паскачуць. Даражэнькія ўдзельнікі, станьце, калі ласка, па парах. Зараз мы паглядзім, якія вы спрытныя. Станьце ў кола, я пугу пакручу, а вы паскачаце, а хто па нагах атрымае, той і прайграе.
***Васіліна:***
Але ёсць яшчэ адна ўмова: дзяўчаты павінны трымаць хлопца за плечы, а хлопцы дзяўчат — за стан, і калі Міхал круціць пугу, вы павінны сінхронна падскокваць, каб не атрымаць пугай па нагах. А хто атрымае пугай, той выбывае, якая пара застанецца апошняй - атрымае ўзнагароду. Пачынаем!
*(Гучыць полька. Праводзіцца гульня "Спрытная парачка ".)*
***Міхал:***
Вось, нарэшце, і вызначылася самая спрытная пара, трэба вас пачаставаць. Трымайце гэтыя абаранкі з макам.
***Васіліна:***
Ой, наскакаліся, паўпацелі ўсе. Пакуль мы з Васілінай правядзём Юр'еўскую віктарыну, кожны з вас прыдумайце, калі ласка, сабе свойскую жывёлу, якую ён мог бы ўвасобіць, для наступнай гульні.
***Міхал:***
Калі ласка, паважаныя гледачы, хто ведае, якія малочныя
стравы бываюць?
*(Гучыць мелодыя "Юрай, устань рана... " Праводзіцца Юр' еўская віктарына. Гледачы называюць малочныя стравы: сыр, тварог, верашчака, смятана і г. д.)*
***Васіліна:***
Вось гэты чалавек апошні назваў малочную страву, хадзіце, калі ласка, да нас на пляцоўку. Але ж і малайчына, бачыш ты, Міхалка, колькі ён страў ведае. За гэта, даражэнькі, атрымай вось гэты салодкі падарунак. *(Пераможца атрымлівае вязанку абаранак.)*
*(Міхал пасля віктарыны звяртаецца да ўдзельнікаў.)*
***Міхал:***
Ну што, шаноўныя, кожны выбраў сабе свойскую жывёлу для ўвасаблення? Ну тады дапамажыце нам з Васіліначкай яйкі ў траве знайсці на Юр'еўскую яечню.
***Васіліна:***
Адна каманда, станьце за мной, а другая — за Міхалам. Вось ляжаць два кажухі, пад імі сырое яйка, вам патрэбна прайсці па кажуху, ствараючы вобраз свойскай жывёлы, і не раздушыць яйка. Тая каманда, у якой яйка застанецца цэлым, і пераможа.
***Міхал:***
Ну што, падрыхтаваліся... Пачынаем!
На працягу гульні гучыць мелодыя "Юр'ева матка пагнала цялятка...".
***Васіліна:***
Добра, даражэнькія, дзякуй велькі. Свойскімі жывёламі вы пабылі, пугу сплялі, а зараз трэба паглядзець, ці добра пугай карыстацца вы ўмееце. Хто грамчэй лясне пугай і ў якой каманды гэта атрымаецца больш разоў, тая і будзе пераможцам.
***Міхал:***
А па вашых апладысментах мы даведаемся, якая з каманд пераможа.
***Васіліна:***
Падрыхтаваліся... Раз, два, тры — пачынаем! *(Гучыць ціха мелодыя "Ай, вясна, ай, красна...")*
***Міхал:***
Якая з каманд перамагла? Па вашых апладысментах я бачу, што перамагла вось гэтая каманда.
***Міхал:***
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Малайцы, добрыя ў нас пастушкі атрымаліся.

***Васіліна:***

А зараз, паважаныя сябры, мы запрашаем вас павадзіць разам з намі старажытны Юр'еўскі карагод.

*(Удзельнікі водзяць карагод, у цэнтры стаяць Міхал і Васіліна з вербамі і акрапляюць усіх. Затым...)*

***Міхал:***

Калі ласка, станьце ручайком і праз яго праходзьце і займайце свае месцы ў зале.

*(З карагода ўсе становяцца ў ручаёк, першымі Міхал з Васілінай, якія трымаюць у руках вербы, удзельнікі, праходзячы праз "ручаёк " займаюць свае месцы. Пакуль яны займаюць свае месцы, карагодная мелодыя плаўна змяняецца мелодыяй "Юрай, устань рана...")*

***Васіліна:***

Мы б маглі да ранку
Танцаваць, гуляць, смяяцца.

***Міхал:***

Але, як не сумна, нам трэба
Развітаца
!

***Васіліна:***

Спадзяёмся, што Юр'еўскія забавы вам спадабаліся і добра вас пацешылі!

***Міхал:***

А прыгожае беларускае свята кранула вашыя сэрцы!

***Васіліна:***

Хай Юр'я здароўе і долю,
Хай будзе ў хаце прыбытку даволі.

***Міхал:***

Як зеленню цешацца кусціны, почкі
Няхай прыгажэюць сынулі і дочкі.

***Васіліна:***

Няхай заклякоча вам бусел на ранку,
Падорыць дзяцей вам, бы тых абаранкаў.

***Разам:***

І хай абміне вас бяда і нянасце,
А сонечным ранкам да вас прыйдзе шчасце!

***Міхал:***

Яшчэ раз вялікі дзякуй вам і са святам усіх вас, сябры. Прыміце, калі ласка, ад нас вось гэты цудоўны Юр'еўскі каравай!

*(Калі Васіліна абносіць усіх караваем, на пляцоўку выходзіць дудар і іграе мелодыю "Юр 'я, устань рана... " Затым зачыняецца занавес.)*

## ***Сёння свята для усіх будзе***

**Гульнёва-забаулялыіая праграма**

Сцэна святочна прыбрана. На задніку сцэны намалявана сонца з промнямі, на сонцы — пастуховая пуга і дудачка.

На сцэне бліжэй да задніка стаіць плот, пасярэдзіне — брама.

*Гучыць фанаграма песні "Юр'я, устань рана".* Кожны радок паўтараецца:

Юр'я, устань рана,
Юр'я, мыйся бела.
Юр'я, ідзі ў стайню.
Юр'я, сядлай каня.
Юр'я, едзь ў поле.
Юр'я, адамкні зямлю.
Юр'я, пусці расу.
Юр'я, цяпленькую.
Юр'я, бяленькую.

Пад апошнія гукі песні на пляцоўку выходзіць вядучая: цётка Марыся ў беларускім нацыянальным касцюме. *Яна ўсім кланяецца і гаворыць:*

***Цётка Марыся:***

Прывітанне, добрым людзям!
Сёння свята для ўсіх будзе.
Песні, гульні, карагоды.
Смехі, жарты і прыгоды.
Запрашаем усіх ласкава.
На вясновыя забавы.

— Дзякуй усім, хто адарваўся ад хатніх спраў і знайшоў час прыйсці сюды.

*Бо сёння:*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Святы Юрый па межах ходзіць,
Усім людзям дабро робіць,
Зямлю адмыкае, расу выпускае
І густую, і частую,
І цёмную, і мокрую.
На добрае лета, на буйнае жыта,
На гэты свет, на ўсякі цвет,
Каб зямелька ажывала,
Ды дабром нас асыпала.

Заўсёды 6 мая, у дзёнь святога Юр'я, на Беларусі праводзіўся ўрачысты абрад першага выгану жывёлы ў поле.

*(Выходзіць Ганначка — дзяўчына ў нацыянальным беларускім аддзенні).*

***Ганначка:***

Вітаю вас, людцы добрыя! Добрай раніцы, цётачка Марыся!

***Цётка Марыся:***

Добрай раніцы, Ганначка! Нешта ты, Ганначка, спазняешся? Госцейкі ўжо даўно сабраліся, трэба забавы Юраўскія пачынаць, а цябе ўсё няма. Прыбіралася, мабыць, доўга?!

***Ганначка:***

Не, цётачка, я ўжо зранку на нагах! А каб даведацца за чым я хадзіла, трэба адгадаць маю загадку.

Месяц убачыў — не забраў,
Сонца ўстала — падабрала!
Хто ведае, што гэта такое?

*(Адказ з залы: "раса". Той, хто адказаў, атрымлівае жэтон-сонейка.)*

Правільна, гэта раса, якая, згодна з народнымі павер'ямі, у Юраўскую раніцу мае жыватворную сілу для раслін, жывёл і чалавека. Таму людзі заўсёды імкнуліся памыцца Юраўскай расою.

***Цётка Марыся:***

Сапраўды, раса на Юр'я чарочная. Нездарма ў народзе гавораць: "На Юр'еву расу, ды на божую красу", памыешся ею і заўсёды будзеш прыгожым і здаровым. ***Цётка Марыся:***

Але ж час ідзе, сонейка ўсё вышэй устае. Прыйшоў час выганяць кароўку ў поле, каб было ў нас цёплае парное малачко. А хто ведае, якія стравы вырабляюць з малака?

*(Гледачы з месцаў адказваюць: вяршкі, смятана, масла, тварог, сыр, прастакваша і г. д. Адказаўшым даюць жэтоны-сонейкі і жэтоны-дудачкі, роўныя па колькасці.)*

***Ганначка:***

Бачыце, цётачка Марыся, як нашы госцікі любяць малачко. А зараз усіх, хто адказаў на нашы пытанні і атрымаў жэтоны, прашу выйсці да нас.

*(Удзельнікі гульні выходзяць на сцэну).*

***Марыся:***

Ведаеце, госцікі, у даўнія часы, каб нячыстая сіла не шкодзіла скаціне, яе абыходзілі з запаленай грамнічнай свечкай, вось і вы зараз паспрабуеце засцерагчы яе ад нячысцікаў. А мы паглядзім.

*(На сцэне па дзвюх дыяганалях ставяць 6 цацачных кароў (у два рады па 3 шт.)*

***Ганначка:***

Спачатку падзяліцеся, калі ласка, на дзве каманды. У каго жэтоны-сонейкі, той уваходзіць у каманду "Сонейка". У каго жэтоны-дудачкі — у каманду "Дудары". Правілы гульні такія: кожны ўдзельнік павінен стаць каля сваей "кароўкі" збоку. Першыя ўдзельнікі каманд трымаюць у руках запаленыя свечкі. Па камандзе вы тройчы абыходзіце "кароўку" і перадаяце свечку наступнаму ўдзельніку вашай каманды. Апошні аддае свечку вядучаму. Пераможа тая каманда, якая першая данясе сваю свечку цётцы Марысі і патушыць яе. Нарэшце, пачынаем: адзін, два, тры — гуляці пачалі! *У час гульні гучыць фанаграма песні:*

"Юр'я! Ранак, добры, Юр'я!
Юр'я! Падай ключы, Юр'я!
Юр'я! Нашто ключы, Юр'я!
Юр'я! Зямлю адмыкаць, Юр'я!
Юр'я! Нашто адмыкаць, Юр'я!
Юр'я! Расу пушчаць, Юр'я!
Юр'я! Нашто раса, Юр'я!
Юр'я! Для каровак, Юр'я!
Калі гульня заканчваецца —

***Ц. Марыся:***

Ты глядзі, Ганначка, якія спрытныя госцікі ў нас на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

святе. Дзякуй вам усім за цікавую гульню. А пераможцы сёння атрымліваюць як узнагароду Юраўскае пячэнне ў форме свойскіх жывёл, якое некалі пяклі нашы бабулі да гэтага свята.

***Ганначка:***

Цётачка Марыся, а вось ёсць у мяне загадка для нашых госцікаў, ці адгадаюць яны яе? Слухайце, сябры, уважліва:

"Пасярод двара стаіць гара,
Спераду — вілы, ззаду — мятла.

*(Адказ з залы: Карова. Адказаўшаму даюць жэтон-сонейка).*

Правільна! Нездарма гавораць: "Кемлівы — ні ў гародзе, ні ў горадзе не прападзе".

***Ц. Марыся:***

А цяпер, Ганначка, прынясі мне вербную галінку, на Вербніцу пасвечаную, якою калісьці выганялі скацінку ў поле, каб засцерагчы яе ад хваробы.

***Ганначка:***

А вербную галінку вам, цётачка, прынясуць самі госцікі нашай праграмы.

*(Перадае галінку гледачам у зал і гаворыць):*

Перадавайце яе, калі ласка, з рук у рукі, і ў каго яна апынецца ў час, калі змоўкне музыка, той і прынясе яе цётачцы Марысі. Добра?

*(Гучыць мелодыя Юраўскай песні. Гледачы перадаюць галінку адзін аднаму. У каго яна засталася пасля заканчэння музыкі, выносіць яе на сцэну і аддае ц. Марысі.)*

***Ц. Марыся:***

Дзякуй, даражэнькі, за паслугу. Але пачакай трошкі, самае цікавае наперадзе. Запрашаю сюды і госця, які правільна адгадаў загадку пра кароўку.

*(Выходзіць глядач з жэтонам-сонейкам.)*

Вы ўжо ведаеце, што мы сабраліся кароўку ў поле выганяць, але спачатку трэба пад браму яйка пакласці, каб кароўка,
пераступіўшы яго, была гладкая, поўная і круглая, бо яйка — сімвал жыцця!

*(Звяртаецца да ўдзельнікаў гульні.)*

А калі вы ўжо тут апынуліся, то зрабіце гэта самі калі ласка. Згодны?

***Ганначка:***

Вазьміце, калі ласка, у рукі галінку вярбы і ёю каціце гэтыя яйкі пад браму. Хто хутчэй справіцца — і будзе пераможцам! Адзін, два, тры — гуляці пачалі!

*(Гучыць мелодыя беларускай полькі "Юрачка ".)*

Пасля вызначэння пераможцы Ц. Марыся выносіць два маляваныя яйкі і гаворыць:

***Ц. Марыся:***

А вось і ваша ўзнагарода. Але не здзіўляйцеся, бо дзень святога Юр'я лічыцца апошнім днём, калі можна біцца велікоднымі яйкамі. Таму не губляйцеся, а хутчэй бярыцеся за справу і пачынайце апошні бой яек у гэтым годзе. Дзякуй вам за гульню!

*(Удзельнікі гульні займаюць свае месцы.)*

***Ганна:***

А ці ведаюць нашы госці іншых свойскіх жывёл, акрамя каровы. Бо Юр'я быў заступнікам усіх свойскіх жывёл.

***Ц. Марыся:***

А мы зараз праверым! Загадвай ім нашы загадкі Ганначка!

***Ганначка:***

Возіць усіх на сабе і за сабою
Сам жа заўсёды ідзе пехатою. *(Конь)*

***Ц. Марыся:***

Балабан бяжыць На ім лес дрыжыць. *(Баран)*

***Ганначка:***

З барадою, а не стары,
З рогамі, а не бык,
Дояць, а не карова,
Лыкі дзярэ, а лапці не пляце. *(Каза)*

***Ц. Марыся:***

Ляжыць пад ганкам,
Хвост абаранкам. *(Сабака)*

***Ганначка:***

Калматы, вусаты



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Есці пачынае —
Песенькі спявае.*(Кот)*

***Ц. Марыся:***

Ходзіць цар па агародзе,
Носіць два бліны ў бародзе,
А трэці — на галаве.*(Певень)*

***Ганначка:***

На полі і ў лузе
Ходзіць у кажусе.*(Авечка)*

***Ц. Марыся:***

Хто не хворы,
А ўсё стогне. *(Свіння)*

*(Усім адгадаўшым загадкі даюць жэтоны-сонейкі і жэтоны-дудачкі па роўнай колькасці.)*

***Ц. Марыся:***

Нічога не скажаш, кемлівы народ тут сабраўся! Нездарма кажуць: за аднаго вучонага — дзесяць нявучаных даюць! Але ж дзе пастухі нашы, Ганначка?

***Ганначка:***

Можа, затрымаў іх хто, бо сёння у пастухоў свята. Раней у гэты дзень гаспадары скацінкі не толькі віншавалі пастухоў, але і адорвалі іх яйкамі, пірагамі, сырам, маслам.

***Ц. Марыся:***

А, можа, пугу з зімы ніяк не знойдуць?

***Ганначка:***

Не хвалюйцеся, цётачка! Мы спляцём новую. А дапамогуць нам тыя, хто правільна адказаў на нашы загадкі і атрымаў жэтоны. Выходзьце, калі ласка, сюды да нас.

*(Удзельнікі будучай гульні збіраюцца на сцэне.)*

Зараз мы з вамі будзем плясці новыя пугі для нашых пастухоў. Спачатку падзяліцеся, калі ласка, па сваіх жэтонах на каманды "Сонейка" і "Дудары". Па аднаму ўдзельніку з кожнай каманды вазьміце будучыя пугі ў рукі за кіёчак *(за ручку)*. Астатнія вазьміце канцы вяровак у рукі і па камандзе, пачынайце плясці касічку-пугу, але не выпускаючы вяроўку з рукі. Калі пуга будзе сплецена, перавяжыце яе гэтай чырвонай стужачкай. Тая каманда, якая хутчэй гэта зробіць, будзе пераможцай. Адзін, два, тры — гуляці пачалі *(У час гульні гучыць беларуская полька "Юрачка ".)*

***Ганначка:***

Малайцы! Папрацавалі вы добра. Таму, каб падтрымаць вашыя сілы, мы частуем вас Юраўскім пячэнннем! Дзякуй за гульню!

*(Удзельнікі гульні займаюць свае месцы ў зале. Тыя, хто трымаў пугі, застаюцца.)*

***Ц. Марыся:***

А вы, даражэнькія, застанцеся, калі ласка, замест пастухоў і пакажыце нам сваю спрытнасць. Надзявайце гэтыя каўпакі на галаву, руку з пугай трымайце за спінай, а другой імкніцеся зняць каўпак з галавы свайго праціўніка, але рухацца трэба на адной назе. Пераможа той, хто першы тройчы зніме каўпак з галавы праціўніка.

Адзін, два, тры — гуляці пачалі.

*(Гучыць Пастуховы наігрыш на дудачцы.)*

Пасля заканчэння гульні

***Марыся:***

У мяне вока вострае, адразу прыкмеціла, што з вас атрымаюцца добрыя пастухі. Дзякуй вам за гульню! А пераможцу мы адорым, як сапраўднага пастуха, смачным сырам. Каб жылі вы, як сыр у масле. Дзякуй вам!

*(Удзельнікі гульні займаюць свае месцы.)* ***Ганначка:***

Майская травіца для ўсякай скацінкі гадзіцца, казалі раней беларусы. Таму што для кожнай жывёлы ў Юр'я была свая расліна. Адкажыце, калі ласка, для якой свойскай жывёлы ён прыпас траву? *(Для каровы)*

Для якой лазу? *(Для казы)*
Для якой мурог? *(Для авечак)*
Для якой дзягель? *(Для свіначак)*
Для якой канюшыну? *(Для коней)*

*(Усе, хто адказаў правільна, атрымліваюць жэтоны-сонейкі.)*

***Ц. Марыся:***

Малайцы, усё ведаеце. А ці ведаеце вы, што калі статак прыходзіў на поле, яго асвячалі свянцонай вадою. Потым атрыманыя ад сялян дары, якім надавалася магічнае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значэнне, пастухі складвалі разам і гатавалі на раскладзеным вогнішчы абрадавую страву — яечню.

***Ганначка:***

Вось і ў нас ёсць такая яечня, якую толькі што спяклі пастухі і прынеслі сюды для вас. Але пакаштаваць яе зможа толью адзін чалавек, а хто — мы зараз даведаемся. Запрашаем сюды тых, хто вылучыўся ў апошняй віктарыне, пакаштаваць Юраўскую яечню!

***Марыся:***

Вы павінны знайсці гаршчок з яечняй з завязанымі вачамі.

*(Удзельнікам гульні завязваюць вочы хусткамі, і яны імкнуцца яго знайсці пад мелодыю пастуховага наігрышу на дудачцы. Пасля заканчэння гульні.)*

***Ц. Марыся:***

Дзякуй усім за гульню! А вы, пераможца, частуйцеся Юраўскай яечняй і ўспамінайце гэтае свята.

***Ганначка:***

Цётачка Марыся, некалі ў дзяцінстве мне бабуля расказвала шмат Юраўскіх прыкмет, але я трохі запамятавала, можа, вы падкажаце?

***Ц. Марыся:***

Абавязков.

***Ганначка:***

Вось, напрыклад: Як дождж на Юр'я?

***Ц. Марыся:***

То будзе хлеб і ў дурня!

***Ганначка:***

А як на Юр'я — пагода?

***Ц. Марыся:***

То будзе на грэчку няўгода!

***Ганначка:***

А калі будзе раса?

***Ц. Марыся:***

То будзе ў дастатку коням аўса!

***Ганначка:***

Калі ў Юр'еў дзень ідзе дождж густы і вялікі?

***Ц. Марыся:***

То будзе расці высокае жыта! Бо святы Юрый быў апекуном земляробства. Існаваў такі звычай. На сваім полі гаспадар клаў спечаны каравай, каб па тым, як вырасла маладое жыта, меркаваць пра будучы ўраджай. Гэты каравай гаспадар дзяліў на ўсю сваю сям'ю.

*(Марыся бярэ ў рукі каравай на ручніку.)*

Вось мы і вырашылі пачаставаць вас Юраўскім караваем. Запрашаем усіх жадаючых да нашага пачастунку.

*(Марыся стаіць з караваем пасярод сцэны. Дзве дзяўчыны трымаюць ручнік у выглядзе хаткі на адлегласці 2—3 м ад цэнтра збоку.)*

***Ганначка:***

Толькі хвалююся я, што не хопіць нашага каравая на ўсіх. Таму станавіцеся ў карагод вакол цётачкі Марысі. Пад Юраўскую песню рухайцеся, калі ласка, у карагодзе. Калі музыка змоўкне, той, хто апынецца у ручніковым доміку, атрымае кавалак смачнага каравая.

*(Гучыць песня "Зарадзі, божа, жыта ", неаднаразова яна спыняецца, і тады частуюць аднаго з удзельнікаў кавалкам каравая.)*

**Песня:**

Зарадзі, божа, жыта,
Ды на новае лета.
Юр'я, Юр'ева. *2разы*
Коласам каласіста,
На ядро ядраніста.
Юр'я, Юр'ева. *2разы*
На таку ўмалотам,
А ў млыну прымалотам.
Юр'я, Юр'ева. *2разы*
А ў пячы румяна,
А на стале жадана.
Юр'я, Юр'ева. *2разы*

*(Калі ўвесь каравай раздалі гульня спыняецца.)*

***Ц. Марыся:***

Дзякуй вам, сябры! Цудоўны карагод у нас атрымаўся. На душы стала так лёгка і светла!

***Ганначка:***

Але не разыходзьцеся, калі ласка, бо зараз самы час паказаць у вясёлай беларускай польцы сваю жвавасць і неўтаймаванасць. Запрашаем усіх жадаючых да нас у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

круг. Ну, а для самай лепшай пары мы падрыхтавалі прыз.

*(Вядучыя запрашаюць да танца ўдзельнікаў праграмы і танцуюць разам з імі польку "Весялуху". Выбіраюць лепшую пару.)*

***Ц. Марыся:***

А вось і самыя здатныя танцоры. Сёння вы лепш за ўсіх скакалі, таму трымайце гэтыя дудачкі каб не было вам *ніколі* сумна і адзінока, каб яе песня была заўсёды вашым верным сябрам.

***Ц. Марыся:***

Дзякуй вам усім за добры настрой, а астатнім гасцям нашага свята — за гарачыя апладысменты!

***Ганначка:***

Паважаныя сябры! Мы маглі б да ранку танцаваць, гуляць, смяяцца! Але як нi сумна нам, Трэба з вамі развітвацца.

***Ц. Марыся:***

Спадзяёмся, што Юраўскія забавы прыйшліся вам даспадобы і гэта прыгожае беларускае свята кранула вашы сэрцы і не пакінула вас абыякавымі да нашай роднай спадчыны з яе хараством і непаўторнасцю.

***Ганначка:***

Хай Юр'я прыносіць здароўе і долю.
Хай будзе ў хаце прыбытку даволі.
І як распускаюцца зеленню почкі,
Няхай прыгажэюць сыны вашы, дочкі.

***Ц. Марыся:***

Няхай заклякоча над стрэхай на ранку
Той бусел, што дорыць дзяцей і заранку.
І хай абміне вас бяда і нянасце
Хай сонечным ранкам да вас прыйдзе шчасце.

***Ганначка:***

Са святам вас, сябры!

***Ц. Марыся:***

Да новых сустрэч!

## Юр'еў дзень

Па вёсцы даносіцца гук ражка. Усе дзяўчаты па папярэдняй дамоўленасці збіраюцца на пляцоўцы каля клуба.

***Дзяўчына.***

Добрай вам святочнай раніцы, сяброўкі мае, бярыце ручнікі, пойдзем Юр'евай расою ўмывацца, здароўя, прыгажосці набірацца. Сябе прыбяром, а тады двары прыбяром, каб і кароўкі нашы таксама былі прыгожыя і здаровае малачко нам давалі.

Дзяўчаты стаюць карагодам і з песняй "Выйду я на двор..." ідуць праз вёску на поле.

Там яны рассцілаюць на рунь белыя абрусы, топчуцца па іх босымі нагамі каб раса ўвайшла у тканіну, пасля ўмываюцца расою самі, высушваюць твар у праменнях узыходзячага сонца.

Карагодам вяртаюцца ў вёску. Па дарозе збіраюць кветкі, галінкі, а пасля утыкаюць іх у плоты і вароты двароў.

Ля клуба іх ужо чакаюць хлопцы і Стары Пастух.

Дзяўчаты віншуюць іх са святам і дораць застаўшыеся кветкі і галінкі.

***Стары Пастух.***

Дзякую. І я вас зараз павіншую. *(Гудзіць у ражок).* Выходзіць Знахарка, трымаючы ў руках гаршчочкі з зёлкамі.

***Знахарка.***

Добрай раніцы. Са святам цябе, Юрый, са святам, хлопцы, са святам усіх.

***Стары Пастух.***

І цябе таксама.

***Знахарка.***

Вось вам, дзяўчаты, гаршчочкі павыжыгаць ліхія вочкі. Ідзіце, дзевачкі да двароў, акрапіце расою нашых кароў. Ідзіце за каровамі сцежкамі, акурыце іх варажбіцкімі зёлкамі.

Знахарка раздае гаршкі, Стары Пастух кладзе ў іх вуголле. Утвараецца шэсце: дзяўчаты з ручнікамі, за імі дзяўчаты з гаршкамі, хлопцы, госці свята, замыкаюць шэсце Стары Пастух і Знахарка.

Падыходзяць да падворка № 2.

Дзяўчаты вітаюцца з гаспадыняй, віншуюць яе СА святам.

Гаспадыня запрашае ўсіх у двор, выносіць з дому

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"хрэсцы", ламае іх і раздае прысутным са словамі.

— Ешце, любыя дзеткі, каб жа ж і кароўка мая ела, прыбывала, малачка давала.

Потым ідзе да стайні, выймае са страхі пук саломы, адчыняе дзверы, выводзіць карову ў двор, абводзіць вакол яе 3 разы па сонцу, пагладжвае пукам саломы і прыгаворвае:

Ідзі, мая каровачка, на Юр'еву расу, на Юр'еву расу, на Мікалаеву траву з вялікімі малакамі, з тоўстымі сырамі з глыбокімі смятанамі.

Затыкае салому ў дзверы стайні. Дзяўчаты ўтвараюць калдор: з правага боку стаяць дзяўчаты з ручнікам, з левага — з гаршкамі.

Гаспадыня выганяе праз яго кароўку на вуліцу. Тым часам на падворку № 1 адбываецца наступнае.

Гаспадыня з даёнкай ідзе праз двор і звяртаецца да Гаспадара:

— І ты ўжо падняўся, то добра. Зараз паснедаем ды і ў поле скацінку пагонім.

***Гаспадар:***

Я не толькі падняўся, але і сабраўся, сёння ж хто будзе спаць.

На Юр'еву расу кароўку трэба гнаць.

Ідуць у хату і снедаюць. Наеушыся, Гаспадар хрэсціцца на абраз.

***Гаспадар:***

Дзякуй Богу за хлеб на стале.

Гаспадыня бярэ святую ваду, дастае з абраза галінку вярбы, бярэ яйка.

***Гаспадыня (на абраз).***

Святы Юрай —Ягорай, спасі маю худобку ад гада паўзучага, ваўка бягучага, змея лятучага, злога чалавека. Накрый яе, Госпадзі, сваёй рызай святой, сахрані, памілуй.

Чараз поле чыстая, чараз мора быстрая шла маці Прычыстая. Там яна траву рвала, вадзіцу брала, рыбай кароўцы вымца падмывала. Як у моры, у калодзежы ўвечары вада прыбывае, каб у маёй кароўкі малако прыбывала.

Святы Юрай — Ягорай, спасі маю худобку ад гада паўзучага, ваўка бягучага, змея лятучага, злога чалавека. Накрый яе, Госпадзі, сваей рызай святой, сахрані, памілуй.

Благаславі, Божа, скацінку ў поле гнаці пасвіць, запасаць, ад ліхадзеяў замаўляць. *(Чытае малітву).* Выходзяць у двор. Гаспадар завязвае вяровачку на вароты, у вядро налівае ваду, кладзе яйкі.

Гаспадыня адчыняе вароты, выпускае карову.

***Гаспадыня:***

Дзе гэта рабая скацінка будзе хадзіць, там будзе і начаваць. Дзень была пад сонцам, вечар пад месяцам. Сонцам асвяцілася, месяцам адчарадзілася, зорачкамі асыпся.

Абыходзіць вакол з вядром вады, вылівае яе услед карове. Гаспадар паганяе карову вербачкай на вуліцу. Шэсце падыходзіць да падворка № 3. Дзяўчаты вітаюцца з гаспадыняй, віншуюць яе са святам. Гаспадыня запрашае ўсіх у двор, падыходзіць да стайні, выводзіць карову, бярэ нажніцы і падразае ёй хвост, кавалачак затыкае пад страху са словамі.

Каб ты хадзіла-хадзіла, ды не блудзіла.

Праганяе карову праз дзявоцкі "калідор" са словамі.

Святы Юр'я — Ягорый, сцаляй, спасай маю каровушку, ды й дадому прыганяй, сваё залатой рызай пакрывай.

Скідайся на пагоні туманам у боры, пнём у лугу, калодай у лесе.

Шэсце падыходзіць да падворка № 4. Дзяўчаты вітаюцца з гаспадыняй, віншуюць яе са святам. Гаспадыня запрашае ўсіх у двор, падыходзіць да стайні, выводзіць карову, тры разы абыходзіць вакол яе, пасыпаючы макам са словамі.

Як гэтага маку не злічыць, так няхай малака у цябе будзе не злічыць.

Праганяе карову праз дзявоцкі "калідор" са словамі.

Ідзі, мая кароўка, на Юр'еву расу, на зялёную траўку, ножкамі патанчы, ворагам не ўручыць...

На вёсцы кароў сустракае пастух, выганяе іх праз вёску ў поле. Хлопцы і дзяўчаты спяваюць і запрашаюць гаспадароў і гаспадынь пайсці ўслед за пастухом.

Усе праважаюць стада да канца вёскі.

Фальклорны гурт спявае "Як кароўка ёсць..."

Знахарка дастае з кошыка яйка і некалькі разоў катае яго па спінах кароў.

***Знахарка.***

Ах, Юр'я метка
Усю ночку не спала,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Пятра ключы брала,
Зямліцу адмыкала,
Пасіцу выпускала.
А вы, людзі,
Раненька уставайце,
І скацінку сваю выпускайце,
На Юр'еву расу,
На Міколаву траву,
Каб ваша скацінка
Здаравенька была,
Расу спажыла,
І дадому здаровай прыйшла.

***Стары Пастух.***

Твая, браток, зараз чарга каровак запасаць, свята ў поле сустракаць. Вось табе кайстра з хлебам да абеду *(перадае яму кайстру з пачастункамі)*.

Фальклорны гурт спявае "Тры карысці, тры радасці..."

***Дзяўчына.***

А мы, хлопцы — дзяўчаты, як віншаваць пастуха станем?

***Хлопец.***

"Цяцера.".

Моладзь спявае і гуляе.

Пастух дзякуе ўсім і зычна 3 разы ляскае пугай.

***Знахарка.***

А зараз, гаспадынькі, спяшайцеся па хатах, хуценька упраўляйцеся, на свята збірайцеся.

Усе паступова разыходзяцца па хатах.

У 10 гадзін ад вогнішча каля клуба пачынае свой шлях валачобнае шэсце. Наперадзе ідуць пастухі з пугамі, дудачкамі, свістулькамі, ражкамі. За імі дзяўчына з караваем, потым валачобнікі, Знахарка і Стары Пастух, фальклорныя гурты і госці свята.

Валачобнікі і фальклорныя гурты спяваюць.

Шэсце спыняецца ла двароў, віншуе гаспадынь са святам, просіць напоуніць кайстры пастухам, кажа святочныя пажаданні, запрашае пайсці з імі:

—Хай жывёла — гавяда пасецца.
—Хай курачка нясецца.
—Хай свіння сыцее,
—Хай кароўкі тлусцеюць, малачка даюць дзеткам.
—Хай расце жыта коранем караністае,
Коласам каласістае,
На ніве капамі,
У полі снапамі,
У дзежы падходам,
У печы прыпёкам,
У хаце спорам,
На стале сыццю.

Гаспадыні частуюць валачобшкау і далучаюцца да шэсця.

Прайшоўшы па вёсцы, натоўп з песнямі і музыкай накіроўваецца на Борачанец.

Пастухі першымі падыходзяць да вогнішча № 1 і сустракаюць астатніх.

***Хлопец.***

Пастухі, кажуць, нас ужо заждаліся!

***Стары Пастух.***

То йдзем, людзі добрыя,
Пастухоў нашых частаваць,
Юр'я святкаваць.

Музыкі граюць, фальклоныя гурты спяваюць. Натоўп накіроўваецца да пастухоў. Наперадзе ідуць Хлопец і Дзяўчына з кайстрамі.

***Хлопец.***

Гэй, браты-пастухі! Прымайце дары!

***Дзяўчына.***

Два мяхі сала, кіўбас, поўны кошык яек ад нас! Сем караваеў хлеба для сытнага абеду.

Пастухі дзякуюць і прымаюць дары.

***Пастух 1.***

Чым аддзячым, хлопцы? Можа "Юрачку" пойдзем?

Музыкі граюць "Юрачку", пастухі танчаць.

***Стары Пастух.***

Сонца ўжо высока, няхай вогнішча заззяе далека!

***Пастух 1.***

Няхай заззяе!

Пастухі ідуць, раскладаюць вогнішча і гатуюць яечню, Стары Пастух і Знахарка ім дапамагаюць.

***Стары Пастух.***

Давай, Ліоля, гаршчок, куды яечню класці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ліоля падае гаршчок. Стары Пастух кладзе туды кавалачак яечні. Пастух 1 бярэ яго і ставіць сабе на галаву, падтрымліваючы абедзвюма рукамі. Пастух 2 бярэ ў руку галаву, Пастух 3 кладзе ў правую руку жменьку солі.

***Стары Пастух:***

Ідзіце, хлопцы, каровак сцеражыце.

Фальклорны гурт спявае "Святы Юрэй". Усе ідуць да выгану, пастухі ўтвараюць невялічкае шэсце: наперадзе Пастух 4 з пугаю, за ім — Пастух 2 з галаўнёю, Пастух 3 — з соллю, замыкае Пастух 1 з яечняй.

Пастухі тры разы абыходзяць статак і спыняюцца ля месца, з якога пачалі шэсце, паварочваюцца да статка спінай, тварам у чыстае поле.

***Пастух 1.***

А—ту яго!

Астатнія Пастухі:

А—ту я го!

Пастух 4 зычна ляскае пугаю.

***Пастух 1.***

Соль жну ў вочы!

Пастух 3 кідае ў чыстае поле жменьку солі.

***Пастух 1.***

Галаўню жну ў вочы!

Пастух 2 кідае ў чыстае поле галаўню.

Знахарка бярэ стары башмак і тры разы таксама аббягае статак. Тады кідае башмак у сярэдзіну статка.

***Знахарка.***

Башмак ляціць — кароўка стаіць.
Башмак колам — каровы вакол.

***Дзяўчына.***

Можа, час ужо і на ўраджай паваражыць.

Фальклорны гурт спявае "Ой, палоса ты палосістая...". Усе ідуць да палянкі.

Дзяўчына перадае Старому Пастуху каравай.

***Стары Пастух:***

Здраствуй, ніва святая!
Віншуем з хлебам-соллю.
І з святам Юр'ем.
Каб Бог найвысшы і святы Юр'я
Пацешыў нас пагодаю і здароўем.

Абыходзіць з караваем поле. Фальклорны гурт спявае "Святы Юрэй". Абышоўшы поле, Стары Пастух кладзе каравай сярод руні:

Бачу гэты год будзе багаты.
Будзем піва варыці,
Сыноў жаніці,
Дачок замуж аддаваці.
Частуйцеся, калі ласка!

Рэжа каравай і раздае ўсім прысутным. Апошні кавалачак закопвае ў зямлю са словамі:

Не скупіся, зямліца родная,
Дай нам ураджаю добрага.

Фальклорныя калектывы спяваюць юр'еўскія песні.

***Знахарка.***

Смачны каравай? А калі б да яго яшчэ малака, сала ды кавалачак яечні! Запрашаю ўсіх на святочны абед.

Шэсце падыходзіць да вогнішча № 1. Граюць музыкі.

***Пастух 1.***

Частуйцеся, калі ласка!

Стары Пастух і Ліоля частуюць усіх прысутных яечняй, Пастухі смажаць сала, дзяўчаты наразаюць каравai хлеба.

Пастухі распальваюць вогнішчы № 2 і № 3. Паступова людзі разыходзяцца па пляцоўцы, набываюць штосьці ў гандляроў, спяваюць, абедаюць.

Праз некаторы час Знахарка.

Як выгналі кароўку, то кожная гаспадыня ля сваей пастае, а вышлі ў поле — хай Бог кароўку пасе. Пойдзем, бабанькі, каровак запасаць, па лесе за імі паплікаць.

Гурты в. Ананчыцы і Гаўрыльчыцы ідуць да лесу. Там разыходзяцца ў розныя бакі і ідуць насустрач адзін аднаго, гукаючы, паплікаючы, спяваючы (дадатак № 1). Сустрэўшыся, абдымаюць адна адну, віншуюць са святам, запрашаюць да свайго вогнішча. З песнямі вяртаюцца на пляцоўку.

## Куток халастых

Пляцоўка аформлена як сялянская вуліца *(пляцень, калодзеж)*. На плоце на рознакаляровых стужках —

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драўляныя цурачкі. Гучаць вясёлыя найгрышы дуды. На пляцоўку выходзіць вядучая — дзяўчына ў беларускім народным убранні.

***Вядучая.***

Добры дзень, шаноўныя людцы! Дзевачкі галубачкі, хлопцы-удальцы! У нас сёння Масленіца! Прыляцела к нам ластавіца,

Сёла на капу, скінула масла па каму.
Масляная, шчаслівая,
Працягніся да Вялікадня!
Масленачка, бела вутка,
Нясі сыру, масла да нас хутка!
Масленку сустракалі,
Сырам гару набівалі,'
Маслам гару палівалі.
Як на Масленай нядзелі бліны з горачкі ляцелі
Масленіца — пышка на вуліцу выйшла!

А ці ведаеце, мае даражэнькія, у што гулялі на Масленіцу? Гушкаліся на арэлях, кідаліся у сняжкі каталіся на санках з горак. А яшчэ на Масленіцу частаваліся блінамі, галушкамі ў смятане і клёцкамі ў малацэ. Колькі ж страў можна прыгатаваць са смачным духмяным малаком, ды і з самога малака? Хто з вас назаве больш за ўсіх малочных страў, той і будзе пераможцам у нашым "малочным" аўкцыёне, атрымае смачны пачастунак.

*(Праводзіцца аўкцыён "Малочныя стравы ".)*

***Вядучая.***

Я запрашаю да сябе вось гэту прыгожую дзяўчыну. Вы шмат ведаеце малочных страў, і я частую вас кубкам смачнага, свежага малака, каб шчочкі вашы былі заусёды ружовенькія. Пэўна ж, вы прыйшлі на свята з сяброўкамі? Дык запрашайце іх сюды да нас. *(Дзяўчына прыводзіць сябровак.)*

***Вядучая.***

Якія красуні сабраліся тут! А ці ведаеце, што раней дзяўчаты на Масленічнай нядзельцы, як сустрэнуць хлопца маладога на вуліцы, дык начэпяць яму на шыю калодку ў пакаранне за тое, што не ажаніўся у мінулы мясаед? Вунь, бачыце, дзяўчаты: хлопцы маладыя паселі. Вядзіце іх хутчэй да мяне!

*(Дзяўчаты вядуць хлопцаў.)*

***Вядучая.***

Вось вам, дзевачкі цурачкі: пачапіце іх на хлопцаў. А вы, хлопцы, зараз павінны адкупіцца — гульнямі, песнямі, танцамі, загадкамі. Я вам буду загадваць пра каханне, сямейнае жыццё. А хто не адгадае,
той да веку жаніцца не будзе.

1. Што люблю — не куплю, чаго не люблю — не прадам.
*(Маладосць і старасць.)*
2. Чатыры чатыркі, пятая лубяначка, а шостая каханачка.
*(Калыска і дзіця.)*
3. Усе кузні абхадзіў, а не кованы застаўся.
*(Халасцяк.)*

***Вядучая.***

Як вы хутка мае загадкі адгадалі. Малайцы, кемлівыя. А ці падабаюцца вам нашы дзяўчаты? Пэўна ж, вы, хлопцы, ведаеце шмат песень пра дзяўчат? Вось зараз мне і праспяваеце тыя, дзе сустракаюцца слова "дзяўчына", альбо жаночае імя. А дзяўчаты будуць спяваць песні, дзе сустракаюцца слова "хлопец" альбо мужчынскае імя. А гледачоў мы падзелім на дзве каманды, два хоры: злева хорам кіруюць хлопцы, а справа — дзяўчаты. *(Першым спявае хор пад кіраўніцтвам дзяўчат. Затым — пад кіраўніцтвам хлопцаў.)*

***Вядучая.***

Якія цудоўныя хоры атрымаліся! Прашу паспяваць цяпер разам якую-небудзь песню, пажадана пра каханне.

*(Усе разам спяваюць песню "Касіў Ясь канюшыну ".)*

***Вядучая.***

Так, добра спявалі, але ж, на мой погляд, перамагла каманда дзяўчат *(хлопцаў). І* пераможца ў спевах запрашае другую каманду на польку-паскакуху.

*(Гучыць полька.)*

***Вядучая.***

Вось, хлопцы, пакуль вы тут спявалі і танцавалі, пэўна ж, і дзяўчыну сабе прыкмецілі. Зараз я даведаюся, ці добра вы разгледзелі сваіх дзяўчат, з якімі так гарэзліва танцавалі.

*(Вядучая вядзе дзяўчат за шырму і размяшчае іх так, кааб былі бачны толькі ногі.)*

Хлопчыкі, пазнайце сваю дзяўчыну, з якой вы танцавалі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якая вам спадабалася, па чаравічках. *(Хлопцы шукаюць.)* Той, хто знайшоў, становіцца ў пары, а хто не знайшоў, гуляе ў гульню "Вяроўка".

***Вядучая***

*(звяртаецца да прайграўшых у папярэднім конкурсе).* Не сумуйце, хлопцы, я даю яшчэ вам адну магчымасць знайсці сабе пару. Слухайце уважліва. Удзельнікі гульні ўтвараюць два канцэнтрычныя кругі. Дзяўчаты становяцца ў знешні; хлопцы — у той, што бліжэй да цэнтра, у трох кроках ад дзяўчат. Гурт хлопцаў абкружаны, як кольцам, звязанай канцамі вароўкай, якую яны трымаюць рукамі на узроуні пояса. Гучыць музыка. Усе рухаюцца карагодам у сваіх кругах. Як толькі музыка змаўкае, кожны хлопец павінен, не выпускаючы вяроўку, пастарацца пераадолець адлегласць да дзяўчыны насупраць, каб пацалаваць яе. Зрабіць гэта не проста, бо кожны цягне ў свой бок. Перамагае самы дужы, якому першаму удаецца пацалаваць "сваю" дзяўчыну, не дакрануўшыся да яе рукамі.

*(Гульня працягваецца некалькі разоў, пераможцы ўзнагароджваюцца прызамі і пацалункамі дзяўчат.)*

***Вядучая.***

Ну і хлопцы-пераможцы! Такіх сабе дзяўчат прыдбалі, люба глянуць. Якія красуні, ды не з якіх заморскіх краін, а з родных нашых мясцін. І спяваць умеюць, і танцаваць прыгожа, і гасцінна частаваць. Добрыя гаспадынькі будуць: і накормяць, і прыгалубяць. Ой, жаніцеся, хлопцы, не адкідвайце работу на суботу, а вяселле на старасць, бо, як вядома, — "не жанаты — не багаты", а хто захоча жаніцца — таму ў куту не сядзіцца. Дык чыё ж вяселле першае гуляць будзем? Дзяўчаты хай стануць і утвораць нам дугу, як сімвал вяселля, а хлопцы з завязанымі вачамі тры разы абягуць вакол вось гэтай калоды, стануць на каленкі і пастараюцца прапаўзці ў дугу. Каму гэта удасца, той абавязкова ў гэтым годзе вяселле згуляе. А калі не, то цягаць яму гэтую калодку да наступнай Масленіцы.

*(Гучыць музыка.)*

Пасля заканчэння гульні вядучы вызначае пераможцаў.

***Вядучая.***

Вой, хлопцы, нездарма ў народзе кажуць: "Ажаніся, чорце, не будзеш круціцца!" А каб дакладней даведацца, праз колькі часу вяселле будзе, паскачыце праз гэту вяроўку. Дзяўчаты, разгушквайце вяроўку, а мы будзем лічыць. Хто больш за ўсіх праскача, той хутчэй і ажэніцца.

*(Хлопцы па чарзе скачуць праз вяроўку.)*

***Вядучая.***

Ну што ж, хлопцы-ўдальцы, мы пераканаліся ў тым, што ніхто з вас халасцяком не збіраецца застацца. Дык хопіць ужо вам цягаць гэтыя калодкі, а запрасіце лепш сваіх дзяўчат на вясёлую кадрылю. Калодку я пакладу паміж парамі. Але ж асцярожна, толькі не зачапіце, калі будзеце танцаваць. Хто калодку не зачэпіць, у таго будзе моцнае каханне на ўсё жыццё.

*(Гучыць музыка. Усе танцуюць.)*

***Вядучая.***

Дзякую ўсім за весялосць і жарты і частую самымі смачнымі, самымі салодкімі блінамі. Бо блін — гэта сімвал трох адзінстваў: Зямлі, Агню і Вады. Хто будзе есці бліны на Масленіцу, той будзе бадзёры, здаровы, прыгожы і закаханы. Дык няхай жа, сябры, будуць дні вашага жыцця ў шчасці і каханні. І няхай трывогі змяняюцца радасцямі.

*(Гучыць музыка. Вядучая частуе ўсіх блінамі)*

Да пабачэння!

Сустрэнемся праз год!

## ***Камаедзіца***

Пляцоўка прыбрана наступным чынам: на заднiку з ручнікоў альбо мешкавіны імітаваны дах хаты, на якім надпіс: "Запрашаем на Камаедзіцу". Стаіць стол, засцелены абрусам, на ім абрадавыя стравы Камаедзіцы. Гучыць мелодыя беларускай народнай песні.

На фоне музыкі на пляцоўку выходзяць хлопец і дзяўчына.

***Хлопец.***

Добры дзень, шаноўныя
Паннaчкі і пане!
Шчыра запрашаем вас
На спатканне з намі.

***Дзяўчына.***

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Сёння ў нашай хаце свята,
Ды не абы-якое —
Свята продкаў нашых слаўных,
Свята веснавое!

***Хлопец.***

Напярэдадні Благавешчання
Свята адбывалася
І ўвесь чысцюткі дзень
Жывёла ўслаўлялася.

***Дзяўчына.***

Мядзведзем жывёлу тую звалі
І ў гонар яе
Нават свята спраўлялі.

***Хлопец.***

А свята
называлася

***Разам.***

Ка-ма-едзіца!

***Дзяўчына.***

Яно прысвячалася ўрачыстай сустрэчы мядзведзя пасля доўгага зімовага сну.

***Хлопец.***

Яшчэ прашчуры беларусы Лічылі, быццам бы род наш пайшоў ад мядзведзя, і ставіліся да яго, як да найбольш паважанага родзіча.

***Дзяўчына.***

Вось і мы разам з вамі будзем ушаноўваць мядзведзя. У гонар яго песні громкія пяяць, танцы добрыя скакаць, у гулі розныя гуляць і загадачкі гадаць.

***Хлопец.***

А цяпер, мае ж вы браткі, адгадайце-ка загадкі.

***Дзяўчына.***

Хто адгадае нашую загадку, таго запрашаем у Камаедзіцаву хату.

***Хлопец.***

Ён вялікі і касматы,
Кажуць, што ён смокча
лапу,
Моцна можа ён равець,
Хто гэта такі?
*(Мядзведзь)*

— Правільна, мядзведзь! Калі ласка, заходзьце да нас у хатку.

***Дзяўчына.***

З вусамі, а не стары,
Зайздросныя вочы,
За што-небудзь на двары
Учапіцца хоча.
Хопіць хітрасці на трох,
Ну, на тое ж ён ...
*(гарох)*
- Правільна, гарох. Калі ласка, заходзьце да нас у хатку.

***Хлопец.***

Смачная, духмяная,
Лістамі прыхаваная,
Як убачыш — цячэ слюна.
Што ж гэта расце?
*(Маліна)*
— Правільна, маліна. Калі ласка, заходзьце да нас у хатку.

***Дзяўчына.***

Ляціць гудзіць,
Нектар збірае,
Мёд стварае.
Хто гэта такі?
*(Пчала)*

— Правільна, гэта пчала. Калі ласка, запрашаем і вас у нашу хатку. Дзе пчала, там і мёд, а мядзведзь вялікі ахвотнік да мёду. Само імя, якое дало яму славяна-літоўскае племя, азначае "жывёла, якая есць мёд".

***Хлопец.***

Дзякуй усім, загадкі добра адгадваеце. Спадзяюся, вы не забылі як наша свята называецца?

***Разам.***

Правільна, Камаедзіца!

***Хлопец.***

Дык вось, у гэты дзень сяляне рыхтавалі асаблівую ежу. *(Гучыць беларуская народная мелодыя. Хлопец і дзяўчына падыходзяць да стала, бяруць абрадавыя стравы Камаедзіцы і паказваюць гледачам.)*

***Дзяўчына.***

Па-першае, сушаны рэпнік, таму што мядзведзь ужывае пераважна раслінную ежу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Хлопец.***

На другое падавалі гарохавыя камы. Адсюль і назва свята Камаедзіца!

***Дзяўчына.***

А на трэцяе — аўсяны кісель, таму што мядзведзь надта любіць авёс.

*(Зеяртаецца да ўдзельнікаў, якія на сцэне.)*

— А вось кісель мы прыгатуем разам з вамі. Гэта вельмі проста.

Злева — каманда "Камы".

Справа — каманда "Мядзведзь".

*(Насупраць кожнай команды стаяць кубы, на іх— дзве міскі і два глечыка.)*

На гэтым стале прыгатавана усё, што патрэбна для кісялю: авёс і вада.

Першыя з абедзвюх каманд павінны ад стала да куба перанесці 2 лыжкі аўса, пакласці яго ў міску і 5 разоў патаукці лыжкай. Пасля гэтага вы вяртаецеся да сваей каманды і перадаяце лыжку другому ўдзельніку гульні. Гэты удзельнік павінен перанесці ад стала да куба 5 лыжак вады і уліць у міску. Зрабіўшы гэга, другі перадае лыжку трэцяму ўдзельніку. Трэці павінен перамяшаць авёс з вадой у місцы, пераліць у глечык, прынесці і паставіць на стол.

Якая каманда першая паставіць на стале глечык з кісялём, тая і будзе пераможцай.

*(Гучыць беларуская народная мелодыя. Хлопец і дзяўчына праводзяць гульню.)*

***Хлопец.***

Ну, вось мы і прыгатавалі кісель. І, нягледзячы на тое, што перамагла каманда мы камаедзіевым кісялём частуем усіх удзельнікаў і гасцей.

*(Гучыць беларуская народная мелодыя. Дзяўчына частуе кісялём удзельнікаў і гасцей.)*

***Хлопец.***

Пасля абеду на Камаедзіцу пачыналася рытуальнае дзеянне: людзі наядаліся гарохавых камоў, лажыліся на ложак і паварочваліся з боку на бок, імітуючы варочанне мядзведзя у бярлозе. Яны лічылі, што так дапамогуць мядзведзю устаць з бярлогі і гэтым абудзіць прыроду пасля доўгага Зімовага сну.

***Дзяўчына.***

А яшчэ на Камаедзіцу пасля абеду і сну людзі не працавалі а святкавалі. Наймалі музыкаў, песні спявалі, у гулі гулялі, танцавалі Калі-некалі на свята завітвалі і скамарохі са сваімі мядзведзямі.

***Дзяўчына.***

І на наша свята мы таксама запрасілі мядзведзя.

*(Гучыць беларуская народная мелодыя. Дзяўчына выводзіць мядзведзя.)*

***Хлопец.***

Добры дзень! Калі ласка, да нас у хату.

***Дзяўчына.***

Мішка толькі што выйшаў з бярлогі. Ён галодны, бо ў лесе пакуль няма чаго есці. Ён так марыць аб цёплым лецейку, калі ў лесе з'явіцца шмат смачнай ежы і ён будзе ею ласавацца. Давайце ж і мы разам з мядзведзем у сваіх марах перанясёмся у цёплае лецейка і пачастуем яго тым, што расце ў лесе.

Адкажыце, чым жывіцца мядзведзь?

*(Удзельнікі адказваюць: ягады, грыбы, мёд, арэхі, карэньчыкі і г.д.)*

***Хлопец.***

Малайцы, паказалі добрае веданне харчовых запасаў лесу. А ці ўмееце вы іх збіраць. Зараз паглядзім!

***Дзяўчына.***

Мы разам з Мішай прапануем вам пагуляць у гульню "У мядзведзя на бару грыбы-ягады бяру". Прашу вас, станьце ў круг, вазьміцеся за рукі і паўтарайце за мной словы:

"У мядзведзя на бару
Грыбы, ягады бяру,
А мядзведзь на нас глядзіць
і вурчыць".

*(У гэты час, пакуль развучваюць песню, мядзведзь прыносіць імітавапыя грыбы і ягады і раскладвае вакол сябе.)*

***Дзяўчына.***

Вось бачыце — паляна. На ей растуць грыбы і ягады. Але не надта іх проста ўзяць, бо гэтае дабро мядзведзь вартуе. Давайце будзем ісці па крузе і спяваць песеньку, якую ўжо вывучылі... Як толькі песенька скончыцца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кожны стараецца ухапіць сабе што-небудзь з палянкі. Каго мядзведзь запятнае, той з гульні выбывае, а хто спрытны ды ўдалы, атрымае прыз нямалы. Як музыка зайграе, гуляць усе пачынаем.

*(Гульня працягваецца да таго часу, пакуль скончацца ўсе грыбы і ягады.)*

***Хлопец.***

А зараз вернемся на наша свята Камаедзіца. Прашу ўсіх, пакажыце, хто што пабраў у лесе.

***Дзяўчына.***

Ну вось бачыце — найбольш за усіх грыбоў і ягад у Мядзведжы бары назбірала (вось гэтая дзяўчына або хлопец). Яе завуць ______________________ .

Мядзведзь ей дарыць гарохавы стручок, бо гэта — дар Камаедзіцы. Павітаем пераможцу.

***Хлопец.***

А цяпер павітаем мядзведзя, бо гэта ж яго свята.

І праспяваем разам мядзведжыя прыпеўкі.

*(Дзяўчына раздае тэксты з прыпеўкамі)*

***Хлопец.***

Спяваць будзем па чарзе, кожны па куплету.

На вясёлыя прыпеўкі
Сабраліся хлопцы, дзеўкі —
Добра пець і танцаваць
Ды мядзведзя шанаваць
А мой милы, як мядзведзь,
Не гаворыць, а равець
Калі п'яны — ссе ён лапу,
Калі злы — яго не цапай.
Ой, спужалась я мядзведзя.
У цемры, ля дарожкі.
Гята ж мой каханак Федзя,
Ды крывыя ножкі.
А мая ж ты любая,
Ты, як та мядзведзіца:
Сама, з'ела слоік мёду —
Вось вам, Камаедзіца!
А мой мілы касалапы,
У яго нага, як лапа.
Я мілога круць і верць
А ён скача, як мядзведзь
Я не ведала такога
Свята Камаедзіца,
І што прашчур у мяне —
Бабулечка- мядзведзіца.

***Дзяўчына.***

Вось якія цудоўныя прыпеўкі мы праспявалі!

***Хлопец.***

А зараз запрашаем патанцаваць "Гарохавую польку". Усе сталі па парах. Мядзведзь таксама разам з намі будзе танцаваць. Але ў яго замест пары — гарохавы ком. Як толькі музыка скончыцца, вы павінны хуценька памяняць сабе пару. Мядзведзь кідае на падлогу гарохавы ком і таксама шукае яе. Каму пары не застанецца, той павінен станчыць з гарохавым камяком. І так будзем. танцаваць, пакуль ногі не забаляць.

***Дзяўчына.***

А аб прызе "Гарохавай полькі" вы даведаецеся у канцы полькі.

*(Іграе музыка, усе танцуюць польку.)*

***Дзяўчына.***

Калі ласка, станьце ўсе паўкругам. У каго застаўся гарохавы камяк? Мядзведзь таму дарыць мех гароху, каб вас ніхто не скуб, як гарох пры дарозе, каб вы елі гарохавыя камякі і ўспаміналі свята.

***Хлопец.***

Ну, а той дзяўчыне, з якой першай затанчыў Мядзведзь, таксама прыемная навіна: згодна з народнымі павер'ямі, пасля замужжа ў яе павінна нарадзіцца двойня...

***Дзяўчына.***

Вось і скончыліся нашыя гулі!
Дзякуем шчыра,
Што не паснулі

***Хлопец.***

Што рагаталі ад душы,
Пелі і скакалі.
Дзяўчына. І па звычаю старому
Мядзведзя ўшанавалі

***Хлопец.***

Звычаі народа — нашага багацце,
Скарбніца, што засталася на шчасце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І скарб гэты трэба ўсім захаваць,
Каб потым нашчадкам сваім перадаць.
Разам. Жывіце шчасліва!
Здаровы бывайце!
І Камаедзіцу ўспамінайце!

## *Птушыныя гульні*

Гучыць веснавая песня "Жаваронaчкі, прыляціце". На яе фоне гучаць спевы птушак. Праз нейкі час з'яўляецца Шпак.

***Шпак.***

Ну, вось я і дома. Як цудоўна вакол! Вось і прыляцеў! А людзі так рады мне: я прынёс з сабой вясну.

Ой, вясна, вясна вясёлая, гу-у-у!
Прыйдзі, прыйдзі, вясна вясёлая, гу-у-у!

*(Гучыць веснавая музыка, спевы птушак, пералівы вады і г. д. З'яўляецца Вясна.)*

***Вясна.***

Добры дзень, мае даражэнькія! Я яшчэ здалёк пачула цудоўную песню і прыйшла да вас. Вы ж мяне так чакалі.. А вы ведаеце, хто я такая?

*(Чуюць воклічы: "Вясна!".)*

***Вясна.***

Так-так, я Вясна, як жа я рада бачыць вас. Любыя мае, а вы загадкі ўмееце адгадваць? Ну, тады дапамажыце мне, калі ласка. Мне зімачка халодная загадала адну загадку, і я ніяк не магу адгадаць яе. Вось слухайце: 12 арлоў, 52 галкі адно яйка знеслі. Што ж гэта можа быць? *(Год) (Пасля адказу):* І сапраўды так, як жа раней я не зразумела? *(Звяртаецца да таго, хто адказаў):* Правільна, вось табе гэты маленькі падарунак.

**Слухайце далей і адгадвайце:**

**1.** Шапачка
маленькая,
Камізэлечка
нятканая,
Каптанік рабенькі,
Ды ходзіць басенькі. *(Верабей)*

2. У чырвоных ботах
Ходзіць па балоце,
На'т падняўшы лапку,
Спрытна ловіць жабку.
*(Бусел)*

3. Белы бок і чорны бок,
Скок ды скок, скок ды скок. *(Сорока)*

4. Без рук, без сякеры
Зроблена хатка і дзверы.
*(Гняздо)*

5. Хапатая ў мяне крылы,
Хвосцік востры, нібы вілы,
З гліны я гняздо ляплю,
Мошак на ляту лаўлю.
*(Ластаўка)*

Пасля кожнай загадкі Шпак раздае жэтоны ў выглядзе птушак.

***Вясна.***

Малайцы, правільна адгадалі загадкі. Тых, хто атрымаў жэтоны,калі ласка, запрашаю да сябе.

А зараз я правяду с вамі гульню, якая называецца "Ластаўка і мошкі". Ўсіх жа летам камары і мошкі кусалі? І Ластаукі іх знішчалі. Зараз мы пры дапамозе лічылкі вызначым ластаўку.

Пайшла курка ў аптэку,
Закрычала: "Кукарэку!
Дайце пудры і духоў,
Каб прывабіць петухоў!"

***Вясна.***

Вось і вызначылі ластаўку, усе астатнія стануць мошкамі. Ластаўка будзе лавіць вас. Да каго яна дакранецца, той выбывае з гульні. І так да таго часу, пакуль не застанецца апошняя мошка, якую ластаўка ператварае ў сваю сяброўку, такую ж ластаўку.

*(Гучыць вясёлая музыка.)*

***Вясна.***

Дзякую вам, вы ўсе так добра гулялі таму запрашаю ў веснавы карагод разам з дзяўчатамі, якія атрымалі ад Шпака вяночкі Калі ласка, хадзіце да нас. *(Гучыць песня*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*"Жаваронаачкі, прыляціце ", усе вядуць карагод.)*

***Вясна.***

Добра вы вадзілі карагод, і я зараз пачастую вас веснавым печывам.

*(Вясна пасля пачастунку запрашае ўсіх на свае месцы.)*

***Вясна.***

А хто хоча адказаць на такія пытанні:
Якія птушкі першыя адлятаюць у вырай?
А якія на зіму застаюцца?
Дзе жыве бусел?
Як называецца хатка шпака?
Якія птушкі вяртаюцца з выраю дадому?
З чаго ластаўка робіць сабе гняздо?

*(Хто першы адказвае, таму Шпак раздае жэтоны.)*

***Вясна.***

Ну, добра, малайцы, хутка адказалі на ўсе пытанні. Тых, хто атрымаў жэтоны, я запрашаю да сябе. Правядзем яшчэ адну гульню. Зараз пабачым, якія вы спрытныя. Станьце ад мяне аберуч па 3 чалавекі. Зараз мы правядзем гульню "Хто хутчэй выведзе птушаня". Вядома, што пакуль птушаня вылупіцца з яйка, праходзіць шмат часу. Але сёння мы паспрабуем вывесці птушанят за некалькі хвілін. Сёння ў нас птушкі незвычайных памераў *(паказвае на ўдзельнікаў)*, адпаведна і яйкі большыя за звычайныя *(паказвае на шарыкі)*. Вы павінны даляцець да гнязда, сесці на яйка, вывесці птушаня. Гэта значыць: яйка павінна лопнуць, а вы скажаце пры гэтым, якое птушаня вывелі. Хто хутчэй зробіць, той і атрымае прыз. Зразумелі? І так, лічым: раз, два, тры...

*(Гучыць вясёлая музыка. Пасля гульні Шпак частуе ўдзельнікаў.)*

***Вясна.***

Каб нам было весялей, запрасіце да сябе сваіх сяброў для ўдзелу ў наступнай гульні.

*(Гучыць музыка, удзельнікі збіраюцца ў пары і выходзяць на пляцоўку.)*

***Вясна.***

Вось і добра, хуценька сабралі сваіх сяброў. З аднаго боку — каманда "Жаваранкі", з другога — "Шпакі". Зараз мы правядзем яшчэ адну гульню, якая называецца "Сарочыны рэчы".

Вы ведаеце, што сарокі любяць збіраць бліскучыя рэчы? Перад вамі яны якраз і ляжаць. Умовы гульні: кожны з вас бярэ па адной рэчы і нясе ў сваё гняздо. Гэта трэба зрабіць за той час, пакуль гледачы будуць лічыць да 10-ці. Тая каманда атрымлівае прыз, якая як мага больш назбірае рэчаў у свае гняздо. Зразумелі? Пачалі!

*(Гучыць музыка, Шпак з гледачамі лічаць да 10-ці.)*

***Вясна.***

Вось зараз і паглядзім, чыя каманда назбірала болей рэчаў. *(дзе падік, пасля чаго вызначаецца каманда пераможцаў. Усіх частуюць печывам.)*

***Вясна.***

Хто яшчэ больш хоча зарабіць прызоў? Я запрашаю на вясёлую польку, у якой вы павінны танчыць і адначасова рабіць адпаведныя рухі той птушкі, якую вы сабе уявілі. А калі музыка скончыцца, то спыніцца.

*(Гульня праводзіцца 2—3 разы, пасля кожнага раза вызначаецца лепшы вобраз птушкі. Шпак частуе пераможцаў, дае прызы.)*

***Вясна.***

Ой, як весела ў нас, ногі самі рвуцца ў пляс. Зараз я запрашаю вас у карагод.

*(Гучыць музыка, усе спяваюць беларускую народную песню "Ой, праляталі два галубочкі". Шпак заводзіць карагод "На улітку".)*

***Вясна.***

Вось якая цудоўная птушыная хатка атрымалася, у ёй весела і дружна спяваюць розныя птушкі. Зараз перад вамі выступае птушыны хор, які выконвае песню толькі на птушынай мове. Зразумелі?!

*(Гучыць песня "Ой, прыляталі два галубочкі ". Усе спяваюць па-птушынаму: сакочуць, свішчуць, шчоўкаюць і г. д.)*

***Вясна.***

Добра, проста цудоўна вы спявалі За гэта я вам аддзячу галоўным салодкім прызам.

*(Шпак запрашае ўдзельнікаў стаць паўкругам,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вясна частуе ўсіх. Гучыць музыка.)*
***Вясна (звяртаецца да ўдзельнікаў).***
Чуеце гукі знаёмага танца "Качаняты"? Калі ласка, запрашайце на пляцоўку ўсіх танцаваць з намі.*(Агульны танец "Качаняты ".)*
***Вясна.***
Вось і заканчваецца наша веснавое свята. Вялікі дзякуй вам усім, хто прыйшоў, усім, хто браў удзел у танцах, карагодах, гульнях. Няхай звіняць радасным напевам, весела гамоняць і спяваюць нашы крылатыя сябры, якія нясуць на сваіх крылах вясну, мір і шчасце. Беражыце кожную маленькую раслінку, кожную крынічку, кожную птушку.
Будзьце здаровы, як крынічная вада,
Будзьце вясёлы, як добрая вясна,
Будзьце багаты, як наша зямля!
Да пабачэння, да новых сустрэч!
*(Гучыць музыка. Вясна і Шпак адыходзяць.)*

## *Вялікдзень*

На задніку сцэны выява ўзыходзячага сонца. На ручніках раскладзены хлеб *(каравай) і* яйкі.
На пляцоўку з песняй уваходзяць валачобнікі: пачынальнік, падхватнік (дзяўчына,) і механоша. Пяюць:
Борам, борам, баравінаю —
Ой, віно, віно, віно зеляно —
Валачобнікі валачылісь,
А куды мы, а куды мы пойдзем?
Пойдзем, пойдзем мы дарожанькай,
Дарожанькай ды шырокай...
***Пачынальнік.***
Вось і вёска. А жыхароў колькі сабралася!
***Усе разам.***
Дзень добры, паважаныя!
***Пачынальнік.***
Нам, валачобнікам, каго спрадвеку чакаў сённяшнім днём просты і няпросты люд, каб з нашых вуснаў пачуць тое, чаго яму хацелася і што абавязкова павінна было адбыцца, дазвольце павіншаваць вас са светлым святам абуджэння прыроды, святам Сонца і надзей...
***Усе разам.***
Святам Вялікадня!
***Падхватнік.***
Жадаем цэлы год быць без хвароб.
***Механоша.***
Грошай поўны кашалёк.
***Падхватнік.***
Хай усё ў вас вядзецца.
***Усе разам.***
Шчасце-радасць не звядзецца!
***Падхватнік.***
Калісьці ў гэты дзень адзначалі надыход новага працоўнага года.
***Пачынальнік.***
Адным з галоўных прадметаў на свяце было што? *(Дастае з кішэні яйка.)* Правільна — яйка! Па ім нашы далёкія продкі меркавалі аб будове свету. А хто з вас, паважаныя, ведае, дзе ў яйка "верх" і дзе "ніз"? Пакажыце, калі ласка. *(Падыходзіць да таго, хто хацеў адказаць.)* Правільна. .Лічылі, што вось гэтая частка яйка*(паказвае на "тупую" вяршыню)* нагадвае круглы купал неба, а ніжняя замыкае свет падземны. Вось якое вялікае гэта наша звычайнае яйка.
***Падхватнік.***
Яле яно яшчэ вельмі смачнае. А колькі разнастайных і цікавых страў можна прыгатаваць з яго і пры дапамозе яго.
***Пачынальнік.***
Цікава, сябры, хто з вас больш усіх ведае страў, у якіх яйка з'яуляецца незаменнай часткай? Але пачакайце, я пачну. Першая страва — яечня. Яечня, раз, яечня два...
*(Гульня па тыпу аукцыёна праводзіцца да лічбы "3".)*
***Пачынальнік.***
...тры. Усё, прададзена! Самаму дасведчанаму кулінару — велікоднае валачобнае і прыз.
***Механоша.***
Дарэчы, сябры. Дзесьці тут схаваўся вялікі велікодны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыз — для самага шчаслівага — і шмат маленькіх. Шкада будзе, калі яны "пойдуць" разам з намі, у суседнюю вёску. ***Пачынальнік.***

Так, так. Але ж стравы яны добра ведаюць.

***Механоша.***

Пачакай, пачакай. А ці ведаюць яны тыя з іх, якія мелі магічны уплыў на урадлівасць і пладавітасць у гаспадарцы? ***Пачынальнік.***

А сапраўды, сябры, хто з вас ведае такія "магічныя" стравы? *(Тых, хто назаве: яйкі, хлеб (каравай), свініну, валачобнкі адорваюць велікодным валачобным. У гэтым спісе можа быць і курыца.)*

***Пачынальнік.***

Ну вось, малайцы, усе ведаеце! ***Механоша.***

Малайцы... А вось назавіце мне: хто матка яйка?

*(Гледачы адказваюцъ: "курыца ".)* ***Пачынальнік.***

Гэта ведаеце. А вось прымаўкі пра яе шумлівую сямейку наўрад ці?

***Механоша.***

Ты маеш на ўвазе пеўня з яго курыцай?

***Пачынальнік.***

Так. Ну дык слухайце, шаноўныя. І, калі ведаеце, дапаўняйце мяне:

—Яйка курыцу не ... *(вучыць).*

—Не чакай, каб певень яйка... *(знёс).*

—Ад дрэннагаругана дрэнныя ... *(яйкі).*

—На ліц0 яйцо, а ў сярэдзіне... *(баўтун).*

—Скажы адной курыцы, а яна ўсей ... *(вуліцы).*

—Бывае, што і курыца пеўнем... *(спявае).*

—Хто куры краў, у таго і рукі ... *(трасуцца).*

***Пачынальнік.***

Паглядзіце, сябры (да валачобнікаў), у якую прыгожую вёску мы зайшлі. І прымавак, здаецца, тут шмат ведаюць.

***Падхватнік.***

Відаць, дома яны аднымі прыказкамі ды прымаукамі і размаўляюць.

***Пачынальнік.***

Тым не менш, усіх, хто мяне дапаўняў, запрашаю падысці да нас за велікодным прызам і невялікім сюрпрызам. Смялей.

*(Адорваючы выходзячых, валачобнікі ставяць іх збоку. На сярэдзіну пляцоукі выносіцца накрытая ручнікам скрыня з яйкамі, адно з іх — чароўнае.)*

***Пачынальнік.***

А вось, паважаныя, і сюрпрыз. У гэтай скрыні, разам са звычайнымі, ляжыць "чароўнае яйка". Хто яго выцягне, той будзе самы шчаслівы на працягу усяго года. Калі ласка, цягніце па чарзе.

*(Гуляючыя цягнуць яйка. Далей гульня ідзе ў залежнасці ад абставін. Прапануем прыкладны працяг.)*

***Пачынальнік.***

У вас аказалася звычайнае яйка. Не хвалюйцеся, яшчэ будзе магчымасць выправіць справу. Яйка пакіньце сабе і пачакайце хвіліначку тут, калі ласка.

*(Праводзіць на другі бок пляцоўкі, дзе будуць збірацца ўсе, каму не пашанцуе.)*

***Пачынальнік.***

Наступны хто? Цягніце смялей... У вас таксама звычайнае. Не пашанцавала... Праходзьце сюды, яйка цяпер вашае. Наступны. О, у вас "чароўнае". Вось самы вязучы чалавек года. Чароўнае яйка вашае. Прыз. Віншуем. Адпачніце, калі ласка, чакаем вас у наступных гульнях.

*(У гэты час валачобнікі замест скрыні ставяць "горку" для качання яек.)*

***Пачынальнік.***

Сябры, да каго цягнуць чароўнае яйка чарга не дайшла, — вам на шчасце па велікоднаму валачобнаму. Трымайце. *(Валачобнікі дораць яйкі. Пачынальнік працягвае.)* У старажытныя часы, каб зямелька хутчэй абудзілася ад зімовага сну, па ей качалі яйкі... А яшчэ, качаючы іх з горкі, людзі маглі даведацца аб працяглсці свайго жыцця. Давайце і мы выявім сярод вас доўгажыхара. Шаноўныя, я запрашаю сюды ўсіх, хто мае валачобнае і жадае палічыць свае гады. Адна ўмова — яйка з горкі трэба каціць, лёгка пускаючы, і не кідаць ні ў якім выпадку. Ну а цяпер па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чарзе пачынаем.

*(Усе ўдзельнікі коцяць яйкі)*

***Пачынальнік.***

Ваша яйка закацілася найдалей. Вы — будучы доўгажыхар. Вам прыз, і не забудзьце з цягам часу запрасіць на 100-гадовы юбілей. Чакаем вас у наступных гульнях.

*(На пляцоўку, крыху з боку, ставіцца стол, на якім стаяць талерачкі. Укожнай з іх ляжаць: сырое яйка, крыху солі, хлеб і нож.)*

***Пачынальнік.***

Сябры, хто з вас любіць сырыя яйкі?

*(Адказваюць.)*

Вельмі добра. Падыдзіце, калі ласка, да стала. А вы (да тых, хто не любіць сырыя яйкі) тут хвілiначку пачакайце. Добра? Дзякуй. Так, зараз мы выявім самага дужага чалавека гэтага года, бо ён больш за ўсіх вып'е сырых яек і рабіць гэта будзе хутчэй за ўсіх. Старыя людзі нездарма кажуць: хочаш быць здаровым — пі сырыя яйкі. Умовы простыя — хто хутчэй вып'е яйка. Вам тут і соль, і хлеб. Падрыхтаваліся? Пачынаем. *(Удзельнікі выпіваюць яйкі.)*

***Пачынальнік.***

Вось самы дужы і здаровы, а значыць, і самы працавіты чалавек. Атрымайце велікодны прыз. Дзякуй, чакаем вас у наступных спаборніцтвах.

*(У гэты час на стол замест талерачак кладуць драўляныя лыжкі.)*

***Пачынальнік.***

А вам, сябры, не пашанцавала? *(Да тых, хто прыйшоў з залы.)* Дык атрымайце валачобнае. І ўсе мы зараз пагуляем у цікавую велікодную гульню, у якой вы прадэманструеце свой паляўнічы спрыт. Слухайце ўмовы: вы па чарзе, з завязанымі вачыма, павінны з трох разоў лыжкай пацэліць па яйку, якое будзе ляжаць дзесьці тут *(паказавае на стол)*. Усё зразумела? Тады, калі ласка, па тры чалавекі падыходзьце да стала, бярыце лыжи. Вось з вас пачнём, і далей — па сонейку па чарзе. Б'ём усяго тры разы.

*(Валачобнікі завязваюць удзельнікам вочы.)*

***Пачынальнік.***

Увага, яйка на месцы. Пачынаем.

Удзельнікі па чарзе б'юць тры разы лыжкай па паверхні стала. Тым, хто пацэліць па яйку, Пачынальнік дае прыз і кажа: "Дакладнасць будзе адметнай рысай ва ўсіх справах"; тым, хто не пацэліў — "У вас усё наперадзе. Не хвалюйцеся". *(першых, і другіх ён пакідае на пляцоўцы, пераводзячы на другі бок адносна тых, хто яшчэ не згуляў. Прапануе згуляць жадаючым з залы. Дорыць ім прыз ці яйка.)* ***Пачынальнік.***

Ну, а зараз, даражэнькія, і вас (да тых, хто на пляцоўцы), і ўсіх, хто атрымаў наша валачобнае, я запрашаю сюды да нас. Калі ласка! Старажытная велікодная гульня ў біткі і галоўны велікодны прыз чакае вас.

*(Удзельнікі свята збіраюцца на пляцоўцы.)*

***Пачынальнік.***

Сябры, сутнасць гульні, думаю, вам вядома? Хтосьці адзін з вас у выніку яйкавых баёў павінен застацца з цэлым яйкам. Усё зразумела? Тады пачынайце. А мы *(да гледачоў)* паспяваем крышку. Добра? *(Валачобнікі спяваюць беларускую народную песню "А я бачыў, бачыў ", уцягваючы ў яе тых удзельнікаў свята, якія з 'яўляюцца гледачамі на гэты момант. Песня і гульня скончыліся.)*

***Пачынальнік.***

Дык у каго з вас самае моцнае валачобнае? У вас? Вось "мацак". Віншуем. У вас у гэтым годзе будзе самая моцная гаспадарка. Трымайце прыз. Сябры, давайце ўшануем гэта яйка і яго гаспадара, каб і для нас год быў багатым. Калі ласка, зрабіце вакол нас карагод — сонейка з велікодных яек. А пры канцы карагода наш мацак выбера самага шчаслівага з вас. Хто жадае стаць шчаслівым? *(У зал.)* Хутчэй у карагод!

*(Карагод на мелодыю беларускай народной песні "У карагодзе мы былі.)*

***Пачынальнік.***

Што ж, "мацак", пакажы нам самага шчаслівага. *(Гаспадар "мацака " круціць яго на талерачцы. Пасля таго, як яйка прыпыніцца, умоўна правёўшы рыску ад "нізу"да "верху", знаходзяць "самага шчаслівага чалавека".)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Пачынальнік.***

Вось каго "выбрала" яйка! Самы шчаслівы чалавек. Вам вялікі велiклодны прыз. Віншуем.

*(Усіх удзельнікаў у гэты момант валачобнікі выстройваюць у паўкруг.)*

***Пачынальнік.***

Сябры, цяпло так і льецца з вашых вачэй і ўсмешак. Цяпло, якое разам з Сонейкам адагрэе зямельку і абудзіць у ей жыццё і надзею. Дзякуй вам за гэта свята, а нам пара ісці далей.

*(У гэты момант усе валачобнікі сабраліся каля Пачынальніка.)*

***Пачынальнік.***

Хай тут сонца ярка свеціць,
Каб усё ў вас
расло. ***Падхватнік.***
Каб вяліся ў вас дзеці
І каб гора не было.

***Механоша.***

Каб зімой было што есці,
Што надзець і ў чым
пайсці. ***Падхватнік.***
Сеяць што каб засталося,
І вясною хлеб
пячы. ***Усе разам.***
Бывайце здаровы,
Дабро нажывайце,
А год прабяжыць —
Вы нас зноў тут чакайце.
Да пабачэння, сябры!

*(З валачобнай песняй валачобнікі адыходзяць.)*

## *Сёмуха*

Сцэна ўвасабляе сабой паляну, пасярэдзіне якой стаіць бярозка. Усё навокал упрыгожана галінкамі і зелянжай.

Выходзяць дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах, спяваюць песню "Ой, Троіца, Троіца". Потым выходзіць вядучая ў нацыянальным касцюме і з вянком на галаве:

Ой, Троіца, Троіца, багародзіца,
Пасеем жыта, ды няхай зародзіцца.

***Вядучая.***

Вось так на Беларусі пачыналася адно з прыгажэйшых святаў, свята Сёмухі, альбо Троіцы. Гэта свята працягвалася два-тры дні, а ў некаторых мясцовасцях ажно цэлы тыдзень. Людзі ўпрыгожвалі свае хаты зелянінай, кляновым ці бярозавым лісцем, падлогу высцілалі аерам. Таму Сёмуху яшчэ называлі "Зялёнымі святкамі". Сёмуха прыходзіцца на час, калі расквітнее расліннасць, а ў земляроба, у яго бясконцых клопатах, невялікая перадышка: сяўба скончылася, а сенакос яшчэ не наступіў. А можа, хто з вас ведае, шаноўныя, гэта свята больш жаночае ці мужчынскае?

*(Адказ.)*

***Вядучая.***

Гэта свята лічыцца дзявоцкім, таму што менавіта дзяўчына сімвалізуе маладосць і прыгажосць прыроды. У Сёмушны дзень дзяўчаты збіраліся ў гурты, спявалі песні, вадзілі карагоды, вілі вянкі і варажылі на лёс.

*(Памочніцы раздаюць вянкі дзяўчатам з групы.)*

***Вядучая.***

Дзяўчаткі прыгажуні, вось і ў вас вяночкі ёсць. Дык выходзьце з
намі на лёс варажыць. Калі ласка, станьце вакол нашай бярозкі і загадайце жаданне, потым кідайце вянок на дрэва. Калі ваш вянок зачэпіцца — жаданне збудзецца, калі ўпадзе на дол — значыць, не. Усё зразумела? Дык давайце варажыць.

*(Ідзе варожба.)*

***Вядучая.***

Вось у нас і ёсць той чалавек, жаданне якога ў гэтым годзе збудзецца. А каму не пашанцавала, не засмучайцеся. Заставайцеся на сваіх месцах, будзем гуляць далей. Гульня называецца так, як адна цікавая расліна. Вось вам загадка. Тыя, хто іх адгадае, калі ласка, падыходзьце да бярозкі:

- Не агонь, а пячэцца;
—Не з клыкамі, а баяцца да яе дакрануцца;
—Паспрабуеш голай пяткай затаптаць — будзеш войкаць і да вечара скакаць.

Вось у нас і ёсць пераможцы, якія здагадаліся: гаворка ідзе пра Крапіву. А зараз будзем у крапіву гуляць. Станьце ўсе ў круг і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вазьміцеся за рукі. Вы павінны, ходзячы вакол "бабкі", што сядзіць у цэнтры і дрэмле, дружна спяваць:

У карагодзе мы хадзілі,
Ай-люлі, мы хадзілі.
А што там мы відзелі?
Ай-люлі, мы відзелі?
Сядзіць бабка на траве,
Ай-люлі, на траве
Прытварылася — драмле,
Ай-люлі, драмле.

У гэты час мы павінны "бабку" падштурхоўваць ззаду, але так, каб яна не прачнулася. А на словах "прытварылася — драмле" разбягайцеся, бо "бабка" прачнецца і крапівы не пашкадуе. Тут начэрчана кола, за якое яна не можа выбегчы. Ну, пачынаем.

*(Ідзе гульня.)*

***Вядучая.***

Зараз падыдзіце тыя, каго наша "бабка" не зачапіла крапівай. А ўсім астатнім — вялікі дзякуй. Каму дасталося крапівай, таму пашчасціла болей. Можа, хто скажа, чаму?

*(Гледачы адказваюць.)*

Сапраўды лічылася, што крапіва выратоўвае чалавека ад злых духаў, хвароб і розных нягод. А калі хто ля нашай бярозкі пастаіць, той будзе здароўе мець і доўга жыць.

Таму падыходзьце, будзем вянкі завіваць. Дзве галінкі, якія вы злучыце ў вянок, могуць адказаць, збудзецца ваша жаданне ці не.

*(Удзельнікам завязваюць вочы. Раскручваюць іх. Пачынаецца гульня"Хто хутчэй заўе вянок ".)*

***Вядучая.***

Вялікі дзякуй. Усе вашы жадантні споўняцца, у кагосьці раней, а ў кагосьці пазней.

Але што мы ўсё на адным месцы гуляем? Вунь колькі вянкоў у нас прыгожых. Можна па рэчцы пускаць, каб з берага паглядзець на квітнеючыя хвалі. Толькі дзе ж рэчка наша? А рэчку, я думаю, мы зробім самі. Зараз я запрашаю тых, каму ў пачатку гульні раздалі бярозавыя і кляновыя галінкі. Прашу выстраіцца на левы бок каманду з бярозавымі галінкамі, а па правы — з кляновымі. Станьце, калі ласка, за рыскай, якую вы бачыце, паралельна адна адной. Тлумачу ўмовы. Я пляскаю у далоні, вы хуценька аддаеце вянок — кожная сваёй хвалі. Калі вянок дойдзе да канца, апошняя ўдзельніца бяжыць наперад і перадае другой. І так паўтараецца да той пары, пакуль першыя удзельнікі зноў не апынуцца ўперадзе.

*(Ідзе гульня. Затым дзве дзяўчыны становяцца ў цэнтры пляцоўкі, імітуючы "бярозавыя вароты ", яны трымаюць у руках стужку.)* У гэты час спяваюць песню

За рэчкаю, за быстраю
Слабодка стаіць.
Небальшая слабодка —
Чатыры двары:
Ой, а ў той жа слабодачцы
Чатыры кумы.
Вы кумушкі-галубушкі,
Падружкі мае,
Куміцеся, любіцеся,
Любіце і мяне.

***Вядучая.***

Зараз, дзяўчаткі пойдзем пад бярозавымі варотамі і кожная папарна злучыцца з дзяўчынай супрацьлеглай каманды, пацалуецца і стане кожная ў канцы сваей каманды.

*(Праходзіць гульня.)*

***Вядучая.***

Вось вы і пакумілся. Так рабілі раней на Сёмуху, а яшчэ абменьваліся невялікімі падарункамі. Ну, куманькі прыглядайце сабе кума, з якім на Пятра куміцца будзеце. Зараз кожная выбера хлопца і стане з ім у карагод вакол бярозы. Наша кума горліца будзе ў сярэдзіне круга рухацца супраць руху агульнага карагода, а ўсе астатнія дапамагаюць ёй спяваць:

Зялён гай падмяцём
Зялёнаю мяткаю,
Дробненькаю ружкаю высыплён.
Хто ж яго падмятаў?
Падмятала дзеванька,
Падмятала малада,
Сама адна.

***Вядучая.***

На апошнія словы "сама адна" дзяўчына, якая шла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супраць ходу карагода, спыняецца. Хлопец, які насупраць яе стане, будзе з ею на Пятра кумам. За тое, што яна выбрала яго, ён павінен пацалаваць яе. Затым кожная дзяўчына такім чынам выбірае сабе кума.

***Вядучая.***

Станьце, калі ласка, паўкругам, зараз мае дзяўчаты прынясуць пачастунак.

*(Дзве дзяўчыны нясуць смажаныя яйкі,а яшчэ дзве дзяўчыны — сурвэткі кожнаму.)*

***Вядучая.***

Каштуйце, даражэнькія, не ганьбуйце, бо сёння свята такое, каб пакаштаваць гэту страву. Яечня — рытуальная страва на Сёмуху, сімвал Сонца. А зараз давайце ўсе разам развітаемся са святам Семухі і скажам: "Да сустрэчы, Сёмуха, у наступным годзе!".

## *Фэставыя гульні*

У глыбіні сцэны стаіць стол, на ім сявенька з жытам. У жыта ўваткнута свечка. Па баках ручнікі, на якіх стаяць 2 пустыя пасудзіны. На задніку вісіць вянок з хлебных калоссяў, ад якога ў два бакі адыходзяць па 3 каляровыя стужкі. На авансцэне стаяць 2 пасудзіны з зернем, ад якіх калідорам да сявенькі выкладзены каласы.

Гучыць мелодыя песні "Ты не захадзі, жаркае сонца". Вядучая — дзяўчына ў беларускім народным адзенні выходзіць на авансцэну.

***Вядучая.***

Вось і лета сышло,
Адспявалі калоссі,
Цяжка мне заўважаць,
Як з'яўляецца восень.
Непрыкметна зусім —
Прыплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.
Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
Памахае буслiным.
А пасля, а пасля...
Ліст апошні сарвецца,
Ды не знаю чаму
Ты мне, восень, па сэрцу?

***Вядучая.***

Восень! Я думаю, памыляюцца тыя, хто бачыць у восені толькі адно заміранне жыцця. Здаецца, гэта не так. Жыццё ў гэту пару не замірае, бо закладваецца аснова будучага ўраджаю. Нездарма кажа беларуская прыказка: "Прыйшоў багач — кідай рагач, бяры сявеньку — сей памаленьку".

Вось і мы сягоння, восеньскім днём, сабраліся тут, каб адзначыць свята Багач. Ад Іллі мы збіралі ўраджай, спраўляючы зажынкі, дажынкі і вось, нарэшце — Багач.

Хлеб — усяму галава! Ён адыгрывае ролю не толькі як найпершы прадукт харчавання, але і як носьбіт чарадзейнай сілы, здольны забяспечыць ураджай і захаваць яго. Увогуле сяляне з вялікай павагай адносіліся да хлеба. І зараз нам цяжка уявіць наш стол без духмянага бохана, розных булак і пірагоў. Ды ці мала яшчэ існуе страў з мукі?

А вы якія ведаеце стравы, дзе галоўным кампанентам з'яуляецца мука? Зараз мы з вамі правядзём невялікую гульню-аўкцыён. Будзем называць стравы. Хто назаве апошнім - атрымае прыз.

*(Ідзе гульня-аўкцыён. Кожнаму ўдзельніку даецца прыз-абаранак.)*

***Вядучая.***

Малайцы! А зараз таго, хто атрымаў абаранак, запрашаю да сябе на сцэну. Станьце, калі ласка, за каласамі па два бакі, разбіўшыся на дзве аднолькавыя каманды. Давайце паспрабуем уявіць, што мы знаходзімся на багачовым фэсце, куды з'ехаліся людзі з розных вёсак. Адна каманда з адной вёскі *(вуліцы)*, другая — з другой. Так, на фэсце жыхары вёскі *(называе назву)* і жыхары другой вёскі *(называе назву)*.

*(Гучыць музыка.)*

***Вядучая.***

Як кажа беларуская прыказка, "Не радзіцца хлеб без працы". Доўгі шлях цяжкай работы трэба пераадолець, каб духмяны хлеб ляжаў у нас на стале.

Зараз я хачу вас запрасіць у падарожжа па жніўных палях. Пачынаецца жніво з зажынак, кат гурт выходзіць на поле, каб зжаць першы сноп, і вось ваша першае заданне: хутка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сабраць сноп з каласоў, якія вы бачыце на нашай імправізаванай ніве.
Удзельшюікі каманд становяцца ў чаргу адзін за адным. Першыя удзельнікі каманд падбягаюць да сваёй паласы, бяруць па аднаму каласу, вяртаюцца на сваё месца, перадаюць колас наступным удзельнікам і становяцца апошнімі ў чарзе. Другія падхопліваюць з "поля" яшчэ па аднаму каласку. Ужо з двума і вяртаюцца, перадаючы 2 каласы наступнаму і г. д., пакуль усе каласы з поля не будуць сабраны. Апошнія удзельнікі падбягаюць да стала з сявенькай, бяруць па стужцы і завязваюць свае снапы. Падрыхтаваліся? Пачаллі!

*(Ідзе гульня. У гэты час гучыць вясёлая беларуская музыка.)*

***Вядучая.***

Спрытнейшай аказалася каманда з вёскі *(называе).* Давайце павіншуем яе з першым выпрабаваннем і першай перамогай. А снапкі папрашу паставіць на авансцэну каля посуда з зернем.

*(Гучыць лірычная мелодыя, якая чулася з пачатку праграмы.)*

***Вядучая.***

Пасля зажынак пачыналася жніво, якое вядзе нас да дажынак. Дажынкі - гэта сапраўднае свята. Пакуль жнеі дажыналі жыта, дзяўчаты плялі вянок з каласоў і палявых кветак. Вянок надзявалі на галаву самай прыгожай дзяўчыне і, узяўшы апошні дажынкавы сноп, с песнямі вярталіся ў вёску.

Каціўся вянок з поля,
прасіўся снапок да пакоя:
"Я ў полі настаяўся, •
Мяне ветрык намахаўся,
А дожджык накрапіўся,
Я на бок каласом нахіліўся".
Дакаціўся вянок з поля,
Дапрасіўся снапок да пакоя.

Зараз я запрашаю да сябе па тры прадстаунікі з кожнай вёскі. Кожнаму трэба ўзяць у рукі па стужцы і па маёй камандзе, пераходзячы з месца на месца і не выпускаючы з рук стужку, заплесці касу вянку. Гатовы? Пачалі!

*(Гучыць вясёлая беларуская музыка, дзе гульня.)*

***Вядучая.***

Ну вось мы і убачылі, як хутка пляцецца ўпрыгажэнне для нашага вянка. І першай спляла касу вёска ... *(называе).* А вянок гэты пакладзем паміж снапкамі *(на авансцэне).*

*(Гучыць лірычная мелодыя.)*

***Вядучая.***

Адспявалі дажынкі. Сабраўшы з палёў ураджай, мы вас запрашаем на свята Багач. Багачом народ называе гэта свята таму, што яно супадае з заканчэннем уборкі хлеба — нашага галоўнага багацця. Ураджай сабраны і абмалочаны. Хлеб трэба звесці з току ў свіран. Чым мы зараз і зоймемся.
Станьце ў дзве лініі ад "току" да "свірана" тварамі да каманды вёскі-саперніцы. Вы павінны хутка перадаць зерне ў жменях па ланцугу адзін аднаму да нашага "свірана". Але ўвага! Ні адно зярнятка не павінна апынуцца на доле! Гатовы? Пачалі!

*(Гучыць вясёлая беларуская музыка, дзе гульня.)*

***Вядучая.***

Як мы бачым, прадстаунікі вескі... *(называе)* больш пільныя і хукія. Павіншуем іх апладысментамі. А зараз адпачніце і парайцеся, якія вы ведаеце песні пра хлеб, жыта, жніво, каб падрыхтавацца да наступнага конкурсу.

***Вядучая.***

Як казала раней, на Багачовы фэст збіраецца люд з розных вёсак. Сваякі едуць да сваякоў, родныя да родных, знаёмыя да знаёмых. Пачынаюцца вясёлыя гульні з песнямі, жартамі, танцамі і загадкамі. Я таксама хачу вам загадаць загадкі:

Было жоўтым, вырасла зялёным, сонца пацалавала — зноў жоўтым стала. *(Жыта)*

На коліку сем саколікаў, кожны ў капотачцы. (Авёс)

Задраўшы чупрыну, ляцеў у адрыну. *(Ячмень)*

Тысячу браткоў адным поясам падперазаны. *(Сноп)*

У каго вусы даўжэй, чым у пана? *(Ячмень)*

Пад ліпавым кустом мяцеліца мяце. *(Муку сеюць на сіта)*

*(Тым, хто адгадвае, вядучая дае прыз.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Вядучая.***

А ці любіце вы співаць? А песень шмат ведаеце? Зараз мы паглядзім, якая каманда больш ведае песень. Спяваем па аднаму куплету. Адна каманда, потым другая. Гледачы, таксама не спіце ў шапку, а падказвайце і спяваць дапамагайце.

*(дзе конкурс песень, вызначаецца пераможца.)*

***Вядучая.***

На сённяшнім свяце пераможцамі сталі жыхары вёскі... *(называе вёску)*. Яны па праву атрымліваюць прыз.

*(Гучыць лейтматыў свята.)*

***Вядучая.***

Вясна прыгожа кветкамі, а восень пірагамі. А якое свята без каравая? Ды і грэх нам сягоння не пакаштаваць духмянага каравая.

*(Вядучая выносіць каравай.)*

***Вядучая.***

Радуюць сэрца
Збожжа і травы.
Дзень мой праменны,
Дзень мой ласкавы!
Водар хваёвы,
Сіняе неба,
Кожнае ранне
Рады я хлебу.
Ах, як прывабна ён выглядае...
Я перад хлебам шапку здымаю...
Як нагляджуся, дык прыгадаю
Поле без краю кожнага краю;
Тых, хто на полі з лецейка ў лета...
Дзякуй ім, родным,
Дзякуй за гэта!

*(Вядучая частуе прысутных караваем.)*

***Вядучая.***

Адведаўшы багачовага каравая, няхай прыбудзе вам моцы, каб спрытныя ногі былі, каб дужыя рукі былі, каб хваробы абміналі. Хай у вашай хаце заўжды будзе мір і спакой, а на стале свежы духмяны хлеб.

Шчасця і дабрабыту, здароўя і поспеху!

Да сустрэчы!

# *Дзіцячы санны цягнік*

Некалькі саней, дыкарыраваных пад ледзяную хатку, печ, лодка, з устаноўленым у цэнтры сцягам, паступова злучаны паміж сабой і заканчваюцца санямі-развалкамі з тройкай коней ці мотальыжамі. Дзед Мароз і Снягурка, якія арганізоўваюць катанне дзяцей на санным цягніку і праводзяць конкурс з дзецьмі на выкананне вершаў і песень пра зіму, частуюць пераможцаў ласункамі.

Другі санны цягнік складаецца з саней, дэкарыраваных пад трактар, самалёт, касмічны карабель.

**"Калаўрот" — беларуская народная гульня**

На ледзяной пляцоўцы ўбіваюць слуп, на які прыладжваюць кола з дзвюма доўгімі жэрдкамі. Да жэрдак прымацоўваюцца сані. Некалькі чалавек, узяўшыся за жэрдкі круцяць кола, і сані хутка мчацца па кругу. Хто даўжэй пратрымаецца ў санях — той і пераможца. Удзельнікі гульні, што круцяць кола, могуць стаяць на каньках.

**Палескі прызавы слуп**

У зямлю ўкопваецца 15-метровы слуп, папярэдне абліты вадой. Ён уяўляе сабой слізкую ледзяную паверхню, якую даволі цяжка пераадолець, каб дасягнуць вяршыні. У вяршыню слупа ўбіты металічны стрыжань метровай вышыні, на ім — рухомае кола з прызамі. Задача ўдзельнікаў — дабрацца да вяршыні слупа і выбраць прыз.

**Гродненскі слуп — "падкавырка"**

На адлегласці пяці метраў адзін ад другога ў зямлю ўкопваюцца два слупы — 8—15-метровай вышыні. Праз вертыкальныя прорэзі на вяршынях абодвух слупоў ці праз ролікі, прымацаваныя на вяршынях, прапускаецца вяроўка. Ля падножжа аднаго слупа (меншага) вяроўка замацоўваецца цвікамі. Наверсе большага слупа да вяроўкі прымацоўваецца прыз і робіцца абмежавальнік, які не дае ўпасці вяроўцы ўніз.

Гульня ідзе наступным чынам: скамарох, трымаючы канец вяроўкі ля малога слупа, крыху апускае прыз. Удзельнк гульні лезе на вялікі слуп, імкнучыся дастаць прыз. Але прыз падымаецца вышэй і вышэй. Вось удзельнк знясілеў, пачынае спускацца назад... І следам за ім апускаецца прыз. Удзельнік спыняецца, імкнучыся дастаць прыз, які вісіць над галавой, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зноў пачынаецца паядынак. Гэты атракцыён карыстаецца вялікай папулярнасцю, ставрае шматлікія камічныя сітуацыі і выклікае актыўную рэакцыю гледачоў.

**Перацягванне каната**

Пасярэдзіне гульнёвай пляцоўкі ўстаноўлена снежная сцяна 2-метровай вышыні. Праз цэнтр сцяны прапускаецца канат. Удзельнікі дзвюх каманд, не бачачы з-за сцяны адзін аднаго, па сігналу арганізатара імкнуцца перацягнуць праціўніка на свой бок. Перамагае каманда, якая прымусіць сапернікаў прабіць ці разваліць снежную сцяну. У гэтай гульні магчымы варыянт розыгрышу, калі каманда цягне канат, канец якога прывязаны да дрэва.

**Ледзяны конус**

На пляцоўцы ўстанаўліваецца ледзяны конус вышынёй два з палавінай метры. На вяршыні конуса прымацавана рэшата, у якім ляжыць прыз. Удзельнікі гульні павінны падняцца па коўзкай паверхні ледзянога конуса і дастаць прыз.

**Гарызантальны ледзяны слуп**

Ён уяўляе сабой драўляную канструкцыю 10-метровай даўжыні, устаноўленую на двух слупах вышынёй 1,5 м.

Для школьнікаў старэйшага ўзросту на гэтым атракцыёне праводзіцца трохбор'е па прынцыпу выбывання.

*I тур* — прайсці па бервяне з канца ў канец, іграючы на бубне;

*II тур* — прайсці па бервяне, рухаючыся спіной, да фінішнай кропкі.

*III тур* — праскакаць па бервяне на адной назе.

Для моладзі праводзіцца турнір рыцараў лёду. Двое ўдзельнікаў сыходзяцца на сярэдзіне слупа, трымаючы ў правай руцэ сетку з вялізным каляровым мячом. Утрымліваючы раўнавагу, удзельнікі стараюцца мячом збіць саперніка на зямлю. Атрымлівае прыз той, хто пераможа трох сапернікаў запар.

**Беларускае спартыўна-ігравое дзевяцібор'е “Гара – не гара, а радасці мора"**

Спаборніцтвы праводзяцца на ледзяной дарожцы снежнай гары. Кожная школа, прадпрыемства і ўстанова горада выстаўляе на турнір сваю каманду ў складзе трох чалавек. За кожны турнір прысуджаецца адно пераможнае ці штрафное ачко.

Каманда, якая набрала большую колькасць ачкоў, атрымлівае прыз Спарткамітэта — выраб з хрусталю.

*Змест спартыўна-ігравога дзевяцібор'я:*

***"Скорасны спуск"***

Удзельнікі імкнуцца, седзячы на лядзянках, па чарзе пераадолець вызначаны ўчастак дыстанцыі. Лядзянка ўяўляе сабой кавалак лёду з высечаным месцам для сядзення. Кожная лядзянка вырабляецца ўдзельнікам самастойна.

***"Коварны паварот"***

Удзельнік, седзячы на перавёрнутай лаўцы і разагнаўшыся на спуску, павінен зрабіць віраж вакол стойкі.

***"Снайперы"***

Слізгаючыся па наклоннай ледзяной дарожцы на падмарожаным рэшаце, удзельнік турніру павінен трапіць снежкай у надзіманы шар (бычыны пузыр), які калышацца на вудачцы.

***"Вазьмі прыз"***

Саннік павінен пераадолець круты спуск, потым на роўнай дарожцы прыўзняцца на санках і зняць прыз, які вісіць на вудачцы.

***"Непаслухмяная дошка"***

З'язджаючы на дошцы, удзельнік павінен сабраць раскладзеныя злева і справа восем рознакаляровых сцяжкоў, ні разу не зваліўшыся на снег.

***"Утаймуй сані"***

Санніку неабходна пасля разгону на спуску і скачка з трампліна ўтрымацца на санях.

***"Вароты"***

На ледзяной дарожцы ў форме варот на адлегласці аднаго метра ўстанаўліваюцца лыжныя палкі. Удзельнік, разагнаўшыся на ледзяной горцы, павінен праехаць праз вароты, не закрануўшы палак.

***"Санны біятлон"***

З'язджаючы з гары, удзельнік, прыўзняўшыся на санках, павінен праткнуць лыжнай палкай надзіманы шар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**"Хто далей?"**

Удзельнікі кожнай з каманд, разагнаўшыся на стартавай пляцоўцы, на ходу садзяцца ў сані-развалкі і спускаюцца з ледзяной гары. Перамагае каманда, якая ў час спуску не згубіла ні аднаго ўдзельніка і праехала большую адлегласць.

**"Лыжны фестываль"**

*(спартыўная праграма)*

У спаборніцтвах удзельнічаюць каманды ДСТ у саставе 20 чалавек. У зоне дзеяння кожнай каманды абмежавальнымі арыенцірамі служаць вароты з лыж, уваткнутых у снег. Кожная каманда апранута ў спартыўную форму выбранага ею колеру.

Каманда-пераможца ўзнагароджваецца кубкам Спорткамітэта, а пераможцы конкурсаз праграмы— каштоўнымі прызамі.

**Лыжная эстафета**

Па камандзе суддзі лыжнік стартуе. З эстафетнай палачкай у руках ён абягае паваротны слуп і, падыходзячы да лініі старту, перадае эстафету наступнаму ўдзельніку. Перамагае каманда, якая першай прыйдзе да фінішу.

**Бег "пераступам!"**

Каманды дзеляцца на дзве палавіны, становяцца па пяць чалавек каля лініі "старт" і "фініш". Па камандзе суддзі удзельнік ад лініі "старт" пачынае ісці "пераступамі" *("ёлачкай")*. Дайшоўшы да лініі фінішу, ён перадае эстафету наступнаму таварышу па камандзе, які праходзіць дыстанцыю такім жа чынам і перадае эстафету ўдзельжку сваей каманды і г д. Перамагае каманда, якая першай закончыць дыстанцыю.

**"Турнірная нечаканасць"**

У гэтай эстафсце каманды выстаўляюць па 4 удзельніка, якія па двое становяцца каля ліній "старт" і "фініш". Па камандзе суддзі яны бягуць на адной лыжы без палак, дапамагаючы сабе свабоднай нагой. Перамагае каманда, якая хутчэй пераадолее дыстанцыю.

**"Снежны цір"**

У эстафеце ўдзельнічае ўся каманда. Па сігналу суддзі са старту кожная з каманд пасылае наперад свайго прадстаўніка. Дайшоўшы да лініі "фініш", удзельнік спаборніцтва спыняецца і кідае пяць снежак у кошык, які размешчаны за 10 метраў ад яго, затым вяртаецца назад і перадае эстафету наступнаму ўдзельніку. Кожны промах на "стрэльбішчы" снежнага ціра наказваецца лішнім кругам *(50метраў)*. Перамагае каманда, якая затраціла менш часу на пераадоленне дыстанцыі.

**"Лыжны слалам"**

На дыстанцыі праз роўныя прамежкі расстаўлены кеглі. Стартуюць аўтамабілі УАЗ, якія едуць з раўнамернай скорасцю. Трымаючыся за доўгую вяроўку *(5 метраў)*, прымацаваную да аўтамабіля, лыжнікі аб'язджаюдь кеглі. Калі ўдзельнік каманды саб'е кеглю, выйдзе з павароту — каманда атрымлівае штрафное ачко. У гэтым туры ўдзельнічаюць усе члены каманды.

**"Палёт на лыжах"**

На сярэдзіне дыстанцыі ўстанаўліваецца трамплін. Стартуе аўтамабіль. Удзельнік, трымаючыся за вяроўку, прымацаваную да аутамабіля, робіць разбег і, выйшаўшы на трамплін, робіць скачок. Перамагае каманда, якая па суме скачкоў пераадолела найбольшую адлегласць.

**"Лыжныя скачкі"**

У гэтай эстафеце ўдзельнічае ўся каманда. Трымаючыся за павады, запрэжкі, лыжнік павінен праехаць дыстанцыю, развярнуцца вакол паваротнай стойкі і вярнуцца да месца старту, перадаўшы лейцы таварышу па камандзе. Перамагае каманда, якая хутчэй за іншых пераадолее дыстанцыю.

**"Сараканожка"**

Усе ўдзельнікі становяцца ў шарэнгу, трымаючыся за вяроўку. Па камандзе суддзі стартуюць адначасова. Перамагае каманда, якая тры кругі запар не згубіць ні аднаго ўдзельніка і затраціць менш часу на праходжанне дыстанцыі. За кожны збой на дыстанцыі *(заступ на лыжы папярэдняга ўдзельніка, падзенне)* каманда атрымлівае тры штрафныя секунды.

**"Гуські"**

Беларуская народная гульня. На ўскрайку круглай ледзяной, пляцоўкі выбіваюць "гнёзды" *(ямкі дыяметрам 25—30см)*. Удзельнікі гульні маюць калкі-рагачыкі *(палкі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*даўжынёй 1—1,2м, раздвоеныя на канцы) і гуські (цуркі памерам 12х4 см).* Кожны па чарзе кладзе свой гусёк у цэнтр пляцоўкі. Па сігналу астатнія ігракі ад сваіх "гнёздаў" бягуць у цэнтр і ўдарамі калкоў стараюцца загнаць гусёк у свае "гняздо". Перамагае той, хто загоніць большую колькасць гуськоў.

**"Заяц"**

Беларускі народны танец-гульня. Два выканаўцы становяцца адзін супраць другога, кладуць накрыж два палены і танцуюць, стараючыся не зачапіць іх нагамі. У варыянце гульні гэты танец можна ператварыць у масавы конкурс, у час якога танцавальныя пары павінны выконваць розныя па рытму і характару рухаў танцы.

**"Перахват"**

**Беларускі народны атракцыён.**

Уяўляе сабою наступную канструкцыю: на адлегласці 10 м у зямлю ўкопваюць два слупы вышынёй 2,5 і 3,5 м. Уверсе да іх прымацоўваюцца канаты *(30 см)* з вузлом на канцы. Канцы сямі апошніх канатаў распушчаны. На пляцоўцы слупа вышынёй 3,5 м ляжыць прыз. Задача ўдзельніка — перабіраючы рукамі канаты і падцягваючыся на іх, дабрацца да фінішнага слупа. Каму гэта ўдасца — здымае прыз. Атракцыён выклікае вялікую зацікаўленасць у прысутных, бо заданне — не з лёгкіх і патрабуе значнай сілы, спрыту: у канцы дыстанцыі, калі сілы ўдзельніка гульні памяншаюцца, дадатковае выпрабаванне для яго — пераадоленне канатаў з распушчанымі канцамі, дзе ён пазбаўлены падтрымкі, у выглядзе вузла.

**"Палеская рыбная латарэя"**

Гэты беларускі кірмашовы атракцыён можна праводзіць як на адкрытым вадаёме, так і ў бочках ці чанах, запоўненых вадой. На воднай паверхні ўстанаўліваецца 50—100 паплаўкоў, выраблены з кавалачкаў бярозы. У кожны з паплаўкоў зверху і знізу ўзбіваюцца невялікія цвікі, якія згінаюць у пятлю. Да ніжніх петляў паплаўкоў прымацоўваюцца як каштоўныя, так і жартоўныя прызы *(прышчэпка, парваны бот, пустая бутэлька, сцірка, бляшанка з-пад кансерваў і г. д.).*

Жадаючы'я ўдзельнічаць у латарэі, купляюць білеты на права "рыбнай лоўлі" і атрымліваюць вуду з вялікім загнутым цвіком на канцы лескі. Па свістку арганізатара пачынаецца розыгрыш латарэі. Удзельнікі павінны на працягу адной мінуты зачапіць цвіком пятлю аднаго з паплаўкоў і выцягнуць прыз. Арганізатарам рыбнай латарэі варта ўключаць у дзеянне некалькі чалавек, што значна павялічыць зацікаўленасць усіх гледачоў. Як паказвае практыка, рыбная латарэя мае вялікую папулярнасць і прыцягвае ўвагу, жаданне ўдзельнічаць у ей людзей усіх узростаў.

**Барацьба "Да крыжа"**

Беларуская народная гульня. Нагадвае вольную барацьбу. Барцам дазваляецца штурхацца, ставіць падножкі, хапаць за ногі. Перамагае той, хто прыцісне праціўніка спінай да зямлі і ўтрымае яго рукі, разведзеныя ў бакі.

**Барацьба "Накрыж"**

Беларуская народная гульня. Нагадвае рускую гульню ў абхват. Праціўнікі абхватваюць адзін аднаго, і той, хто кіне саперніка на зямлю, — пераможца. Падножкі, штуршкі не дазваляюцца.

**"Була"**

Беларуская народная гульня. Гуляюць дзве каманды. Кожная каманда выбірае вядучага. Ён моцна б'е пал'кай з загнутым канцом (тыпу клюшкі) па буле *(драўлянаму шару)* і гоніць яе па зямлі (лёдзе) у бок праціўніка, каманда памагае яму. Сапернікі імкнуцца перахапіць і вярнуць булу да пазначанай рысы.

**"Падчапі гаршчок"**

Сучасная беларуская народная гульня. У канструкцыю печы ставяць гаршчок. Удзельніку гульні, які знаходзіцца за 10 крокаў ад печы, на твар надзяваецца шчыльная маска. У рукі даюцца вілкі. Па сігналу культарганізатара ўдзельнік павінен тры разы павярнуцца вакол сябе, зрабіць дзесяць крокаў і падчапіць вілкамі гаршчок. Гульня стварае багата камічных сітуацый, калі ігрок зробіць няпоўныя абароты і з вілкамі наперавес ідзе прама на гледачоў, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выклікае адпаведную рэакцыю. Удзельнік, які падчапіў вілкамі гаршчок, атрымлівае прыз.

**Спартыўная праграма "Вакол хакея"**

У праграме ўдзельнічаюць дзве каманды па 16 чалавек (тры пяцёркі палявых ігракоў і варатар у кожнай з каманд). *Састаўныя элементы праграмы:*

***1. "Скарасная эстафета"***

Па сігналу суддзі ад кожнай каманды стартуе па аднаму ўдзельніку, якія, несучы ў руцэ эстафетную палачку, абыходзяць паваротны слуп і, вярнуўшыся на зыходныя пазіцыі, перадаюць эстафету таварышу па камандзе. Перамагае каманда, якая першай закончыла дыстанцыю.

***2."Вароты"***

На ледзяной дарожцы ўстанаўліваюцца (ці абазначаюцца) вароты і невысокі борцік даўжынёй 2—3 м. Удзельнік, зрабіўшы перадачу ў борцік, павінен папасці шайбай у вароты. Кожны ўдзельнік мае права на адну спробу. Перамагае каманда, якая больш разоў пападзе ў вароты.

***3."Эстафета перадач"***

Ад кожнай каманды адначасова стартуюць два хакеісты. Перадаючы шайбу адзін аднаму, яны агінаюць фінішную стойку, даходзяць да месца старту і перадаюць шайбу наступнай пары. Перамагае каманда, якая першай закончыць дыстанцыю.

***4."Катапульта"***

На сярэдзіне дыстанцыі ўстанаўліваецца борцік, а на лініі старту кожнай каманды — катапульта ў выглядзе дзвюх злучаных паміж сабою рам-стоек, на якіх замацавана тугая гумавая паласа. Удзельнік становіцца ў катапульту спіной да паласы. Паласу (разам з хакеістам) адцягваюць назад, затым адпускаюць і хакеіст ляціць у бок борціка. Яго задача — зрабіць прыпынак каля самага борціка на адзначанай рысе. Калі ж удзельнік "урэзаўся" у борцк, ён атрымлівае штрафное ачко. Выйграе каманда, у якой будзе найменшая колькасць штрафных балаў.

***5."Буліт"***

На дыстанцыі ўстанаўліваюцца хакейныя вароты, у якія становіцца варатар каманды сапернікаў. Хакеісты па чарзе праводзяць хакейнае пенальці. Перамагае каманда, якая выйшла наперад на два галы.

***6.Каманды праводзяць 20-мтутны хакейны матч.***

*Камбінаваная эстафета канькабежцаў*

1. Бег у бочцы без дна.
2. Бег удвух у адным гімнастычным абручы.
3. Рух наперад у пары тварам адзін да аднаго. Адзін слізгаецца, другі адштурхваецца. Каля стойкі партнёры мяняюцца ролямі.
4. Бег у пары на "трох" нагах (дзве звязаны).
5. Рух наперад да стойкі, седзячы на санях і адштурхваючыся лыжнымі палкамі. Назад — бег з санямі.
6. Бег, штурхаючы перад сабою сані з партнёрам. Каля стойкі ўдзельнікі тура мяняюцца ролямі.
7. Бег з вядзеннем клюшкай баскетбольнага мяча.
8. Слізганне на каньках з адштурхваннем лыжнымі палкамі.
9. Чарадою ўзяўшыся за доўгую вяроўку, усе ўдзельнікі бягуць да стойк1 і назад.

*Гульнёвая праграма "Снежныя забавы "*

***1. "Эстафета з коромыслам"***

Лініі старту і фінішу пазначаны драўлянымі бочкамі. Удзельнікі з поўнымі вёдрамі вады на каромыслах бягуць дыстанцыю, агінаюць бочку і, вярнуўшыся на месца, перадаюць ношу наступнаму таварышу. Перамагае каманда, якая прыходзіць да фінішу першай (улічваецца колькасць захаванай у вёдрах вады).

***2."Пінгвіны"***

Удзельнікі пераадольваюць дыстанцыю хуткім крокам, заціснуўшы мяч між каленяў і залажыўшы рукі за спіну. Страта мяча або папраўка яго рукамі караюцца штрафным балам. Каманда, якая прыйшла першай і атрымала найменшую колькасць штрафных балаў, перамагае.

***3. "Гарадкі са снежкамі"***

На снежным полі ўдзельнікі вылепліваюць фігуры. З пазначанай лініі яны кідаюць у фігуры снежкі, стараючыся разбіць і паваліць іх на снег. Кожны ўдзельнік мае права дзвюх спроб. За адну спробу ён кідае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тры снежкі. Колькасць фігур абумоўліваецца загадзя. Перамагае каманда, якая затраціла менш снежак, каб паваліць фігуры.

**4. *"Ледзяны лабірынт"***

На дыстанцыі праз аднолькавую адлегласць расстаўляюцца ледзяшы. Па сігналу два ўдзельнікі, пасадзіўшы на сані трэцяга, бягуць, агінаючы "кеглі" і паваротны круг і такім жа чынам вяртаюцца назад. Перакульванне санак або падзенне ўдзельніка з санак, збітая "кегля"-лядзяш караюцца штрафным балам. Перамагае каманда, якая хутчэй пераадолела дыстанцыю. Кожнае ачко штрафу ацэньваецца як пяць штрафных секунд.

**5. *"Збяры снежкі"***

Двум удзельнікам завязваюць вочы. На гульнёвай пляцоўцы раскіданы снежкі *(10 шт.)*. Павярнуўшыся вакол сябе тры разы, удзельнік падыходзіць да цэнтра, бярэ снежку, даходзіць да стартавай адзнакі і кладзе яе на зямлю. Затым за другой, трэцяй і г. д. Выйграе той, хто першым справіцца з заданнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***6. "Арыентаванне"***

На дыстанцыі стаіць снежная баба. Удзельнік з завязанымі вачыма павінен паставіць ей на месца носа моркву. Той, хто зробіць гэта найбольш дакладна, і стане пераможцам.

***7. "Чарадзейная палачка"***

Удзельнікі становяцца ў круг і пад музыку перадаюць адзін аднаму лядзяш. Музыка прыпыняецца. Удзельнік, у якога ў руках апынулася ледзяная палачка, выбывае з гульні. Гульня працягваецца да таго часу, пакуль не застанецца адзін удзельнік. "Чарадзейнасць" палачкі ў тым, што яна прыносіць прыз, не застаючыся ў руках пераможцы.

***S. "Вясёлыя снегасакі"***

Удзельнік надзяе на твар шчыльную маску і бярэ ў рукі палку. З 10 крокаў ад яго знаходзіцца снежны шар. Павярнуўшыся тры разы вакол сябе, трэба падысці да шара і адным узмахам палкі разрубіць яго напалову.

***9. "Футбол на снезе"***

На зямлі ляжыць снежны шар. За 10 крокаў ад яго на лініі старту — мяч. Удзельнік павінен мячом патрапіць у шар.

***10. "Канатаходцы"***

Удзельнік павінен прайсці на адной назе па ледзяному гарызантальнаму бервяну, несучы на падносе тры ледзяныя шарыкі. Калі шарык падае з падноса, удзельнік здымаецца з дыстанцыі.

***11. "Пеўні"***

Два удзельнікі сыходзяцца насустрач адзін аднаму па ледзяному гарызантальнаму бервяну. Залажыўшы далонь левай рукі за спіну, а правую выцягнуўшы ўперад, яны павінны, пляснуўшы ею ў далонь саперніка, скінуць яго з бервяна. Пераможца працягвае шлях да канца бервяна і выйграе, калі дасягне яго, не ступіўшы на зямлю.

***12. "Бег на хадулях"***

На дыстанцыі праз аднолькавую адлегласць устанаўліваюцца ледзяшы. Удзельнікі становяцца на хадулі — паўтараметровыя палкі, якія маюць брускі для пастаноўкі ног. Яны павінны дайсці да фінішнай рысы, абышоўшы ледзяшы і не збіўшы іх.

***13. "Снежны сувенір"***

На снежным кубе ляжаць прызы. Удзельнік становіцца на адлегласці 10 крокаў ад снежнага куба, надзяе на твар шчыльную маску. Выцягнуўшы правую руку ўперад і павярнуўшыся тры разы вакол сябе, удзельнік павінен падысці да снежнага куба і пакласці на яго руку. Калі рука трапіла на прыз, удзельнік атрымлівае яго ў падарунак.

## *Матчын ручнік*

На сцэне — інтэр'ер беларускай сялянскай хаты, упрыгожаный ручнікамі. На пярэднім плане сцэны, з правага боку — прызба. Інсцэніроўка песні "Вочы".

***2 дзяўчыны.***

Вечарынка каля млына,
Льюцца песні, гоман, жарт,
А дзяўчына ў дзяўчыны
Пад гармошку нарасхват.

***Хлопец.***

Вочы вы вочы,
Тыя дзявочы,
Мне без іх няма жыцця,
Узяў бы замуж, ды ня хоча.
Ах, ты долечка мая.
*(Інсцэніроўка куплета песні "Барада".)*

***Алёнка.***

Яснавокі, слаўны, мілы
І падцягнуты заўжды
І яго я пакахала б,
Каб ён быў без барады.
Ой, бяда, бяда, бяда,
Што ў хлопца барада.
*(Хлопец пакідае сцэну.)*

***Таццяна.***

Алёнка, навошта так крыўдзіць хлапцоў? І так ужо не першы раз здараецца.

***Алёнка.***

Не ведаю, што са мною, Таццяначка. Можа гэта ад таго, што я сон бачыла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тацяна.***

Ну раскажы, што ж ты там бачыла? ***Алёнка.***

Быццам ідзем мы... знейкім незнаемым хлапцом па дарозе, ад царквы да дому. А дарога доўгая-доўгая, а мы ідзем побач і нам так хораша, навокал такі прастор — кветкі цвітуць, птушкі шчабечуць. У мяне так сэрца трапятала, хацелася, каб дарога гэта ніколі не канчалася.

***Тацяна.***

Прыдумала нейкага незнаёмца, дзе ж ты яго шукаць будзеш? Што раз пабачыш, другі раз не ўбачыш.

***Гаспадыня.***

Ніякіх варожб, дзяўчаткі. Хто гадае — той лес прагадвае. Я прашу прабачэння — незнарок пачула вашу размову. І вы не адны адзінокія ў гэтай зале. Тут знаходзіцца шмат дзевак і хлапцоў, якія б хацелі знайсці сабе пару. Ці не так? Калі дазволіце — я пачну знаёміць вас так, як знаёміла мая матуля. І вось у нашай праграме хлопцы выбіраюць сабе нявест па працавітасці, асабліва па уменні прасці і вышываць ручнікі.

***Алёнка.***

Чаму ручнікі?

***Гаспадыня.***

Таму што ручнік — гэта дзявочы сімвал, сімвал чысціні, цяпла роднай хаты. Сапраўдны ручнік могуць вышыць дзяўчаты з чыстай душой, шчырым сэрцам і з цеплынёй пачуццяў.

***Дзяўчаты.***

Мы згодныя. Але няўжо мы будзем вышываць такія ручнікі, як у вас. Вы іх самі выраблялі? ***Алёнка.***

Гэта ручнікі маёй матулі, і калі вы спытаеце яе, яна вам шмат чаго аб іх раскажа. Але, можа, нашы гледачы могуць што-небудзь аб іх расказаць. Ну хаця б аб тым, дзе яны выкарыстоўваюцца.

*(Прысутныя расказваюць.)*

***Гаспадыня.***

Вельмі рада, што вы так шмат ведаеце аб ручніках. Але ж, каб ручнік атрымаўся, трэба шмат папрацаваць. І праца гэта нялёгкая. Нездарма наш народ злажыў шмат прымавак і прыказак аб працы. Давайце іх успомнім. Я называю першую частку, а вы — другую.

*Дзе няма ахвоты/* там няма работы.

*Работу словам* / не заменіш.

*Зямлю грэе сонца* / а чалавека — праца.

*Хто адзін аднаму дапамагае,* / той у працы перамагае.

*Дзе гультай ходзіць,* / там зямля не родзіць.

Малайчынкі! Добра ведаеце прыказкі і прымаўкі аб працы. І не спужаліся работы. Мы запрашаем усіх дзяўчат у гэтай зале, хто жадае павучыцца, хто паспяваць — ну і, канешне, любай стаць.

*(Уключаецца фанаграма.)*

Падымайся на сцэну,
Падымайся сюды.
Усіх дзяўчат мы запрашаем,
Усе сядайце вось сюды.

***Гаспадыня.***

Як вы лічыце, каб атрымаць такую кудзелю, што мы спачатку павінны зрабіць? Сапраўды — пасеяць лянок. Давайце яго пасеем у песні "Ох, і сеяла Ульяніца лянок".

*(інсцэніроўка песні.)*

Ох, і сеяла Ульяніца лянок,
Ох, і сеяла Іванаўна лянок,
Ох, сэрца лянок,
Мая радасць ты, лянок,
Белы, слаўны кужалёк!
Ох, і рвала Ульяніца лянок,
Ох, і рвала Ульяніца лянок,
Ох, сэрца лянок,
Мая радасць ты, лянок,
Белы, слаўны кужалёк!
А сарваўшы, у снапочкі сабрала,
А сарваўшы, у снапочкі сабрала,
Ох, сэрца лянок,
Мая радасць ты, лянок,
Белы, слаўны кужалёк!
Ох, і мяла Ульяніца лянок,
Ох, і мяла Ульяніца лянок,
Ох, сэрца лянок,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мая радасць ты, лянок,
Белы, слаўны кужалёк!
Ох, і прала Ульяніца лянок.
Ох, і прала Ульяніца лянок.
Ох, сэрца лянок,
Мая радасць ты, лянок,
Белы слаўны кужалёк.

***Гаспадыня.***

Дзякуй вам за падтрымку, добра ведаеце, як сеюць лянок. А зараз праверым, ці ўмееце вы працаваць. Лянок мы пасеялі, вырвалі крыху паваражылі над ім, і ў нас атрымалася вось такая кудзеля. А каб ніткі атрымаць, павінны вы яе спрасці. Вось вам кудзеля, верацяно — прынімайцеся за працу. А каб вам не было сумна, мы з залай пагуляем у гульню "Беларускія песні". А ну, музыканцік, падыграй нам.

*(Зал дзеліцца на дзве часткі. Ідзе конкурс, хто каго перапяе.)*

***Гарманіст.***

Хопіць, хопіць, болей не магу гармошку дзяржаць — прытаміўся. Дайце адпачыць. А заадно і на дзяўчатак паглядзець, не ведаю, якая болей падабаецца.

***Гаспадыня.***

Можа пасля гэтай гульні выбярэш, бо зараз нашы дзяўчынкі павшны ніткі з верацён у клубкі зматаць.

**Гульня "Хто хутчэй".**

*(Пад фанаграму хуткай беларускай музыкі.)*

***Гаспадыня.***

Ну як, Міхасік, не выбраў яшчэ нявесту. А можа, цябе хто выбярэ. Бо наступны конкурс — узор для ручніка. Дзяўчынкі напралі столькі цудоўнай пражы, зматалі яе ў клубкі. Можна ўжо і вышываць, толькі ўзору няма. Цяпер, хлопцы, ваша чарга паказаць, на што вы здольныя, праявіць сваю фантазію. Вам патрэбна намаляваць узор для ручнка. А рабіць гэта будзем такім чынам: вось вам алоўкі, каляровая папера, нажніцы, з дапамогай іх вы павінны намаляваць элементы беларускага арнаменту, выразаць іх і злажыць у адзінае цэлае.

**Конкурс "Узор для ручніка".**

***Гаспадыня.***

А каб нашы гледачы не сумавалі, мы правядзем гульню "Слуцкія паясы", бо наша старонка славіцца не толькі ручнікамі, але і паясамі.

1. У якім горадзе знаходзілася фабрыка знакамітых паясоў?
2. Каму належала гэта фабрыка?
3. З якіх ніток былі сатканы паясы?
4. У чым адрозненні слуцкіх паясоў ад іншых?
5. У якім стагоддзі фабрыка перастала існаваць?

*(Віншуе пераможцўу.)*

***Гаспадыня.***

Ну вось, нашы хлопцы справіліся з заданнем. Дзякуй вам. Цяпер засталося вышыць гэты ручнік на белым палотнішчы.

**Конкурс "Вышыўка".**

***Алёнка.***

Матулечка, адкажы, калі ласка, што гэта мы вышываем сцяблінкі чорным колерам. Здаецца, не так трэба.

*(Фанаграма песні "Слуцкія паясы".)*

***Гаспадыня.***

Ой, маладыя вы, неразумныя. Слухайце. Вось чорны колер — гэта Зямля. Толькі яна ў нас адзіная і нязменная, на ей мы працуем, час надыдзе — паміраем. Чырвоны колер — гэта жыццё, самі павінны здагадацца. А жоўты што азначае, ведаеш? Гэта надзея, яе чалавек нясе ў сэрцы праз усе жыццё.

***Алёнка.***

Ого! Дык гэта ж цэлая грамата і пішацца яна на белым палотнішчы.

***Гаспадыня.***

Так, правільна, на белым палотнішчы, бо белы колер — колер Хрыста.

***Алёнка.***

Вось яно як... А я ніколі не задумвалася, што на ручніку не толькі малюнкі, а цэлы расказ.

*(Уключаецца фанаграма, ідзе паказ відэаслайдаў.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Дыктар (за кадрам).***

Вазьму я сонечны прамень
І вільгаць ад крыніц.
Паўдзённую спякоту
І звонкі шчэбет пціц.
Зары вячэрні свет, яе красу,
На кветачцы — дрыжачую расу.
Духмянае паветра луга і стагоў.
І не забуду прыгажосць садоў.
Складу ў ручнік я восені дары,
Подых зямлі, яе пары.
Укладу часціцу сэрца я
свай го... ***Гаспадыня.***

А зараз давайце праверым вашы малюнкі. ***Гаспадыня.***

Дарагія сябры! Мы вельмі ўдзячны ўсім тым, хто прыняў актыўны ўдзел у нашай гульні. А паколькі я спадзяюся, што кожны жаніх ужо выбраў сабе нявесту, то цяпер ладком, мірком — ды і за вяселлейка.

*(Стук у дзверы, уваходзяць хлопцы, ідзе інсцэніроўка песні "Ручнікі ".)*

У суботу Янка ехаў ля ракі,
Пад вярбой Алёна мыла ручнікі:
—Пакажы, Алёна, броды земляку,
Дзе тут пераехаць на кані раку.
—Адчапіся, хлопец, едзь абы-куды,
Не муці мне толькі чыстае вады.
У маркоце Янка галавой панік:
Упусціла дзеўка беленькі ручнік.
—Янка, мой саколік, памажы хутчэй.
Ой, плыве, знікае ручнічок з вачэй.
— Мілая Алёна, я вады баюсь,
Пацалуй спачатку, што, як утаплюсь.
Супыніўся гнеды пад вярбой густой,
Цалаваў Алёну Янка над вадой.
Стала ціха-ціха на ўсёй зямлі,
Па рацэ далека ручнікі плылі...

## *Горы, не згасай, зорка любові!*

На фоне музыкі М.Тарывердзіева з кінафільма "Зорны хлопчык", чытаючы верш Я. Янішчыц, вядучая раздае рознакаляровыя паветраныя шары. ***Вядучая.***

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві.
На дарозе жыцця шырокай
Пачынаецца ўсё з любві —
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі
Там, дзе выбеглі ў даль канавы,
Пачынаецца ўсё з любві —
Адчуджэнне і боль, і нянавісць.
Ты пакліч мяне, пазаві.
100 дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві —
А іначай і жыць немагчыма.

Прывтчнне! Я запрашаю ўсіх вас у чароўнае падарожжа, зорнае падарожжа любові. Мудрыя кажуць, што калі яднаюцца два сэрцы — у небе загараецца зорка, якая іскрыцца, мігае на маятніку часу дні, месяцы і нават стагоддзі. У вас у руках паветраныя шары. ўсіх, хто іх атрымаў, я запрашаю да сябе вось на гэтую пляцоўку.

*(Гучыць музыка.)*

***Вядучая.***

Увага! Гучыць першы зорны салют у гонар любові і шчасця.

*(Па камандзе вядучай праколваюцца шары. У іх знаходзяцца маленькая зорачкі, на якіх напісана частка прыказкі ці прымаўкі аб каханні.)*

Вось і знайшоў кожны сваю зорачку шчасця. Але, ці разгарыцца яна, ці знойдзе свой шлях да вянка любові, залежыць толькі ад вас. Калі ласка, я папрашу кожную дзяўчыну, якая атрымала зорачку, зачытаць пачатак народнай мудрасці (які знаходзіцца на адваротным баку зоркі), а юнакоў — другую яе палову.

*(Зачытваюць.)*

***Вядучая.***

Вось і з'ядналіся дзве зорачкі ў адно цэлае сузор'е,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якому быць разам можа хвіліны, можа дні, а калі пашчасціць — нават цэлае жыццё. Бо толькі ад вас саміх залежыць, якія фарбы ўпляцеце ў вянок вашых адносін.

А зараз гучыць вальс знаёмства, на працягу якога кожны як мага лепей павінен запомніць сваю новую знаёмую (знаёмага) — ад колера вачэй да нейкай пэўнай характарыстыкі яе і яго асобы.

*(Гучыць вальс.)*

***Вядучая.***

Я прашу першую пару стаць у процілеглыя напрамкі адзін ад аднаго і хутка, не раздумваючы, адказаць на пытанні.

*(Вядучая задае пытанні тыпу: які колер вачэй вашай знаёмай, як завуць вашага новага знаёмага, нацыянальнасць, упрыгожанні і г.д. Удзельнікі адказваюць.)*

***Вядучая.***

Дзякую за правільныя адказы. Вы атрымліваеце вось гэтыя прызы. Пара, якая атрымае іх больш, атрымае і суперпрыз. Ведаеце, існуе старажытная прытча. Калі Бог вырашыў стварыць чалавека, то доўга думау, з чаго яго зрабіць. Нарэшце яго погляд упаў на яблыню, якая расла ў райскім садзе. "Вось з чаго я сатвару людзей", — падумау ён. Але яблыкаў было няшмат і тады Бог іх разрэзаў на палавінкі і скінуў на зямлю. Кожная палавінка ў час падзення ператваралася ў чалавека, але яны перамяшаліся і згубілі адзін аднаго. З той пары кожны чалавек шукае сваю палавіну, сваю адзіную зорачку. А можа палавінкі аднаго цэлага ёсць і сярод вашых супаўшых зорак — зараз мы гэта праверым.

Я прашу кожную пару ўзяцца за рукі. Свабоднымі рукамі вы павінны выканаць мае заданні. Першае — прышыць зоркі адзін аднаму, удзеўшы нітку ў іголку. Усё гэта патрэбна зрабіь, не раздымаючы сплеценых рук. Пачынаем па маёй камандзе.

*(Ідзе конкурс.)*

***Вядучая.***

Калі прыходзіць каханне — вочы іскрацца радасцю, сэрца напаўняецца музыкай, а душа спявае, спявае ўсё, што прыходзіць на розум. Зараз я распачну песню, а вы павінны апошнімі яе словамі пачаць новую песню.

Напрыклад: "Колькі ў небе зор...
Я раблю паўзу, і наступную песню падхоплівае першая пара. Яна павінна пачынацца са слоў аб зорках ("Зорачка мая, ясная мая лілея). Затым гэта пара робіць паўзу на слове "лілея", і наступныя ўдзельнікі, падхапіўшы апошнія словы, пачынаюць сваю песню. Тая пара, якая не ўспомніць песню на апошнія словы, прагучаўшыя ў папярэдняга дуэта, выбывае з гульні, і іх сузор'е распадаецца. *(Ідзе конкурс.)*

***Вядучая.***

Шчыра дзякую зорным парам, у якіх усё атрымалася, і запрашаю прыняць удзел яшчэ ў адным выпрабаванні ў гонар любові. Ёсць у Японіі звычай: раз у год, на дзень закаханых, запальваецца факел шчасця, і хто яго здабудзе, той будзе найшчаслівейшым цэлы год. У мяне таксама ёсць там факел. Гэта факел любові, уладальнік якога на працягу ўсяго жыцця будзе найшчаслівейшым чалавекам у свеце, бо разам з ім будзе спадарыня любоў. Я прашу дзяўчат, ахоўніц факела, стаць ва ўнутраны круг. Ён будзе рухацца ўправа, а знешні круг юнакоў рушыць пад музыку ўлева. Як музыка змаўкае, юнакі спрабуюць авалодаць факелам любові. Дзяўчаты з круга не дазваляюць гэтага рабіць (паліваюць нападаючых вадою, дазваляецца мазаць крэйдай). Такім чынам, да барацьбы за факел любові і шчасця прашу падрыхтавацца. *(Музыка,* ідзе *гульня.)*

***Вядучая.***

Вось і вызначылася самая шчаслівая зорная пара. Але гэта не значыць, што астатнія сузор'і знікнуць у касмічнай прасторы. Будзем спадзявацца, што вашы зоркі будуць разгарацца і пераадольваць на шляху да шчасця і любові яшчэ не адну перашкоду. Бо што такое любоў? Гэта вясёлка, гэта суквецце вянка, які квітнее, уецца, пераплятаецца з іншымі раслінамі, але засыхае, калі яму няма каго абняць — абняць дзіця, абняць каханую, абняць музыку, Радзіму і Зямлю, на якой нарадзіўся.

## *А ў нас сёння Стрэчанне!*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Сцэнарый тэатралізаванага прадстаўлення**

Пляцоўка ўбраная маляўнічымі плакатамі, жартоўнымі аб'явамі. Над уваходам — Сонца, злева на шырме — Зіма, справа — Вясна. Гучаць фанфары. Выбегаюць скамарохі.

1. Слухайце маю аб'яву:
Абяцаю ўсім забаву!
Зараз будуць песні, скокі!
Выступаюць
Усе. Скамарохі!
2. Не было ветру, ды надзьмула,
Не было гасцей, ды наплескала!
Заходзьце, госці дарагія!
Заходзьце, рассаджвайцеся!
Няма дзе сесці —
На кукішы прысаджвайцеся!
3. Рады вам Гаспадар з Гаспадыняю,
Ды адзін аднаму кожны рад!
4. Усе госці сышліся-сабраліся!
Як, любыя, даехалі-дабраліся?
5. А ў лесе палянка,
А ў нас сёння гулянка!
6. А мы на палянцы ды Вясну страчаць будзем!
7. А мы на гулянцы ды гуляць будзем!
*(Фанфары.)*
1. А ў нас сёння Стрэчанне,
Стрэчанне,
Зіма з Летам стрэлася, стрэлася,
Лета Зіму піхнула, піхнула
Ды ножаньку звіхнула, звіхнула,
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы!

Скамарохі пяюць "Дзе хадзіў карагод?", вядуць карагод, запрашаючы ў яго дзяцей і дарослых. У сярэдзіне карагода з'яўляецца Зіма, танцуе, на апошніх радках песні яна скідае зімовы ўбор, на яе галаву вяснянкі надзелі вянок з кветак, на шыкоўнае веснавое плацце — кветкавую гірлянду. Зайграў аркестр, вітаючы з'язленне Вясны.

2. А Масленка — бела вутка,
Вясна будзе, ды не хутка!

Вясна і вясняначкі, танцуючы, адыходзяць.

3.А сёння Улас,
Радзі, Божа, лён наш:
Залатое ды насеннейка,
Срэбранае ды карэннейка,
Сам шаўковы лён!

Скамарохі пяюць "Ох, і сеяла Ульяніца лянок", астатнія заводзяць карагод, запрасіўшы ў яго гасцей.

4. Ой, вясёлае сёння свята,
І гасцей тут вельмі багата!
Бачу, які тут вясёлы народ!
Дык весялей скачы, карагод!
5. Мы з званочкамі ды кляшчоткамі!
З дудкамі ды з бразготкамі!
6. А мы з ножкамі ды з далонькамі,
А яшчэ з прыпеўкамі звонкімі!

Скамарохі пяюць прыпеўкі, граюць на драўляных інструментах, ідзе вясёлы карагод і пераходзіць у перапляс.

Пяюць: Ой, дазвольце паскакаць,
Ды дазвольце топнуць!
Ды няўжо ў гэтай хаце
Ды маснічкі лопнуць?
Прыпеў: Здорава, здорава
Ля варот Рыгоравых,
А ля нашых ля варот
Усё ідзе наадварот!
Як на наш дзень нараджэння
З'елі мы бідон варэння,
І ад гэтае бяды
Забалелі жываты!
Хлопцы. Хлопцы ўсе гуляць ідуць,
А мне нечага абуць:
Лапці новыя згарэлі
І страхоўкі не даюць!
*(Я. Янішчыц.)*

Прыпеў.
*Дзяўчаты.*
Усе прыйшлі, усе прыйшлі
Ды па лавах селі,
Майго хлопчыка няма



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мусіць ваўкі з'елі.
*Прыпеў.*
А мы польку танцавалі,
А нам полька шанцавала,
Перастанем танцаваць —
Перастане шанцаваць!
*Прыпеў.*
Гарманісцік, весялей,
Нашых ножак не жалей:
Нашы ножкі не баляць,
Яны хочуць танцаваць!
*Прыпеў.*

7.Досыць, сябры, вам пецьтанцаваць! У "Вартавога" зараз будзем гуляць!
Дарослыя гуляюць,
Дзеткі-кветкі адпачываюць!..

У круг сталі адзін аднаму рукі далі, падраўнялі круг. Круг — гэта сад. У садзе ёсць вартавы, вось ён! Але, бачыце, заспаўся небарака! А тым часам нехта яблычкамі паласаваўся. Трэба дапамагчы вартавому злодзея знайсці! Пойдзем па крузе са словамі:

Вартавы, пакуль ты спаў
Нехта яблычкі пакраў!
Ты па садзе пахадзі
Злодзея хутчэй знайдзі!

Вартавы, не расплюшчваючы вачэй, ходзіць па садзе, на слове "знайдзі" спыняецца, да каго-небудзь дакранаецца рукой і расплюшчвае вочы. Злодзей спайманы! Калі гэта атрымалася пара — хлопец і дзяўчына, то яны цалуюцца, калі два хлопцы ці дзве дзяўчыны, то яны танцуюць. Усё зразумела? Пачалі!

*(Гуляюць.)*

1. Ой ты, сябар, мой пане,
Прыгожы ў цябе стане!
Апусці руку ў кішэню,
Вынімай загадак жменю!

2 і 3. Загадка не адгадваецца сама,
Паспрабуйце вастрыню свайго розуму!

—У кутку барада на кійку. Што гэта? *(Мятла.)*
—Вось вам быль-небыліца: у пяці чалавек адна паясніца. *(Рука.)*
—Не звер, а махнатая, не звер, а з вушамі *(Шапка-вушапка.)*
—Глядзіць і ўдзень, і ўночы, вытарашчыўшы вочы, ні на двары, ні ў хаце... Як яго назваці? *(Акно.)*
—Што за дарога: хто ні ідзе, кожны кульгае? *(Лесвіца.)*
—Ляцела цяцера з вечара, не цяпера.
Упала у лебяду — удзень не знайду. Што гэта? *(Раса.)*
—У маленькім гаршчочку смаката за шчочкай.
На кусце нарадзіўся, пад куст скаціўся,
А як прачнуўся — у мяне апынуўся. А гэта што? *(Арэх.)*

4. А вось пра гэту смакату
Я для вас гульню знайду!
У лесе на паляне
Стаіць арэшнік у каптане,
Стаіць — пануе,
Арэшкамі частуе!
Тваё ці мае?

Каму-небудзь з гасцей працягвае два кулакі: у адным з іх схаваны арэх. Звяртаецца да таго, хто адгадаў, у якой руцэ ляжыць арэх:

Быць табе пачынальнікам,
Пачынальнікам-шукальнікам!
Выходзь на круг!

Астатніх прашу стаць па крузе парамі, як у гульні "Трэці лішні". Наша гульня завецца "Знайдзі сваю пару". Усе гучна кажам: — У карагодзе ходзім, сваю пару знаходзім!.. Малайцы! Зараз зайграе вясёлая музыка, унутраны круг, прытанцоўваючы, пойдзе управа, знешні — улева. Як толькі музыка спыніцца, усе бягуць да сваей пары. У гэты час шукальнік займае бліжэйшае да сябе месца. Той, хто застанецца без пары, становіцца новым шукальнікам. Зразумела? Пачалі? *(Ідзе гульня.)*

5.Гэй ты, песня-весялушка:
Сум — з вачэй, цяжар — з плячэй! Вось і сэрца, быццам птушка, Стала лётаць весялей!
***(Я. Янішчыц.)***

*(Усе пускаюцца за "падсадкамі" ў скокі.)*
А вы, госці мае, вы прашоненькія,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А чаму адна дзяўчына невясёленькая?
Калі хлеб не пушон, будзем пушыць яго,
Калі нехта невясёлы, развясёлім яго.
Калі хлеб не пушон, будзем пушыць яго,
Калі нехта засумуе, перапросім яго!

6. *(Перабіваючы музыку).*
Эх, колькі ж нас — адна жменечка!
Пагуляем жа харашэнечка!
Бо цяпер мне пагуляць,
Пакуль грае скрыпка,
Ручкі-ножкі не баляць,
Мая спіна гібка! *(Пускаецца з усімі ў скокі.)*

7. Мы Масленку дажыдалі,
Мы Масленку сустракалі,
Блінам-Сонцам пачыналі,
Шчыра маслам палівалі!

Хлопцы выносяць на сярэдзіну пляцоўкі прыгожае Сонца-кола. З імі зноў выходзіць Вясна.

7. Наша Масленіца гадавая,
Яна госцейка дарагая.
Яна пешаю к нам не ходзіць,
Усё на коніках раз'язджае,
Што б конікі былі вараныя,
Што б слугі былі маладыя!

Заспявалі скамарохі-вядучыя. Вясна, а з ей вяснянкі і скамарохі-памочнікі павялі вакол Сонца карагод. За імі дзяўчаты з рознымі прысмакамі.

Шырокая Масленіца,
Ты з чым прыйшла-з'явілася?
З весялосцю ды з радасцю,
Ды з усякай саладосцю,
Ды з мядовымі пернікамі,
З абаранкамі макавымі,
З вясёлымі скамарохамі,
Ды з музыкамі-забаўнікамі,
Са звонкімі карагодамі!
Шырокая Масленіца,
Ты навошта тут з'явілася?
Пагуляць, пазабавіцца,
Ды з госцейкамі вясёлымі,
Паказацца-пацешыцца
Ды з сябрамі са харошымі!

2. Весяліцеся, госцейкі дарагія! Весялосці вам і радасць! Мір вашаму дому! Быць пірагу ядому!

3. Гладкай вам дарогі
Ад гэтага парога
Да поля шырокага,
Усе. Вясёлага, гульнёвага!

4. Пойдзем Сонца — кола каціць,
Пудзіла Зімы паліць!

Сонца, за ім Вясна з вяснянкамі і скамарохамі, а за імі ўсе госці пад гукі духавога аркестра вясёлым шэсцем рушылі на гульнёвае поле, дзе іх чакаюць снежны пір, снегавая горка, пляцоўка "скарбаў", вясёлыя конкурсы. У баку ад пляцоўкі — церамок з самаварам, блінамі, ласункамі.

5. Слухай і мяне, народ!
Хто пагрэцца хоча чаем,
У церамочак запрашаем
З'есці смачны бутэрброд!

6. Зверху — пар, знізу — пар!
Развясёлы самавар!
І пяе ён, і раве
На бліны ўсіх заве!

7. Мы не ленаваліся,
Усё рабілі самі,
А цяпер гасцей завем
Еціш разам з намі!

1. Усіх вас Масленка частуе!
Усе. Усіх са Стрэчаннем віншуе!
*(Фанаграма песні "На вуліцы Масленіца ".)*

*2.* Хутчэй, народ, у карагод:
З Зімой развітаемся,
З Вясной павітаемся.

Вясна і ўсе персанажы прадстаўлення, госці вядуць вялікі карагод вакол пудзіла Зімы. Хлопцы высока ўгару падымаюць Сонца-кола, падпальваюць пудзіла Зімы. Усе скамарохі гучна крычаць:

Гары ясна, каб не пагасла!
Гары ярчэй! — Лета будзе жарчэй!
*(Спальваюць пудзіла.)*

3. Ой, добрыя людзі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паглядзіце, што будзе!
4. Да слупа збірайцеся,
Ды не вельмі штурхайцеся!
5. Хто на верх слупа ўзлезе,
З прызам вялікім з яго той злезе!
6. Дзе тыя спрытнюкі, што сабе, ці сваім дзецям падарунак добры прыдбаюць? Тыя, каму пашанцуе, здымуць са слупа набор са сталярным рыштункам, вялікую лялькy, гульню "За рулём" ці прыгожае пано! (Зацікаўленыя здымаюць прызы са слупа.)
7. А што гэта за Масленка без снежнага ціра, без гоны на санках ці лыжах? Запрашаем!
1. А вось і пляцоўка "скарбаў"! Вас тут чакаюць драўляныя рыдлёвачкі! Паспрабуйце вызваліць свой "скарб" з-пад снегу! Запрашаем!
2. На конкурс снегавой скульптуры, на вясёлыя гульні-атракцыёны — запрашаем!
3. Патрэбныя вам пляцоўкі вы знойдзеце па шыльдах! Запрашаем!
Праз 20 хвілін падведзены вынікі гульняў, спаборніцтваў, конкурсаў. З рук Вясны пераможцы атрымалі свае ўзнагароды. Зноў гучыць "На вуліцы Масленіца".
3. На развітанне прыгадаем,
Усе. Што вам мы пажадаем:
4. Будзьце ўсе вы моцнымі, як вада,
5. Багатымі, як зямля,
6. Працавітымі, як пчала,
**Усе.** Прыгожымі, як вясна!
7. Да пабачэння, госцейкі дарагія!
**Усе.** Да пабачэння!

## *Лясная казна*

Для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту
**Атрыбутыка і рэквізіт**:
1. Разнастайныя мастацкія сродкі для абсталявання сцэны ці рабочай пляцоўкі ў выглядзе лясной паляны.
2. Бутафорскі камар.
3. Галінкі дрэў.
5. Шапка "Цямнілка".
5. Паветраныя шары.
6. Кораб для мядзведзя.
7. Старыя газеты ці каляровая папера.
Пад мелодыю "Галасы лесу" на ўпрыгожаную "Лясную паляну" выходзіць Машачка.

***Машачка.***
Ой, што гэта? Куды я трапіла? Дзе я апынулася? Ай-яй-яй! Якая цудоўная лясная паляна. А колькі тут прыгожых кветачак, вясёлых грыбочкаў, вось дык дзіва! Цікава, вельмі цікава, а як жа клічуць вось гэту яркую кветачку?
*(Пытае, як імя дзяўчынкі, атрымаўшы адказ, дорыць ей галінку дрэва.)*
А як завуць вось гэты незвычайны грыбочак? *(Пытае, як імя хлопчыка і ў адказ таксама дорыць галінку. Так паўтараецца некалькі разоў.)*
Але пачакайце, пачакайце. Неверагодна! Ніколі не чула, каб у кветачак і грыбочкаў былі імёны хлопчыкаў і дзяўчынак. Можа, я апынулася на незвычайнай паляне? Ага! Зразумела! Пэўна, усе гэтыя кветачкі і грыбочкі зачараваныя дзеці. Так-так, зачараваныя дзеці. Мабыць, іх паводзіны былі вельмі-вельмі кепскімі, яны не слухаліся бацькоў, не хацелі класціся спаць, ленаваліся, блазнілі, дрэнна елі. Ну, што, ці не так?

***Дзеці.***
Не, не.

***Машачка.***
Не? Вось добра, што я памылілася, і на гэтай цудоўнай лясной паляне сабраліся такія добрыя і вясёлыя, працавітыя і паслухмяныя, ну зусім сапраўдныя хлопчыкі і дзяўчынкі. Але, можа, сярод вас усё-такі ёсць дрэнныя дзеці?

***Дзеці.***
Не, не!

***Машачка.***
Няма? А вось я зараз праверу. Хуценька адкажыце: сярод вас ёсць крыўлякі і задавакі?

***Дзеці.***
Не, не!

***Машачка.***
А шалапаі і свавольнікі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Дзеці.***

Не, няма, няма!

***Машачка.***

А гарэзы, балаўні, плаксы?

***Дзеці.***

Не, не!

***Машачка.***

А добрыя хлопчыкі і дзяўчынкі?

***Дзеці.***

Не, не, так!

***Машачка.***

Што я чую? Добрых рабят сярод вас таксама няма? *(Дзеці шумяць).* Ну цішэй, цішэй, супакойцеся. Я і сама бачу, што на гэтай прыгожай лясной паляне сабраліся добрыя, вясёлыя дзеці і дрэнных сярод вас ну зусім няма. А зараз мне патрэбна ваша дапамога. Я буду чытаць вершы, а вы ўсе разам дапамажыце мне даць правільны адказ словамі: "хлопчыкі”, альбо "дзяўчынкі”, але трэба, каб адказ быў у рыфму з вершамі. Зразумелі? "Хлопчыкі" альбо "дзяўчынкі". Навастрыце вушкі, слухайце вельмі ўважліва. Пачынаем.

1. Гуляць у лялькі, фарбай пэцкаць вочкі
Напэўна любяць толькі ... хлопчыкі.
2. Цвікі, балты і розныя пружынкі
Хаваюць у кішэні дбайныя ... дзяўчынкі.
3. Штодня змагаюцца асілкі,
Яны ўсе дужыя і моцныя ... дзяўчынкі.
4. Лапочуць языком, суюць усюды носікі
У сукенках каляровых ... хлопчыкі.
5. Ганяць мячы, змагацца без упынку
Спадручней усяго... дзяўчынкам.
6. На галаву вязаць хусцінкі, стужкі і банты
Занадта любяцьтолькі... хлапчукі.

Ну вось, якія смешныя вершы пра хлапчукоў і дзяўчынак у нас атрымаліся, і вы ўсе так добра мне падказвалі, але я нешта не зразумела, хто лепей падказваў — хлопчыкі ці дзяўчынкі?

*(Дзеці шумяць.)*

А-а. Цяпер зразумела. Пэўна у нашым лесе болей хлопчыкаў, таму яны лепей і падказвалі. Не? Дзяўчынак? Нічога не разумею. Такі шум стаіць, як у навальніцу. А давайце лепш зробім так. Спачатку ўсе хлопчыкі моцна-моцна папляскаюць у далоні. Ага. Добра. А цяпер дзяўчынкі. Ну вось і разабралася. Дзяўчынак атрымалася болей. Не? Хлопчыкаў? Што ж рабіць? Ну... тады... усе дзяучынкі моцна патупаюць ножкамі. Так, так. А цяпер патупаюць хлопчыкі, толькі яшчэ мацней. Ага, і сапраўды хлопчыкау болей. Зноў не? Дзяўчынак? Вось бяда, зусім заблыталася, ніяк не разбяруся, каго болей. Відаць, у нашым лесе надта шумяць дрэвы. Рабяты, а як паміж сабою размаўляюць дрэвы, вы ведаеце?

*(Дзеі шыпяць, махаюць рукамі.)*

Ой, як весела размаўляюць дрэвы, як ласкава шапочуць галінкі. А ці ведаеце вы, як на дрэвах гойдаюцца галінкі, калі падзьме вельмі моцны вецер? Ведаеце? А паказаць зможаце? Ну, тады узніміце ўгару рукі. Гэта будуць галінкі дрэў. А цяпер усе разам моцна, моцна падзьмем. Ай-ай, якія магутныя дрэвы атрымаліся, а як страшна шуміць вецер, як моцна гойдаюцца галінкі. У гэткім дрымучым лесе і згубіцца не цяжка. Во, я ўжо за такімі вялікімі дрэвамі і дзяўчынак не бачу. Давайце ўсе, дзяўчынкі, гучна пагукаем. Ау-ау-ау. Добра. Адзе ж нашы хлопчыкі? А ну, усе, хлопчыкі, разам адгукнемся: у-у-у-у, у-у-у. Ой, якое гучнае рэха. Як страшна, аж мяне дрыжыкі бяруць.

*(Гучыцьмузыка. З песняй на паляну выходзіць Лесавік.)*

***Лесавік.***

Хто ў лесе тут крычыць,
Хто смяецца і шуміць?
Зараз з лесу праганю,
Я парадак навяду.
Хоць я добры Лесавік
І бурчаць зусім не звык,
Шкоды лесу не сцярплю,
Бо я вельмі лес люблю.

***Машачка.***

Даражэнькі Лесавік, не крыўдуй на нас, калі ласка. Мы ў тваім лесе крышачку пагулялі, вось і шум пайшоў. Але, калі ты зірнеш навокал, то зусім не знойдзеш дрэнных дзяцей. Зрэшты, ты і сам можаш іх спытаць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Лесавік.***

Сам, сам, а вунь тыя дзеці, пэўна ж, вельмі дрэнныя?

***Машачка.***

Ды што ты, Лесавік, ты вельмі памыляешся. Дрэнных дзяцей сярод нас няма. Ці так, дзеці? *(Дзеці даюць адказ.)* Вось бачыш, Лесавічок, тут усе дзеці добрыя, і ўсе яны захоўваюць і сцерагуць лес, усе вельмі клапатлівыя, любяць звяроў, птушанят і наогул кожную травінку-былінку.

***Лесавік.***

Ну, калі так, то добра.

***Машачка.***

Яшчэ як добра. Але і гэта не ўсё. На нашай паляне ўсе дзеці вельмі музыкальныя і назіральныя. І ў гэтым ты сам зможаш пераканацца, калі крышачку нам дапаможаш. ***Лесавік.***

Ну, такім добрым дзецям абавязкова дапамагу.

Праводзіцца музычна-пазнавальная гульня *(дыдактычная)* "Лясныя галасы".

***Машачка.***

Цяпер, дзеці, будзьце велымі ўважлівымі, таму што зараз мы з вамі створым незвычайны лясны аркестр, у якім я буду вашым галоўным дырыжорам, а вы маімі таленавітыміляснымі музыкантамі. Згодны?

Вось тэты гурт рабят назавем "Совы". А совы, наставіўшы вушы, шырока расплюшчыўшы вочы і сярдзіта надзьмуўшыся, сядзяць у дуплах старых дрэў, у лясным гушчары, паволі машуць крыламі і голасна крычаць у-у-у-у, у-у-у аж на ўсю цэлую музычную ноту. Паслухайце, як гэта ў іх атрымоўваецца.

*(Лесавік выконвае музычны уступ. Машачка пад вясёлую рытмічную мелодыю паказвае, як выконваецца галасавая партыя савы і як правільна паказаць пры дапамозе рук (крылаў) працягласць рытмічнага гучання цэлай ноты. Музычна-рытмічную падрыхтоўку дзяцей вядучыя праводзяць перад кожным вывучэннем гучання новых "партый" аркестра.)*

А зараз совы-музыканты выканаюць сваю партыю разам з намі. Малайцы. Вось якія сярдзітыя совы ў нас атрымаліся, аж нам з Лесавічком страшна зрабілася.

А вось гэты гурт —"Дзікія качкі".

Качкі здаля заляцелі на маленькае лясное возера, селі на беразе і здзіўлена круцяць галоўкамі, нібыта пытаюць адна ў адной: кра-кра, кра-кра, дзе ж мы апынуліся? Такім чынам у іх атрымоўваецца палавінная музычна-рытмічная нотка. Давайце паслухаем, як выконваецца палавінная нотка... А цяпер разам са мною пакажам, як размаўляюць качкі. І як яны выконваюць пры дапамозе сваіх галовак музычны малюнак палавіннай ноты. Дзякуй качкам. Вы вельмі добра выканалі сваю партыю.

А гэты гурт — "Вераб'і".

Яны вельмі жвавыя і дапытлівыя, таму і зляцеліся з усяго лесу пацікавіцца, што ж у нас робіцца. А прыляцеўшы — забыліся, чаго хацелі, раскрылі свае дзюбкі і весела заспявалі любімую песеньку, выконваючы чацвяртную рытмічную нотку чырык-чырык-чырык-чырык. Працягніце ручкі ўперад. Гэта будуць вашы дзюбкі. Вы сваімі далонямі, як дзюбкамі, адшчоўквайце чацвяртную музычна-рытмічную нотку, нібы выконваючы такім чынам галасавую музычную партыю. Робім разам з намі. Ой, якія вясёлыя і звонкія вераб'і.

А вось гэты гурт — "Мышкі".

Мышкі жвава круцяць сваімі хвосцікамі. Пакажыце, як вы круціце сваімі хвосцікамі? Вось якія ў нас хвосцікі. А яшчэ мышкі танюсенька пішчаць. А ну, пакажыце, як мышкі пішчаць. (Дзеці паказваюць.) Дык вось, калі мышкі пішчаць, яны выконваюць рытмічную нотку-васьмушку. А ну, мышкі, разам з намі пакруцім хвосцікамі і выканаем нотку-васьмушку. Вось якія ў нас музыкальныя мышкі атрымаліся.

І яшчэ да нашага аркестра зляцеліся працавітыя і вясёлыя пчолы.

Так, дзе мае пчолкі? Ага, вось яны *(выбірае некалькі хлапчукоў і дзяўчынак.)* Гэтыя пчолкі будуць маімі адказнымі памочнікамі. Яны створаць у аркестры пчаліны меладычны фон, будуць шпарка лётаць па паляне, моцна гудзець, хуценька махаць крылцамі. Ну, пчолы, пагудзіце і палётайце вакол мяне. Цудоўна. Якая дзіўная пчаліная песня атрымалася.

Ну вось, аркестр створаны, партыі падрыхтаваны, рэпетыцыі праведзены — можна пачынаць лясны канцэрт. Уважліва сачыце за мной і памятайце, што я ваш галоўны дырыжор, а вы мае таленавітыя выканаўцы. Падрыхтаваліся.

*(Даецца музычны ўступ. Машачка па чарзе кіруе*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*гуртамі, якія выконваюць свае партыі. Вакол яе ўвесь час лётаюць і гудуць пчолкі. У канцы нумара ўсе "музыканты " апладзіруюць сваім сябрам і сабе.)*

***Машачка.***

Ну як, Лесавічок, цяпер ты пераканаўся, што гэтыя рабяты вельмі музыкальныя? Да таго ж усе яны вельмі шануюць лясных жыхароў, таму так добра і таленавіта выконвалі свае музычныя партыі.

***Лесавік.***

Машачка, а якіх лясных звяркоў яны болей любяць?

*(Дзеці называюць любімых жыхароў лесу.)*

А якіх звяроў яны болей баяцца?

*(Дзеці даюць адказ.)*

***Машачка.***

Рабяты, а ці жывуць у лесе камары?

*(Адказ.)*

А ці спалохаецеся вы ляснога камара, калі ён прыляціць да нас? *(Дзеці шумяць.)* Так, ніхто не спалохаецца? А калі на вас наляціць цэлая зграя пісклявых і злых камароў, не забаіцеся іх? *(Адказ.)*

А як вы будзеце адганяць камароў? *(Дзеці паказваюць.)*

Вось гэтак, рукамі і нагамі? А яшчэ як?

*(Дзеці робяць разнастайныя рухі, шумяць.)*

**Гульня "Паляванне на камара".**

А хто з вас самы-самы смелы? *(Выбірае аднаго з хлопчыкаў.)* Вось ты самы смелы хлопчык, так? І цябе завуць... Ты зусім не спалохаешся такога малюсенькага, пісклюсенькага камара? Не? Вось і добра. А як абараніцца ад дакучлівага, кусачага камара ты, пэўна, добра ведаеш? Вось малайчына. Але мы з Лесавічком мяркуем, што ад любога камара можна абараніцца і простай галінкай. Так? Тады давайце, рабяты, аддадзім нашаму смеламу паляўнічаму свае галінкі і ён пакажа усім, як трэба абараняцца ад камара.

*(Дзеці вяртаюць Машачцы галінкі дрэў, атрыманыя імі ў пачатку гульні, яна аб'ядноўвае іх у вялікі "букет ", дае хлопчыку, і той паказвае усім, як ён адбіваецца ад камароў.)*

Вось які ў нас смелы паляўнічы. Але на нашу звычайную чароўную лясную паляну прыляцеў зусім незвычайны лясны волат Камарышча. Вось ён.

*(Машачка выносіць вялікага бутафорскага камара. Такога камара можна зрабіць з розных падручных сродкаў: дроту, дрэва, кордона, паперы і г.д. У тулава камара ўмацоўваюць паветраны шар, які пры трапным удары па камары галінкамі дрэў лопаецца, і гэта сведчыць аб знішчэнні камара і выкананні задання.)*

Бачыш які волат? Не спужаўся? Добра. А цяпер у нас адбудзецца сапраўднае паляванне на камара. Але спачатку паслухайце заданне. Паляўшчаму трэба вось гэтымі галінкамі пацэліць па шары, каб ён лопнуў. Гэта будзе сведчыць, што камар знішчаны і ў цябе зоркае вока. За гэта табе даецца імя "Сакалінае вока" як самаму вопытнаму і смеламу паляўнічаму. Зразумеў? Але пачакай, пачакай, гэта яшчэ не ўсё. Тут такая справа. Ведаеш, на нашай чароўнай паляне нельга паляваць без вось гэтай прыгожанькай шапкі-цямнілкі. Калі ты яе надзенеш, то навокал адразу зробіцца вельмі цёмна. Але ты не хвалюйся. Усе дзеці на нашай паляне з задавальненнем табе дапамогуць. Ну як, дапаможам паляўнічаму? Тады слухайце. Калі паляўнічы будзе паляваць далека ад камара, вы ўсе гудзіце ціха-ціха, а калі паляўнічы наблізіцца да яго, вы гудзіце моцна-моцна. Зразумелі? Тады пакажыце, як вы будзеце гудзець і дапамагаць паляўнічаму. *(Дзеці гудуць.)* Вось малайцы. А цяпер, калі ўсім зразумела, што трэба рабіць, паляванне пачынаецца.

*(Гульня праводзіцца з 2—3 "паляўнічымі". У канцы гульні на паляне раптоўна з'яўляецца мядзведзь з вялікім корабам, у якім схаваны ласункі і прызы.)*

Ой, паглядзіце, хто да нас прышоў. Пэўна, сваім шумам мы разбудзілі нашага ляснога сябра Мішку. Добры дзень, Мішка. А мы тут на камара паляванне рабілі.

*(Гучыць музычная імітацыя палёту камара, Міша пужаецца, адмахваецца і хаваецца за Лесавіка.)*

Што гэта, Міша, ты спалохаўся камара? Ай-яй, які баязлівец. Ну, не пужайся, Міша, мы з рабятамі даўно камара прагналі. Лепш павітайся з намі. (Мядзведзь б'е паклоны.) Бачыце, дзеці, які Міша артыст, хоць і баіцца камара. А як добра ён гнецца ў розныя бакі, відаць ён вельмі любіць займацца ранішняй зарадкай. А ці не пакажаш нам, Міша, як ты раніцай устаеш з цёплай пасцелі? Давайце папросім Мішу.

*(Міша паказвае, як ён прачынаецца, збіраецца ў лясную*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*школу, ідзе са школы дадому, якія віды спаборніцтваў яму больш за ўсё падабаюцца і г.д. Машачка ў час показу дае свае каментарыі.)*

Мы ўсе бачым, Мішанька, што ты вельмі сябруеш са спортам. Ды і як жа табе без спорту. Трэба ж вялкую сілу мецъ, каб і на дрэва злазіць за пчаліным мядком, і бервяно на будоўлю бярлогі прыцягнуць, часам і дарогу ў гушчары для дзетак расчысціць. Так? *(Міша ківае.)* А ці не дапаможаш нам, Міша, вывучыць вясёлую зарадку? Дапаможаш? Тады, рабяты, падрыхтаваліся, глядзіце на мяне і Мішу ўважліва, паўтарайце за намі ўсе рухі. *(Музыка танца "Крыжачок".)*

Мы уздымем ўгору рукі,
Каб зрабіць такія рухі,
Памахаць, пакруціць,
Тузаніну ў бокс зрабіць,
Папляскаць, пашчаўкаць
І спачатку усё пачаць.

Ну і замарыў ты нас, Міша, сваей зарадкай. Пэўна і сам стаміўся? Тады сядай, адпачывай. А для вас, рабяты, у мяне ёсць адзін сакрэт. Ведаеце, наш Міша самы знакаміты фокуснік. Я аднойчы падгледзела адзін з яго фокусаў і зараз пакажу яго вам. Паказаць? Т-с-с, Гэта сакрэтны фокус, і каб яго зрабіь, нам патрэбны старыя газеты альбо каляровая папера. Ну, Міша, дай нам рэквізіт.

*(З короба мядзведзя вымаюцца газеты, папера, і ўсё раздаецца дзецям.)*

Глядзіце ўважліва і рабіце, як я.

**Фокус "Папяровыя ялінкі".**

Бярэм газету, падзелім яе на дзве палавіны і па чарзе скруцім іх у адну трубку. Затым трубачку разарвем уздоўж папалам, але не да канца. Кожную палову трубачкі разрываем яшчэ раз папалам. Атрымалася чатыры паловы, так? Цяпер асцярожна бярэмся за сярэдзіну трубачкі з боку разрыву і выцягваем уверх. Атрымоўваецца прыгожая ялінка. Хто зрабіў ялінку? Уздыміце ўгору. Ай, які прыгожы лес атрымаўся. Пэўна, і Мішаньку ён спадабаецца. А давайце, рабяты, падаруем Мішаньку ўсе нашы ялінкі. Хай ён забярэ іх з сабой у лясную хату, а нам за гэта дасць гасцінца.

*(Дзеці аддаюць свае вырабы мядзведзю, ён дастае з кораба падарункі, а ўзамен хавае ў кораб зробленыя дзецьмі ялінкі.)*

А цяпер усе хуценька збтраемся да Мішкі ў шырокі круг, каб станцаваць для яго наш любімы танец "Лявоніха".

*(Дзеці гуртуюцца ў круг, Міша і Машачка паказваюць рухі танца "Лявоніха", дзеці паўтараюць усё разам з імі.)*

Вось, як прыгожа і хораша вы можаце танцаваць.

Але мы тут з вамі танцавалі,
У гульні розныя гулялі,
Вы стаміліся ці не?
Хуценька кажыце... *(не).*
Добра, добра, шум не рабіце,
Вы лепей крышачку мне падкажыце,
З намі вам весела ці не?
Не чую адказу... *(не).*
Мо з вас заснуў хто, навокал зірніце,
Трошкі, убокі суседа штурхніце,
Ну як, прачнуўся сусед ваш ці не?
Шпарка кажыце мне... *(не).*
Мо сярод вас тут ёсць абібокі,
Што чыняць капрызы, не робяць урокі?
Нешта не бачу такіх сярод вас я,
Усе тэрмінова мне дайце адказ... *(не, так).*
Бачу, народ тут сёння вясёлы,
Мабыць, да жартаў усе
вельмі здольны,
Любіце жарты вы альбо не?
Нешта не чую... *(не).*
Вось як цудоўна з сябрамі шуткуем,
Усіх я ў лесе прыгожым віншую,
Любіце лес вы альбо не?
Разам адкажам... *(не).* Не?

Дык не, ці так? Што, не любіце? Усе любяць? Вось і добра. Цяпер і мы з Мішам і Лесавічком пераканаліся, што вы вельмі паважаеце і шануеце нашу родную прыроду, свае лясы, палі, лугі, рэкі і азёры, любіце звяркоў і птушак, і ўсю нашу з вамі старажытную мілую Бацькаўшчыну. Але, на жаль, надышоў час нам з вамі развітвацца, бо канчаецца наша лясная казка. Мішаньку пара ісці да сваіх мядзведзянят, Лесавічку



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абыходзіць лясную гаспадарку, а мне вяртацца дадому, да сваей хаты. Прыходзьце ў наш прыгожы, чароўны лес, але паважайце і любіце яго, і тады кожная лясная паляна абавязкова запросіць вас да сваей чароўнай Лясной казкі.

Да пабачэння, сябры нашы!

## *Яблычны спас*

На пляцоўцы, дзе будзе праходзіць свята, стаіць стол, накрыты абрусам, на ім пірог з яблыкамі і розныя стравы, прыгатаваныя з яблык, цукеркі. Справа і злева стала — дзве яблынькі. Гучыць вясёлая музыка. Гасцей сустракае Вядучая. У руках кош з прыгожымі, сакавітымі яблыкамі. Яна віншуе ўсіх са святам садавіны:

Вось і наступіў доўгачаканы час —
Прыйшоў на зямлю светлы Спас!
Глядзіце, які воз багаты
Прыехаў сёння ў нашы хаты!
Чаго ў нас толечкі няма,
Што падарыла нам зямля.
А восень поўныя кашы
Духмяных яблык нам дала.
Мы бачым восень нам не хлусіць,
Чаруюць вока спелыя бакі,
Ах, асалода! Смак, калі адкусіш!
А ну, бліжэй! Каштуйце, землякі!

***Вядучая.***

Кажуць, што добра яблычка да Іспасу. Таму з сённяшняга дня пажадана, каб на вашым стале заўсёды былі яблыкі. Дзякуючы ім мы забяспечваем сябе вітамінамі на цэлы год! Яны вельмі карысныя і смачныя сырыя, але з іх можна прыгатаваць і шмат розных страў. Напрыклад: яблыкі ў грыльяжы, у жэле, з тварагом, з вяршкамі і г. д. А якія смачныя атрымоўваюцца з іх цукеркі, месячныя каменьчыкі, рахолі і яшчэ многа розных далікатэсаў.

Паважаныя гаспадынькі, а што яшчэ можна прыгатаваць з яблык? Можа, у вас ёсць свае сакрэты? Падзяліцеся з намі, калі ласка. Той, хто прапануе самы цікавы рэцэпт, будзе ўзнагароджаны яблычным прызам.

*(Праводзіцца конкурс на самы лепшы рэцэпт. Пераможца ўзнагароджваецца пірагом з яблыкамі, а усе астатнія — яблычнымі цукеркамі.)*

***Вядучая.***

Яблыкі яшчэ шырока выкарыстоўваюць у лячэбных мэтах. Салодкія сарты прымяняюць пры захворванні печані, сардэчна-сасудзістай сістэмы, а кіслыя — пры цукровым дыябеце. У народнай медыцыне кашыца са свежацёртых яблык прымяняецца як зажыўляючы сродак пры драпінах скуры.

Спрыяльна ўздзейнічаюць на самаадчуванне разгрузачныя яблычныя дні.

Хто хоча атрымаць яблычак — наліўны, салодкі? Для гэтага вы павінны назваць летнія сарты яблык.

**Адказ:** белы наліў, мелба, папінаўка...

А якія вы ведаеце асеннія сарты?

**Адказ:** манцэт, красуня саду, слава пераможцам, непараўнальны, усмешка восені і г. д.

Якія сарты яблык належаць да зімніх і позніх зімніх?

**Адказ:** беларускі малінавы, жыгулёўскі, беларускі сінап, лімонны, уэлсі, мінскі, палескі, суворавец...

*(Той, хто называе сорт, атрымлівае яблык.)*

Іх вядучая запрашае на пляцоўку.

***Вядучая.***

Ёсць такая прымаўка: "Сад пасадзіць нікому не рана і не позна — ні малому, ні старому". Яблыневыя сады радуюць нас вясной сваей пышнай квеценню, а восень мы не ўяўляем без шчодрых яблынь, без духмяных і сакавітых пладо. Яблыня, бадай, адзіны від садавіны, які нават у неспрыяльных умовах дае багаты ўраджай. Зараз мы з вамі будзем садзіць сад.

*(Усіх, хто знаходзіцца на пляцоўцы з яблыкам, вядучая дзеліць на дзве каманды. Гульня праводзіцца ў два этапы.)*

**Першы этап. "Пасадка саду"**

Першыя ўдзельнікі каманд падбягаюць да яблынь і ставяць іх на крыж. Другія рыдлёўкамі "ўзрыхляюць глебу" вакол яблынь, трэція паліваюць дрэўцы вадой з палівачкі. Чацвёртыя беляць камялі. Пятыя выконваюць ролю пчолкі — "апыляюць", абягаючы вакол дрэўца. Шостыя чапляюць яблыкі на дрэўцы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Другі этап. "Збор яблык"**

Першыя ўдзельнікі каманд падбягаюць да сваіх яблынь, зрываюць па яблыку і кладуць у свой кош. Другія робяць тое ж самае. І так да той пары, пакуль на дрэўцах не застанецца ніводнага яблыка. Пераможа тая каманда, якая першая збярэ яблыкі ў свой кош.

***Вядучая.***

А зараз успомніце, якая сувязь паміж яблыкам і навукай? Усім вядома, што вялікі вучрны Ньютан адкрыў закон сусветнага цягацення. Што дапамагло адкрыць гэты закон?

***Адказ:*** Ньютан сядзеў у садзе пад яблыняй. Упаўшы на яго яблык дапамог адкрыць закон сусветнага цягацення.

***Вядучая.***

Успомніце, у якім старажытным міфе згадваецца яблык раздору?

***Адказ:*** У старым грэчаскім міфе сказана, што на вясельны пір багоў не запрасілі багіню раздору — Ірыду. За гэта яна падкінула багіням залаты яблычак з надпісам "прыгажэйшай". Багіні Гера, Афіна і Афрадзіта сталі прэтэндаваць на званне "прыгажэйшай". Царэвіч Парыс аддаў гэтае званне Афрадзіце, таму што яна абяцала яму самую прыгожую жанчыну Алену. У выніку багіні перасварыліся. І дзве, што засталіся без яблык, пакляліся адпомсціць Парысу. Афрадзіта, выконваючы свае абяцанне, дапамагла Парысу выкрасці Алену — жонку траянскага цара. Гэта і стала прычынай вайны паміж грэкамі і траянцамі.

***Вядучая.***

Адкажыце, калі ласка, у якіх літаратурных творах яблык таксама адыграў вялжую ролю?

***Адказ:*** У творы А.С. Пушкіна "Сказка о мёртвой царевне и семи богатырях", у драме Фрыдрыха Шылера "Вільгельм Тэль", дзе расказваецца аб барацьбе швейцарцаў за сваю незалежнасць. Намеснік імператара загадаў на людным месцы, на шасце, павесіць свой капялюш з тым, каб кожны прахожы здымаў свой капялюш і станавіўся перад яго капелюшом на калені. Паляўнічы Вільгельм Тэль адмовіўся выканаць гэты загад, за што яму пагражала смерць. Але намеснік абяцаў памілаваць яго, калі той выстралам з лука саб'е яблык з галавы сямігадовага сына. Паляўшчы яблык збіў, а затым стралой прабіў сэрца намесніка імператара. Гэта стала сігналам да паўстання швейцарскага народа.

***Вядучая.***

Можа, у прысутных ёсць жаданне збіць стралой яблык з капелюша?

*(Праводзіцца гульня "361 яблык".)*

**Умовы гульні:** На капялюш, які ляжыць на стуле, кладуць яблык. Жадаючыя павінны збіць яго пры дапамозе дзіцячага арбалета. Шчаслівчыкі ўзнагароджваюцца падарункамі.

***Вядучая.***

У музыцы яблык таксама пакінуў свой след. Дзе менавіта? У якіх музычных творах?

**Адказ:** Расіні — опера на сюжэт Ф. Шылера "Вільгельм Тэль", Глюк — опера "Парыс і Алена", Берліёз — оперная дылогія "Траянцы".

***Вядучая.***

А якія вы ведаеце песні пра яблынкі?

*(Прапануе выканаць прысутным найбольш вядомую песню.)*

***Вядучая.***

Вы ўсе ведаеце, што яблык стаўся прычынай разладу паміж Богам і людзьмі, якія адведалі яблык з дрэва пазнання. За гэта Бог выгнаў іх з раю. Што гэта за людз1?

**Адказ:** Адам і Ева.

***Вядучая.***

А цяпер адкажыце: на што падобна палова яблыка?

**Адказ:** На другую.

***Вядучая.***

А цяпер гульня "Знайдзі сваю палову". Кожны ўдзельнік атрымлівае палову яблыка. Задача— знайсці сваю палову. Той, хто гэта зробіць першы, атрымлівае ўзнагароду ад партнёра ў выглядзе пацалунка.

*(Гучыць музыка. Усе запрашаюцца на "Спасаўскую польку". Затым вядучая частуе ўсіх прысутных яблыкамі.)*

***Вядучая.***

Жадаю вам, паважаныя сябры, каб восень і далей дарыла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вам свае сакавітыя, прыгожыя плады. І вось, як гэты салодкі гладкі яблык, няхай у вас будзе такой жа светлай і гладкай жыццёвая дарога.

Каб у вашы пакоі заўсёды свяціла сонца,
А радасць і шчасце каб было бясконцым.
Жадаю вам часцей усміхацца
І новага Спаса зноў дачакацца!

## *Спас — усяму час*

**Афармленне пляцоўкі.**

На задніку вісіць намаляванае дрэўца з яблыкамі і прымацаваны некалькі свежых яблыкаў. Гучыць музыка. Адчыняецца генеральная заслона. Ялінка збірае яблыкі з дрэўца, прытанцоўвае. За ей ідзе Цаца — багіня лета з кошыкам, поўным яблык. Туды Ялінка складае яблыкі, якія зрывае з дрэўца. *(Падыходзяць да гледачоў.)*

Цаца, багіня лета. Вітаем усіх у гэтай зале. Мы велымі рады вам, сябры. На Спас усіх вас мы запрашаем. І на цудоўныя забавы, что вас чакалі да пары.

***Ялінка.***

Пачнём мы зараз жа з усмешкі. Ой! Штось не бачна мне яе? Дзе падзявалася гарэза? Ці, можа, дрэнна вам, сябры? Вось пачастуйцеся вітамінчыкам. У ім і смеху трошкі ёсць.

*(Раздаюць 5 кавалачкаў чырвонага і 5 кавалачкаў зялёнага яблыкаў.)*

На Спас усе яблыкі, як лекі...

***Цаца.***

І рэчка лечыць ад хвароб.

***Ялінка.***

Цётачка-Цацачка, як гэта зразумець: "Рэчка лечыць ад хвароб?" Раз ты багіня лета, — усе ведаешь, і нездарма мяне адправілі да цябе вучыцца, розуму набірацца, дык растлумач нам.

***Цаца.***

У Спасаўскую нядзелю адзначаюць некалькі розных Спасаў. Адзін з іх — Макавей — 14 жніўня. У гэты дзень неабходна ў рацэ купацца людзям і мыць свойскіх жывёл, каб пазбавіць сябе ад хвароб і грахоў, а жывёлу ад нячыстай сілы і суроку.

***Яліна.***

Вось як цікава, цётачка. Нам таксама ж трэба ў вадзе паплёскацца. І таму я запрашаю да сябе ўсіх, хто атрымаў кавалачкі чырвоных яблыкаў. Праходзьце ў правы бок, а у каго кавалачкі зялёных — у левы бок.

*(Гучыць музыка. Гледачы выходзяць на пляцоўку і становяцца ў два рады.)*

***Ялінка.***

Вось так у нас і атрымліваецца быццам бы дзве вёскі — Чырвоная і Зялёная. А зараз я вам раскажу, як мы будзем "купацца ў рацэ". Вам трэба па чарзе падбегчы да вядра з вадой, памыць твар і рукі, толькі так, каб не расплёскваць ваду, пасля дабегчы да дзяўчыны з ручнком, выцерці твар і рукі. І толькі тады вярнуцца ў сваю вёску. Зразумела?

***Гледачы.***

Так! Зразумела!

***Ялінка.***

Тады адзін, два, тры, да рэчкі хуценька бяжы!

*(У час гульні гучыць вясёлая беларуская музыка.)*

***Ялінка.***

Вось і добра. Усе вы ў гэтым годзе будзеце здаровыя і прыгожыя. А гэта галоўнае. І мы ўдзячны вам за добрую гульню, прыміце нашы падарункі і праходзьце на свае месцы.

*(Гучыць музыка. Удзельнікі гульні ідуць на свае месцы.)*

***Цаца.***

У мінулыя часы людзі лічылі, каб рукі ў чалавека ніколі не стамляліся ад працы, іх на Спас абавязкова мылі ў рацэ.

***Ялінка.***

Ой, цётачка, калі ў нас усюды ў раёне будуць такія працавітыя людзі, як у гэтых вёсках, як добра мы будзем жыць. І хай усе бачаць, якія людзі ў нас ёсць.

***Цаца.***

Хопіць, хопіць нашых жыхароў хваліць! А я зараз пагляджу, як яны ведаюць беларускія прыказкі і прымаўкі. Я пачну гаварыць, а вы працягвайце. Вось як усе адкажуць, тады і хваліць будзем.

—Без гаспадара сад — прыйдзе ў поўны ... *(разлад).*
—На Спас праспіш — зімой з торбай ... *(пабяжыш).*
—Папрацуй у садзе да поту і з'ясі яблык... *(у ахвоту).*
—Садок садзіць — жыццё ... *(харашыць).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— Прыйшоў Спас — бяры рукавіцы ... *(у запас).*
*(Адказаўшым раздаюць па кавалачку яблыка.)*

***Цаца.***

Усе, хто велымі шмат чытае
І на Спас прыказкі бае,
З сябрам разам да мяне!
Доўга нам чакаць цябе?
*(Гучыць музыка. Гледачы выходзяць на пляцоўку.)*

***Ялінка.***

А зараз, шаноўныя, я прапаную вам трошкі папрацаваць. Трэба перанесці яблыкі з аднаго месца на другое. Няцяжка?

***Іграκі.***

Няцяжка!

***Ялінка.***

Але ёсць адна ўмова: рукі неабходна схаваць за спіну, а яблыкі браць зубамі. Яблыкі трэба перанесці вунь з таго вядзерца на талерачку, што стаіць у канцы вашай вёскі. Якая з вёсак самая спрытная, працавітая, мы ў хуткім часе даведаемся. ***Цаца.***

Гляджу і не нарадуюся на сваю вучаніцу. Якая спрытная і разумная! Нездарма я яе ўзяла да сябе вучыцца. І не шкадую цяпер.

***Ялінка.***

Цётачка, я ажно зачырванелася. *(Да гледачоў.)* Яна мяне хваліць, а нашы шаноўныя ўдзельнікі велымі папрацаваць жадаюць. Дык давайце разам ім палічым:

— Раз, два, тры — пачалі.

*(Гучыць музыка. Пасля заканчэння пераможцы атрымліваюць прызы, а астатнія— па кавалачку яблыка.)*

***Ялінка.***

Дзякуй за гульню і за сабраны ўраджай. А цяпер праходзьце на свае месцы.

*(Гучыць музыка. Удзельнікі займаюць свае месцы.)*

***Цаца.***

Ад гэтай мітусні я нешта запамятавала, што яшчэ хацела вам, даражэнькія, расказаць.

***Ялінка.***

Пра Спасы, цётачка. ***Цаца.***

Так, так. Падкажыце мне, калі ласка, якія яшчэ ёсць Спасы?

Гледачы адказваюць: *(Мядовы альбо макавы— 14 жніўня, яблычны — 19 жніўня, Спас на палатне, хлебны альбо арэхавы Спас— 29 жніўня).*

***Ялінка.***

Тыя, хто атрымаў яблычкі, выходзьце да мяне і запрасіце з сабой па аднаму сябру.

*(Усяго патрэбна толькі 10 чалавек.)*

*(Гучыць музыка. Удзельнікі выходзяць на пляцоўку.)*

***Ялінка.***

А якое свята без застолля, яно нават і не свята зусім. А як у нас раней святкавалі Спас на Беларусі?

***Цаца.***

Ішлі адзін да аднаго ў госці. Неслі дарункі новага ўраджаю — віно і яблыкі да сваіх сяброў і суседзяў. Каб і наступны год быў такі шчодры і багаты!

*(Жыхары вёсак мяняюцца бутэлькамі віна і яблыкамі, якія загадзя атрымалі ад памочнікаў.)*

***Ялінка.***

А зараз пачастуйце сваіх суседзяў з другой вёскі сваім віном і яблыкамі. А потым мы і вызначым, чые пачастункі найсмачнейшыя.

**Умовы застолля:** трэба 2 вёскі па 5 чалавек у кожнай. Жыхары вёсак выстройваюцца адзін за адным. На ўскрайку ставяць бутэльку віна, талерку з яблыкамі і невялічкі кубачак — для кожнай вёскі свае пачастункі.

Першы павінен дабегчы да бутэлькі, наліць поўны кубачак і паставіць яго.

Другі падбягае, выпівае налітае.
Трэцці закусвае.
Чацвёрты налівае і г.д.
Зразумела?

***Удзельнікі.***

Так! Зразумелі.

***Цаца (да гледачоў).***

А вы, паважаныя, добра-добра сачыце, хто як частуецца. Трэба пільна глядзець, каб не парушылі чаргу практыкаванняў. Спачатку налівалі, потым выпівалі, толькі тады закусвалі. Зразумелі?

***Гракі.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так!

***Цаца.***

Добра. Госці даражэнькія, частуйцеся, калі ласка!

*(Гучыць вясёлая беларуская музыка. Пасля гульні ўсе застаюцца каля вядучай.)*

***Ялінка.***

Вось і пачаставаліся нашыя госцікі. Трэба ж на свяце і польку рэзнуць.

Эй, музыка, жару дай там!
Добра, добра паіграй нам!

*(Гучыць полька. Усе танцуюць.)*

***Ялінка.***

Дзякуй усім за добры танец. Сядзьце трошкі, аддыхніце і свій дух перавядзіце.

*(Гучыць ціхая, павольная беларуская музыка.)*

***Цаца.***

Ох і добра мы пагулялі, паскакалі з вамі. Ад працы адпачылі і яшчэ пажартавалі...

***Ялінка.***

А цяпер прыйшоў нам час з вамі развітацца. Бо ў доўгую дарогу трэба нам збірацца.

***Цаца.***

Бывайце здаровы
І ў шчасці жывіце.

***Ялінка і Цаца (разам).***

Калі прыйдзем у госці, дык шчыра прыміце!

*(Гучыць музыка. Зачыняецца генеральная заслона.)*

## *Багач*

***Гульнёвая праграма "Багач"***

**Рэжысёрскі аналіз:**

**Абгрунтаванне выбару:** на сучасным этапе існуе недастатковая колькасць матэрыялаў аб свяце Багач. Таму захацелася адрадзіць гэта свята пры дапамозе гульнёвай праграмы.

**Тэма:** Багач — свята заканчэння ўборкі зерневых і пачатак азімай сяўбы. Святкаванне Багача выказвае пашану да зямлі і да хлеба.

**Ідэя:** пазнаёміць з гісторыяй Багача, перадаць вытворчы вопыт родавых традыцый. Даць зразумець гледачу, што трэба ашчадна адносіцца да матулі-зямлі.

**Сцэнарна-рэжысёрскі ход:** Знаёмства з традыцыямі свята Багач праз дзеі вядучай, якія ўвасабляюцца ў гульнях, вершах, прымаўках, загадках.

**Мастацкі вобраз:** кошык з зернем і ўстаўленай свечкай.

У музычным вырашэнні: мелодыя з жніўнай песні *("Як на нашай ніўцы...")*.

**Лейтматыў:** мелодыя з жніўнай песні "А ў садочку цвіла лілея..."

**У пластычным вырашэнні:** гульня-танец "Незвычайная полька".

***Інтэрпрэтаваны сцэнарый гульнёвай праграмы свята "Багач"***

Гучыць мелодыя са жніўнай песні "А ў садочку цвіла лілея". Выходзіць гаспадыня, яна заносіць багач і ставіць яго над абразамі ў "хаце".

***Гаспадыня:***

Гаварыла поле шырокае, жыта ядранае:
Жнейкі, жнейкі мае маладыя,
Сярпы залатыя,
Прыходзьце да мяне заўтра рана,
Каб я недажатым не стаяла.
Не хачу я ў полі стаяці,
Апошнімі каласамі махаці,
А толькі хачу ў полі — стагамі,
А ў гумне — капамі.

Шаноўныя госці! Сёння мы запрасілі вас на свята Багач. У мінулым людзі адзначалі яго тады, калі апошні сноп быў дажаты. Сноп урачыста прыносілі ў хату, абмалочвалі, зерне ссыпалі ў лубку. Затым устаўлялі свечку і запальвалі яе. Такім чынам рабіўся багач, які заносілі ў кожны двор, тым самым жадаючы багацця. Багач, згодна з павер'ем, забяспечваў ніву житам і прыносіў у хату дастатак і шчасце.

"Прыйшоў Багач, кідай рагач, бяры сявеньку ды сей памаленьку!".

***Гаспадыня:***

Свішчуць косы ў траве,
Проста дзіва гульба;
Размахнуліся рукі, узыгралася кроў,
Сонца паліць агнём, пот льецца з ілба —

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абмахнуў рукавом, ды і далей пайшоў.

—А ці хочаце вы самі паўдзельнічаць у касьбе?

*(Адказ)*

—Хто загадкі адгадвае, той са мной і пагуляе. Загадаю загадку, закіну за градку, у адзін год пушчу, у другі выпушчу.

*(Загадкі)*

Гаспадыня: — Гарбаты дзядок усё поле аббегаў *(Серп)*

—Ляжыць мужычок у залатым каптане, сам устаць не можа, а людзі яго падымаюць *(Сноп)*

—На коніку сем саколікаў, кожны ў каптаночку *(Авёс)*

—Чорная світка мае тры спінкі *(Грэчка)*

— Яго бьюць каламі, рэжуць нажамі, за тое яго так любяць, што ўсе любяць *(Хлеб)*

*(Тыя, хто адгадаў загадкі, атрымліваюць жэтоны)*

***Гаспадыня:***

Тыя, хто атрымау жэтоны, выходзьце, калі ласка, да мяне на пляцоўку. Я прапаную вам тульню "Касьба". Вы будзеце касцамі, але ў такіх умовах: уявіце сабе, што гэта поле *(выносяць ніць, на якую прывязаны каласкі)*, вам трэба будзе з заплюшчанымі вачыма "скасіць" каласок сапраўдным сярпом. "Касіць" вы будзеце па аднаму разу, калі не атрымаецца, то паспрабуеце яшчэ. І так, пакуль усе каласкі не будуць зрэзаны.

Гучыць жніўная мелодыя. Пасля гульні ігракоў частуюць. ***Гаспадыня:***

На Багач да ўсходу сонца гаспадар засяваў ніву жытам. Да азімай сяўбы селянін прыступаў урачыста. У доме ўсё мылася, чысцілася, а вечарам спраўлялі ўрачыстую вячэру.

А ці ведаеце вы, якія стравы гатавалі на Багач?

*(Праводзіцца аукцыён страў. Тыя, хто называе стравы, атрымліваюць абаранкі. Гучыць жніўная мелодыя: "Як на нашай ніўцы...")*

***Гаспадыня:***

Загудзела, як трэба, жыта скрозь галасамі,
Заглядзелася ў неба да аблок каласамі.
Будзе хлеба багата — млын муку вырабляе
Маці булак згатуе — каб з'есці потым з чаем.

А зараз тыя, хто атрымаў жэтоны, хадзіце, калі ласка, да мяне на пляцоўку. Мы зараз пагуляем у "Млын". Падзяліцеся, калі ласка, на дзве каманды. Уявіце сабе, што кожная каманда будзе няспынным канвеерам, які будзе малоць зерне. Першы з каманды павшен узяць каласок з падлогі і перадаць яго над галавой, пакуль не дойдзе да апошняга. Апошні павінен зноў перадаць каласок наперад — першаму іграку, але ўжо паміж нагамі. Першы павінен палажыць гэты каласок у мяшэчак. Але ўвага: браць наступны каласок першы ігрок можа толькі тады, калі ў мяшэчак будзе пакладзены папярэдні каласок, перададзены ўнізе.

*(Пачынае гучаць хуткая мелодыя з песні "Як на нашай ніўцы ")*

*(Пасля гульні "Млын"усіх удзельнікаў частуюць).* ***Гаспадыня:***

"У стагнача хопіць хлеба да Багача"
Багач заткнуў за страху рагач.
Да Багача баба рабача, па Багачы хоць за плот валачы.
—Ой, якая багатая восень
Усё ў яе ўдалося!
Жыта ў трубу павілося.

Усё святкаванне Багача было святасцю, выказваннем вялікай адказнасці, асобай пашаны да хлеба.

А ці ведаеце вы прымаўкі пра хлеб?

*(Адказ)*

—Я буду пачынаць прымаўку, а вы працягваць.
Шмат снегу *(працягваюць)* — шмат хлеба.
Не той хлеб, што на полі *(працягваюць)* — а той, што ў гумне.
Едзеш на дзень — бяры хлеба *(працягваюць)* на тыдзень.
Без хлеба няма *(працягваюць)* абеда.
Хлеб не зяць — паглядзяць *(працягваюць)* ды з'ядзяць.
Жывём *(працягваюць)* хлеб жуём.
Калі ёсць хлеб і вада *(працягваюць)*, то не бяда.
Хлеб усяму *(працягваюць)* галава.

*(Хто* ***дапоўніў прымаўку, атрымлівае жэтон).***

***Гаспадыня****:*

Хто атрымаў жэтон, калі ласка, выходзьце да мяне на пляцоўку. Зараз вы паспрабуеце "замясіць цеста на каравай". Падзяліцеся на дзве каманды. Умовы гульні наступныя. Каля кожнай каманды стаяць неабходныя рэчы, а насупраць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каманды — "сталы", на якіх вы будзеце замешваць цеста. Першы ігрок бярэ посуд і бяжыць ставіць на стол, другі — муку, трэцці — ваду, чацвёрты павінен усё добра перамяшаць. Хто хутчэй усё зробіць, той і пераможа. Але гэта гульня не толькі на хуткасць, а таксама на якасць.

*(Пачынае гучаць мелодыя з песні "Як на нашай ніўцы")* ***Гаспадыня:***

Дзякуй вам за працу. Добра вы гуляеце, а зараз паглядзім, як вы спяваеце.

*(Раздаюцца прыпеўкі)*

—Чым хата багата, тым і рада. Асабіста багацейшая тая, у якой гучаць песні.

Удзельнікі па чарзе спяваюць прыпеўкі:

—У горадзе, авясец
На сто рублёў каласец
А вяночак на шаблю
Адхініся, не люблю.
—Мне не трэба пуд гароху
Толькі дзве гарошынкі.
Мне не трэба многа хлопцаў
Мне адзін харошанькі.
—Толік з Піцеру прыехаў,
Гармонь новую прывёз.
Гармонь новая раве,
Бацька хлеба не дае.
— Я па беражку бягу,
Бераг асыпаецца
Я бяззубага люблю —
Бяззубы не кусаецца.
—Хараша табе, каліна,
На табе шырокі ліст,
Хараша табе, падруга, —
Цябе любіць гарманіст.
—Бацька грае, сын басуе,
Дачка замуж галасуе.
Дачку замуж аддае.
—Не хадзіце, дзеўкі, у лазню,
Не хадзіце парыцца.
Ад гарачае прыпаркі
Пудра ўся адваліцца.
— Мне не трэба пуд мукі,
Мне не трэба сіта,
Мяне мілы пацалуе,
Целы тыдзень сыта.

***Гаспадыня:***

Добра спяваеце, а зараз паглядзім, як танцуеце. Запрашаю ўсіх на польку. Але мая полечка незвычайная.

***Гаспадыня:***

Пачынаем усё з кружочку
Рукі ўнізе ў замочку
Гэй, музыка, рэж нам ох!
Польку дробну, як гарох
Полька ўлева, полька ўправа
*(Усе танцуюць)*
А цяпер, каб не згубіцца,
Трэба локцем зачапіцца.
Полька ўлева акуратна,
Полька ўправа дэлікатна.
*(Усе танцуюць)*
А цяпер такія рэчы
Бярэмся за суседа плечы
Полька ўлева, полька ўправа
*(Усе танцуюць)*
Ножкі цэлы? *(Адказ)*
Ручкі не стаміліся? *(Адказ)*
Самі вы не зажурыліся? *(Адказ)*
Аб'яўляю разам з тым,
Што цяпер у нас інтым!
Хлопцы ды паненкі,
Бяромся за каленкі.
Полька ўлева, полька ўправа,
А цяпер пайшлі ў скокі
Круціцеся ва ўсе бокі.

Гаспадыня: Добра вы спявалі, добра і плясалі,
Вось за гэта ў пячы я напёк вам калачы
Свежыя, гарачыя, ды к таму ж і смачныя!
Добра Багач сустрэлі, а зараз не грэх і пачаставацца.
*(Усіх гледачоў частуюць караваем).*
Але трэба ўжо несці да іншых двароў.

***Гаспадыня:***

Мае ж вы дзетачкі, дочачкі, сыночкі,
Вялікі дзякуй, што вы ўсе сюды прыйшлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дай Бог вам долі, мае каласочкі,
Каб усё жыццё вы ў шчасці правялі!
*(Гучыць музыка, гаспадыня развітваецца і забірае Багач. Гучыць мелодыя з песні "А ў садочку цвіла лілея").*

## ***Жаніцьба Цярэшкі***

*(Пасля полечкі гледачы застаюцца на пляцоўцы.)* ***Лявон.***
А ці будзем сёння Цярэшку жаніць?
***Усе.***
Так,
будзем!
***Лявоніха.***
Хто Цярэшку жаніць будзе, той у золаце хадзіць будзе! ***Дзяўчына.***
А хто ў нас будзе за
бацьку? ***Музыка.***
А няхай Лявон. Ён у нас самы сталы і ў такіх справах вельмі ўдалы!
***Лявон.***
Добра, буду вам за бацьку, вас у абіду не дамо, а калі што дзе ні то, то і дубца дам па-бацькоўску. ***Музыка.***
А Лявоніха няхай будзе за матку, згодны? ***Лявоніха.***
Ну, ставайце, дзеткі, у рад, каб Бог быў рад! ***Лявон.***
Станьце, хлопчыкі, радком, пагаворым мы ладком!
*(Лявоніха зЛявонам выстройваюць моладзь на пляцоўцы так, каб атрымаўся клін.)*
***Музыка.***
А зараз трэба бацьку і маці ў "Лявонісе" скруціць!
*(Гучыць "Ллвоніха ", гаспадары танчаць.)*
Лявон і Лявоніха спяваюць "Божаж мой..."
*Лявоніха (выводзіць дзяўчыну з радоў).*
Ёсць у мяне дачка Волечка — тоненькая, як бярозка, а салодкая, як цукерка. Адшукай ей, бацька, добрую пару!

***Лявон.***
Калі твая дзяўчына сохне ад кручыны, то мой Вадзік якраз ей да пары — вясёлы, добры хлопец.
*(Гучыць "Лявоніха ", у танцы маладых падводзяць адзін да аднаго.)*
Лявон і Лявоніха спяваюць "Вадзімка — сынулечка..."
***Лявон*** *(выводзіць дзяўчыну з зала).*
Вось у мяне дзяўчына дык дзяўчына! Абцерушыце пыл з вушэй, каб не запарушыў вачэй. Такіх дзяўчат шукаюць гадамі, у замежных краінах за марамі, а яны вось тут, разам з намі.
***Хлопец.***
Татуля, аддай Таццянку за мяне замуж!
***Лявон.***
Вось і добра, ты, Яўгенка, хлопец працавіты. Танечка, згодна?
*(Дзяўчына згаджаецца, гучыць "Лявоніха ", маладыя падыходзяць да першай пары, якая знаходзіцца на апошнім плане пляцоўкі.)*
***Лявон.***
Ой, мае вы даражэнькія, вы толькі паглядзіце, які хлопец, як тваё імя? *(Хлопец адказвае.)*
***Лявоніха.***
А мая прыгажуня Галечка якраз яму да пары.
Спяваюць "Галечка-душачка", усе астатнія пары ўтвараюць "ручаёк", ідзе гульня, адна дзяўчына застаецца без пары.
***Лявоніха.***
Пагляньце, якая перад вамі дзяўчына, і адна, без пары!
*(На пляцоўку ідзе Бахур.)*
***Бахур.***
Мне спадабалася гэтая дзяўчына, я даўно яе ўгледзеў!
*(Становіцца з дзяўчынай у "ручаёк ".)*
***Лявоніха.***
Дай вам Бог шчасця ў нянасці і харошую долю ў волю!
*(Пары з ручайка разыходзяцца ў паўкола, Шчодра выносіць пірог, гурт спявае "Цярэшка-Цярэшачка...", гаспадары абносяць пірагом пары.)*
***Лявоніха.***
Пойдзем жа ў карагодзе, каб шчасце нас не мінала!
***Лявон.***



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пойдзем жа ў карагодзе, каб жыццё наша лепшым стала! ***Лявоніха.***

Пойдзем жа ў карагодзе, каб не спыніўся вечнага жыцця круг,

***Усе.***

Каб ачысціўся наш дух!

*(Усе ідуць у карагодзе і спяваюць "У карагодзе мы былі".)*

Пасля карагода ўсе спяваюць калядную развітальную песню "Будзь ваша здароўе".

## *Пакроўскае ігрышча*

На пляцоўцы стаяць два кошыка: у адным — паленне, у другім — бульба. З аднаго боку стаіць свечка, каля яе ляжаць яшчэ некалькі свечак, з другога боку на ручніку — печаныя булачкі. Па цэнтры на задніку вісіць вяночак. На стале стаяць чаравічкі, ляжаць бубен і дудачка.

*(Гучыць беларуская танцавальная мелодыя. На пляцоўку выходзіць жанчына, якая выконвае ролю Свахі.)*

***Сваха.***

Добры дзень, людзі добрыя! Са святам Пакровы! Кажуць, на Пакровы заўсёды былі свахі, якія хадзілі і сваталі дзяўчат, ладзілі знаёмствы. Дык вось, гэту справу буду сёння рабіць я. Так што запрашаю ўсіх — і старых, і малых, дзяўчат і хлопцаў — пакаштаваць бліноў, на свяце пабываць, сябе паказаць, у гульні пагуляць, паспяваць і вясёлы настрой не губляць!

*(Музыка змаўкае.)*

***Сваха.***

Вось і прыйшлі Пакровы. А яны спытаюцца — ці да зімы гатовы? Ці ёсць у каморы і ў аборы? Ці пажалі жыцечка? Ці пакапалі градачкі? Паказалі парадачкі? Вось паслухайце, як было здаўна. Свята Пакроў адзначалася кожны год глыбокай восенню, калі заканчваліся ўсе работы ў полі. Гаспадары рыхтавалі смачныя стравы да святочнага стала. Казалі людзі: "Прыйшоў Пакроў з усім дабром!". Няхай, дарагія людзі, будзе ўсім сытна і ў кожнага будзе духмяны хлеб з новага ўраджаю!

*(Гучыць вясёлая танцавальная музыка.)*

***Сваха.***

Песні сыплюць, нібы зоры,
Сэрцу хочацца прасторы...

Прыходзьце, хто толькі хоча, да нас на свята. Усім будзе і прывет, і пачастунак шчодры... Я ўжо бачу: завіталі да нас суседзі-цыганы. Рады вам, далучайцеся да ўсіх.

*(Гучыць народная песня "Ой, на гары цыганы стаялі".)*

Ой, на гары цыганы стаялі, 2р.
Стаяла, думала цыганачка малада, 2 р.
Цыганачка малада.
Ён цыганачку сабе выбірае 2 р.
Стаяла, думала цыганачка малада, 2 р.
Цыганачка малада.
Ты, цыганачка, будзь мая каханка, 2 р.
Стаяла, думала цыганачка малада, 2 р.
Цыганачка малада.

***Сваха.***

Без вясёлых цыганоў свята не свята. А дзяўчаты-цыганачкі якія прыгожыя, могуць і паваражыць.

*(Гучыць мелодия "Цыганачка".)*

А вось і "Цыганачка" запрашае паскакаць. Ці здольныя дзяўчаты да скокаў? Калі здольныя, то мы зараз пабачым: хто як працуе, той так і танцуе. А вы, хлопцы, глядзіце, каму якая падабаецца. Заўсёды на Пакроў сваталіся хлопцы да дзевак, дамаўляліся аб шлюбе. Я сваха, буду вам падказваць, з якой вёскі дзяўчына і якога роду. Дамовіліся? Калі так, то пайшлі скакаць!

***Сваха.***

Добра скакалі нашы дзеўкі! Ну вось, я бачу, што знайшлася першая пара, мабыць, і ўсе нашы дзяўчаты не застануцца без суджаных. Вы знаеце, калісьці на Пакроў гулялі ў гульню з чаравікамі.

Хлапец становіцца на адно калена перад дзяўчынай, трымаючы ў руцэ пару чаравікаў, і кажа: "Ці падабенькі пасталенькі?". Калі яна згодна пайсці за яго замуж, то кажа: "Падабенькі". А калі не, то я, сваха, запрашаю другую пару.

*(Гучыць беларуская народная песня "Лявоніха". Ідзе гульня.)*

Тыя, хто падабраў сабе пару, танцуюць "Лявоніху".

***Сваха.***

На Пакроў заўсёды было весела, шмат збіралася народу, і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сёння так. Прыйшлі і прыехалі і нават з сабою прывезлі новыя прыпеўкі. Зараз паглядзім, якія вы спрытныя ў прыпеўках.

*(Ідзе конкурс прыпевак, выканаўцы атрымліваюць узнагароды — кошык бульбы.)*

На Пакровах я была,
Бачыла Міхася.
Ён хацеў пацалаваць,
А я не далася.
Ой, Пакроўскі кірмаш!
Даражэнькі ты наш,
А што грошы палучыла —
Я ў краму падарыла.
Як па восені ў нас
Быў Пакроўскі кірмаш.
Прадавалі, таргавалі—
Хлопцы дзевак выбіралі!
Хлопцы дзевак выбіралі,
Іх да шлюбу рыхтавалі,
Падарункі ім куплялі,
Моцна, моцна цалавалі.

***Сваха.***

У дзень Івана Шаптуна, перад Пакровамі, свахі патаемна дамаўляліся з жаніхамі наконт нявест, падказвалі, якую браць замуж, а якую не. Прыказка сцвярджае: "Прыходзяць Пакровы — раве дзеўка, як карова".

Дык вось, каб дзеўкі не плакалі, а былі радасныя — ёсць я. Сваю справу я ведаю. Зараз я запрашаю да сябе аднаго хлопца і як мага больш дзевак. Хлопец становіцца тварам да гледачоў, а дзяўчаты ззаду яго па чарзе кажуць: "Я — твая нявеста". Хлапец павінен па голасу пазнаць сваю. Затым падыходзіць другі хлапец, трэцці... Усе па чарзе павінны пазнаць па голасу сваю нявесту.

*(Праводзіцца гульня "Я— твая нявеста ".)*

***Сваха.***

Ого, колькі пар атрымалася! Прыміце ў падарунак па свечцы. І памятайце, што я, сваха, пачэсны госць на вяселлі. А якая ж дзеўка не хоча выйсці замуж?! Ці хлапец знайсці пару на ўсё жыццё?

Звычайна ў дзень Пакрова дзяўчаты хадзілі ў царкву, ставілі свечку перад іконаю Пакрова са словамі: "Святы Пакроў пакрыў зямлю і ваду — пакрый і мяне, маладу!".

А яшчэ варажылі. Дык вось я прапаную вам гульню-варажбу "Паленне".

*(Раскідваюцца паленні. Дзяўчаты разам хуценька пачынаюць збіраць. Потым пачынаюць лічыць. Чым больш паленняў збярэ дзяўчына, тым багацейшы будзе ў яе жаніх.)*

***Сваха.***

Ну вось, цяпер вы, дзяўчаткі, ведаеце, што чакае вас у жыцці. *(Гучыць вясёлая музыка.)*
Вось і музыка гучыць, скора чакаць шмат шчаслівых веселляў. А зараз я запрашаю дзяўчат і хлопцаў. Дзяўчаты, станавіцеся па адзін бок, а хлопцы — па другі. Пагуляем у "Дудку- самадудку". Гуляюць і хлопцы, і дзяўчаты. Хлапцы спяваюць песню пра свята, а дзяўчаты стаяць кругам і перадаюць з рук у рукі "дудку-самадудку" да таго часу, пакуль спяваецца песня. Па заканчэнні песні тая дзяўчына, у якой застанецца дудка, пераходзіць на бок хлопцаў і дапамагае спяваць. *(Ідзе гульня.)*

У нашага свата галава
І яшчэ вялікая барада.
А ў нашага свата доўгі нос,
І яшчэ за годзік ён падрос.

Песня паўтараецца некалькі разоў. У выніку застаецца адна дзяўчына.

***Сваха.***

Не журыся, дзяўчынка, зараз мы выберам табе хлопца ў час танцаў. Я ведаю, што ў нас вельмі любяць "Кракавяк". Дык усіх, і старых, і маладых, я запрашаю паскакаць разам з намі.

*(Ідуць скокі. Тыя пары, якія пазнаёміліся ў час гульні, атрымліваюць маленькія каравайчыкі-булачкі.)*

***Сваха.***

Ну вось, справу сваю я зрабіла, шмат засватала дзяўчат. Пасля Пакрову будзе дзе разгуляцца! Ото ж, якая я добрая сваха! Ой, і шмат вяселляў будзе. Ну, няхай на здароўе жывуць.

Мы ўсім маладым жадаем жыць-пажываць
І дабра нажываць!
Хай шчасце вашу хату не мінае!
Каханне хай яе не пакідае!
Павагі, дабрабыту, весялосці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жадаем вам — я, жыхары і госці!

ЗМЕСТ

*Уступ*........................................................ 3
*Калядныя варожбы*................................... 7
*Шчодры вечар - добры вечар* ................... 14
*Калядкі Дзеда Мароза* ............................. 18
*Добры вечар таму, хто ў гэтым даму* ... 27
*А ў нас сёння Каляда* ................................ 31
*Ішла Каляда*............................................. 35
*Зіма з вясною сустракаюцца* .................. 52
*Масленка* .................................................. 70
*Масленічныя забавы* ................................ 78
*А мы Масленку чакалі* .............................. 83
*Гуканне вясны*........................................... 89
*Юр' я*......................................................... 96
*Юр 'я на парог вясну прывалок* ............... 101
*Прыйшла Юр'ева раса* ............................... 108
*Юр'ева матка ў свет пайшла* ................. 115
*Юр'еўскія забавы* ...................................... 122
*Сёння свята для ўсіх будзе* ...................... 128
*Юр'еў дзень* .................................................. 137
*Куток халастых* ........................................... 143
*Камаедзіца* .................................................. 146
*Птушыныя гульні*........................................ 152
*Вялікдзень* .................................................. 155
*Сёмуха* ......................................................... 161
*Фэставыя гульні* .......................................... 164
*Дзіцячы санны цягнік*.................................. 168
*Матчын ручнік* ............................................. 177
*Гары, не згасай, зорка любові*.................. 182
*Лясная казка* ............................................... 190
*Яблычны спас* ............................................. 198
*Спас - усяму час*.......................................... 202
*Багач* ............................................................ 206
*Жаніцьба Цярэшкі* ...................................... 211
*Пакроўскае ігрышча*.................................... 213

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ